Валеры
МАРАКОЎ

# Рабінавая ноч

ВЫБРАНАЕ

ВЕРШЫ, ПАЭМЫ
ПРОЗА, ПУБЛІЦЫСТЫКА, КРЫТЫКА
ПЕРАКЛАДЫ

У дадатку — успаміны пра В. Маракова сяброў і сучаснікаў, погляд на яго і ягоную творчасць праз гады, кароткі жыццяпіс паэта

Мінск
2003

***Прымай, дарагая краіна,***
***Прымай свайго сына ізноў!***
***І месячным светам —***
***Крывёю рабіны,***
***І сумам начэй, і трывогаю сноў...***

Іх расстралялі, як гэта звычайна робяць каты,



В. Маракоў. 1925 г.

УДК
ББК 84(4Беі)6
М 25

Укладанне і каментар Леаніда МАРАКОВА

Фотаздымкі Леаніда МАРАКОВА,
а таксама з архіваў Літаратурнага музея Я. Купалы,
Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва,
Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры

**Маракоў В.**
М25 Рабінавая ноч: Вершы, успаміны, жыццяпіс / Уклад., жыццяпіс, фота Л. Маракова; прадм. В. Рагойшы.— Мінск, 2003. — 480 с., 24 іл.

ISBN 985-

Кнігу „Рабінавая ноч“, якая выходзіць праз 68 гадоў пасля смерці вядомага беларускага пісьменніка Валерыя Маракова, рэпрэсаванага ў 1930-я гады, склалі творы паэта, успаміны яго равеснікаў, погляд на яго і ягоную творчасць праз гады, кароткі жыццяпіс.

УДК
ББК 84(4Беі)6

© Л.У.Маракоў. Укладанне, жыццяпіс, каментар, фотаздымкі, 2003

© В.П.Рагойша. Прадмова, 2003

ISBN 985-

# НА ПЕРАЛОМЕ ЖАЛЕЗА І ПЕСНІ

*Жыць нам прыйшлося вялікімі днямі*
*На пераломе жалеза і песні.*

на досвітку 29 кастрычніка 1937 года. Іх брацкая магіла, відавочна, знаходзіцца (каты звычайна не хочуць пакідаць слядоў) у прыгарадным лесе, які з часам стаў мінскім паркам імя Чалюскінцаў. За дзень да гэтага іх, усіх дзевяцярых, „судзіла“ (ды хіба можна назваць гэта судом!) выязная сесія Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР. Кожнаму на разгляд справы было адведзена роўна 15 хвілін — столькі, каб хапіла адно спытаць, ці прызнае сябе падсудны віноўным, і зачытаць стандартнае абвінавачванне ў прыналежнасці да „аб’яднанай антысавецкай, нацыянал-фашысцкай, тэрарыстычнай і шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі, якая ставіла сабе за мэту адарваць Савецкую Беларусь ад СССР і ўстанавіць пры дапамозе інтэрвенцыі фашысцкую дыктатуру“. Ды яшчэ закончыць гэтае абвінавачванне фразай, што не пакідала ніякай надзеі падсуднаму: „Прысуд канчатковы, абскарджанню не падлягае, і, згодна Пастановы ЦВК СССР ад 1 снежня 1934 г., павінен быць неадкладна выкананы“.

У той чорны дзень у гісторыі беларускай літаратуры ахвярамі сталінска-бальшавіцкага этнацыду сталі:

Анатоль ВОЛЬНЫ, паэт, празаік, драматург (у

тым ліку кінадраматург), удзельнік грамадзянскай вайны, адзін час — работнік апарату ЦК ЛКСМБ;

Платон ГАЛАВАЧ, вядомы празаік і грамадскі дзеяч, які ў свой час займаў адказныя пасады першага сакратара ЦК ЛКСМБ, члена ЦК КПБ і ЦВК БССР, намесніка наркама асветы БССР, рэдактара газеты „Чырвоная змена“, часопісаў „Маладняк“ і „Полымя“;

Міхась ЗАРЭЦКІ, празаік і драматург, творчая спадчына якога, у тым ліку раман „Сцежкі-дарожкі“, не страціла мастацкую вагу да нашага часу (нядаўна выйшаў чатырохтомны збор яго твораў);

Васіль КАВАЛЬ, арыгінальны празаік, аўтар апавяданняў і аповесцяў;

Васіль СТАШЭЎСКІ, драматург і празаік, удзельнік першай сусветнай і грамадзянскай войнаў;

Ізі ХАРЫК, выдатны яўрэйскі паэт, які пісаў на мове ідыш, рэдактар мінскага часопіса „Штэрн“ („Зорка“);

Міхась ЧАРОТ, паэт, празаік, драматург, аўтар шырокавядомай у свой час рэвалюцыйна-ўслаўленчай паэмы „Босыя на вогнішчы“ і сцэнарыя першага беларускага мастацкага фільма „Лясная быль“, удзельнік грамадзянскай вайны, член ЦВК БССР, рэдактар газеты „Савецкая Беларусь“...

Я не назваў самага маладога з дзевяцярых (хоць і самыя „старыя“ з іх — В.Сташэўскі і М.Чарот — толькі-толькі перасягнулі саракагадовы рубеж), дваццацівасьмігадовага Валерыя Маракова — пра яго ў нас пойдзе асноўная гаворка. Судзілішча над ім пачалося — без сведкаў і адваката — 28 кастрычніка 1937 г. ў 19 гадзін 15 хвілін, скончылася — у 19 гадзін 30 хвілін. Падсудны віноўным сябе не прызнаў, заявіў, што асобаў, якія на яго нагаварылі, ведаў асабіста, але чаму яны гэта зрабілі — вытлумачыць не можа; у сваім апошнім слове прасіў „суд“

паверыць, што ніякай контррэвалюцыйнай дзейнасці ён не вёў, і аднесціся да яго спагадліва.

О святая наіўнасць!

Бальшавіцкая рэвалюцыя, як і ўсялякая іншая, папярэдне знішчыўшы не толькі сваіх ворагаў, але і незычліўцаў, пачала пажыраць уласных дзяцей. Няўжо каты (назавём прозвішчы членаў выязной „тройкі“, што прыехалі з Масквы і якім развязаў рукі сам Сталін: Матулевіч, Маліноўскі, Заранаў) маглі пашкадаваць ахвяру? Няважна, гаварыў ці не гаварыў В.Маракоў у свой час, як пра тое сведчылі сексоты, што „партыя і савецкая ўлада вядуць у адносінах да БССР русіфікатарскую палітыку, што ў БССР няма сапраўднага развіцця нацыянальнай культуры, што калектывізацыя вядзе беларускі народ да голаду і разарэння“. Хутчэй за ўсё, гаварыў, не мог не гаварыць хаця б у вузкім коле, бо не мог не бачыць, што тварылася навокал. Аднак справа нават не ў гэтым. Не было б такой зачэпкі, з’явілася б іншая. Бо планава, па загадзе зверху праводзілася суцэльная дэбілізацыя грамадства, вынішчалася духоўная эліта нацыі. А пісьменнікі — у першых шэрагах гэтай эліты. Таму і вынішчалі нават камуністаў, тых, хто ўстанаўліваў, у тым ліку і са зброяй у руках, савецкую ўладу, хто арганізоўваў, а пасля і ўзначальваў камсамольскую арганізацыю рэспублікі (якая іронія лёсу: камсамольскіх лідэраў Галавача і Дудара расстралялі ў дзень нараджэння камсамола!). Таму і знішчылі адразу дзевяцярых. А назаўтра, 30 кастрычніка 1937 года, — яшчэ чатырох: Уладзіслава Галубка, Янку Нёманскага, Тодара Кляшторнага, Юрку Лявоннага. Увогуле ж, з больш чым двухсот беларускіх пісьменнікаў пад канец 30-х гадоў засталося ўсяго каля сарака. Ды і тых, у тым ліку Янку Купалу, Якуба Коласа, Змітрака Бядулю, Кандрата Крапіву, Петруся Броўку і інш., тагачасны першы сакратар ЦК КПБ Панамарэнка

ў канцы 1938 г. вырашыў пусціць у распыл, каб тым самым „закрыць беларускае пытанне“. На шчасце, не выйшла: „план“ па дэбілізацыі быў значна перавыкананы, за пісьменнікаў „заступіўся“ сам Сталін...

Аднак вернемся да Валерыя Маракова, яго жыццёвай і творчай біяграфіі. У другой палове 20-х — першай палове 30-х гадоў імя Маракова было добра вядома аматарам беларускай паэзіі. Нарадзіўшыся 27 сакавіка 1909 г. у вёсцы Акалонія (пазней увайшла ў межы Мінска), ён ужо ў семнаццаць гадоў трымаў у руках свой першы паэтычны зборнік „Пялёсткі“ (1926), а ў васемнаццаць — другі, „На залатым пакосе“(1927). Увогуле, трэба сказаць, што ў тыя гады, у адрозненне ад пазнейшага часу, Маракоў быў не адзіны, хто яшчэ да дваццаці гадоў трымаў у руках свае першыя кніжкі. Так, у дзевятнаццаць гадоў мелі ўласныя зборнікі А.Звонак, М.Лужанін і Ю.Таўбін, у васемнаццаць — С.Дарожны, а А.Куляшоў — нават у шаснаццаць. І ўсё ж такая ранняя творчая сталасць паэта прыемна здзіўляе. За свой дзесяцігадовы творчы шлях (1925—1935) Маракоў паспеў выдаць усяго чатыры паэтычныя кнігі (яшчэ — „Вяршыні жаданняў“, 1930 г., і „Права на зброю“, 1933 г.). І сёння наш духоўны свет можа і павінна ўзбагачаць творчасць таго, хто

У казках, і ў песнях, і ў думах,
У шуме і ў звоне дарог
Сэрца, сагрэтае сумам,
Роднаму краю збярог.

Умоўна творчасць паэта можна падзяліць на два перыяды: тое, што напісана да 1930 года, і творы 1930–1935 гадоў. Маракоў — паэт выразнага лірычнага даравання, што арганічна лучылася з яго спакойным, ураўнаважаным, далікатна-цнатлівым, нават сарамяжлівым характарам, з яго дабрынёй, чуласцю,

справядлівасцю. Думаецца, усе гэтыя якасці паэта і чалавека найбольш плённа і арыгінальна выявіліся ў першы перыяд яго творчасці, калі грамадская атмасфера яшчэ больш-менш дазваляла раскрывацца кожнаму таленту па-свойму, па-асабліваму. Паэт у гэты час належаў да літаратурных арганізацый „Маладняк“ і — з канца 1928 г. — БелАПП, якая на першым часе (да 1930 г.) нямала рабіла па ідэйным выхаванні літаратурнай змены, стварэнні так званай пралетарскай літаратуры, пашырэнні сувязяў беларускай літаратуры з літаратурамі народаў СССР і замежных краін і не была асабліва прасякнута пазнейшай вульгарна-сацыялагічнай агрэсіўнасцю, нецярпімасцю да іншадумцаў. На гэты час выпалі як першыя вершаваныя практыкаванні, так і настойлівая паэтычная вучоба паэта, большасць яго творчых дасягненняў. Сын муляра, сам муляр, потым — студэнт Мінскага Белпедтэхнікума, штатны і няштатны супрацоўнік часопісаў і газет (у тым ліку — сакратар „Маладняка“, загадчык літаратурнага аддзела „Савецкай Беларусі“), Маракоў быў захоплены, паланёны паэзіяй. Выдатныя прыродныя здольнасці, выключнае адчуванне моўнага рытму, яскравае метафарычнае мысленне — усё гэта садзейнічала таму, што вершы лёгка і нявымушана складаліся ў галаве юнага паэта, ён літаральна не паспяваў запісваць іх на паперы, а тым больш — выпраўляць іх. Прычым вершы складаліся пры любых умовах: у часе мулярскай працы, у дарозе, на лекцыях, у студэнцкім інтэрнаце... Пастаяннае ўнутранае жыццё паэзіяй не магло не пазначыцца на знешнім, фізічным вобліку Валерыя, яго псіхічным стане, паводзінах. Вось як апісваў паэта ў 1929 годзе яго аднакурснік, а пазней — сумна вядомы крытык Алесь Кучар: „Нервовая напружанасць адбіта ва ўсёй яго постаці. Рухі яго нервовыя, няпэўныя. Блакітныя вочы (надзіва часта

сустракаюцца ў паэтаў) таксама блукаюць нервова, трывожна. Увесь архіў ён хавае ў кішэнях. Вершы ў большасці замусоленыя, абарваныя. Кожны дзень ён частку іх губляе, але ўсе свае вершы памятае напамяць і, здаецца, ніколі іх не забудзе... Ён прапускае большасць лекцый. На тых жа, што прысутнічае, — піша... Амаль увесь год не здае залікаў. Толькі ў канцы года пачынае здаваць. Працуе палка, напружана, нервова. Працуе цэлымі днямі безупынна... Дня адпачынку ў Валерыя няма. Ён прывык адпачываць працуючы...“ („Маладняк“, 1929, № 7).

Менавіта ў часе такой пастаяннай працы, і не толькі творчай, у стане выключнага нервовага напружання і напісаліся вершы, якія склалі дзве першыя кніжкі паэта — „Пялёсткі“ і „На залатым пакосе“. Прычым Маракоў літаральна ўварваўся ў беларускую паэзію, уварваўся адразу і напорыста, у юнацкім шаснаццацігадовым узросце. Спіс яго публікацый за 1925 год — год першай публікацыі — налічвае ажно два дзесяткі пазіцый. І гэта не публікацыі ў шматтыражках ці раёнках, а ў рэспубліканскіх газетах „Савецкая Беларусь“, „Звязда“, „Беларуская вёска“, „Чырвоная змена“, „Беларускі піянер“, часопісах „Малады араты“, „Чырвоны сцяг“ і г. д. У 1926 г. да гэтых выданняў далучыліся самыя салідныя літаратурна-мастацкія часопісы — „Полымя“ і „Маладняк“.

У „Пялёсткі“ ўвайшлі вершы, напісаныя пераважна ў 1926 годзе і апрабаваныя на старонках перыядычнага друку. Што вызначала гэтыя творы? Калі сказаць коратка — настрой маладой радасці. Радасці ад усведамлення таго, што ты малады і моцны, што вакол роднае, сваё, што ты любіш людзей і цябе любяць, што ты кахаеш і цябе кахаюць, што... Ды хіба мала з чаго можна радавацца юнаку, амаль падлетку, адгароджанаму бацькоўскімі клопатамі ад цяжкасцяў і складанасцяў жыцця, ды яшчэ калі радасць памнажаецца тым, што яна арганічна выліваецца ў вершаваныя радкі, якія ты

і твае знаёмыя неўзабаве могуць прачытаць у друку!

Я цяпер з хлапцамі ў радасці бягу,
Каб уліць у сэрца нашых дзён разгул.
І не чую свісту, вострага, як нож,
Што другіх без жалю ўжо скасіў даўно.
Толькі я спяваю ў залаты прастор,
Каб дарыць прыволлю радасць светлых зор...
Ўсе трывогі — глупства, трэба знішчыць іх,
Каб квітнела шчасце ў нівах дарагіх,
Каб над роднай вёскай, на прастор сівы
Пралілася песня кветак і травы.
Вось чаму сягоння ў радасці бягу
І ўліваю ў сэрца нашых дзён разгул!

Верш гэты— даволі тыповы для Маракова першага этапа ягонай творчасці. Тыповы як па змесце, так і па форме. Сапраўды, пра што б ні пісаў малады паэт, нават пра наўрад ці радаснае (расставанне з родным домам, з любай дзяўчынай, цяжкая праца муляра і г. д.),— настрой маладзечай бяздумнай радасці пераважае. Як і ў другім вершы („О, мой любы дружа, дружа дарагі...“), дзе ўжо радавацца, здаецца, зусім не выпадае:

Ты і я сягоння будзем пець і жыць,
Хоць парой пад горлам зіхацяць нажы. (?!)

Гэткім настроем заліхвацкай радасці ў асноўным прасякнута і другая кніжка Маракова — „На залатым пакосе“,— якая выйшла ўслед за першай і якую склалі вершы, напісаныя пераважна ў 1927 г. „Радасць звоніць у грудзях“, — усклікае паэт (верш „Вясной“). Ён хоча „песняй радасці і волі Праславіць свету Беларусь“ („Цяпер ў грудзях другія словы...“). „Наша радасць не згіне ў цьме, Наша песня надзей і юнацтва“, — запэўнівае ён сябе і

іншых у праграмным вершы „Паэтам“. Гэтым самым Маракоў лучыўся з агульным настроем усёй маладнякоўскай паэзіі, у многім па-ясенінску бравааднай („дзён разгул“, „пад горлам зіхацяць нажы“), па-маладому бяздумна-радаснай („ўсе трывогі — глупства“). „Мы дзеці рэвалюцыі, Кастрычніка сыны, Ў дзень радасці кіпучае на свет з’явілісь мы“,— бадзёра ўсклікаў калега па літаратурным цэху і блізкі сябра Маракова Алесь Дудар (мы сёння добра ведаем, якой чорнай радасцю былі прасякнуты падзеі Кастрычніка і пачатай ім грамадзянскай вайны). „Стары бор з карэннем выламан, Сумны шум яго навекі змоўк“,— задаваў тон у паэтычным асэнсаванні новай рэчаіснасці заснавальнік „Маладняка“ і яго духоўны бацька Міхась Чарот.

Праўда, нават у „Пялёстках“, а яшчэ больш у „На залатым пакосе“ за знешняй бравадай пачынаюць заўважацца сталая, не па гадах, развага, матывы суму, тугі. „Як надзеі, тухнуць залатыя зоры На прасторах песенных завей“; „І зноў холад, і вецер, і цьма...“; „Знаю я, што ў палях непагодна“ — гэта з „Пялёсткаў“. „Сціх у сэрцы юнацтва разгул“,— заяўляе, хоць, зразумела, і залішне перабольшана, малады паэт у „На залатым пакосе“. Цікава, чаму? А таму,

...што нічога не хочу
І нікога спаткаць не магу.
...што ў другіх

У змаганні за хлебам
Адцвітае жыццё і вясна.
...Бо ў жыцці,
Калі ў што-небудзь верыш,
Ты йшчэ можаш
Цвісці і гарэць.

Вельмі сімптаматычнае прызнанне! Нават варта здзіўлення, як паэт-юнак хутка сталеў. І гэта пры ўсім тым, што па-ранейшаму ў ягонай паэзіі нямала бравады, „сіні“, „цвеці“, „разгулу“, „згарання“ і г. д., імажынісцка-зацемненых вобразаў-сімвалаў, залішняй разнасцежанасці душы і слова, што ішлі і ад юнацкай легкадумнасці, і ад усесаюзнай „паэтычнай хваробы“, вірус якой распаўсюджваўся найперш ад „Масквы кабацкай“ Ясеніна. Як і пераважная большасць маладых паэтаў, Маракоў вучыўся ахвотна, старанна. Аднак, як і іншым маладнякоўцам, яму не заўсёды ставала вопыту, а то і часу вылучыць у творчасці сваіх настаўнікаў галоўнае, істотнае, аддзяліць яго ад часовага, другараднага, непатрэбнага. Але ці можна ўсё гэта назваць „культываваннем ясеніншчыны“, „упадніцтвам“, „замыканнем у сваю асобу“, ды яшчэ прычыну гэтага бачыць у „мяшчанскім сацыяльным асяроддзі“, „дробнабуржуазнай бесхарактарнасці“, а то і ў наўмыснай падтрымцы „шкодных анарха-дэкадэнцкіх настрояў“, чужой і варожай нам філасофіі „тугі і завядання“? Думаецца, што не. А менавіта так вытлумачвалі ў другой палове 20-х гадоў звычайную вучнёўскую некрытычную залежнасць Маракова ад Ясеніна, а таксама асобныя матывы тугі і смутку, што ішлі, хутчэй за ўсё, не ад „светапогляду і светаадчування“, а ад звычайнага юнацкага максімалізму, неразздзеленага першага кахання, разлукі з роднымі, сябрамі. Не трэба забываць, што Маракову ў той час не было і дваццаці гадоў, ён, як пісаў у рэцэнзіі на кнігу „На залатым пакосе“ А.Лясны (А.Мардвілка), „яшчэ не дасягнуў грамадзянскага паўналецця“.

Дый „матывы расчаравання і бязвер’я“, якія быццам бы пераходзілі з верша ў верш,— гэта яўнае перабольшанне. У супрацьвагу некаторым беларускім

крытыкам украінскі паэт і крытык Тарэнь Масэнка ў 1928 г. слушна пісаў: „У настроях вершаў Маракова пераважае мажор. Мажор, у якім адчуваецца радасць жыцця, радасць творчай працы“ („Молодняк“, 1928, № 2). Што да ўплываў, то гэта былі найперш уплывы ў галіне мастацкай формы (вобразнасць, вершаскладанне, рыфма). І часам — вельмі станоўчыя ўплывы. У першай палове творчага шляху ў Маракова, бадай, не заўважаецца голай рыторыкі, прасталінейнага ілюстравання нейкіх фактаў і з’яў грамадскага ці асабістага жыцця. Вялікая эмацыянальнасць, душэўная адкрытасць, вобразная шчодрасць і неардынарнасць, шчырая спавядальнасць — гэтыя рысы пераважалі ў той час у яго паэзіі. Вось, у прыватнасці, некаторыя арыгінальныя вобразы паэта, звязаныя з паэтызацыяй месяца: „Узняўся месяц кветкай белай І срэбра кінуў у цёмны бор“; „срэбны месяц прылёг на кусты“; „Срэбны месяц над сіняй ракой Упадзе на ваду залатым васільком“; „быў ціхі-ціхі вечар, Месяц жыў і плакала зара“; „Упаў срабрысты месяц на калені, Стаў цалаваць магільныя крыжы“; „пад белаю калінаю Нам будзе месяц сыпаць каласы“; „Месяц, як мёртвы, упаў над сялом“... Паэт уносіў пэўны ўклад і ва ўзбагачэнне беларускага верша, у прыватнасці — рыфмы і рыфмоўкі. Гэта датычыцца перш за ўсё рыфмы прыблізнай, недакладнай, каранёвай: сад — казаў, душы — жыць, зары — згарым, паласой — лясоў, асфальт — фальш, сказаў — лаза, сінь — асін, грудзей — дзень... У Ясеніна і рускіх імажыністаў малады Маракоў, такім чынам, пераймаў не толькі слабое, але і моцнае, тое, дзякуючы чаму рускі паэт стаў класікам паэзіі.

Неяк літаратуразнавец М.Піятуховіч сказаў пра Маракова: ён чуйны, як мембрана. Паэт магутнага лірычнага даравання, аўтар „Пялёсткаў“ адгукаўся

нават на самыя кволыя хістанні грамадскай атмасферы. Праўда, адгукаўся па-асабліваму, як, зрэшты, і адгукаецца сапраўдны лірык рамантычнага складу: не непасрэдна рэагаваў на тыя ці іншыя падзеі, а апасродкавана, праз сістэму настраёвых вобразных асацыяцый. Мембрана не адрознівае крыніцы гукавых хваляў, для яе важная толькі сіла гуку і вышыня тону...

Каханне, Радзіма, прырода — асноўныя тэмы лірыкі Маракова 20-х гадоў, дзе ён паказаў сябе найарыгінальней і наймацней. Пачынаючы з самых першых публікацый, выяўляліся ў творчасці паэта (і з кожным годам усё выразней) і грамадзянскія матывы. Не будзем забывацца, што першымі вершамі Маракова былі сацыяльна арыентаваныя „Піянерыя“, „Піянерская восень“, „Муляр“, „Гораду“ (усе — 1925), „Кастрычнік“ (1926), якія пазней дапоўніліся такімі творамі, як „Камсамолу Мазыршчыны“, „Янку Купалу“, „Цішку Гартнаму“ і інш. Відаць, у паэта такога складу, як Маракоў, грамадзянскія настроі маглі арганічна „ўрастаць“ у пейзажную і нават інтымную лірыку. Аднак наступаў час, калі з усіх лірычных жанраў пачаў прызнавацца толькі адзін — грамадзянская лірыка, ды і то разумелася яна толькі як „зброя класавага змагання“, дакладней — як паэтычная ілюстрацыя дасягненняў у галіне індустрыялізацыі і калектывізацыі, праслаўлення „мудрэйшага з мудрэйшых, правадыра ўсіх часоў і народаў“ — Сталіна. Злы дэман, што прысмактаўся да жывога цела беларускай літаратуры, галоўны ідэолаг БелАППа Лукаш Бэндэ павучаў: „Трэба нашым пісьменнікам, асабліва пачынаючым, рашуча адмовіцца ад думкі, што верш пра „месяц“, пра „вясну“ і інш. вузка асабістыя перажыванні, набыўшыя вершаваны выгляд, маюць якую-небудзь вартасць“ („Чырвоная змена“, 1929, 7 ліпеня). Хто гэтага

не разумеў — абвінавачваўся ў „надкласавасці“, імкненні „адарваць мастацтва ад палітыкі“, гэта значыць, у „зрывах творчага і ідэалагічнага парадку“, „палітычнай блытаніне“. Што ішло за гэтым — здагадацца няцяжка.

Некаторыя крытыкі пачалі настойліва „ператломваць“ Маракова, прыроду яго паэтычнага таленту. Прычым гэтае пераломванне пачалося з рэцэнзій на два першыя зборнікі паэта. Так, не паспелі яшчэ астыць ад друкарскага станка „Пялёсткі“, як крытык Антон Адамовіч запытаў у аўтара-юнака: „А дзе ж грамадскасць?“ Рэцэнзія з такой назвай аднагодка і аднакашніка Маракова па Белпедтэхнікуме (дарэчы, гэта было першае выступленне ў друку будучага крытыка вульгарна-сацыялагічнага кшталту) з'явілася ў часопісе „Чырвоны сейбіт“. У чым толькі не абвінавачваўся малады паэт! „...Поўная блізка адсутнасць грамадскіх матываў“, „адарваны ад грамадства“, „не любіць горада і імкнецца да вёскі“, „непрыхільнасць да горада“, „імкнецца ўцячы да прыроды“, „замкнуўся ў сваю асобу і прыроду“, „звальвае прычыны свайго ўпадніцтва на перагасу мінулага“... Праўда, трэба аддаць належнае часопісу: у тым жа яго № 4 за 1926 год была змешчана і рэцэнзія на „Пялёсткі“ другога крытыка — Сцяпана Баркоўскага, цалкам станоўчая. У гэтым выступленні крытыка (таксама першым у яго творчай біяграфіі) з красамоўнай назвай „Пойдзем піць прыгожасць сонца і вясны“ (радок з верша Маракова) былі толькі дзве (і трэба сказаць — цалкам слушныя) заўвагі: „...у некаторых яго вершах заўважаецца вычурнасць“, „Маракоў таксама хварэе „ўсесаюзнай хваробай“, падражаннем Ясеніну“. Аднак такія аб'ектыўныя, павучальныя для аўтара і чытачоў разгляды творчасці Маракова, накшталт рэцэнзіі Баркоўскага, пачалі ўсё часцей змяняцца

патрабавальна-пагрозлівымі вокрыкамі „а дзе ж грамадзянскасць?“. Паўлюк Шукайла ў №№ 1, 2 часопіса „Росквіт“ за 1928 г. абвінавачвае Маракова „ў захопленасці плынню, якая знаходзіць прыгожае ў старызне“, „у адмаўленні сённяшняга“, у „слепаце да нашай сучаснасці“, у арыентацыі не на „жыццё, як крыніцу, адкуль бярэцца сырызна для вырабу літаратурнага матэрыялу“, а на Надсана, Ясеніна, зборнікі старых рамансаў, „пушчынскія настроі“ (г. зн., паэзію Язэпа Пушчы), нават у „сваяцтве з Паўлюком Трусам“(?!)... І, трэба сказаць, з часам патрабаванні „грамадзянскасці“, заклікі наблізіцца да „сённяшняга“ далі свае вынікі. Але спачатку не тыя, на якія разлічвалі крытыкі а-ля Адамовіч і Шукайла.

Паэзія Маракова з аднолькавай мембраннай чуйнасцю рэагавала як на станоўчыя працэсы ў тагачасным беларускім грамадстве (палітычная і сацыяльная актывізацыя ніжэйшых слаёў грамадства дзякуючы распачатай Леніным новай эканамічнай палітыцы (НЭПу), несумненныя дасягненні „культурнай рэвалюцыі“, пэўныя поспехі ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці, адраджэнні беларускай культуры і г.д.), так і на адмоўныя. А гэтага адмоўнага было не менш, чым станоўчага, ды з кожным годам, у выніку „ўзмацнення класавай барацьбы па меры набліжэння да сацыялізму“ (Сталін), станавілася яго ўсё больш і больш. У гэтым сэнсе 1926 год, год выхаду ў свет „Пялёсткаў“, быў пераломны, кульмінацыйны. У тым годзе дыктатар азіяцкага тыпу Сталін расправіўся са сваім галоўным праціўнікам і палітычным канкурэнтам — Троцкім (прымусіў яго выехаць за мяжу), пачаў ліквідоўваць НЭП, змяняць распрацаваную яшчэ Леніным і прадвызначаную рашэннямі Х і ХІІ з’ездаў КПСС нацыянальную палітыку, рэзка абмяжоўваць дзяржаўную

самастойнасць рэспублік. У Беларусі гэта вылілася ў паступовае згортванне беларусізацыі, падспудную, а пасля і адкрытую русіфікацыю, у барацьбу з так званымі нацдэмамі (нацыянальнымі дэмакратамі)... Менавіта ў 1926 годзе адбыўся першы арышт беларускага пісьменніка Францішка Аляхновіча, прайшоў суд над настаўнікамі і слухачамі Слуцкіх курсаў беларусазнаўства (т.зв. „лістападаўшчына“), распачаліся нападкі на арганізатараў і ўдзельнікаў канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі, быў забаронены спектакль па п’есе Янкі Купалы „Тутэйшыя“ і звольнены з пасады ўсе супрацоўнікі БДТ-1 (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы), хто меў дачыненне да ўвасаблення гэтай п’есы на сцэне. На 1926 год прыпадае і першае адкрытае выступленне рускіх чарнасоценцаў супраць беларускай мовы — публікацыя ў газеце „Савецкая Беларусь“ (ад 16 мая) ананімнага беларусафобскага артыкула „Вражда из-за языка“ з абражальнымі выпадамі ў адрас беларускай мовы і яе носьбітаў, што, у сваю чаргу, выклікала вострую інвектыву Янкі Купалы „Акоў паломаных жандар...“, скіраваную супраць вялікадзяржаўных шавіністаў, якім „не панутру“ быў перавод народнай адукацыі і дзяржаўнага справаводства на беларускую мову. Увогуле, антыбеларуская і антынародная палітыка партыйных функцыянераў сталінскага кшталту выклікала ў 1926 годзе цэлую буру ў сэрцы народнага паэта Беларусі (вершы „І прыйдзе“, „Праз гультайства“, „Царскія дары“, „Каб...“, „Ёсць жа яшчэ...“ і інш.). Пасля гэтай „буры“, як мы ведаем, для яго наступіла паэтычнае зацішша: у 1927 г. Янка Купала не надрукаваў ніводнага верша, у наступныя два гады — усяго толькі па два вершы.

Несумненна, калі не ўсё, то многае з гэтага Маракоў ведаў, бачыў на ўласныя вочы, пра многае

здагадваўся. І „грамадскасць“, набліжэнне да „сённяшняга“, да чаго настойліва заклікалі яго крытыкі, усё часцей увасаблялася ў яго сэрцы ў матывах грамадзянскага суму. Праўда, гэта быў найперш радасны сум, ці сумная радасць — усё ж „маладыя гады, маладыя жаданні“ (М.Багдановіч), а таксама маладняко ўская настроенасць на радасць рабілі сваё. Аднак нават у „Пялёстках“, а яшчэ выразней — у „На залатым пакосе“ скрозь браваду, сапраўдную і запазычаную радасць прабіваюцца матывы смутку, тугі:

І зноў холад і вецер, і сіняя цьма,
І зноў сэрца балючае плача.
О, нашто над палямі разлёгся туман,
Калі хочацца сонца пабачыць.

Зацвіла прад вакном маім белая даль,
Налілася жыццём і каханнем,
Толькі сонца не хоча цяпла ёй даваць
І схавалася недзе ў тумане.

Гэта — з „Пялёсткаў“. У „На залатым пакосе“ неаднаразова з’яўляецца вобраз крыжа („Сястры Ніне“, „Адказ“, „З белых начэй“ і інш.), паэта нават наведвае прадчуванне смерці. З верша „Сястры Ніне“: „Над табой схіліўся нізкі белы крыж, Дзе кладуцца фарбы сонца і зары. Знаю я сягоння — буду хутка там, Толькі радасць песні для жыцця аддам“. Падобнае — у вершы „Ты знаеш, Ніна...“: „Дзе цяпер ліецца светазарны смех, Будуць пець другія пра жыццё і смерць“. Зусім суладна з тагачаснымі адчуваннямі Уладзіміра Дубоўкі: „Паляжам мы, і вецер косці нашы Паточыць, пылам над палямі разнясе“; „Што было, што будзе — гэта Кайданы жабрацкай долі. Беларускага паэта Толькі жвір і супакоіць“...

Чысты лірык, Маракоў адчувае нешта нядобрае, што творыцца ў грамадстве. Што? Канкрэтызаваць і персаніфікаваць небяспеку ён яшчэ не можа. Але не хоча „так рана ў песнях дагараць“: „Я йшчэ жыў так мала і так мала пеў, Ну дык дайце ж, братцы, мне пажыць цяпер“ („Жаданне“). Ды „братцы“ спакойна жыць не давалі, патрабавалі ўсё той жа „грамадскасці“: класавасці, сацыяльнасці. Нават такі ўдумлівы і вопытны літаратуразнавец, як Максім Гарэцкі, у нарысе „Маладняк“ за пяць гадоў: 1923—1928“, спачатку высока ацаніўшы Маракова („вызначаецца лірычнасцю, эмацыянальнай напружанасцю і гучальнасцю сваіх вершаў. У яго шмат пачуцця, ён любіць яскравыя фарбы і гучанне“), робіць паэту закід: „У яго, на жаль, мала сацыяльнага зместу...“. І паступова Маракоў, насуперак рамантычна-лірычнай прыродзе свайго таленту, пачаў „пераломвацца“.

Тым не менш, „нагляданні за жыццём“, і не толькі беларускім (у складзе пісьменніцкіх дэлегацый у 1927 г. ён пабываў у Ленінградзе, у 1928 г. — на Украіне), абумовілі напісанне, за рэдкім выключэннем, не нейкіх прымітыўных савецкіх агітак, што цэлымі касякамі ішлі ў той час у друку, а глыбока патрыятычных вершаў — „Чуеш, Беларусь?“ (прысвечаны К.Каліноўскаму), „Беларусі“, вершаў-прысвячэнняў і вершаў-пасланняў („Паэтам“, „Васілю Кавалю“, „Цішку Гартнаму“, „М.Дубовіку“, „Паўлюку Трусу“, „Янку Купалу“ і інш.), прачулых лірычных споведзяў. Нават паэмы Маракова не вытрымлівалі прывычных жанравых канонаў: яны не ліра-эпічныя, а наскрозь лірычныя, галоўная дзейная асоба іх — лірычнае „Я“, лірычны герой паэта. Гэта можна сказаць і пра „Адноўленую зямлю“ (1928), і пра „Маю паэму“, „Муляр“ (абедзве — 1929). Аўтар імкнецца кожнай з іх надаць і сюжэтнасць, і сацыяльнасць, але гэта яму яўна не

ўдаецца. Лепшыя старонкі паэм — гэта надзвычай шчырыя споведзі-прызнанні лірычнага героя паэта, радкі, прысвечаныя роднаму краю — Беларусі. Як, у прыватнасці, у паэме „Адноўленая зямля“ з яе патэтычным заклікам: „Руйнуй мінулых дзён галгофу, Дзе сэрца краю Мураўёў На жах, на крыўду ўсёй Еўропы Мячом Расіі пракалоў“...

З вершаў, з паэм „Адноўленая зямля“ і „Таварыш Нюрын“, напісаных у час „пераломвання“, пераважна ў 1928—1930 гг., склалася трэцяя кніга паэта — „Вяршыні жаданняў“. Здаецца, і аўтар, і выдавецкі рэдактар на гэты раз улічылі ўсё: выбралі з ранейшых публікацый найбольш сацыяльна-выразнае, пралетарска-класавае, замянілі або падправілі — зыходзячы з тых жа „класавых“ пазіцый — асобныя радкі першапублікацый, „саветызавалі“ назвы некаторых твораў (паэма „Муляр“ ператварылася ў „Таварыш Нюрын“, твор без назвы стаў вершам „Камсамолу Мазыршчыны“) і г. д. Аднак, зразумела, нельга было адразу і цалкам змяніць прыроду таленту паэта, арганічнасць яго светаадчування: рамантычную неакрэсленасць і шматзначнасць вобраза, настроенасць на суб’ектыўна-лірычную спавядальнасць (гэта грэбліва называлася „капаннем ва ўласнай душы“), пэўны душэўны разлад паміж марай і явай, вёскай і горадам, прыродай і гарадскім брукам і г. д. Усім гэтым, дарэчы, Маракоў быў вельмі блізкі да маладзейшага за яго на тры гады Максіма Танка, які гэтак жа нечакана-напорыста, быццам віхор, уварваўся ў заходнебеларускую паэзію. Але калі ў Заходняй Беларусі, што ўваходзіла тады ў склад Польшчы, рамантычнае і лірычнае (ажно да інтымна-лірычнага) успрымалася натуральна і спакойна, то тут, ва Усходняй Беларусі, новая савецкая эстэтыка, якая крыху пазней акрэслілася паняццем „сацыялістычны рэалізм“, патрабавала ад творцаў

рэалістычнай дакладнасці, сацыяльна-класавай выразнасці і сацыялістычнай ідэйнасці. Зразумела, якраз гэтага ў Маракова — пры ўсім жаданні і яго самога і крытыкаў — яшчэ было малавата. І гэта адразу было заўважана — ці са шкадаваннем, ці з абурэннем.

Матывамі „шкадавання", у прыватнасці, прасякнута вялікая публікацыя Максіма Лужаніна ва „Узвышшы" (1930, № 8) пад красамоўнай назвай: „Думкі пра паэзію Валерыя Маракова, пра „Вяршыні жаданняў" і „Счастливый домик" ды наогул пра музыку, які не чуе сваe музыкі". М.Лужанін шкадуе, што Маракову, якому Пушкін „зусім чужы", які „хутчэй захапляецца бунтоўным Лермантавым", усё ж найбліжэй Надсан: „Тая ж пашана да маці, нават культ яе, пашырэнне гэтага культу праз перанясенне адзнак маці, па інерцыйнай традыцыі нашаніўства, на бацькаўшчыну, на Беларусь. Ад Надсана паэт бярэ надрыўнасць ягонай вясны..." Яшчэ большае шкадаванне ў крытыка выклікае падабенства Маракова да Хадасевіча — „яны падобны ад назваў кніжак („Вяршыні жаданняў" — у Маракова і „Счастливый домик" — у Хадасевіча. — **В.Р.**) да паасобных тэм і радкоў" (апяванне „лянога балота мяшчанскага супакою", „адарванасць ад класа, грамадства" і г. д.). На думку Лужаніна, „паэт яшчэ на раздарожжы", для яго яшчэ характэрная „хісткасць светапогляду". Праўда, у „Вяршынях жаданняў", у адрозненне ад ранейшых зборнікаў Маракова, можна „заўважыць сугучнасць класавым пачуццям пралетарыяту", яны „сведчаць пра шчырасць Маракова"; хоць „ранейшыя зборнікі Маракова больш апрацаваны", дый гэтая кніжка пакідае за ім „права называцца адным з моцных паэтаў нашае маладой літаратуры". Ужо не шкадаваннем, а радасцю асветлена рэцэнзія на тыя ж „Вяршыні жаданняў" Эд. Галубка („Полы-

мя“, 1931, № 1). У двух папярэдніх зборніках паэта часта заўважаліся „самакапанне ў душы“, „ноткі песімізму“, уплывы „Ясеніна і іншых упадачных паэтаў“. Цяпер жа, у выніку „дзейнасці БелАППу па перабудове літаратуры на новыя рэйкі“, „пад уплывам нашага сацыялістычнага будаўніцтва“, Маракоў „сам адмяжоўваецца ад таго „балота“, якое ён „славіць пачынаў“, і „накіроўваецца ў бок пралетарыяту“. Крытык перакананы, што „Вяршыні жаданняў“ з'яўляюцца „моцным доказам таго, што пісьменнік больш не вернецца да апявання нуды і не будзе даваць больш месца разважанням аб тым, што Маракоў пагрузіўся ў тэмы абывацельшчыны і мяшчанства, у перадачу іх настрояў і ідэй“. „Малады паэт стаіць на правільным шляху“,— радасна падагульняе свае разважанні крытык (дарэчы, сын вядомага драматурга і тэатральнага дзеяча Уладзіслава Галубка).

Калі названыя водгукі на кнігу Маракова былі прасякнуты настроямі радасці ці, прынамсі, шкадавання, то рэцэнзія У.Сядуры, надрукаваная ў „Маладняку“ (1931, № 1), вызначалася махровымі вульгарна-сацыялагічнымі наскокамі на маладога пісьменніка — „папутніка пралетарыяту“, абвінавачваннем яго ў невыразнасці класавых і ідэйных пазіцый, у „псіхічным разладзе паэта з рэчаіснасцю“, „налёце песімізму, апаэтызаванні суму“, у „поўным панаванні над усім псіха-ідэалагічным складам стыхійнага, выбухі якога выліваюцца ў гэткія, зусім неакрэсленыя, неканкрэтныя агульныя словы-вобразы, як „вясна“, „песні“, сонца“, „шчасце“, „уздым“...“. Адзінае, што прымае Сядура ў Маракова,— гэта „малюнкі прыроды“, накшталт гэтага:

Ліпнёвы вечар дагараў
Ў абдымках ласкавых і кволых.

І тонкагубы вецер граў
Над даллю ніў,
Палёў і сёлаў
Такою дзіўнаю гаворкай,
Такою ласкавай красой,
Як гэта даль,
Як гэта зорка,
Над гэтай буйнай паласой:
Хтось кінуў ружы на закаце
Жывой і сонечнай рукой.
І, нібы казачная маці,
Ноч навявала ім спакой...

Аднак і гэта, аказваецца, кепска: прырода з'яўляецца толькі своеасаблівым „сродкам „исцеления“ паэта ад туману і дыму жыццёвага шляху“, паэт уцякае да прыроды, таму што „ў сучасным савецкім горадзе адчувае сябе непрыстасаваным, як бы не на сваім месцы“.

Падобныя развагі ў той час былі ўжо не бяскрыўдныя, яны браліся пад увагу ідэалагічнымі службамі КПСС, НКУС. Не забудзем, што якраз на 1930 г. прыпадаюць першыя найбольш буйныя калектыўныя расправы над творчай і навуковай нацыянальнай інтэлігенцыяй — арышт каля 100 буйнейшых беларускіх пісьменнікаў, вучоных, палітыкаў (А.Бабарэка, М.Гарэцкі, У.Дубоўка, Я.Пушча, В.Ластоўскі, Я.Лёсік, С.Некрашэвіч, У.Пічэта, А.Баліцкі, Д.Прышчэпаў і інш.), абвінавачаных у прыналежнасці да прыдуманай у нетрах НКУС арганізацыі „Саюз вызвалення Беларусі“ (годам раней за прыналежнасць да міфічнага „Саюза вызвалення Украіны“ асудзілі дзесяткі ўкраінскіх нацыянальных дэмакратаў). Менавіта ў канцы 1930 г., не вынесшы тагачаснай палітычнай атмасферы, зрабіў спробу самагубства Янка Купала... Таму вельмі пагрозліва-папераджальна прагучалі словы та-

гачаснага загадчыка ідэалагічнага аддзела ЦК КП(б)Б А. Канакоціна, які ў адным са сваіх выступленняў, а пасля і ў друку, выказаў не толькі сваю думку: „Ёсць у нас і таварышы, якія блукаюць у нетрах упадніцкай лірыкі, Маракоў, Кляшторны, якія ніякім чынам не могуць узняцца на вышыню тых задач, якія стаяць перад пралетарскай літаратурай“. Прычым, гэта было сказана ў кантэксце пагромнага „антынацдэмаўскага“ выступлення, дзе нават пра Янку Купалу і Якуба Коласа гаварылася як пра пісьменнікаў, карэнні творчасці якіх „моцна ўраслі ў нашаніўскі перыяд і не меней моцна ўраслі ў перыяд абслугоўвання акупантаў кайзераўскіх і акупантаў польскіх“...

Валерый Маракоў не мог не ўлічваць грамадскую атмасферу, палітычную сітуацыю, якую ён мембранна вычуваў і выдатна выказаў яшчэ ў 1929 годзе:

Жыццё, як мора-акіян...
А шчасце — бераг дальні...
Ідзе ў пустэльні караван
Пад гукі ветраў пахавальных:

Шчаслівы я, што тут жыву.
Й за гэты край вясной вялікай,
Быць можа, знімуць галаву,
Праколюць цела вострай пікай...

Ад „аглабельнай“ крытыкі паэт нейкі час спрабуе схавацца ўдзелам у ТАВІЗе (абрэвіятура „Таварыства аматараў выпіць і закусіць“ — тагачаснай літаратурнай багемы Мінска). У 1931 г. паступае на літаратурна-творчае аддзяленне Мінскага педінстытута (скончыў у 1934 г.; цяпер — Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка). У друку з’яўляюцца паведамленні, што Маракоў здаў у друк зборнік выбраных вершаў, празаічную

аповесць, кнігу перакладаў кітайскага пралетарскага паэта Эмі Сяо, піша драму „Ксеня Лабанок“, „якая адбівае барацьбу за кадры“, лібрэта оперы (нічога з гэтага не ўбачыла свету). Што да арыгінальнай паэтычнай творчасці, то пісьменнік, насуперак сваёй творчай натуры, крок за крокам адступаў ад лірыкі спавядальнай у бок вузка сацыяльнай і вершаванага эпасу. Ён пачаў пісаць творы класава арыентаваныя („Ленін“, „Камісар“, „Дарогаю ў штаб“), расцягнутыя вершаваныя аповеды пра Асінбуд („Да тысячы новых тваіх Асінбудаў“) і запалкавую фабрыку („Першы дзень на запалкавай фабрыцы“), новыя заводы („Адтуль, дзе палыхаюць домны“) і калгасы (незакончаная паэма „Зямля бунтуе“), пра ілжэўдарніка Абрамава („Ілжэўдарнік Абрамаў з фабрыкі „Дзвіна“), вынаходніка Капусціна („Вынаходніцтва майго сябра Капусціна“), спартыўныя спаборніцтвы („Адна партыя ў валейбол“)... У вершатворчасць Маракова прыйшлі, як і патрабавалі некаторыя крытыкі, пралетарская класавасць, канкрэтыка, рэалізм. У той жа час пачала знікаць... сама паэзія. Голая рыторыка, барабанная траскатня ўсё больш і больш чуюцца ў радках, зробленых на гэты раз „пад Маякоўскага“, нават лесвічкай напісаных. Крытыкі тыпу С.Левіна (ён пасля на судовым следстве будзе сведчыць супраць Маракова) хваляць, паказваюць шлях паэта як суцэльнае ўзыходжанне на вяршыню. Наўрад ці верыў такім пахвальбам сам Маракоў. Аднак склаў з такіх твораў і ў 1933 г. выдаў яшчэ адну, як аказалася апошнюю, кніжку — „Права на зброю“.

І ўсё ж нішто не магло застрахаваць ад новых нападак вульгарных сацыёлагаў, што практыкаваліся па лініі палітычнага даносу. Не паспела кніга выйсці з друку, як у „Літаратуры і мастацтве“ (1934 г., 12 студзеня) з’явілася вялікая — на трэць першай газетнай паласы — рэцэнзія тагачаснага кіраўніка пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі

(старшыні аргкамітэта Саюза пісьменнікаў БССР) Міхася Клімковіча „Пра кніжку В. Маракова „Права на зброю“. Па сваёй сутнасці гэтая рэцэнзія — рэдкі ўзор слоўнай эквілібрыстыкі, падтасоўкі фактаў, дэмагогіі, па стылі — судовае абвінавачванне. Вось некалькі зусім бяздоказных пунктаў гэтага „абвінаваўчага акта“:

„Асноўныя памылкі палітычнага парадку ў гэтых вершах зводзяцца да наступнага:

1. Прапаганда буржуазнай тэорыі надкласавага грамадства.

2. Сцвярджэнне „права“ паэта — стаяць у баку ад практыкі сацыялістычнага будаўніцтва (што з'яўляецца выцякаючым з першай „тэорыі“).

3. Няправільнае, скажонае адлюстраванне нашай рэчаіснасці, а адсюль і няправільныя вынікі, няправільныя рэцэпты выпраўлення недахопаў і прарываў, якія абураюць паэта“.

У той час ужо аднаго пункта такога абвінавачвання было дастаткова, каб чалавека не стала. М.Клімковіч значна аблегчыў работу следчым НКУС...

У 1934 годзе Маракоў канчае педінстытут, едзе настаўнічаць у Бабруйск. Знаходзячыся „пад каўпаком“, усё ж многае друкуе з уласных вершаў і перакладаў (з А.Гідаша, М.Дудзіна, М.Ціханава, П.Тычыны, С.Стальскага). Вершы, у асноўным, адпавядалі духу часу: „Майскім маршам“, „Героі краіны Саветаў“, „Памяці тав. Кірава“, „За край камуны“. У рытме гімна СССР нават піша оду партыі, Сталіну і „моцнаму бальшавіку тав. Гікала“ (з эпіграфа твора) — верш „Слова Беларускай Савецкай Рэспублікі“. Аднак нічога ўжо не дапамагло: пачынаўся планавы адстрэл нацыянальнай творчай інтэлігенцыі. У сакавіку 1935 г. яго першы раз арыштоўваюць, трымаюць у турме два з паловай месяцы і... выпускаюць. Але амаль цалкам адбіваюць

ахвоту да пісання вершаў і друкавання. 3 лістапада 1936 г. арыштоўваюць другі і апошні раз. І ўжо не выпускаюць...

Фінал нам вядомы.

**Вячаслаў Рагойша**

# *В*ершы, паэмы

# 1925

*Толькі раніцай сонца як гляне,*
*І расою заплача трава —*
*Устае ў русакудрым тумане*
*Залацістых нябёс сінява.*

* * *

Песні, песні юнацкага слова,—
Вам шырокі, як радасць, прастор.
Па-над вёскай і горадам новым
Вашы струны ткуць сонца узор.

Я падслухаў вас ў ціхіх калоссях,
Пад бярозамі радасных ніў,
Калі сэрца агнём абвілося
У жыццёвыя хвалі крыніц...

Вашых думак — аб сонцы і ранні —
Кінуў я тады вольны прыбой,
Дзе ўзнімаліся горда курганы,
На курганах шаптаў сіні бор!..

І цяпер, калі горад шумлівы
Ўскалыхнуў у грудзях гул машын,
Усё роўна пяю я пра нівы,
Пра вясковыя рысы душы...

Песні, песні юнацкага слова —
Вам шырокі, як радасць, прастор...
Па-над вёскай і горадам новым
Вашы струны ткуць сонца узор.

* * *

Белае зімняе поле,
Ніў белагрывы прастор
Дыша магутнаю воляй,
Воляй залочаных зор.

Эх, разыдзіся над вёскай,
Сонечнай песні вясна!
Радасна-родных палосак
Ў сэрцы не змоўкне струна.

Сэрца — не лёд і не камень,
Сэрца — у полымі кліч,
Кліч маладога жадання
Вольных прастораў зямлі.

Кінуў той кліч я сягоння,
Сам малады, як вясна.
Радасна-сонечных гоняў
Ў сэрцы не змоўкне струна!

* * *

Толькі раніцай сонца як гляне,
І расою заплача трава —
Устае ў русакудрым тумане
Залацістых нябёс сінява.

Поўны радасці сінія далі
Каласістых, курчавых палёў...
Эх, за ўзгоркам узвіранай хваляй
Славіць рэчка свой радасны лёс!

Выйду я і пайду за узгорак,
Пакланюся зялёнай вярбе...
Колькі сілы, узмаху й прастору!
Сэрца ў грудзі мяцежнае б’е.

Сэрца звоніць у песні, у марах
Аб прыгожасці родных сяліб.
Вецер лісце усмехамі шпарыць,
Абнімаючы грудзі зямлі.

Нешта шэпча рабіна над рэчкай
Залатымі узмахамі слоў...
А з-за лесу кудлатая грэчка
Прывітанне паслала ў сяло.

Толькі раніцай сонца як гляне
І расою заплача трава —
Устае ў русакудрым тумане
Залацістых нябёс сінява.

* * *

Я іду зялёнай палоскай.
Сінявокі смяецца блакіт...
Ціха спіць дарагая вёска
Пад напевам вясёлкі-ракі.

Ціха спіць. У курчавых хмарах
Уздымаецца месяц-юнак.
Звонкі спеў у вірлівых марах
Ўзгадавала сягоння вясна.

Сіні цень срэбралістай ночы
Успамінамі ў сэрцы акрэп.
І жаданні руччом клакочуць,
На прыволле ахвота, у стэп.

Хвойкі цень залаціста-шэры
Кладзе далям курчавы паклон.
І бяжыць маіх думак шэраг
На прыволле — шырокі разгон!..

Я іду зялёнай палоскай.
Сінявокі смяецца блакіт...
Ціха спіць дарагая вёска
Пад напевы вясёлкі-ракі.

## У ЛЕСЕ

Я сягоння у вечары белым
Увайшоў ў родны лес-маладняк.
Я спяваў там сонечна-смела,
Бо у сэрцы запела вясна.

Буду я упівацца шчасліва
Гэтым гоманам ветру і хвой,
Бо ў далі залацістая ніва
Заліваецца радасцю слоў.

Бо над хатамі месяц нясмелы
Пазірае, як хлопец-юнак.
І над вёскай увысь узляцела
Зорка-цвет залатога агня.

Ой, ахвота далёка-далёка,
Ў сінявокі, як радасць, прастор,
Каб аплёскалі сонечным сокам
Срэбралітыя хвалі вазёр.

Радасць буйную шчыра і смела
Запаліла у сэрцы вясна...
Я сягоння у вечары белым
Увайшоў ў родны лес-маладняк!

* * *

Зялёны месяц над ракой
Ўстае ў крыштальных пералівах,
І ночка сінім васільком
Схіліла твар свой сіратлівы.

Ой, ночка!.. ночка!.. над вакном
Рабіна блішча пазалотай
І устаюць жаданні зноў
Пайсці за рэчку, на балота.

Пайсці і песняй маладой
Зноў ажывіць жыццё дубровы,
Што голле нізка над вадой
Схіліла ў полымі сталёвым.

І дзе вясны жыццё цвіло,
Дзе вецер песні кідаў срэбрам,
Яна разгонам шчырых слоў
Ізноў мо скажа „ты патрэбны...“

Ой, месяц... месяц над ракой
Ўстае, смяецца, б’е паклоны,
І ночка сінім васільком
Схіліла твар свой на загонах.

* * *

Гадавала нас вёска і горад
Ласкай шчырай пад сонцам вясны...
Нашы песні ў чыгунным прасторы
Льюцца звонам кіпучай струны!

Мы выходзім, чырвоная рацць,
У жыццё на мяцежныя хвалі,
І з табой, камсамол, будаваць
Будзем нашы чырвоныя далі!

Паглядзіце, ўжо колькі тут нас,
Мы да шчасця бурлівы палёт!
Мы калёсаў прасмалены пас
На прасторах зялёных палёў.

Мы выходзім, чырвоная раць,
У жыццё — на кіпучыя хвалі,
Гэй жа, з песняй юнацкай шагаць
Там, дзе горад і сінія далі!

Гадавала нас вёска і горад
Ласкай шчырай пад сонцам вясны.
Эх, затое над вольным прасторам
Льюцца песні кіпучай струны!

## З ВЁСКІ

Эх, прастор сінякудрых палёў,—
Срэбралітая рэчка ў даліне,
А над рэчкай фальварак разлёг
І купаецца сонца у сіні.

А над рэчкай бярозавы смех
Віхрамётнай праносіцца хваляй:
То ускочыць на золата стрэх,
То ў калоссях шнуроў закрышталіць.

Я схіліўся над белым пяньком,
Песні слухаў і думаў пра горад.
Там, дзе вуліц шырокі пракос
Прада мною ляжаў, шумны, горды;

Там, дзе гулкі машынны удар
Мяне клікаў на новыя хвалі —
Я на хвалях тых сонца аддаў
За напевы віхрастыя сталі.

Ну, дык што ж! Ў буйным сэрцы ізноў

Устае безупынна жаданне —
Каб пачуць зноў акорды станкоў
І згубіцца ў сталёвым тумане...

А над рэчкай бярозавы смех
Віхрамётнай праносіцца хваляй:
То ускочыць на золата стрэх,
То ў калоссях шнуроў закрышталіць.

## ГОРАДУ

Ад курчавых і радасных нівак,
Ад вясковых сяліб дарагіх
Я прыйшоў сёння ў горад бурлівы,
Хлопец срэбра-сталёвай сахі.

Я прыйшоў малады і тужлівы,
Грохат вуліц мяне ап’яніў;
Гэты грохат, як мора, бурлівы,
Як палац старадаўні ў агні.

Я прыйшоў, патануўшы у хвалях
Гарадскіх разнаколерных дзён...
Мае родныя ніўкі сказалі
Перадаць табе нізкі паклон.

Ну, дык песняй юнацкага слова
Ад вясковых сяліб дарагіх
Я прынёс прывітанне дубровы,
Прывітанне сталёвай сахі.

## МУЛЯР

Эх ты, дзень залаціста-агнёвы,
П'яным сонцам цалуеш зямлю...
Я сягоння над цэглай ружовай
Потам песню сваю абалью.

Мае дошкі акордам высокім
Вецер б'е і калыша ля сцен...
Белай вапны абліўся я сокам,
Як вясновымі кветкамі стэп.

Лазой кудры упалі на плечы,
Думкі хваляю б'юць ў галаве,
Ў сэрца песня запала карцеччу
І на рэчку да хлопцаў заве.

Але не!.. Не пайду я, бо трэба
Яшчэ пільнае шмат што зрабіць.
Шлях мой — коньмі разбітыя грэблі,
Лозунг мой — працаваць і рабіць!

Эх, сягоння я сэрцам мужычым
Ўсё жыццё палюбіў і абняў,
Мне пяе малаток звонна-зычна,
Усміхаецца голлем дубняк.

Цэлы дзень я пяку і мазолю
Свае рукі над ростам сцяны.
Толькі вечарам з працы праз поле
Я пайду — сын жыццёвай вясны.

Эх ты, дзень залаціста-агнёвы!..
Каласіш ты праменнем зямлю...
Сваю працу над цэглай ружовай
З гэтай песняй я шчыра люблю!

* * *

Хоць даўно ўжо я выбраўся з вёскі,
Роднай песні ж яшчэ не забыў;
Песні поля курчавых палосак...
Мне ўспаміну аб іх не пазбыць.

Хоць сягоння я ў Менску мурую
Сцены новых будынкаў жыцця,
Але песнямі часта жартую
І не бачу, што дні ўдаль ляцяць...

Ды не сціхнуць машынамі шастаць...
Груды новага ймчыць кожны год...
То дарма, што мне толькі семнаццаць,
Але з днямі і я — ў карагод.

А і праўда... ў гранітным прасторы
Падружыў я з чумазай братвой.
Нездарма ж ў гулкавулічны горад
Мяне лёс ў дзень ліпнёвы прывёў...

**ТЫЯ ДНІ**

Песняй звонкай
Ў вачах неба снежнага
Усміхнуўся кастрычнік-юнак...
Аб тых днях,
Днях паўстання мяцежнага,
Не забыцца ніколі нам!

Помню,
Помню ў палях цёмна-зраненых
Не адзін праклінаў
Горкі лёс,
Калі ў сініх палях,
Над курганамі
Завывалі гарматы да слёз.

І пайшла
Завіруха нястрымная,—
Рэкі буйнай крыві,
Мора слёз...
Віхрамётных пажараў уздымы,
Але ўсё наш народ гэта знёс.

І цяпер
Над сівымі абшарамі
Паланее крывёю наш сцяг.
Гэта кроў
Узнялася пажарамі,
Гэта сённяшні сімвал жыцця.

Нездарма ж на грудзях
Неба снежнага
Нашых песень агні
Запаліла вясна.
Аб тых днях,
Днях паўстання мяцежнага,
Не забыцца ніколі нам.

## А ЦЯПЕР

Шнуроў зялёных стройны шэраг
Вянком паслаўся за сялом.
Між іх рачулка хваляй шэрай
Ў каменне плешча сваё шкло.

Узняўся месяц кветкай белай
І срэбра кінуў ў цёмны бор...
Ой, шэпчуць нівы песняй спелай
У гэты вечар пра любоў.

Ой, шэпчуць нівы... Ясных зорак
На небе ўецца карагод,
І смехам буйным за узгоркам
Начлежны радуе агонь.

У светлых думках вечар сіні
Абняў прастор зямных грудзей
І радасць ў песні жменяй кінуў
Адтуль, дзе бор стары гудзе.

* * *

Ой, не радасна шуміць дуброва,
Не смяецца шэрае сяло,
Толькі вецер буйна-чарнабровы
Кінуў радасць маладняцкіх слоў.

Кінуў радасць... Ў волаце клакоча
І цалуе дрэў сінеючы агонь,
Не глядзіць, што неба хмурыць вочы,
Пралівае слёзы на пусты загон.

Што яму? — У слёзных перабоях
Вельмі многа чуецца тугі,
Але ён нястрымнай барацьбою
Абнімае ў песні небасхіл.

І злуе пажоўклая дуброва,
Апусціўшы нізка галаву,
Што сукенку дрэў яе агнёвых
Гэты вецер скінуў у траву.

## УВОСЕНЬ

Непрыветнае неба увосень,
Хмары шэрыя нізка бягуць.
Не пяе болей ніва калоссем...
Хто ж разгоніць у сэрцы тугу?

Хто аб радасці скажа сягоння?
Аб ёй скажа нам сонца й вясна...
А цяпер пачарнеўшыя гоні
Не распаляць у сэрцы агня.

Рэчка люстраю б’ецца ў каменні,
Ад зімы белагрывай бяжыць.
Ў срэбралітых бярозка праменнях —
Слёзы капаюць ў глыбу мяжы.

Не пяе болей ніва калоссем...
Хто ж разгоніць у сэрцы тугу?
Непрыветнае неба увосень,
Хмары шэрыя нізка бягуць.

* * *

Б’ецца вецер над далінай,
Бор стары шуміць тугой,
Залатую шапку скінуў
Гай асенні на загон.

Рэчка буйнай хваляй звоніць,
Устае асенні дзень...
Я пайду, пайду сягоння
На prасторы паглядзець.

Там, я знаю, па-над шляхам
Коньмі выбітай зямлі,
Што мяне абніме сцягам
Хмар асенніх прагны ліст.

Але што мне восень... Хмары
І пажоўклы сонны гай —
Б’юць у сэрцы хваляй мары,
І бяжыць... бяжыць туга.

Да шырокіх вольных гоняў
Песня б’е руччом з грудзей.
Дык пайду, пайду сягоння
На прасторы паглядзець!

* * *

Сціскаецца сэрца не таму, што восень
І зямлю высцілае залацісты ліст,
Не згіне ад марозаў жытні россеў,
Што разаслаўся аксамітам па зямлі!

Дыван хай насцілае залацісты ліст,—
Зіма пакрые белым пакрывалам:
Не восень цісне, не з-за восені душа баліць,
Душа, што многае стрывала!

Зіма пакрые белым пакрывалам
Палі, прастор адзене ў снежна-ватны пух.
І толькі для яе марозаў моцы мала,
Каб у грудзях стрымаць імпэту дух.

Палі, прастор адзене ў снежна-вольны пух,
А захад будзе галасіць, як і галосіць,
І будзе на нагах змардаваных звінець ланцуг,
Пакуль народ пакуту зносіць!

А захад будзе галасіць, як і галосіць,
Дубы і тыя будуць шапацець лісцём інакш.
Калі ж, калі вось гэту восень
Заменіць маладая сонцарусая вясна?!

## 1926

*Тут так хораша, свету так многа...*
*Срэбны месяц прылёг на кусты.*
*Я іду сваёй роднай дарогай,*

* * *

Над сінім лесам, шэрым полем
Задорны смех ліе вясна.
Такой парой па-над раздоллем
Душу я выпяю да дна.

Такой парой ў жыццёвым моры
Б'е радасць свежых галасоў.
Я выйду ў поле, на прасторы,
Абліты сонцам і расой.

Хай ў нівах льюцца яшчэ слёзы
Адцвіўшай ў холадзе зімы,
Ўжо кучаравяцца бярозы.
Няма ні холаду, ні цьмы.

І над узгоркам, над далінай
Вясна-красуня зацвіла.
Я прыгарну, нібы дзяўчыну,
Ўсю гэту шыр, ўсю гэту даль.

Я, сын вясны пад яркім светам,
Люблю жыцця простор і шыр,
Затым, што сонца б'е паэту
Паклоны новых слоў душы;

Затым, што ў даль над шэрым полем
Задорны смех ліе вясна...
Такой парой па-над раздоллем
Душу я выпяю да дна!

***

Чаго сёння так сэрца палае,
Нават цяжка мне дыхаць ў палёх.
Дзе ты, кветак журба маладая,
Дзе ты, песня юнацтва без слоў?

Песня там, на шырокім раздоллі,
Дзе пяюць на курганах крыжы.
Я пайду і для кветак у полі
Буду пець, усміхацца і жыць.

Буду знаць я, што часу і сілы
Не губляў ў гэтым сінім жыцці.
Данясу да халоднай магілы
Ўсё, што ў думках і песнях насіў!

А цяпер над радзімым прасторам
Я спяю пра вясновую цвець*,
Каб асенніх вятроў пераборы
Не звінелі ў пажоўклай траве.

І цяпер хай праплача ад болю
Ўсё, што хоча з надзеямі жыць,
Бо ўжо хутка над лесам і полем
Маім песням не будзе мяжы.

Вось таму і ўздымаюцца грудзі,
І так сэрца надрыўна крычыць:
— Эх, браточкі, эх, любыя людзі,
Толькі дайце дыхнуць-адпачыць!..

* Квецень

***

Я цяпер з хлапцамі ў радасці бягу,
Каб уліць у сэрца нашых дзён разгул.
І не чую свісту, вострага, як нож,
Што другіх без жалю ўжо скасіў даўно.
Толькі я спяваю ў залаты прастор,
Каб дарыць прыволлю радасць светлых зор.

Хай ніхто не кажа, як спяваць, аб чым,
Бо жыццё аб гэтым сёння пракрычыць.
Трэба пець, каб сэрца, камень і вада
Захацелі вечна думаць і гадаць:
А што будзе заўтра і якім агнём
Зацвітуць прасторы срэбных ячмянёў?

І ці будзе заўтра плакаць і гарэць,
Хто цяпер каханнем родны край сагрэў.
Хто краіне сёння аддае жыццё,
Каб пабачыць сонца тых нязнаных дзён,
Што прыйдуць з вякамі на сівы прастор
І мо скажуць сэрцу: не трывожся, стой!

Ўсе трывогі — глупства, трэба знішчыць іх,
Каб квітнела шчасце ў нівах дарагіх,
Каб над роднай вёскай, на прастор сівы
Пралілася песня кветак і травы.
Вось чаму сягоння ў радасці бягу
І ўліваю ў сэрца нашых дзён разгул!

***

О, мой любы дружа, дружа дарагі,
Мне з табой не ведаць суму і тугі.

Ты і я — абодва любім шыр палёў,
Калі срэбра месяц высее на дол.

Ты і я сягоння будзем пець і жыць,
Хоць парой пад горлам зіхацяць нажы.

Нам яны нястрашны, нам яны ніштo,
Калі нашы песні абнялі прастор.

Ну, дык, любы дружа, мы цяпер адны,
Пойдзем піць прыгожасць сонца і вясны.

Дай руку тваю мне, дай цябе абняць,
Пойдзем мы сягоння ў пацерках агня.

Дзе звініць і плача залатая шыр,
Так прывольна разам на прасторах жыць.

Дзе святлей пад сонцам, дзе званчэй душа,
Дзе не так трывожна адбівае шаг.

Дзе, мой любы дружа, дружа дарагі,
Мне з табой не ведаць суму і тугі.

* * *

І зноў прыйшоў, і зноў пабачыў родны край,
І сэрца... сэрца так запаланела.
І зноў лясы агнём зялёным тут гараць,
І зноў я свежы стаў і стаў я смелы.

А ўвесь прастор такім напевам маладым
Свае імкненні ў сэрца мне закінуў.
І я хачу, як гэты месяц залаты,
Стаяць і вартаваць сваю краіну.

І жыць там ціха, радасна, як гэта даль,
Шаптацца з ветрам, упівацца сонцам,
І быць румяным, свежым, песні, — ўсё аддаць,
Каб над табой вясна была бясконца.

І зноў прыйшоў, і зноў пабачыў родны край.
Чаго ж так сэрца, сэрца запалала?
Мо на жалейцы хоча марш хаўтурны граць
Усім надзеям брудным і няўдалым!

* * *

Эх ты, поле! Шырокае поле
Звоніць песняй вясновых надзей.
Маё сэрца пад ветры прыволля
Парываецца з палкіх грудзей.

Зноў лясы, сенажаці, дубровы!
Так, здаецца, пусціўся б у скок.
Тут калісьці пад сонцам вясновым
Расквітала жыццё васільком.

Тут калісьці дзяўчаты і нівы
Мае грудзі паілі агнём…
І не знаў я, што ў травах тужлівых
Ёсць і хмель, і разгул, і віно!

А цяпер ўсё так проста, ўсё ясна,
Толькі сілы ранейшай няма.
І дзяўчаты з гадамі пагаслі,
Як пад восень жыццёвы размах.

І цяпер так хачу я да болю
Хоць зямлю каля рэчкі абняць.
Гэй ты, поле, шырокае поле…
Сыпле кветкі на грудзі вясна.

* * *

Над прасторам ніў і над квяцістым лугам
Бубянцом ахвотна празвінець.
Гэты клён курчавы, як зялёнай пугай,
Апавіў і сцебануў мяне...

Зашумелі ціха дарагія нівы
Срэбнай песняй спелых каласоў.
Я прыйшоў падслухаць гэты шум тужлівы
І прайсціся роднай паласой.

Пабялела даль, і па-над сінім борам
Запаліла сонца яркі свет.
Як надзеі, тухнуць залатыя зоры
На прасторы песенных завей.

Зноў лясок-дубняк перада мной знаёмы
Так шуміць, як некалі шумеў,
Дзе не раз я у разгульна-вольны момант
Разліваў з хлапцамі песні й смех!

Эх, хлапцы, было нас дружных вельмі многа,
Кожны вырас, шлях свой адшукаў:
Той пайшоў сялянскаю мяжой-дарогай,
Гэты выйшаў новы дзень каваць.

Толькі я адзін праходжу без прытулку
То па бруку пыльным і сівым,
То зальюся песняй нечакана-гулкай
Сярод яркіх кветак і травы...

А цяпер над лесам і квяцістым лугам
Бубянцом ахвота празвінець.
Гэты клён курчавы, як зялёнай пугай,
Апавіў і сцебануў мяне!..

* * *

Тут так хораша, свету так многа...
Срэбны месяц прылёг на кусты.
Я іду сваёй роднай дарогай,
Зноў вясёлы і зноў малады.

Даль маўчыць і цяпер не падкажа,
Што рабіць і куды мне ісці.
Толькі знаю, што шлях мой праляжа
Там, за вёскай ў жытах і ў трысці.

Сёння ўсё — гэты хвойнік і Свіслач —
Да сябе заклікаюць пажыць.
Колькі ўпартых бяроз панавісла
Над вадой і на грудзі мяжы.

Гэта межы спыталі у сэрца:
— Ці ж не ты хочаш піць гэту ціш? —
Ўсё маўчыць, не дыхне, як пры смерці,
Ну а ты?.. Ты таксама маўчыш!

Ну і што ж, калі свету так многа,
Срэбны месяц каханнем гарыць.
К чорту песні, разгул і трывогі,
Хоць хвіліну адну так пажыць!

* * *

Пеў пякучыя песні свае салавей,
Кучаравая ліпа драмала;
На прасторы палёў і жытнёвых завей,
Там, дзе песня да шчасця і волі заве,
Маладая дзяўчына спявала.

Слухаў я, і ў грудзях векапомнай струной
Пела сэрца пра светлую волю.
І хацелася шчасця й кахання ізноў,
Каб у гэтым прасторы сівых ячмянёў
Патануць ў цішыні з галавою.

Хай тады яна прыйдзе і скажа: „Кахай
Маладую дзяўчыну прыволля.
Будзе песні нам пець зачарованы гай,
Будзе слухаць іх месяц і радасны край,
А мы будзем кахацца на полі...“

І рукой белай, белай, як лебедзь, рукой
Абдымаць мяне ў шчырасці будзе.
Хай тады белы месяц над сіняй ракой
Упадзе на ваду залатым васільком,—
Ён запал нашых слоў не астудзіць!

Хай тады усю ноч, ўсё жыццё салавей
Свае песні пяе пра каханне.
На прасторы палёў і жытнёвых завей,
Там, дзе песня да шчасця і волі заве,
Ўсё жыццё — залатое світанне!

* * *

Помніш ты, быў ціхі-ціхі вечар,
Месяц жыў і плакала лаза.
Ты так доўга думала аб нечым
І хацела нешта мне сказаць.

Наша лодка ціха і пакорна
Несла нас ў нязведаны йшчэ край,
А ў бяздонні воч тваіх азёрных
Вольным морам плакала зара.

Ты маўчала, любая дзяўчына.
Я таксама думаў і маўчаў.
Не таму, што сэрца неяк ныла
Па вясне і выпітых начах.

Так плылі, не зналі, не чакалі…
Ўсё жыло трызвонамі надзей.
Ты мне нешта тайнае сказала
І прыпала з смехам да грудзей.

Я абняў, каб пакахаць і верыць!
Вусны так палілі, як агонь!
Чуў я стук сваёй крыві і сэрца,
Ды спыніць не ў сілах быў яго.

Твае вусны — вусны мне спалілі,
Твае грудзі — кроў маю ўзнялі:
Мы навокал ўсё тады любілі,
А цяпер, напэўна б, ўсё клялі!…

## ДЗЯЎЧЫНЕ

І так пішу, ізноў пішу з натхненнем.
Твой васілёк перада мной ляжыць.
А за вакном снуюцца і танцуюць цені,
Упаў срабрысты месяц на калені,
Стаў цалаваць магільныя крыжы.

О, што яму — ён сёння верыць ў Бога,
Я ж веру толькі ў шчасце і людзей.
І мо затым з такой пякучаю трывогай
Я жыў, смяяўся і спяваў так многа,
Хоць часта быў я збіты, без надзей.

О!.. ён стары, з ім ў ціш і ў сінь магілы
Лягла вясна... і шчырасць — адміраць;
А я ў разгары свежасці і сілы
Пайду ў прастор, дзе над палоскай мілай
Гарыць, як кроў, вячэрняя зара.

Каб з новай верай ў шчасце і каханне
Цябе да сэрца смела прытуліць
І ў сіні змрок ля шэрага кургана
Пра нашу цвець і першае спатканне
Вясны і траў мелодыю праліць.

І ўжо тады пад белаю калінай
Нам будзе месяц сыпаць каласы;
І так — бывай, каханая дзяўчына,
Прыйду я хутка да цябе ў даліну
Упіцца свежасцю крамянае расы!

* * *

Нашто глядзіш мне так у вочы,
Скажы, о любая, скажы?
Пад гэты змрок халоднай ночы
Я не магу з табою жыць.

Я знаю: сэрца тваё б’ецца
Агнём нявыпітай крыві,
І вось затым ў шырокім свеце
Хачу я песні абнавіць...

Ты горка плачаш, слёзы льюцца,
Яны гараць-пякуць агнём.
Глядзі навокал: кветкі й людзі
Цябе вітаюць з новым днём.
А так нядаўна, так шчаслiва

Твой смех палаў ў маіх грудзёх,
Калі мы дружна, хоць маўкліва,
Ішлі змагацца за жыццё!

І ты парою песні пела,
Як птушка вольная дуброў,
І ўсё на нівах паланела,
Як паланее толькі кроў!

І так ішлі ў трывозе ночы,
Так беглі дні і ўсё жыццё.
А я маўчаў, і толькі вочы
Шукалі нешта над трысцём.

І я не знаў, што ў час расстання
Душу мяцежную аддам
Ўсяму, што з подыхам світання
Імкнецца ў радасную даль.

Дзе ёсць другая маладзіца,
І гэта песня для другой,—
Я толькі ёй адной маліўся,
Адну кахаў сярод лугоў.

Чаго ж глядзіш так мне у вочы,
Скажы, о любая, скажы?
Пад гэты змрок халоднай ночы
Я не магу з табою жыць!

* * *

І зноў холад і вецер, і сіняя цьма,
І зноў сэрца балючае плача.
О, нашто над палямі разлёгся туман,
Калі хочацца сонца пабачыць.

Зацвіла прад вакном маім белая даль,

Налілася жыццём і каханнем,
Толькі сонца не хоча цяпла ёй даваць
І схавалася недзе ў тумане.

Так і песня сягоння мая зацвіла,
Толькі сілы няма й поўнай волі,
Каб на родным прасторы дуброў і сяла
Каласілася спевамі поле.

Я йшчэ ведаю: смехам жыццёвых крыніц
Захаплюся на ўлонні прыроды,
Толькі згінуць хай холад і хмурыя дні,
Што навеялі цьму і нягоды.

Я йшчэ ведаю: ў даль, над маёй паласой
Праліецца прывольная песня,
Толькі дайце гармонік на сто галасоў
І прастор для размаху не цесны.

О, тады ўсё спяю, ўсё скажу вам, браты,
Я скажу, што люблю і што знаю,
Бо у цвеце кляновым прастор залаты
Упаіў маё сэрца каханнем.

* * *

Эх, палі, залатое раздолле.
Ну чаго ж так застукала кроў? —
Гэта даль і шырокае поле
Наліліся каханнем дуброў.

Я прыйшоў, засмяяўся, заплакаў
І на грудзі асіны прылёг,
А яна, як прапашчы гуляка,
Прытулілася ціха без слоў!

Ну і што ж, дарагая асіна,

Ці не ты мяне звала сюды? —
Раскажы ж гэтым вечарам сінім
Аб жыцці тваіх дзён маладых.

Раскажы, дзе хлапцы і дзяўчаты,
Дзе іх песні і радасць вясны.
Можа, там, ў гэтых нізенькіх хатах,
Больш не будуць смяяцца яны.

Я ж хачу яшчэ жыць на раздоллі,
Зноў пабачыць братву і разгул...
Што ж, бывайце, асіна і поле,
З вамі жыць я адзін не магу.

Не магу!.. не магу!.. і не знаю,
З кім дружыць і каго абдымаць,
Ці забыцца на сінім кургане,
Ці каменне зубамі ламаць?!

* * *

Зноў прыйшла, прыйшла ты
Да сялянскай хаты,
На прастор шырокі радасных дуброў, —
Ты сягоння будзеш
Ў маладыя грудзі
Уліваць жаданні і юнацтва кроў.

Хай цвіце Айчына
На прасторах сініх,
Дзе агнём палае прозалаць-зара —
Ты ужо красуеш
І жыццё чаруеш,
Ўжо лясоў кашулі ў зелені гараць.

Ты прыйшла, і ў нівах

Радасна-шумлівых
Твая радасць-кветка б’е агнём крыніц;
І цяпер да болю
Ў залатым прыволлі
Паказаў я песню сваіх родных ніў.

І пад радасць сонца
Хочацца бясконца
Абхапіць рукамі гэту даль і шыр,
Каб пад спевы ветра
Перад новым светам
Ўсё сказаць — і шчыра, што я перажыў!..

Зноў прыйшла, прыйшла ты
Да сялянскай хаты,
На прастор шырокі радасных дуброў.
Вось затым сягоння
Рвуся я на гоні,
Вось затым сягоння так шумуе кроў!..

## НОЧ ЗАПАЛІЛА

Ноч запаліла пажар залаты,
Нехта заплакаў пад ценню вярбы.

Ціхія слёзы, як радасць і сон,
Выйду я заўтра наранні з касой.

Выйду я заўтра да гэтай вярбы,
Поўны задум’я і сіняй журбы.

Выйду я зрэзаць вясновую цвець
Ў раннім пажары пунцовых завей.

Ранне! І слёзы палаючых траў,—
Буду я плакаць, як плача зара!

Так, гэта заўтра, а можа й раней,

Травы заплачуць аб новай вясне,

Косы асыплюць і зрэжуць іх цвець
Вольным размахам сталёвых брывей.

Так яны згінуць ў халодным жыцці,
Сёння іх згоды не будуць прасіць.

Што гэта мора зялёнай травы
Ў песнях сваіх для людской галавы.

Сёння загіне, а заўтра ізноў
Будзе ўпівацца вясной і віном!

Так я стаяў і ў задум'і палёў
Слухаў, як песні лятуць за сялом.

Там, дзе прыбоем зялёнай струны
Кінулі травы на грудзі вясны

Чулыя словы, як радасць жыцця,
Зналі й яны, што хвіліны ляцяць.

З кожнай хвілінаю ранне бліжэй,
Туліцца месяц ніжэй і ніжэй...

Што яму сёння, ён шчырасць згубіў
Ў срэбныя хвалі халоднай вады.

Так я стаяў і глядзеў навакол,
Пеў салавей над срабрыстай ракой,

Пеў аб загубленым нейчым жыцці,
Быццам трывогу юнацтва насіў.

Думаў ці не ён, прыволля пясняр,
Што будзе заўтра у пацерках дня?

Думаў ці не, што сталёвай гурбой
Выйдуць сяляне, як быццам у бой.

Выйдуць і зноў на радзімай зямлі

Голымі стануць прасторы далін.

Не! Ён не думаў аб гэтым. О, не!
Так ён спяваў у трывозе раней...

Плакалі вербы і плакаў прастор.
Людзі ж не зналі, аб чым і нашто.

Людзі пыталі у сонца і ніў,—
Дзе іх прыгожасць жыцця і вясны?

Сонца маўчала, а ў нівах вясной
Пахла каханнем і пахла віном,

Толькі адзін салавей над ракой
Пеў аб жалезным паходзе вякоў!..

Ноч запаліла пажар залаты.
К чорту трывогу пад ценню вярбы!

Гэта трывога, як песня і сон,
Заўтра не выйсці мне з срэбнай касой.

Заўтра туман над прасцягам далін
Кіне мне тайну жыцця на зямлі,

Заўтра мне скажа напевам другім:
Досыць маліцца у песнях тугі.

Пойдзем туды, дзе ў прыволлі дуброў
Кветкі палаюць агнём і зарой.

К чорту! Нашто залатая зара!..
Бачыш, як зоры ў трывозе гараць,

Месяц, як мёртвы, упаў над сялом,
Вецер з узгорка сарваўся далоў.

Што ж я стаю у трывозе адзін?

Нехта мне шэпча: — Браточак, ідзі...

Раз толькі радасць палае ў грудзёх,
Песня ж навекі ўлілася ў жыццё.

Йдзі, мой браточак, для новай вясны
Трэба спяваць, а не плакаць і ныць!

## АЛЕСЮ ІВАШКЕВІЧУ

Палюбіў я асенняе ранне
І красу зарунелых далін,
Мо затым, што у срэбным тумане
Апавіты жальбою палі,
Палюбіў я асенняе ранне.

Ў гэтым ранні, халодным і сінім,
Многа шчырасці й многа крыві.
Чуеш, там, за шырокай далінай,
Нехта кажа: Валеры — жыві!
Ў гэтым ранні халодным і сінім.

Ціха сцелецца жоўтае лісце,
І пяе аб мінулым трава,
Што цяпер весялей, як калісьці,
Песні шчасця й кахання спяваць.
Ціха сцелецца жоўтае лісце.

Знаю я, што ў палях непагодна,
Недзе плача мінорна струна.
Бо за гэтым акордам нягоды
Будзе пець і смяяцца вясна...
Знаю я, што ў палях непагодна.

Палюбіў я асенняе ранне,

Бо ў ім многа раздум'я і слёз.
Калі нехта упаў на кургане,
Гэта значыць,— ён цемры не знёс...
Палюбіў я асенняе ранне.

* * *

О, каменне замоўкла, каменне маўчыць,
Яно цёплага слова не скажа.
Калі так, я хачу між палёў адпачыць,
Хай палі мне пра сонца раскажуць.

А я сэрцам, ўсёй чулай душой юнака
Ўсё скажу й прапяю на прыволлі,
Каб шумела мацней пад гарою рака,
Каласілася спевамі поле.

Каб пад сонцам румяным на роднай мяжы
Я не змоўк разам з брудным каменнем,
І не стаў, як другія, без шчырасці жыць,
Адпіхнуўшы навекі імкненні.

Я хачу яшчэ жыць светам майскіх начэй,
Каб у зелені ўбачыць свой край,
Калі будзе змагацца святлей і ярчэй,
Калі раннем праплача зара...

То праплача мой родны, мой любы народ,
Пралie свае слёзы ад шчасця.
І на вольным прасторы шырокіх дуброў
Ўсё мінулае ў песні пагасне.

І тады ўсё ўздыхне, смела, шчыра ўздыхне,
Сваю радасць спяе для Айчыны
І каменне, як смецце, між палкіх агней,
Каб згарэлі, навекі пакіне!

## СОН

Я прыйшоў на радзімую вольную сінь,
Пад асеннія свісты пажоўклых асін.
О, як сэрца застукала ў грудзі ізноў!
Так не стукала моцна і ўпарта даўно.

Дзе ты, лес кучаравы, задуманы лес,
Толькі дзе-нідзе хвоі, асіны, лазняк
Свае слёзы губляюць і роняць на глей,
Мо затым, што й для іх адцвітае вясна.

Я ніколі не думаў, не ведаў, што так
Мяне стрэне Радзімы прывольны абшар.
І на сэрца кладзецца з трывогай рука,
І так моцна, так глуха галосіць душа.

Дзе прыгожасць, і сонца, і свежая цвець?
А так шкода, так шкода вясны і агня,
Чым гарэлі палі і зялёны дубняк
На шырокім прасторы вясновых завей.

І хоць знаю: ніколі не вернеш назад,
Што прайшло, адцвіло і памерла ў палёх,
Толькі сэрца так хоча прасторам сказаць,
Каб ізноў запалілі вясну над сялом.

О, тады з сваіх чулых і палкіх грудзей
Я аддам гэтым нівам палову душы,
Каб гарэў дыяментам залочаны дзень
І каб вечна прастор красаваўся і жыў!

Гэта сон!.. залацісты, задорысты сон!..
Хто яго мне навеяў ад вёскі і ніў?!
За вакном той жа ўпарты прыбой галасоў,
За вакном той жа брук і працяг камяніц.

Толькі сэрца яшчэ пад кашуляй дрыжыць,
І рука піша песню сялянскай душы:
„Я прыйшоў на радзімую вольную сінь,
Пад асеннія свісты пажоўклых асін.“

* * *

І так, усё... ўсё праляцела,
Чым сэрца некалі жыло;
І над далінай гэтай белай
Іду, як мёртвы, за сяло!..

Даволі сэрца маладое
Душылі вы ў маіх грудзёх.
Прайшло ў жыцці ўсё залатое,
Прайшло і знікла у трысцё.

І я пайшоў, дзе ветры ў нівах
Журбу асеннюю мятуць,
Каб пад напевам палахлівым
Забыць усё і адпачнуць!

А мо, дзе сцелюцца туманы,
З асінай бруднай падружыць,
Каб не пачуць перад світаннем,
Аб чым пяюць штодня крыжы...

І так, усё... ўсё праляцела,
Чым я тут жыў і чым гарэў.
Хлапцы, бывайце!.. Вы сагрэлі
Вячэрнім спевам сініх дрэў.

# 1927

*І там, над рэчкай і над по-*
*лем,*
*Я вып'ю раніцы зару,*
*Каб песняй радасці і волі*

* * *

Была восень у роднай краіне,
Гаварыла мне шчырасць не раз
Гэту песню халодную кінуць
І квітнець, расквітаць, не згарацрь.

Так, я верыў ёй ціха й пакорна,
Я шукаў новых радасных слоў,
І па-новаму рытмам задорным
Маладое жыццё расцвіло.

Тыя дні я прыпомніў з пагрозай...
Хтосьці крыкнуў глыбока ў душу,
Што на бруднай асенняй дарозе
Аб маім самагубстве пачуў.

Абляталі й згаралі пялёсткі
Чорным дымам халоднай пары
І крывёю на грудзі бярозак
Прыпадаў светлы золак зары.

Я стаяў, і дзівіўся, і марыў.
Я хацеў, як другія, пажыць,
Каб згубіць гэтай восені хмары,
Каб навекі забыць пра крыжы.

І затым мо у новую восень
З новай песняй ў юнацкіх грудзёх
Мне так хочацца, хочацца госцем
Прывітаць гэты свет і жыццё!

## ВЯСНОЙ

Устала сонца над палямі
І цёплы ветрык зашумеў.
Прастор запеў і перад намі
Прыйшоў канец, канец зіме.

О людзі-братцы, ясным сонцам
Ўсё ажыло ў палёх, лугох.
Над кожнай хатаю бясконца
Вяснова-новы спеў разлёг.

Вясна, вясна — краса прастораў,
Краса жыцця і нашых дзён.
Бягуць руччы разгульна-горда,
І радасць звоніць у грудзёх.

Такой парой жыццё і песня,
І ў сэрцы радасць чулых сноў,
Бо на прыволлі жыць не цесна
І шчасце піць і піць ізноў!

* * *

Патанаюць далі ў стынь і ў сон-туман.
Над ракой акорды песеннай тугі.
Палюбіў усёй душой я гэта ранне
Над прасторам ніў і вёсак дарагіх...

Вецер ліст бярозкі ціха кучаравіць,
Ціха б’ецца ў бераг сонная рака,
Мне ахвота сёння кінуцца у травы
І між траў забыцца, шчасця пачакаць.

І між траў курчавых ў золата і кветкі
Загубіць знянацку радасць і вясну,
Каб цвілі каханнем родныя палеткі,
Каб у гэта ранне сэрцам адпачнуць.

Каб у гэта ранне спець пра нашу волю,
І пра наша шчасце, і пра наш прастор,
Бо не дарам сёння выйшаў на прыволле,
Бо не дарам сёння ў гэту сінь прыйшоў.

* * *

Мне хочацца любіць, задумацца і верыць.
Душу з другімі душамі зліваць.
Хай не адчыняць мне ў прыгожым доме дзверы,
Дармо! І ў полі можна начаваць.

Пад сінім месяцам, такім далёка-дальнім,
Знайду я ўсё: і радасць, і спакой...
Не мне шукаць мяшчанскай ціхай спальні
Ў вачах мяшчанскіх ціхіх васількоў.

Я не аб гэтым марыў! Марыў я аб новым,
Другім, яшчэ нязведаным жыцці,
Каб не згараць дарма... зрываць з другіх аковы.
Дабром за ўсё... за ўсё дабром плаціць!

Дзе толькі людзі ёсць — задумацца і верыць,
Душу з другімі душамі зліваць.
Хай не адчыняць мне ў прыгожым доме дзверы,—
Дармо! І ў полі можна начаваць!

* * *

О вясна
І бяссонныя ночы!..
Сціх у сэрцы
Юнацтва разгул,
Мо таму, што нічога не хочу
І нікога спаткаць не магу.

Не чаруй,
О, даволі, не трэба!
Я інакшую долю спазнаў,
Што ў другіх
У змаганні за хлебам
Адцвітае жыццё і вясна.

Што другім,
Хто у цемры асенняй
Аддаю сваё цела й душу,
Досыць толькі
Не стаць на калені,
Досыць толькі
Узняць смелы шум.

І тады
Там, дзе грызліся зверы,
Нельга будзе душою хварэць,
Бо ў жыцці,
Калі ў што-небудзь верыш,
Ты йшчэ можаш
Цвісці і гарэць.

## НА ПРЫВОЛЛІ

Маўчала ноч...
Над сінім полем
Пунцовай кветкай месяц плыў.
Сягоння сэрца
На раздоллі
Спявае гімн сваёй зямлі.

Той гімн жыве
І паліць грудзі,
Заве ізноў ў радзімы край,
Дзе між палёў
Каровы й людзі
Стапталі шоўк зялёных траў.

І я прыйшоў,
Прыйшоў пад месяц,
На шыр-прастор сваёй зямлі.
Маўчала ноч...
Над сінім лесам
Півоні зор крывёй цвілі.

Я бачыў іх,
І ў сэрцы чулым
Сладзейна плакала струна.
І ў гэтым сне,
На паўразгуле
Я ўсё жыццё хацеў абняць.

Каб зноў смяяцца
І ў зацішшы
Усё сказаць, чым тут жыву.
Як вецер
Возера калыша,
Куды вятры мяне завуць.

Сказаць так
Проста і прыгожа,
Як я гляджу на новы дзень.
Каб ў моры траў
І ў моры збожжа
Было на радасць
Больш надзей.

Каб на прыволлі,
Пры даліне
Хто-небудзь выйшаў і сказаў,
Што тыя песні
Для краіны
Складалі возера й лаза.

А я? —
Я толькі іх падслухаў,
І ў глыбіні маёй душы
Трывожна,
Радасна і глуха
Вясна і шчырасць
Хочуць жыць!

* * *

Мой родны край... І зноў я тут!..
Бярозы, неба, сонца, нівы
Пра шчасце гутаркі вядуць
У песнях вольных і шчаслівых.

Празрысты дзень. Прастор і шыр.
З палямі разам ў дзіўным сне
Адным жыццём гарэць і жыць,
Адным імкненнем паланець.

Ах, сэрца, цішай, сэрца, стой!
Яна пазнала... Што ж з таго?...
Прайду я ціха між кустоў,
Збуджу ў душы другі агонь.

Бо гэтак цяжка, родны край,
Над полем шэпчуць каласы...
Тут пець і жыць, а там згараць
Ў абдоймах сонечнай красы.

Вітаю ўсіх я з новым днём —
Прастор... дзяўчыну і жніво...
Я так прыйшоў, каб верыць зноў,
Каб зноў згараць ў траве з травой.

* * *

Цяпер ў грудзях другія словы,
Другі агонь ў душы жыве,
І гэты спеў бадзёра-новы
Да светлай праўды ў свет заве.

Злятае сон!.. Мінае крыўда!..
Вясна мне глянула ў вакно.
Цяпер пад сонцам ў поле выйду,
Куды хацеў ісці даўно.

І там, над рэчкай і над полем,
Я вып'ю раніцы зару,
Каб песняй радасці і волі
Праславіць свету Беларусь!

Каб гэты спеў бадзёра-новы
Развеяў крыўду і туман,
Бо зноў цвітуць прыволля словы,
І лепшых слоў ў жыцці няма!

## Я ПРЫЙДУ

Ніна-песня, вясёлая Ніна,
Я далёка цяпер — выбачай!
Мае грудзі прыбоі Наддзвіння
Грэюць ласкамі зор па начах.

Ты як казка, як ціхая песня,
Як апошні акорд у жыцці,

Калі сэрцу ў грудзях стане цесна
Гэту ціхую радасць насіць.

Гэта сэрца жадае так многа
І так многа бярэ ад жыцця.
Помніш сад, яркі дзень і дарогу,
І на вусны упала сляза!

Так, мяне ты любіла, я знаю,
А цяпер ты згараеш з другім.
Дык нашто ж я за буры змаганняў
Кінуў вобраз, як свет, дарагі.

Ах, я так! Я не знаў! Слухай, Ніна!
Я прыйду йшчэ ў наш песенны край,
Каб ў туманах прагорклых і сініх
Разам з любай сваёй дагарадь.

* * *

Ты не знаеш, Ніна, што жыццё — вясна,
Адшуміць, адзвоніць, змоўкне, бы струна.

Я сягоння новы, іншы, як заўчора,
Бо ў жыцці я ведаў многа слёз і гора.

Ўспомні сад над рэчкай, белы, свежы сад,
Дзе не раз табе я аб жыцці казаў.

Толькі ты не думай, не труці душы,—
Не магу я болей так нікчэмна жыць.

Я хачу нанова чуць трызвон палёў,
Каб не плакаць болей без душы і слоў.

Я калісьці думаў, думаў я не раз,
Што ў прасторах сініх ёсць надзей разгар.

Гэта ўсё няпраўда, гэта ўсё мана,—
Ты, напэўна, знаеш, што жыццё — вясна,

Адшуміць, адзвоніць, знікне ў туманох;
Не сумуй жа, Ніна, нам не жыць наноў!

Я з табой, як сябра!.. дай цябе абняць!..
Бо на гэтых нівах, дзе цяпер вясна,
Дзе цяпер ліецца светазарны смех,
Будуць пець другія пра жыццё і смерць.

## АДКАЗ

Ах, пакінь... ці выбачай, Валеры,
Цёплых слоў і ўсмешак не прасі...
Мне хацелася б з табою верыць,
Што знайшоў ты мэту у жыцці.

Не, тут нешта іншае, мой дружа.
Ты мне праўду, праўду мне скажы,
Ці так можна быць такім нядужым,
Ці так можна, ці так можна жыць?

Слёзы помніш, а не помніш вуснаў.
Ты забыўся, ты зусім забыў,
Што і ў цемры бруднай, пад прымусам
Можна верыць шчыра і любіць.

Ну і што ж? Цябе я добра знаю,
І так цяжка знаць тваю любоў,
Што ўсю ноч, быць можа, аж да рання,
Ходзіш ты, атручаны журбой.

Ах, пакінь! Ці выбачай, Валеры,—
Я стамілася згараць і жыць...
Ты прыходзь і будзеш знаць і верыць,
Што не ўсё і холад, і крыжы!

## СЯСТРЫ НІНЕ

Ты не ўспомніш, Ніна, вечар залаты.
На грудзях прыволля плакалі кусты.

Ты тады жадала гэтак вечна жыць,
А мне сніўся выстрал, цёмныя крыжы.

Але нешта ў далях, нешта ў свеце ёсць,
Часта сэрца труціць невясёлы лёс.

Ну а ты, як песня, як прыгожы сон,—
Зацвіла і знікла пад хаўтурны звон,

Над табой схіліўся нізкі белы крыж,
Дзе кладуцца фарбы сонца і зары.

Знаю я сягоння — буду хутка там,
Толькі радасць песні для жыцця аддам.

Я аддам, каб зналі, што жыццё — вясна,
Адшуміць, адзвоніць, змоўкне, бы струна.

І на гэтых далях, дзе цяпер жыву,
Будуць мяць другія кветкі і траву!

Вось затым не ўспомніш вечар залаты,
Не успомніш болей, як квітнела ты!

## Я НЕ КАХАЎ

Я не кахаў,—
Кахаліся другія.
А я на іх
З трывогаю глядзеў.
Былі у іншых
Мары дарагія,
Ў другіх сугучнасць
Сілы і надзей.

А я адзін
Пуцінаю імглістай
Ішоў далёка
Ў нейкі сіні край.
Ад гэтых ніў,
Ад гэтых хатак нізкіх,
Дзе вечна плача
Ўвечары зара.

Я сам не знаў,
Якія парыванні
Мяне туды
Няволілі ісці,
Калі ўставала
Сонца у тумане,
Тады я ў сонца
Шчырасці прасіў.

І так ішлі
Хвіліны дарагія.
Не знаў я вуснаў,
Шчасця і надзей.
Я не кахаў,—
Кахаліся другія,
А я на іх
З трывогаю глядзеў!

## МАЎРЫТАНКА

Ах, якая ты!.. Якая дарагая,
І на сцэне сонца прадаеш,
Бо сама, як радасць, маладая,
Бо сама, як сонца, ты цвіцеш.

Маўрытанка, песня ты, ці казка,
Ці прыгожай радасці прыбой,
Бо ў тваіх вачах зусім няцяжка
Піць чужую песенную боль?!

Цыгарэт-вясна,— мы ўсе такія,
Толькі я хацеў бы так згараць,
Каб вакол былі ўсе дарагія
І ў крыві маёй цвіла зара.

Каб хто-небудзь ціха і балюча
Ў мой апошні, мой трагічны дзень
Апаліў слязой сваёй пякучай
Гэта сэрца выпітых надзей.

Каб хто-небудзь блізкі і каханы
Ў вусны мне і ў грудзі цалаваў,
І ў сваім апошнім развітанні
Ўсю душу, ўсё сэрца аддаваў!

Каб ў тумане вечным і прыгожым,
Хто кахаў і песню і зямлю,
Гаварыў мне ціха і трывожна:
„Мілы мой, люблю цябе, люблю!..“

Ах, якая ты!.. Якая дарагая,
І на сцэне сонца прадаеш,
Бо сама, як радасць, маладая,
Бо сама, як сонца, ты цвіцеш...

* * *

Добры дзень, дарагая,
Цалуй і цалуйся,
Хай гараць твае вусны агнём.
Ты сягоння другая,
Узрастай і красуйся
І жыві гэтым сонечным днём.

Нездарма ж так блукае
Усмешка на твары
І на вуснах істужка зары.

Абапрыся рукамі
На руку, таварыш,
І давай гэтак разам згарым.

Бачыш, дзень дагарае,
Ружовыя плямы
Сонца кідае ў люстра ракі.
Ці хоць раз замірала
Ты сэрцам над ямай,
Як крывёй заліваўся блакіт?

Ты яшчэ маладая!..
Празрыстыя вочы
Толькі бачылі радасць і смех.
Нездарма ж так жадаеш
Не ў белыя ночы,
А ў асеннім тумане шумець.

О, вясна-маладзіца!
І той вось і гэты
Разам некалі свет сцераглі,
На палях і ў байніцах
Узрастала іх мэта
Ў кожнай кроплі пралітай крыві.

Добры дзень, дарагая,
Цалуй і цалуйся,
Прыйдзе час і ты будзеш згараць.
А сягоння другая,
Узрастай і красуйся,
Покуль вольны і радасны край!

## З БЕЛЫХ НАЧЭЙ

### I

Дай ты мне свае белыя грудзі,
Дай да сэрца прыціснуць хоць раз.
Гэта ноч ўсё жывое абудзіць,
Не абудзіць адных толькі нас.

Не абудзіць ні слоў, ні кахання.
Ну і што ж, калі хараша так
Адшукаць свой прытулак ў тумане,
Адшукаць і другім перадаць.

Што глядзіш так таемна і ўпарта?
О, я знаю, ты хочаш йшчэ жыць,
Бо для шчасця — надзеі і жарты,
А для смерці — трызвон і крыжы!..

Дай жа, дай свае белыя грудзі,
Дай да сэрца прыціснуць хоць раз.
Гэта ноч ўсё жывое абудзіць,
Не абудзіць адных толькі нас!..

### II

Не цвілі дыяментамі вочы,
Дый за гэтым тады не сачыў.
Толькі шкода, што ў белыя ночы
Мала знаў я прыгожых жанчын.

Я не знаў, і навошта так рана
Свае грудзі журбой абуджаць,
Раз абудзіш — і чорная рана
Будзе каменем вечна ляжаць.

А так многа, на свеце так многа,
Што згубілі жыццё абы-як,
Бо была ім апошняй дарога,
Што вядзе у бяздонне й кабак.

І хоць так не палалі тут вочы,
Я за гэтым тады не сачыў,
Толькі шкода, што ў белыя ночы
Мала знаў я прыгожых жанчын!

III

Не табе, не з табой я маліўся,
Ну й за гэта сягоння даруй.
Не шкада, што на свет нарадзіўся,
Не шкада, што калісьці памру.

Не шкада, што ў вячэрнім тумане
Мёртвы месяц пажарам гарыць,
І на белыя грудзі туманаў
Льюцца слёзы крывавай зары.

Ах, сягоння ля гэтай дубровы
Хочу жыць, яшчэ хочу я жыць,
Бо кахаць ты не будзеш нанова,
А пажару крыві не стушыць.

І хоць так! Не табе я маліўся,
Ну й за гэта сягоння даруй,—
Не шкада, што на свет нарадзіўся,
Не шкада, што калісьці памру!

## ЛЕТУЦЕННІ

Ішоў адзін
Мяжою мне знаёмай.
Ізноў смяяцца
І співаць ізноў,
І так хацелася
Другой або другому
Аддаць душу
Квітнеючай вясной.

Яна прыйшла
Адна, неспадзявана,
Пад ціхі шопат
Спелых каласоў.
Душа палала
Шчырасцю нязнанай,
Цвілі сады
Нязведанай красой.

Акорды траў
Ліліся на прыволле,
І месяц піў
Ліпнёвы агняцвет.
І так хацеў, хацеў
З мяцежным болем
Упіцца сінню
Месячных завей.

Як ціхі сон
Балючага натхнення,
Шумелі ветры
У радасных палёх.
І жыццятворчай
Песняй летуценняў
У маёй душы
Паўстанне узрасло.

Я ўсё жыццё
І лепшыя хвіліны
Гатоў аддаць
За праўду і другіх,
Каб толькі бачыць
Радаснай Айчыну,
Каб выйсці ўдаль
На новыя шляхі.

А дні ішлі;
Адходзілі, знікалі,
І дні другія
Выйшлі з туманоў,
А разам з імі
У сонечныя далі
Прыйшла й яна,
Узросшая вясной.

Прыйшла і шчырасць
Сэрца маладога
Хацела мне
Навекі падарыць,
А я гарэў
Нязведанай трывогай,
Крывавым сумам
Выплыўшай зары.

І я не знаў,
Не думаў і не марыў,
Што мог яе
Балюча цалаваць,
Бо хто мог бачыць —
Сінія абшары,
Зялёны лес
Ды мяккая трава.

Ах, я дзівак
Упарты і мяцежны,
Я сам уцёк
Ад вуснаў і надзей,
Каб не упіцца
Шыяй беласнежнай,
Каб больш не бачыць
Подыху грудзей.

Чаго ж тады
Я верыў і імкнуўся,
Чаго я пеў,
Чаго хварэў душой?
Ў палях шырокіх
Роднай Беларусі,
Каго шукаў,
Таго я не знайшоў.

Ну, бо яна
Гарэла, не згарала,
Як гэта ноч
І месячная цвець.

І каб другога
Ў свеце напаткала,
Магла з другім
І плакаць, і гарэць!

Ах, я заснуў,
І гэта ўсё здалося.
Бо за вакном
Мяцеліца шуміць
І вецер сыпле
Снежныя калоссі,
Каб гэту даль
Надоўга астудзіць.

І ў сэрцы зноў
Дзіцячыя жаданні.
Мне шкода
І так цяжка мне,
Што гэты сон
Прыгожага спаткання
Ў душы не змог
Ужыцца, паланець.

Відаць, ў жыцці
Нікога не спаткаю,
Каго змагу,
Як песню, палюбіць,
І ўсе шляхі,
Здабытыя вякамі,
Прайду, як сон
Паўстання й барацьбы!

* * *

Здароў, мой таварыш, мой дружа,
Зара заквітнела ізноў,
Развеяўшы ветры і сцюжы,
Жывём і ўзрастаем вясной.

Ты бачыш: ў крыві мае рукі,
Я сэрца з грудзей вырываў,
Каб вольныя дзіўныя гукі
Краіне сваёй даравацъ!

Ў бяссонныя майскія ночы,
На месячнай ціхай вадзе
Я бачыў плакучыя вочы
Ў пажары трывог і надзей.

Яны мне прыносілі песні,
Бяздонне прыгожай журбы
І сэрцу рабілася цесна
Ўвесь свет неасяжны любіць.

Ты бачыш: ў крыві мае рукі,
Я сэрца з грудзей вырываў,
Каб вольныя дзіўныя гукі
Краіне сваёй даравацъ!

Вітанне ж, таварыш і дружа.
Зара заквітнела ізноў,
Развеяўшы ветры і сцюжы,
Жывём і ўзрастаем вясной!

## ПАЭТАМ

Я не знаю, адкуль гэты смех,
Але, хлопцы, чаго тут смяяцца,—
Наша радасць не згіне у цьме,
Наша песня надзей і юнацтва!

Ну чаго ж так пад звоны гітар
Маё сэрца палае каханнем,
Я яму толькі шчырасць аддам,
Я яго не спаткаю ў тумане.

Адпусціце: я сёння не свой,
Не ўзнімайце на сэрцы трывогі,
Я хацеў бы хістацца травой,
Або выйсці на шлях, на дарогу.

Вы не знаеце, хлопцы, о не...
Я скажу вам, браты, як таварыш,—
Сёння зоры за нас чырваней,
Не паэты, а зоры ўжо марацць.

Я не знаю, адкуль гэты смех.
Але, хлопцы, чаго тут смяяцца,
Наша радасць не згіне у цьме,
Наша песня надзей і юнацтва!

* * *

I

Хрыпла гудок прагучэў,
Сэрца скранулася, стала.
Ў цемры асенніх начэй
Спяць златазвонныя далі.

Месяц прылёг на блакіт,
Далі агнём атруціў.
Хораша быць ля ракі,
Хораша пець у жыцці.

Хораша ўспомніць праз сон
Тайную цень тапалёў,
Чорнай дзявочай касой
Ноч загубіць на палёх.

Хрыпла гудок прагучэў,
Мірна схіліліся нівы.
Ў цемры асенніх начэй
Жыць маладым і шчаслівым!

II

Срэбны месяц у вокны смяецца.
Я стаю і дзіўлюся у сінь.
І так хочацца сэрцам сагрэцца,
Каб вясны залатой не прасіць.

Недзе там, на шырокай дарозе,
Дзе бярозы цалуюць блакіт,
Хтось крычыць аб крывавай пагрозе,
Што прыносяць для свету гудкі.

Ах, гудкі, хто за вамі не сочыць,
Я душой палюбіў ваш размах:
Вельмі многа ў мінулыя ночы
Тут п’яніў мае грудзі туман.

Так, я помню, ў абдымках прыроды
Марыў тайна аб новай красе,
Каб ісці, каб квітнець непагодай,
Каб з гудкамі згараць пакрысе!

## МАЦІ

Прыйшла ў далёкі дом, пачула спеў гітары
І раптам нейкая ўлілася ў грудзі боль.
Над хмурым горадам паўзлі густыя хмары,
І чорны дзень быў здушаны жальбой.

Яшчэ нядаўна так жадала дзён вясновых
І жыць агнём пачуццяў і надзей,
Як раптам вестка,— сын яе ахвярай новай
Стаў, родны сын загінуў ад людзей.

Яна так плакала, яна ў агні згарала,
Малілася прад Богам і людзьмі.
І рай, шчаслівы рай яна яму жадала,
Слязьмі й журбой грахі яго абмыць.

Ён быў дзівак, любіў спакойны шум дубровы.
Музыка быў, о, як ён мог іграць!
А потым выйшаў рваць-знімаць з другіх аковы, —
Памёр, — другія выйшлі паміраць...

Ён першы быў, як сон вясны, як летуценне.
Дык плач, пясняр, ўздымай ў грудзях агонь.
Упала маці з плачам, з крыўдай на калені
І вобраз маткі бачыла другой.

І гэты дальні дом, і гэты спеў музыкі
Ўзнялі агнём жаданняў і журбы
Акорд ў грудзях яе, акорд ў душы вялікі,
Бо толькі маці можа так любіць!

* * *

У гэтай цемры
Бязрадаснай ноччу
Песня буры не скажа —
Жыві!
Сёння мора
Жыве і ракоча,
Мора хоча ахвяр і крыві.

Ты пайшла ад мяне,
Ты пакінула
Гэту радасць
Маленькіх надзей,
Бо жадаеш зашмат,—
Над магіламі
Не шкадуюць далёкіх людзей.

Выбачай,
Можа, гэта не гэтак.

Можа, й праўда,
Што сонца для ўсіх,
Каб пялёсткамі
Месячных кветак
Радасць гордай
Прыроды расціць.

Што ж з таго?
Я не веру прыродзе,
Нельга верыць ўсяму,
Што цвіце:
Хай ўзраслі
Мы з табой ў непагодзе,
Дык затое ў грудзях
Больш надзей...

Слухай:
Мора жыве гэтай ноччу,
Мора хоча ахвяр і крыві.
Хай яно
Злосцю дзікай рагоча,
Я ж кажу табе:
Вер і жыві!

## ЖАДАННЕ

Адыходзь, трывога, й забірай з сабой
Плач і крыўду хлопца з чулаю душой.

Ты адна сягоння мне свая між ніў,
Быццам я згараю ў песенным агні.

Быццам я далёка, ў вочы б’е туман,
І нічога светлага больш ў жыцці няма.

Ах, мой край каханы, залаты мой край!
Не хачу так рана ў песнях дагараць.

Я йшчэ жыў так мала і так мала пеў.
Ну дык дайце ж, братцы, мне пажыць цяпер.

Дайце на прыволлі сэрца з сінню зліць,
Каб з другімі марыць і другіх любіць.

* * *

З ценямі думкі, а з думкамі цені
Ўдаль па шпалерах бягуць.
Нехта стаіць прад зарой на каленях,
Выпіўшы сэрца разгул.

Месяц чырвонцам скаціўся у травы,
Ціш, хоць душу вынімай,—
Сёння мне песняў, пачуццяў і славы,
Тых, што ў нікога няма!

Выйду расхрыстаны. Поле і месяц
Грудзі ўстрывожаць наўсцяж,
Будзе мне блізкай далёкая песня
Вольных прыбояў жыцця.

Нехта стаіць прад зарой на каленях,
Выпіўшы сэрца разгул.
З ценямі думкі, а з думкамі цені
Ўдаль па шпалерах бягуць.

# 1928

*Я песні прынёс іх*
*З далёкага поля,*
*З далёкага поля іх ласку прынёс.*
*Рабінавай ноччу*
*Ўзняў зорныя пчолы*
*З эмалевай далі трывожных ня-*

* * *

Адсумаваўшы маладосць сваю,
І ён прыйшоў ў краіну лістапада:
Стамлёны клён абсыпваў галаву
За залатую клетку
Раненага сада...

Ў блакітным возеры усёй сусветнай
Разбіты месяц горда патанаў,
І хтось з зямлі пужліва,
Непрыкметна
Яму рукой,
Як з берага, махаў!..

Давай, мой друг далёкі і нязнаны,
Бярэм чаўнок юнацкіх пачуццёў.
У нас ў грудзёх
Адны і тыя ж раны,
Адзін і той жа ўспыхвае касцёр.

Хутчэй адсюль,
З краіны лістапада.
Хутчэй к цяплу, і к людзям, і к зямлі.
Хай наш чаўнок
Нясе нас ў дзверы сада,
Дзе зоры з кветкамі на градах дзён ўзышлі.

## УСТУП ДА ПАЭМЫ „РАБІНАВАЯ НОЧ“

Я ехаў… Быў вечар гарачы…
Душа расквітала агнём,
Крычалі над возерам качкі,
І вецер стагнаў пад вакном.

Там некалі
Ў хаце мужычай,
Пад песні нязнанай журбы
Любіў я з другімі ў надзвычай
Па-нашаму ласкавым быць!

Ў далёкія кволыя ночы
Я помню сябе, як праз сон,
З душой надазёрнай жаночай
І з шапкай густых валасоў.

Я знаю, мяне там любілі,
Як многіх,
Інакшых,
Другіх,
За песні вясновых ідылій,
За шчырасць душы і рукі…

Пад снегам пушыстых акацый
Я помню, як нехта сказаў:
Там людзі умелі змагацца,
Там з боек не беглі назад.

Я слухаў, і голас знаёмы
Зноў сэрца агнём апаліў…
За садам ля нашага дому
Мінулага думы ўсплылі…

Дрыжэлі над возерам цені.
І дзе узнімаўся туман,
Упала зара на калені,
Упаў на калені я сам…

Прымай, дарагая краіна,
Прымай свайго сына ізноў!
І  месячным светам —
Крывёю рабіны,
І сумам начэй, і трывогаю сноў...

На полі туман,
А ў душы развідняе,
І кветкі палёў зноў вітаюць мяне.
Я іхнюю шчырасць
І ласку іх знаю,
Іх холад зімы ў маіх снох
Не кране.

Я песні прынёс іх
З далёкага поля,
З далёкага поля іх ласку прынёс.
Рабінавай ноччу
Ўзняў зорныя пчолы
З эмалевай далі трывожных нябёс.

## „МАЛАДНЯКУ“ — 5 ГОД*

.............................................
.............................................
Толькі светлай вясне верым мы,
Толькі першым хвалюючым стратам.

Мы імкнемся туды, дзе вясной
Расцвітаюць вяршыні жаданняў.
Дзе забыты з табой мы даўно
Непагодамі бур і туманаў.

Твая песня цвіце, як вясна,
І твой голас п’яней за Купалле.
Дык спявай жа, спявай да відна
Аб прыносячых шчасце нам хвалях!

* У газеце „Звязда“ ад 21 лістапада, дзе ўпершыню быў апублікаваны гэты верш, па нявысветленых прычынах адсутнічаюць першыя два радкі.

## ЧУЕШ, БЕЛАРУСЬ?

Кастусю КАЛІНОЎСКАМУ

Былі імкненні,
Мары,
Барацьба,
Былі пажары бацькаўскіх палеткаў.
Ўзнімала сцяг свой
Галыцьба —
Іх пачуццёў і радасці іх
Сведку.

Кляпалі косы,
Плавілі сякеры,
На панскі чэрап плавілася сталь.
Ў разгары іх
Вялікай веры
Ён на чале, павадыром іх
Стаў.

Любоў і вера...
Мары й маладосць...
Хто іх стрымае прагнаю рукой,
Дзе здзек,
Дзе катаванне ёсць —
Не можа быць там ціша
І спакой.

Кіпела сэрца над нядоляй краю,
Ўздыхаў наш край
Балотнымі грудзьмі.
Тут пад пятой
Расійскіх генералаў
Душыўся ён крывёю
І слязьмі.

Ішла стыхія:
Воля...
І адплата...
Палаў касцёр ў расхрыстаных грудзёх.

З любоўю сына,
Друга,
Брата
Ён аддаваў юнацкае жыццё...

О Беларусь!
Ці чуеш ты,
Ці чуеш?
Твой лепшы сын распяты за цябе.
Няўжо ў грудзёх тваіх
Начуе
Яго вялікіх дум разбег?

О, мабыць, не.
Я чую твае словы,
Я чую твой палаючы уздым —
Яны, як радасць песні
Новай,
Даюць натхненне й веру
Маладым.

* * *

Ёсць лепшы свет
Напружнай творчай працы,
Ёсць сонца, песні, ёсць вясна...
Ёсць шчасце йсці,
І верыць,
І змагацца,
І вольнай думкай ў творчасці
Лунаць.

Там дзесьці, на рабфаках
І у школах,
Жывуць другім, напружаным жыццём.
Не хіляць галаў
Нізка долу
І не згараюць
Ў мёртвых пачуццёх.

А тут туман,
Тут пыл сталеццяў душыць,
Тут сум забытых,
Дальніх і чужых...
Тут,
Па-аслінаму падняўшы горда вушы,
Гавораць так,
Што ім абрыдла жыць!

Я знаю іх... Я ім калісьці верыў...
Я іх балота славіць пачынаў,
Пакуль мне
Ў лепшы свет
Не адчынілі дзверы,
Пакуль іх дум,
Іх пачуцця не знаў...

І вось цяпер
Ў напружнай творчай працы
Знаходжу ўсё:
І радасць,
І любоў.
Я знаю шчасце — верыць і змагацца,
Ісці, гарэць, ўпівацца барацьбой...

* * *

Доўга, доўга стаяў пад акном я і марыў.
Беглі хмары кудысьці на поўдзень і ўсход.
Дарагія, як песні, празрыстыя хмары,
Ап’янялі вы грудзі нязнанай тугой.

Захацелася жыць, і імкнуцца, і верыць.
І пражытага раптам мне стала шкада,—
Нехта стукае ўпарта ў дубовыя дзверы,
Нехта просіць мяне сваю песню аддаць.

Уваходзьце усе. Ёсць віно і гарэлка,
Буду ўсіх дарагіх частаваць давідна.
Калі нехта ў жыцці перавёў адну стрэлку,
То нахлынуўшых мук не жадаю кранаць.

Сёння свята маё. Сёння я багацейшы
Ў сотні раз гэтых буйных трывожных людзей.
Не шкада мне для іх, ў барацьбе дагарэўшых,
Ні жыцця, і ні дум, і ні песні надзей.

Ад мяне не пасмее ніхто прыгажосці
Гэтай любай прыроды і песні забраць...
Я між іншых прайду зачарованым госцем,
Беручы, што дае мне мой бацькаўскі край...

## БЕЛАРУСІ

### I

Заспявала ты вольную песню, Айчына,
Быццам нехта з нядолі
Раскуты прыйшоў...
І з любоўю таварыша,
Друга
І сына
Пацягнула к табе ўсёй душой...

О любімая кветка!..
О маці...
О песня!..
Як аддзякаваць?
Як прывітаць?..
Ты, як лёс твой, нядолі равеснік,
Навучыла тваім,
Ўсёпрымаючым стаць.

Навучыла і жыць,
І змагацца,
І верыць...
Сэрца ў грудзі дала мне, а ў сэрца — агонь.
І пявучую сілу
Сумуючай леры
Я панёс ад чужых берагоў...

Я іду па тваіх пуцявінах-дарогах —
Кроплі сонца,
Бяскрайнасць і сінь у вачох;
І тваё вызваленне
З пацёмкаў былога
Узнімаю, як сцяг барацьбы,
На плячо...

І з любоўю таварыша,
Друга
І сына
Я аддаўся табе ўсёй душой...
Я паверыў у здольнасць вялікай Айчыны,
Пакланіцца у ногі к табе
Я прыйшоў!..

## II*

Дні ідуць, праходзяць і знікаюць
Лістапада сіняй чарадой.
Пакладзецца ўсё жывое камнем
У сталёвым поступе гадоў.

Шлях гранітны й сцежкі залатыя,
Горад пыльны, сінія палі.
Ў непагоду йшлі і кроў не стыла,
Нас агні, агні ўпярод вялі.

І калі сягоння — кінуць камнем,
Кінуць камнем з цёмнага кутка,
Ўсё ж не змеркнуць светлыя жаданні
І не знікне дужасць у руках.

---

* У суаўтарстве з А. Звонакам

Хай скрыгочуць здраднікі Айчыны
З іх бяссільнай злосцю у вачах,—
Наша мэта — дарам не загіне,
І не згаснуць сілы у грудзях!..

Не патухнуць светлыя жаданні,
Кроў не стане ў жылах халадней...
І ў агні палаючых паўстанняў
Край рука чужая не кране.

Пройдуць дні, заменяцца вякамі,
Пройдуць дні мяцежнай чарадой...
Пакладзецца ўсё жывое камнем
У сталёвым поступе гадоў.

## ВАСІЛЮ КАВАЛЮ

### I

Ты прыглядзіся да гэтага рання,
Зноў нахлыне у сэрца спакой.
І ўсё любым і радасным стане,
Пырснуць смехам лілеі ў тумане
Над жалезным паходам вякоў.

Будзе светла і радасна гэтак,
Стане замчышча блізкім такім...
На шырокіх радзімых палетках
Выйдзе дзень, харашэй прыадзеты,
Без праклёнаў, без слёз і тугі.

Выйдзе дзень, і пагасне лучына,
Стол засцеляць абрусам вясны.
Рана збітая горам жанчына
Прывітае цябе, нібы сына...
...І ты скажаш, што ты яе сын.

Потым пойдзе з табою па садзе,—
Там праменняў і кветак нарве
І з трывожным агнём у паглядзе
Скажа: не, ты Айчыне не здрадзіў,
Ў тваім сэрцы йшчэ праўда жыве.

Хутка выйдзе дачка яе, ветла
Запяе аб інакшым жыцці,
Дзе імкнуцца і вольна, і светла,
Дзе над кветнямі любых букетаў
Нават можна і здраду забыць.

Мо заплачаш, мо так адыдзешся,
Ранне згасне, запаліцца дзень,
Над пражытым з журбой усміхнешся,
Не паверыш, што гэта не песня,
І назад будзеш доўга глядзець...

II

Я так доўга блукаў ў зачарованым садзе,
Месяц ласкай сваёю лісты апаліў.
З русай доўгай касою і з болем ў паглядзе
Расказала ты мне нашу тайну зямлі.

Мы пайшлі...
Доўга, доўга ты мне гаварыла.
Гаварыла аб шчасці і долі людзей.
Зноў ў грудзях ажылі жыватворчыя сілы
І трывожныя песні кахання, надзей.

Дарагая мая,
Паглядзі, як над лесам
Дагарэла крывавай тканінай зара,—
Гэта сімвал глухіх і надломаных песень,
Гэта словы кахання, пачуццяў пара.

Я багаты
І песняй сваёй, і юнацтвам.
Ў маёй хаце блакітны варушыцца свет.
Буду сёння над смерцю варожай смяяцца,
Бо інакшая песня да мэты заве.

Я аб гэтым і доўга, і ўпарта так марыў.
Я заснуўшае шчасце сваё абудзіў.
І ўжо шэпча мне нехта з усмешкай на твары:
Не спыняцца нам тут,
А ісці ды ісці.

Мы так доўга блукалі ў квітнеючым садзе,
Месяц ласкай сваёю лісты апаліў.
З доўгай русай касою і з болем ў паглядзе
Раскажала ты мне пра любоў на зямлі.

* * *

Ён адчыніў вакно
І доўга ў сад глядзеў.
Ў душу ўліваўся непакой язміну.
І так хацелася
Да маладых грудзей
Зноў прыгарнуць каханую дзяўчыну.

Прайшла Наташа задрамаўшым садам
І абудзіла сум
Ў яго грудзёх,
І гэты сум
Узварухнуўся гадам,
Каб атруціць юнацкае жыццё.

Ў сваім прыгожым дарагім убранні
Пад ружай дзіўнага заката
Яна прайшла
Якойсьці тайнай зданню,
І ён шаптаў,
Як сімвал шчасця:
— Ната...

Над тапалямі ў прадвячэрняй стоме
Ўзыходзіў месяц

Лесвіцай вякоў.
Ўсё было ціха
Ў гэтым старым доме,
Як у магіле,— ціша і спакой.

І ўспомніў ён былыя захапленні.
І свой фальварак,
Згублены ў палёх,
Сваіх надзей
Святло
І цені,
І успамін на сэрца болем лёг.

І ён казаў: не адчыняй, не трэба.
Не адчыняй акна,
Ні сэрца,
Ні душы!..
Там, ў залатым тумане неба,
Табе, мой любы друг, не жыць.

З тваімі песнямі,
З тваёй душою змрочнай
Пад сум нябёс,
Пад музыку зямлі
Не несці радасць песні іх паўночнай
Ў свае маўклівыя палі.

Яна прайшла мо з злосцю,
Мо з агідай,
І вось ізноў, прыгожая, ідзе...
Ён на спатканне
Ў гэту змрочнасць выйдзе
Ў разгары шчасця,
Веры
І надзей...

Ён зачыніў акно...
Ён стаў каля каміна...
Ён зачыніў акно ад зорных непагод.
І толькі свет
Сваёй Айчыны
Ён патушыць ў сваёй душы не мог.

То быў паэт з блакітнымі вачыма
І з залатою ружай
Галавы.
То для сваёй загубленай
Любімай
Ён краў у ночы кветкі і шыпы...

## ЦІШКУ ГАРТНАМУ

Такім мяцежным, непаўторным
Пяецца горда песнь жывых
І тым,
Хто ўчора ў бурах чорных
Пеў думы-песні маладых...

І я ўстрывожаны...
Я, кволы,
Прынёс табе з радзімых ніў
Напеў бунтоўны і вясёлы,
Якім гарэў,
Якім я жыў!..

Зямля пуцін і раздарожжаў,
Зямля сумуючых раўнін —
Не палюбіць цябе
Няможна.
Я палюбіў цябе, твой сын.

Жыццё, і песні, і змаганне
Праз горкі лёс,
Праз свет надзей
Ў вяках
Паднятым сцягам стануць
Над грамадой жывых людзей.
Дык, непаўторным — свет і слава,
Для непаўторных —

Песнь жывых…
І песнь пральеццца пеннай лавай
З грудзей паўстаўшых,
Маладых!

* * *

За чужое шчасце і любоў,
За чужую радасць маладую
Не сумуй, мой дружа,
Не сумуй,
Не хіліся гордай галавою…

Гасне дзень таемных пачуццёў.
Ах,
Як ўсё вакол зазелянела…
Мы з табой стаміліся вясной
Ад залікаў,
Дружбы
І імкненняў.

Глянь сюды, на жоўтыя лісточкі.
Хто ж іх, хто
Без часу абарваў?
Ах, то сам я песні
І юнацтва
Кінуў ціха ў падарунак дням.

Ах, мой ліст,
Не жыўшы, пажаўцеў.
І яго панеслі, нібы здраду…
Дождж яго,
Як брата, абласкаў,
Вецер ўзяў і кінуў яго з саду…

## М. ДУБОВІКУ

Мне не забыць былыя вечары
І нашы гутаркі пра Байрана і Гётэ.
Мне не забыць
Крывавы смех зары
Над доляю галоднага паэта.

Спяваў раяль.
З блакітнымі вачыма
Жыццё нам кідала пасохшыя вянкі.
Ты гаварыў:
— За шчасце і за край радзімы
Нам не аддаць
Ні сэрца, ні рукі.

А людзі горда йшлі
І горда рвалі кветкі.
Ўпівалі сонца,
Славілі вясну,
І іх надзей былі мы толькі сведкі,
Мы не маглі іх душ закованых
Крануць.

На льдзіне душ ты паскаўзнуўся і упаў.
Заплакаў вецер глуха і трывожна.
Бывай, паэт,
Таварыш,
Брат,
Бывай, жыцця і песні спадарожнік.

Я бачыў кроў,
Я бачыў змрок і раны,
Я бачыў, людзі плакалі ў закат.
І вось затым мо, іх нядоляй п'яны,
Іх, адышоўшых, не заву назад.

Я не заву таго, што адпалала.
Лепш паміраць у росквіце надзей,
Чым несці крыўды горкай джала —
Чужых дарог,
Чужых людзей.

Мне не забыць былыя вечары,
Яны так блізкі сэрцу, так знаёмы.
Я помню, мы пад смех і пад агонь зары
Тушылі сэрца раннія надломы.

## ЦЫГАНКА

Васілю КАВАЛЮ — паэту
зямлі

За вокнамі спевы,
За вокнамі вечар
І радасць зямлі і вясны чалавечай,
За вокнамі смех.
Што ж марыш, цыганка,
На месяц,
На зоры?..
У цыганкі ў душы і сумненне,
І гора.
Цыганка у цьме...
Ёй прысніліся стэп, і дарога
Блуканняў, і сум,
І любоў,
І трывога,
Узрушыўся боль.

Там дзесьці каханак,
Як бронзавы бог,
Спявае пад струны цыганскіх дарог,

Спявае любоў...
Быць можа, цяпер пры агні на закаце
Яе ўспамінае
І бацька,
І маці,
І моляцца доўга і палка удвох,
Каб лёс іх дачку маладую збярог.

І доўга сумуе цыганка увечар
Аб дружбе жывой
І любві чалавечай...
І сніцца ёй стэп
І зялёны прастор...
І месяц над даллю ўстае, бы касцёр.

Што карты?
Што грошы, і крыўда, і боль?
Шырокіх палёў цёмна-сіняя столь
І погляд
Гарачых цыганскіх вачэй,
Што ночы цямней
І што рання ярчэй,
Яе павядуць за далёкі курган
На песні і гульні любімых цыган.

*

Будзе вечар —
Юнак чарнабровы
Над палямі, над ёй, над дарогай
Хмурыць сумна
Маўклівыя бровы,
Сыпаць ў сэрца любоў
І трывогу.

І раскажа цыганка цыганам
(А ў цыганкі
У сэрцы агонь),
Што учора
На сонечным ранку
Ёй сказалі пра новы закон:
Хутка будуць
Ў іх хаты і нівы,
Залатая таемнасць зямлі...

Будзе бераг
Краіны шчаслівай
Ўсіх прыйшоўшых з блукання
Хмяліць...

*

За вокнамі ж спевы,
За вокнамі вечар
І радасць зямлі і вясны чалавечай...
Так марыць цыганка,
Так нікне туман,
Так просіцца сэрца
За дальні курган.

## АДНОЎЛЕНАЯ ЗЯМЛЯ

Паэма

### I

Быў вечар палкіх парыванняў...
Цвіла зара маёй душы.
Быў я ўстрывожаны дазвання,
Я з новай песняй падружыў.

Ў палях успыхвалі зарніцы,
Ў палях праз хмары
І туман
Жывыя песні-чараўніцы
На даўні клікалі курган...

На гонях волі,
На прасторы,
Дзе новы свет жыцця гарыць,
Другія песні,
Смех
І зоры
Прыйшла нам доля падарыць...

Спявай, душа,— крыніца песні,
Жывы узмах арліных крыл.
Ў блакітным ганку
Паднябесся
Ўздымай агонь
Жывых свяцiл...

Руйнуй мінулых дзён галгофу,
Дзе сэрца краю Мураўёў
На жах,
На крыўду ўсёй Еўропы
Мячом Расіі пракалоў.

Пракляцце, кат, табе, і злодзей.
Цябе пракляў
Мой родны край.
Такім, як ты, сказаў ён:
— Годзе,
Даволі сэрца надрываць!..

Так я стаяў,
Так марыў ў нівах
Маіх прастораў залатых,
І ў глыбіні душы шчаслівай
Знікаў туман, праходзіў дым...

II

— Куды ідзеш ты, дзеду любы?
Сядзь-пасядзі, тут родны край...
— О так, сынок,—
Шапталі дзеда губы,—
Прыйшла і наская вясёлая пара.

Прыйшла пара мужычаму разгону.
Ну, што ж, сынок,
То хочаш, пасядзім...
Стары ўжо я...
Зямля старога клоніць,
Зямля дае прасторы маладым.

І пад бярозкай белай на кургане
Мы селі ўдвох:
Я — юны,
Ён — стары...
Закат крывавымі і тонкімі рукамі
Матаў істужку сонечнай зары.

Устрос дзядок сівымі валасамі,
А мне здалося —
Гэта хваль разбег.
— Глядзі сюды, на гэты даўні камень,
Пад ім жыццё,
Пад ім мінулы век...

— Ах, так, дзядок!..
Кажы, кажы, мой любы,
Я рад падслухаць сэрцам маладым,
Аб чым раскажуць ласкавыя губы,
Аб чым раскажаш
З захапленнем ты...

Ты многа жыў...
Ты многа ў свеце бачыў,
Ты знаў прасторы дальніх берагоў...
Ах, што з табой?
Ты сціх.
Ты плачаш:
Аб чым?.. Чаго?..
Скажы, скажы, чаго?..

І ён казаў нек глуха, нек забыта:
— Ты малады:
І мо не ўцяміш ты
Усё, што сэрцам гордым перажыта...
І расказаў жыццё сваё стары.

III

Меў я панурую хату,
Ў хаце ж —
Нядолю вякоў.
І з ёю быў лёсам закляты...
Звалі мяне мужыком.

Хворая жонка...
А дзеці,
Дзеці па свету пайшлі.
Лёсу чужога іх вецер
Ў дальнія кінуў палі.

Дзе яны, кветкі краіны,
Кветкі жыцця і вясны?
Вецер хаўтурыць ў даліне,—
Значыць, памерлі яны!

Я не сумую.
Я — горды.
Толькі душа, як арган...
Лье ў мае думы акорды —
Смерці...
Нядолі
І ран.

Сёння табе раскажу я,
Што не стварыць,
Не вярнуць
Повесць змагання жывую,
Дзіўную повесць адну.

Быў мой Антось на заводзе.
Сын мой —
Рабочы-гарбар.
Меў ён пашану
Ў народзе,
Як правадыр і бунтар.

IV

Як цяпер я помню — хмуры быў завод...
А благі дырэктар
Ў сотні раз хмурнейшы.
Быў ён кат-зладзюга
І нягоднік першы,—
Пра яго казаў так будаўнік-народ.

Горкі і нікчэмны
Быў там хлеб рабочы...
Быў абмыт крывёю й горкімі слязьмі.
І прыйшло другое,—
Хтось сказаў аднойчы:
— Досыць мы цярпелі,
Гнулі спіны мы.

Паўставайце, брацці...
У пустэльні свету,
У пустэльні свету дзікай і глухой
Адшукаць павінны
Мы жывую мэту
Дарагіх і блізкіх, светлых берагоў.

Гудзеў завод, рамні спявалі,
І пад машынны
Дзікі шум
Жывыя словы замiралі,
Віхурай ранілі душу...

Кіпела сэрца бурна,
Ўпарта,
І вось дырэктар увайшоў
І пад агонь насмешак-жартаў
Ён гаварыў,
Як кат,
Як воўк...

— Чаго сышліся, чэрці-гады?!
Пайшлі адсюль!
А ты, а ты...

Ты зноў бунтарыць?!
Ух, пракляты!
Ты што ж— іх бацька,
Іх святы?

Не сцярпеў Антось мой…
Размахнуўся горда,
Размахнуўся горда і, што стала сіл,
Садануў дырэктару
У свіную морду
Ўсю агіду й крыўду, што ў грудзях
Насіў…

V

Прыйшлі душакрывы. Забралі яго.
Забралі яго і з сабой павялі.
Кляліся навек пазнаёміць з тайгой,
З сцюдзёным прасторам
Сібірскай зямлі…

І білі,
І строілі кпіны над ім.
І горка так сэрцу рабілася, горка.
Хацелася
Здзекі пусціць іх на дым,
Парваць
І парушыць іх злую гаворку…

І вось пасадзілі…
За белай сцяной,
Дзе крыўду з маной называлі братамі,
Ён віў
Беларусі любімай вянок,
Ён цвёрды быў сэрцам, як камень.

Нядоўга яму давялося сядзець…
Зямля аблілася
Крывёю навалаў:
Ў агні захаплення

І творчых надзей
Бунтарная сіла паўстала.

Ён выйшаў на волю...
Эх, воля...
Эх, свет,—
Жаданая мара стагоддзяў.
Ўжо тысячы год табе верыў сусвет.
Была ты і чыстай, і светлай
Ў народзе...

VI

Неба пажарам фарбована.
Панству, нядолі —
Капут.
Усё, што струхнела,— зруйнована,
Усё, што душыла,—
Не тут.

Час навальніц і пажараў.
Г-гэх!
Разыдзіся, душа!
Чорная ноч і варожыя хмары.
Нейчы прыдушаны шаг.

Мерзнуць пад плотам
Мінулага цені.
Плот пахіліўся,
Прылёг...
Неба адзета ў пажараў адзенне,
Новы пяройдзен парог.

— Пана павесіць! — крычалі сяляне.—
Панскі маёнтак —
Спаліць.
Смерць і праклён
На жыццёвым экране,
Вечная крыўда зямлі...

Вогненнай лавай кранулася вёска.
— Зрушым маёнтак! —
Буяніў Тамаш...
— Стойце!
Хвіліну...
Вы п'яныя ў дошку!
Пана павесіць, маёнтак жа наш!

Гэта здабыта рукамі працоўных.
Гэта сваё,—
Гаварыў так Антось...
— Што ж, за маёнтак ты?..
— Так, безумоўна!
Нам ён патрэбен...
— Досыць іржавых атос!..

Вогненнай лавай кранулі сяляне,
Выбухнуў крыўды вулкан.
Смерць і праклён на жыццёвым
Экране...
Усе, хто пакрыўджан,— ўзніміся!
Паўстань!..

VII

Ляцелі дні... Прыйшлі чужыя людзі
Ўчыніць апошні суд,
Суд не на смех.
— Хто бальшавік у вас тут будзе,
Хто супраць нас, скажы,
Паўстаць пасмеў?

— Адкуль мне ведаць, любы мой паночку,
Ўжо, мабыць, той,
Ну, як яго... Антось...
— Дзе ён жыве?
— За мною.
— Точка!
Вядзі, скажы, што сябра,
Госць...

Прыйшлі і вось — абшарылі ўсю хату...
— Скажы, стары, дзе сын твой?
— Тут няма.
— Ах, вось як!
Ўзяць яго!
Ах, чорт пракляты!..
Спаліць усё, ў сівы пусціць туман!..

І занялася хата дзіка й палахліва...
Упала жонка ў ногі к падляцом.
— Даруй, панок.
— Ўставай, халера!..
Жыва!
Не то цябе услаўлю бізуном.

З журбой вачэй —
З глухой пустэльнай,
Дзе не было ні кветак,
Ні травы,
Яна пайшла, як з горкага пахмелля,
Схіліўшы сумна ружу галавы.

Я быў ў экстазе помсты
І адплаты...
Ў душы магіла...
Сэрца, як арган...
Ў руках крывавага і дзікага заката
Сачыўся лёс рабочых і сялян!

VIII

Быў вечар дзікі, расстраляны...
А лес шумеў.
А лес шумеў.
Здушыўшы смерць ў душы нагана,
Стаяў паўстанец —
Сам, як смерць.

...Сюды прыйшлі шукаць ратунку
Сыны лясоў,

Сыны балот.
І вецер ўзяў іх пацалункі
Аддаць зары ў чырвоны рот.

І раптам —
Крыкі,
Плач
І стогны.
У небе дым, агонь і кроў.
Хвіліна —
Й лес адзет трывогай...
— Браты, нас паляць! Марш ўпярод!..

І вось сышліся... Рвалі... білі...
На момант месяц выйшаў з хмар...
І я пабачыў —
Сын мой мілы,
Ад кулі ўпаўшы, паміраў.

Рвануўся я душой з-за кратаў.
Душы няма ніякіх крат!
І я адчуў
Ў той дзень пракляты,
Аб чым шаптаў і пеў закат.

Мінулі дні...
Прыйшло другое...
Краіна стала ажываць...
Адным,
Бунтуючым прыбоем
Мы выйшлі край свой вартаваць!..

Зямля не скрыўдзіць,
Не пакіне,
Зямля — наш дом, з нас кожан госць
У новай
Сонечнай краіне,—
Шкада — не можа жыць Антось.

IX

Схіліўся дзед, і срэбра кудраў
Упала хваляй
На плячо.
Ў яго вачах сталеццяў мудрасць...
Агонь і сум
Ў яго вачох.

— Табе шкада, дзядок, памершых?
— Як не шкада?
Шкада, сынок.
Бывае,
Сэрца ў шчасце верыць
І веры тухне аганёк!

Ну, мне пара...
Мяне чакаюць...
Пагас за лесам водбліск дня...
І ён пайшоў...
Ўдалі змаўкалі
Яго шагі.
Ён патанаў
У змроку ночы.

Ўдалі за гаем
Загучала
Няйначай песня — рос уздым...
І ўсё тут
Мэту абуджала
Быць вечна чыстым, маладым!

І я пайшоў...
Дрыжалі цені...
Ўставаў над возерам туман...
Ў агні
Бунтоўнага натхнення
Душа спявала, як арган...

І я пайшоў — палёў бяскрайніх,
Вясны бяскрайняй
Ўзяць агонь...
Вітанне ж, родны край, вітанне
З жывых і родных берагоў.

## ПРЫ ДАГАРАЮЧЫМ КАСТРЫ

Дагараў наш касцёр,
Рассыпаліся іскры,
Лес аб нечым пражытым
У трывозе шумеў,
Раптам недзе за рэчкаю
Уз'енчыўся выстрал,
Нехта здушана крыкнуў
У атручанай цьме.

Мы ўсхапіліся, слухалі
Доўга і ўпарта:
Нехта плакаў, крычаў
І ламаў сабе рукі.
Патухаў наш касцёр,
Разбягалася варта,
Сэрца сціснула ноч
Сваёй чорнаю мукай.

Ты тады падышла
І дрыжачай рукою
Паказала на ўсход,
Дзе ўставала зара,
Дзе ў жалезную ноч
Ў гэтым вечным спакоі
Нехта йшоў не цягнуцца,
А жыць і згараць.

Ён ішоў устрывожаным
Раненым зверам,
На шляхох сваіх кідаў

Пажары і смерць.
І вось я ў яго моц
Ўсёй душою паверыў,
Я адзін толькі
Смеласць юнацкую меў.

— На, бяры, раздзірай
І цягні мае жылы,
Распінай, калі трэба,
Душу на крыжы,—
Хай памру, але холадам
Брацкай магілы
У легендах і песнях
Пачну тады жыць...

Ну, а ты... Ты такая ж
Пустая, як ўсе тут,
Ты не знала й не знаеш
Адважных людзей,
Мне вядома ў жыцці
Твая пошлая мэта —
Непрыкметна цягнуцца
Туды, дзе цяплей!

Дык ідзі, ты ідзі!..
Убірайся ты к чорту!..
Тут мяшчанская спальня,
Там свет і агонь.
Я сягоння другі,
Я бязлітасны, горды,
Не прыбіты, не здушаны
Чорнай тугой.

Я ўжо чую, ўжо блізка!..
— Чаканае блізка!
Чуеш крыкі і песні
Паўстаўшых рабоў?
Гэта наша жыццё,
Гэта наша калыска,
Гэта наша паэзія,
Шчасце, любоў!..

## 1929

*І зноўку пройдзе караван,*
*І бераг мора будзе біцца.*
*Жыццё, як мора-акіян...*
*А лёс мой — віхар-навальніца...*

### ЖЫЦЦЁ, ЯК МОРА-АКІЯН

Жыццё, як мора-акіян...
А шчасце — бераг дальні...
Ідзе ў пустэльні караван
Пад гукі ветраў пахавальных...

Цвітуць ў Італіі сады...
І сонца там, і мора бліжай,
І ты глядзіш з журбой туды,
Над даллю рукі ўзняўшы крыжам.

Хмяльней там дзікае віно.
І там гучней гудуць факстроты,
А мне, мой дружа, ўжо даўно
Абрыдла ўсё, нат воблік цноты...

Шчаслівы я, што тут жыву.
Й за гэты край вясной вялікай,
Быць можа, знімуць галаву,
Праколюць цела вострай пікай.

Дзе песні новых дзён гудуць
І сцяг праменіцца саветаў —
Другія творцы павядуць
Наш край да ленінскае мэты...

І ты, быць можа, скажаш ты,
Што любіш ты, і не забудзеш,
І ўсіх зямных краін сады
Мне прынясуць вянкі на грудзі...

І зноўку пройдзе караван,
У бераг мора будзе біцца.
Жыццё, як мора-акіян...
А лёс мой — віхар-навальніца...

Што ж мне Італіі цяпло?
І той спакой, і сонца поўдню?..
Пад родны скрып тваіх калёс
Я песні родным сном напоўню!

* * *

Сягоння сонца ўстала маладое
І запалалі золатам снягі.
Спаткаць вясну
Мы выйдзем грамадою,
Адной сям'ёй братоў і дарагіх.

Былі віхуры,
Ветры,
Завыванні
Галоднай зграі
Здраднікаў-ваўкоў...
Ірваўся край у муках
І у ранах
Да светлай мэты будучых вякоў.

І выйшла ты таварышам
І братам,
Ты несла сцяг
Вялікай барацьбы...
Ты памірала ў рогаце гарматаў,
І кожны крок
Табой залечан быў.
І вось такой

Мы сёння спатыкаем
І новы дзень, і новую вясну...
Таварыш, дружа, дай руку — вітаем
Цябе і нашу старану!

* * *

Перада мной напружаная зала
Ў чаканні слоў бунтоўных і жывых.
Вам, хто прайшоў Кастрычніка навалы,
Не вешаць долу гордай галавы.

Ўстае вясна ў разгары светлых гімнаў,
І чэзне дым з жыццёвых берагоў...
Вас шмат такіх — і ласкавых, і дзіўных,
З мяцежным сэрцам, грубаю рукой...

Я вам прынёс, бунтоўным і вясёлым,
Напеў палёў шырокіх, залатых,
Дзе ў новы час, ў разгары новай долі
Жыццё па-новаму красуе маладых...

Вакол так многа веры, парыванняў,
Так многа песняў сонечнай вясны.
Дык, дарагія, любыя, — вітанне
Вам сына новай стараны...

Сціхаю я... Ў грудзях не ціхне бура.
І ў зале выбух сотні галасоў...
О, я таксама з новаю культурай
Іду адною з вамі паласой,

Каб несці сцяг змагання, перамогі,
Гарэць імкненнем юных і жывых...
Які уздым! Як сэрца б’е трывогу!
Як горда ўзнята ружа галавы!..

## ВОСЕНЬ

Там, дзе ў полі ззяюць росы
І па начах ўстае туман,
Радзіўся
Дзень светлавалосы
І мой наіўнейшы
Раман.

Яе знервованыя пальцы
Прайшлі,
Як сон, па валасох...
О, восень
Ў вобразе бенгальца
Мудрэй,
Як мудры Саламон!

Вакол крывавыя пажары
Прымушан вецер
Раздзьмухаць,
Бо ўсё ж
Асеннія абшары
Не хочуць сэрцам паміраць.

Шумі,
Спявай,
Прывольны вецер,
Не жабраваць табе ў палёх.
І можа быць, ізноў,
Паэце,
Напомніш ты ягоны лёс..

Было даўно...
Ў прасторах свету
Такой жа восеньскай парой
Ішоў без песні
І без мэты
Дзень,
Акрываўлены зарой...

Быў я малы
І сэрцам кволы,
А год галодны і глухі,

І людзі падалі
Да долу,—
Лісты і людзі — мерцвякі.

Сабакі грызлі чалавека,
А чалавек —
Падчас сабак.
Звяры
Прыходзілі аднекуль
На гэты
Вымушаны баль...

А восень кідала чырвонцы
Пад ногі ветру
І жальбе,
Каб па нямеючай
Старонцы
Прайшла зімы і смерці бель.

Каб заглушыла рогат
Жаху
І трупы ў саван свой ўпляла:
Зямлю,
Лясы,
Даліны,
Дахі,—
Ўсю гэту змучаную даль...

А людзі йшлі...
Яны палалі...
І горда верылі ў жыццё,
І на палях,
На морскіх хвалях
Няслі агонь,
Запал
Ў грудзях...

Кастрычнік...
Выбухі гарматаў...
Зямлі смяротны непакой,

А ўсё ж
Разбілі мары
Катаў
І здзекі згубленых вякоў.

Хлапчынка стройны й кучаравы,
Не разумеў я гэтых спраў,
І ад Масквы
Аж да Варшавы
Наіўным вокам пазіраў

На карту бойкі
Векапомнай.
І міліённы гул
Гармат
Здаваўся мне
Душой бяздомнай,
Што сонца вырвала з-за крат!

Сягоння восень
Ўжо не тая,
Не той кастрычнік сцеле ліст.
Сама,
Як воля,
Маладая,
Як лепшай долі
Цымбаліст,

Фарбуе вуліцы сталіцы
Ў святло
Квятлівістых надзей...
Сягоння
Восень-чараўніца
Прыйшла вітаць наступны дзень.

І сёння я другі...
Я новы...
Пачуў з палаючых раўнін
І вуліц гул,
І шум дубровы,
І песні новыя турбін.

І зразумеў я ў шуме ветраў
Прастор зямлі
І ўсіх марэй,
Тут будзе
Горад-сад
Сусветны —
Адна краіна — СССР.

І наша восень не навее
Халодных вобразаў
Жальбы,
Дзе людзі гінулі
Ў завеях,
Ў агні вялікай барацьбы.

## ПАЎЛЮКУ ТРУСУ

Ну што сказаць?.. Ну як паверыць?..
Журбой вятры спавілі даль.
І стала раптам
Біцца сэрца,
Нібы закутае у сталь...

О, дружа блізкі і далёкі,
Пад крыкі сумных журавоў
Упаў на дол,
Як ясны сокал,
З разбітай лёсам галавой...

Крычыце, буры і пажары,
Хаўтурны марш, ўзнімай агонь...
Памёр паэт...
Памёр таварыш...
Упаў на полі верны конь!

Шумяць палі...
Бунтуюць хвалі...

І сумна слёзы лье сасна…
Няўжо ж цябе мы
Пахавалі?
О… Нашай лірыкі — вясна!..

Няўжо не восеньскімі днямі
І не пад
Чэрвеньскай зарой
Ты і спяваў, і жыў між намі,
І раздаваў сябе парой?

Бывай жа, друг… Вясною ранняй,
Такой жа светлай, як і ты,
Прыйдзе з табою
На спатканне
Твой вобраз сумнай сіраты —

Алеся з кветкамі
І лірай,
І на зары ў шырокі свет
Табе па-брацку
Скажа шчыра,
Што ты сапраўдны быў паэт…

І прыйдзем мы…
І зложым гімны…
Памёр паэт… Агню няма…
І вось пад гэты боль
Нястрымны
Хтось скажа: жыў ён не дарма.

Хачу партрэт у чорны колер
Ўзяць, а у душы,
Нібы праз дым,
Твая прыснілася мне
Доля —
Жыць і памерці маладым!

Згасае лямпа…
Ў сэрцы цёмна…
Скажы, о брат, скажы, нашто

Я сніў цябе
І сніў твой помнік?..
...І ўжо далей ніяк не помню,
Як слёзы ўпалі над лістом...

## МУЛЯР

Паэма

Ах, чаго так месяц хмарай прытуманены?
Што ж ты прызадумаўся, раскудравы мой?
Ці аб маладосці, крыўдамі параненай,
Ці аб вечнай тайне мудрасці людской?..

Не катуй без часу юных і бунтуючых
І не блытай сцежкі к светлым берагам...
Маладосць ахвярам і любві даруючы,
Будзь такім жа светлым і харошым сам...

На бунтоўным моры чалавечых мараў
Сёння творуць шчасце новае зямлі,
Каб мільёны фабрык ад агню і пары
Да энергій сонца перайшлі...

Каб ў палях, абведзеных залатымі сцежкамі,
Каласіўся горда вечны ураджай.
І каб людзі сёння з залатымі ўсмешкамі
Не былі братамі смерці ды крыжам.

### 1. ДРУЖБА І РАЗДАРОЖЖА

Ліпнёвы вечар дагараў
Ў абдымках ласкавых і кволых.
І тонкагубы вецер граў
Над даллю ніў, палёў і сёлаў

Такою дзіўнаю гаворкай,
Такою ласкавай красой,
Як гэта даль, як гэта зорка
Над гэтай буйнай паласой...

Хтось кінуў ружы на закаце
Жывой і сонечнай рукой,
І, нібы казачная маці,
Ноч навявала ім спакой.

Ў адзенне змроку і забыцця,
І сну, бяссоння і трывог
Сюды прыходзіў пазабыцца,
Хто пакахаць, хто верыць мог...

І я праходзіў той дарогай,
Я сэрца нёс ахвярам дню.
І ў ім было так многа, многа
Жывых надзей, навал, агню,

Імкненняў радасных і палкіх,
Узлётаў зор, гарэнняў сіл,
Што і цяпер яшчэ, як змалку,
Жыцця шукаю між магіл.

Было нас двое — я і Нюрын...
Гарэлі разам, разам йшлі
І над адным вялікім мурам
Глыталі вапну, пыл зямлі.

Былі братамі, дружбу мелі,
Шукалі зорных вечароў,
Дзе стан бярозкі белацелай
Падпаясаны быў зарой.

Прайшло нямала дзён за працай,
Нямала сноў аднесла ў дым...
І нам, як ранне, маладым,
Хацелась верыць, што ў палацах

Мы будзем жыць — мы ўладары...
Ах, гэтых мараў не закрэсліць, —
Яны, як мора на зары,
Будзілі сонечныя песні...

Аднойчы мы ў разгары рання
Былі высока над зямлёй.
Хістаў пад намі рыштаванне
Буй-вецер цёплаю рукой.

Абліты глінаю і вапнай,
Я сонцу гімн тады злажыў...
Было так хораша, так трапна,
Бы сад расцвіў у маёй душы...

І над пустэльняй воч туманных
Ўзыходзіў новы край зары,
І, песняй сонечнаю п’яны,
Я новай мовай гаварыў

З прыродай юнай і багатай,
З красой прастораў залатых,
З разлівам хваль крыві заката
І з палкім сэрцам маладых.

Гудзеў трывожна шумны горад,
Гул узрастаў, як акіян.
Я да яго ішоў прастораў
Без болю, крыўды і без ран.

Я успрымаў яго стыхію
Стыхіяй юных сіл сваіх...
І сніў аб кветках дарагіх я
На пыльных плітах гарадскіх.

Я кідаў працу, кідаў дружбу...
Я адлятаў душой у дым.
І словам вольным і напружным
Пеў гімны славы маладым.

А Нюрын горка і жалобна
Ківаў мне буйнай галавой.
І з мэтай ласкавай і добрай
Выказваў погляд шчыры свой…

**Нюрын:**

„Глядзі, браток, не памыліся,
Разгубіш шоўк сваіх кудрэй.
Пагаснуць вочы, ў п'яных мыслях
Пачнеш клясці жыццё і смерць…

Няма нідзе вялікшай праўды,
Як праўда працай жыць сваёй,
І вось чаму зусім не праў ты,
Што верыш мэце той пустой…“

Што адказаць я мог на гэта?
Кіпела сэрца, як вулкан,
І вера ў свет, ў прасторы свету
Мне гаварыла: быць паэтам —
Не значыць жыць разгарам ран.

Я слухаў гул людскіх жаданняў,
Я кветкі рваў, я браў вянкі…
І я пайшоў ў тумане п'яным
Ад сэрцу любых, дарагіх
Туды, дзе бачыў свет пазнання
І светлай долі берагі.

## 2. НАШЫ СЦЕЖКІ

Разышліся дзве дарогі,
Разышліся ўдаль.
Ўсталі хмары-крутарогі,
Загуло разводдзе хваль.
Па дарогах тых ды сцежках,
Дзе туман ды пыл,
Залатыя ружы ўсмешак
Не адзін там сэрцам піў…

Не адзін адходзіў з помстай
Ў золата дарог.
К новым дням, жыццю, знаёмствам,
К новай долі на парог...
І браты на тых дарогах
Пад вятровы вой
Йшлі з агнём жальбы й трывогі
Бараніць край родны свой...

*

Вось так і мы,
Пад залатым убраннем
Жывой і ласкавай начы,
Пайшлі шукаць прастораў рання,
Дасюль нязнаных далячынь.

*

У нас па вёсках русакудрых,
Дзе новы быт ужо ўстае,
Пяюць на даўні лад. Не мудра,
Бо новых песняў не стае.

Пяюць аб здрадзе, аб магілах,
Як крыўдзіць пан сваіх сялян.
Што нікне вера, тухнуць сілы,
І сэрца змучана ад ран...

А паглядзіш, то колькі сілы,
Якая моц! Якая моц!..
Што сталь растопленая ў жылах,
Пульсуе кроў... О, любы мой!

Там, на палях маёй Айчыны —
Вялікай мацеры маёй, —
Часамі сонца дарма стыне,
Не скарыстанае зямлёй!

Дзе узрастаюць людзі сонца,
Патрэбны песні новых дзён,

Каб па абуджанай старонцы
Прайшоў надзей і дум цыклон...

О, любы мой! Пад песні волі
Лягчэй тварыць і будаваць.
Нам трэба сонечнае поле,
Каб і самім, як сонца, стаць...

І я пайшоў шукаць той песні,
Вялікай музыкі жыцця,
Ў вачах з бунтуючым прадвеснем
І з сцягам волі на плячах.

*

Гэткі свет, бунтоўны свет і сіні,
Гэткі свет — таварыш навальніц.
Аддалі усё мы для краіны,
Каб агнём яе жаданняў жыць.

Вырывалі сэрца юнымі рукамі,
Каб ярчэй і радасней палаць.
Колькі песняў спета па-за намі,
Не адзін збудованы палац...

*

Шумела сталіца вясновым разводдзем,
Муры за мурамі ўзрасталі жывей.
Час бур, навальніц і руінаў праходзіў —
Залечвала раны краіна свае...

Звон малаткоў... Размахі кельні...
Жывой рукой ў глушы пустэльні
Узняты волаты-муры...
Дзень устаюў у кветках вапны,
І, быццам мора, ў час зары
Дзевяты вал нясло на лапах
Жыццю паўстаўшых падарыць...

І Нюрын там, як волат-муляр,
Ў сям'і ўзрастаючых муроў
Для іх аддаў пачуццяў чуласць
І маладых жаданняў кроў...

Шумела сталіца вясновым разводдзем.
Муры за мурамі ўзрасталі жывей.
Час бур, навальніц і руінаў праходзіў,
Залечвала раны краіна свае...

*

Вечарамі ў пасёлкавым клубе —
Гульні, смех і гармоніка ўсхліп.
Там страчаўся ён з блізкай і любай
Камсамолкай Наталляй Кулік.

Стала праца вясёлай і светлай...
Мэта знойдзена, мэта жыве.
Дзень праходзіў з усмешкаю ветлай
І з праменнем расы на траве.

Ў вечарох нарадзілася шчасце,
Вечары сагравала любоў...
І што ім даставалася часта,—
Мне прыносіла крыўду і боль.

Я пайшоў між туманаў і цемры.
Я шукаў залатых пуцявін.
І параніў я ногі аб крэмні,
Аб граніт і цэмент маставых...

## 3. ПАДЗЕІ РАЗГОРТВАЮЦЦА

Надрыўны боль. Так ціха ў полі.
І з болю месяц акалеў.
І не стрымаць нам злога болю,
І не пусціць яго на лес.

Цяпер няма нідзе прыпынку...
Дзе ж родны дом маёй душы?

За хлеба чэрствую скарынку
Няўжо я мучыўся і жыў?

Не тое, не!.. Ў прасторах свету,
Ў палях краінных і чужых
Я гадаваў жывую мэту
Надзей вясёлых і жывых.

Я сумаваў па вочах любай,
Па дружбе сэрца і надзей,
Мяне ж ніхто не прыгалубіў
Сярод тупіц і між звярэй...

З балота бруду і мяшчанства
Ўсё ж бачыў полымя зарніц.
Я гадаваў ў сабе паўстанца
І новым дням схіляўся ніц...

І можа, так, што ўчора стала,
Што я імкнуўся да людзей,
Я пакахаў тады Наталлю
Ўсёй сілай песні і надзей.

*

Спаткаўся з ёй ў зялёны вечар,
І словы дзіўныя казаў
Аб дружбе палкай, чалавечай
І пра пачуццяў дзіўны сад...

„Дзяўчына мілая, дзяўчына любая,
Табой ўсхвалёваны, табе кажу,
Калі сягоння шчыра прыгалубіш ты, —
Аддам табе ўсё сэрца, ўсю душу...

Дзяўчына светлая, пачуццяў зоранька,
Агонь у сэрцы ў юным засвяці,
Я стану, любая, такім жа скоранька,
Такім жа светлым, чыстым у жыцці...“.

Быў падфарбован ласкай вечар.
Ах, вечар быў ў яе вачах...
Нашто ж я браў яе за плечы
І слухаў дрож крыві ў плячах?..

Дрыжалі далі у майскай стоме,
І ў стоме сам я ўвесь дрыжаў...
„Не гавары, Валер... нікому...
Так, проста... К дому праважаў...“

*

Закруціліся дні і тыдні,
Па дарогах развеяўся пыл...
Часта, часта ўставалі злыдні
З сутарэнняў жывых магіл.

Разбівалі надзеі і думы.
І не раз я ужо шкадаваў,
Што ударыў па ласкавых струнах
І што з працай, мне блізкай, парваў...

Эх, песня, душа-заранiца,
Не з сонцам яна узышла...
У бурах жыцця, ў навальніцах
Сама навальніцай была.

Радзілася ў муках і стогнах,
І мукі радзіла другім,
Як хмара, над зорным парогам
Туманіла зор берагі.

Палалі і падалі зоры,
І сам я за імі ляцеў
Туды — ў невядомае мора,
Ў вялікае мора надзей...

Закруціліся дні і тыдні.
Ў гэтых днях зноў да працы прыйшоў...
Толькі дзіка смяяліся злыдні
Над маёй накіпелай душой...

*

І пакрыўдзіла горка яна,
Насмяялася... Плюнула ў сэрца...
Дагарала і нікла вясна
Пад чыюсьці сімфонію смерці.

І тады пра каханне і смерць,
І пра крыўду не раз гаварыў...
Халадзей пела зорная медзь
Пад удар языкоў зары.

Я пайшоў зноў шукаць вясны...
Толькі з крыўдай і помстай пайшоў.
Гэтак горда праз дым, палыны
Насмяяўся над здраднай душой.

Я спазнаў, што ні кроку назад.
Крок назад — і насмешкі і здрада.
І пайшоў я паэмы складаць
Пра каханне, юнацтва і радасць...

А яна у адплату, у здзек
Наманіла-збрахала другому:
„Гэта брудны і злы чалавек,—
Яму ўсё, што варожа, знаёма...“

Пахла мёдам і свежым укропам...
Ў цвеце сад залаты патанаў...
„Дарагая,— ці ж гэткай нядобрай,
Я ж ці гэткай, ці ж гэткай шукаў?“

## 4. ТВАР ДА ТВАРУ

Дзе няма ні руху, ні спакою,
Дзе адны каменні ды крыжы,
Любы мой, вясёлаю рукою
Дагарэўшых сэрцам не тушы...

Толькі там жыццё, дзе рух і палыханне,
Толькі там ідуць супроць жыцця,

Дзе ў руках жывога парывання
Дагарае першая свяча.

Чэзне дым, знікаюць перашкоды,
Колькі ж сноў загублена у дым...
Шэраг год жыццёвай непагоды
Замятае дальняга сляды...

Ах, людское сэрца ўсё ж машына,—
Ёсць агонь — трапечацца яно...
Вось чаму за любых, за Айчыну
Часта п’ем і роспач, і віно...

Ну, даволі... Што загаласілі?
Хай падчас я падаў і хварэў, —
Я ўцякаў ад холаду магілы,
Я агнём жаданага гарэў.

Не шукаў мяшчанскага спакою,
Не каменняў чэрствых і крыжоў,
Не душыў юнацкаю рукою
Тых, хто ўдаль да лепшага ішоў!

*

Ён спаткаў мяне злосным і дзікім,
Словы злосныя кідаў у твар.
Ўсё былое, ўсё светлае нікла:
І сяброўства, і свет, і запал...

І тады мне да болю, да мукі
Захацелася праўду душы расказаць.
А ці ж ёсць вось такая навука,
Што вучыла б квітнеючым стаць?

**Слова мне:**

„Паслухай, Нюрын, любы дружа!
Жывем мы толькі раз ў жыцці.
Мы, абагрэтыя культурай,
Аб блізкіх думаем не дужа,
Таму не можам расцвісці,

Як сад пад песнямі зімы.
Ў хвіліну крыўды, ў змроках суму
Шукаў я шчасця светлых сноў...
Я знаў надзей жывую думу
І песні майскіх берагоў...

Дык слухай, браце, слухай, любы,
Я ў ёй шукаў вялікіх спраў...
Я ж памыліўся да загубы
І справу дрэнную сыграў...

Не вінаваць... Не трэба гэтак.
Я расказаў табе, як мог...
Я бачыў ў ёй праменні свету
І нібы гэты свет бярог.
Яна ж была — ўсё для паэта,
А муляр я — ёй быў далёк...“

*

Пахіліўся ён ціха да долу.
Засмучэнне на вусны лягло.
Ў хмарцы курчыўся месяц ад болю
І скацілася зорка далоў.

Было многа напеваў уночы,
Было многа уночы зарніц.
Глянуў ён мне ў туманныя вочы
І прамовіў, схіліўшыся ніц.

**Нюрын:**

„Я зразумеў цябе, таварыш.
З нас кожны так падчас гарыць
І ў пачуцці жывых пажараў,
І ў шуме бур і навальніц.

Мы ўсе па-рознаму шукаем
Жаданых, светлых берагоў...
Дык дай забудзем, што мы маем,
І пойдзем зноў рука з рукой“.

*

Ўсё былое, ўсё горкае нікла;
Дым знікаў за далёкай гарой.
Быў той вечар жывы і нязвыклы,
Як дзяўчына пад майскай зарой.

*

Мы зноў пайшлі ў прасторы працы
Змагацца, жыць і будаваць.
Ён краю роднаму — палацы,
Я ж іх, як волю, апяваць.

І вось я склаў паэму гэту,
Чым я гарэў, што успрыняў...
Ляці ж у свет, нясі паэту
І шум, і лаянку ў газетах
На радасць, сум, на гора дня...
Я успрымаю ўсё без краю.
Я рад за юных і жывых,
Яны і сэрцам не згараюць,
І на кастры чужога краю
Не хіляць гордай галавы!

*

Хутка выйшла Кулік з камсамолу...
Абвянчалася з нейкім панком...
І знайшла з ім жаданую долю,
І знайшла сабе цёплы дом...

Былі ночы жаночых абдымкаў,
Нехта грубай і дзікай рукой
Даў прытулак ёй, даў ёй скарынку,
Як і ўсякай бы іншай, другой...

Гаварыла, знайшла сабе шчасце.
Гэта сталы зусім чалавек.
І аб чымсьці ўздыхала так часта
Пад таемныя рухі брывей.

Можа быць, аб былым шкадавала
Ці чыноўніка-мужа кляла...
Ўсё ж калісьці з другімі ішла
Ў залатую і светлую даль.

*

Гудзеў трывожна шумны горад.
Шум узрастаў, як акіян.
Жыццё — я думаў —
Гэта творчасць,
А творчасць — лепшага экран.

*

На гэтых
Пройдзеных шляхох
Нямала знойдзена,
Здабыта.
І з краю смуты і трывог
Ідзем ў край, сонцам
Апавіты.

О, родны край!
Твае палі
Яшчэ аб светлым так не снілі,
Тут буры творчыя
Прайшлі,
Імкненнем сэрца
Запалілі!

На новы шлях
І ў новы дзень
Вядзе нас творчая імклівасць.
Тут горды дух агнём надзей
Палае моцным калектывам.

Тут
Ўсё аджытае на дно
Сучаснасць наша пахавала

З паганскім міфам
Калдуноў,
З азёрнай казкаю
Русалак,

Дзе ноч пакінула вясло,
Лясун заблытаўся у ціне.
Асушым твань старых балот,
І змрок ўзвядзем на гільяціну.

Мы пабудуем светлы дзень,
Дзе новы творца — чалавек—
Дарогай простаю ідзе
Без надламаных і калек...

Мы узнясем святла палац,
Мы ў вокны кінем
Промні сонца,
Каб нашым будучым палаць
І сніць аб будучай
Старонцы...

Там пад праменнямі вясны
Да свету пройдуць
Міліёны,
І аб мінулым успамін
Сатрэцца трактарнай калонай.

І ў новых,
Чыстых гарадах,
Быць можа,
Ўспомняць на хвіліну
Аб нашых ранішніх
Шляхах —
Ў прасторы будучай краіны...

О, родны край,
Твае палі
Яшчэ аб светлым так не снілі.
Тут
Буры творчыя прайшлі,
Імкненнем сэрца запалілі!

## МАЯ ПАЭМА

Васілю ГІНТАЎТУ

Вецер.
Вецер!
Як сэрца забіла трывогу!
Гэта свой,
Ці мо гэта чужы?
Ты скажы мне,
Скажы,
Хто блукае ўначы па дарогах,
Хто фарбуе
Крывавай зарою на сэрцах нажы,
Ты скажы?

Я стаміўся,
Прыціх,
Я не знаю.
Недзе вецер спраўляе
Магільны разгул,
А так хочацца зноў
Упівацца далёкім каханнем
І ў азёрах душы
Захаваць чорнай восені сум
І тугу.

Прыхіліся.
Як роднай, табе раскажу я,
Што я бачыў ў жыцці,
Чым я жыў і што сніў,
Чуеш?
Вецер,
Мне холадна,
Быццам у склепе ляжу я.
Быццам гэта не сон,
А мае непакорныя дні
Пралятаюць,
Дзе вецер зрывае зарніцы-агні.
О вецер,

Вецер,
Мне хочацца жыць!

*

Я стаміўся і сэрцам прадрог.
Ну і чорт!
Зразумець не магу я.
Над аблiччамі цёмных дарог
Я прыпомніў
Сваю дарагую...

Ноч...
І снег...
І нявесела мне.
Ў полі вецер і злосна, і дзіка
Круціць ранены месяцам снег...

Тут на месячных
Шаблях
І піках
Зноў я ўспомніў
Аб светлай вясне...

Зноў я ўспомніў
Аб любай,
Далёкай...
Успаміны... трывога... журба...
...І міжволі намерзлае вока
Серабрыць маладая сляза...

Цяжка мне...
І крычу я ў марозную муць,
Пад зялёныя хвалі праменняў:
— Эгэ-гэ!..
Досыць!.. Сэрцу пара адпачнуць...
Я крычу...
Спатыкаюся...
Я на каленях...

А вакол
Толькі вецер і снег,
Толькі вецер,
І снег,
І мароз,
І з знаёмага лесу ка мне
Выйшлі постаці сумных бяроз.

Вось і бліснуў ў акне аганёк.
— Уваходзь!
Тут душа аджыве.
Мы чакалі цябе,
Мы чакалі даўно,
Што ж ты, ліха тваёй галаве,
Не прыйшоў к нам
Мінулай вясной?..

— Эх, бабуля!..
Я знаю, не ўсё тут расказана:
Мала жыў я,
А многа цярпеў,
Мо затым, што
З душою пакрыўджанай блазана
Голас музы
Пра роспач мне пеў.

Ах, я знаю цяпер,
Што табе не уцяміць
Гэту кроплю
Ў штодзённым жыцці, барацьбе,
Што не плачаш, як мы,
Над пражытымі снамі,
Што не знаеш,
Як сэрца у роспачы б'е,
Калі брат душыць брата
Сваімі рукамі.

Ах, чакай!..
Ты з малітваю зноў
І ізноў з самагонам.

Горка мне за атруту тваю!
Я прыйшоў к табе з горада
З нізкім паклонам,
А цяпер
Зноў павесіў ў туман галаву.

Крыўдна мне!
Зноў я чую тваё нараканні,
Зноў тут пахне струхнелым жыццём.
Дзе ж былыя
Тваё абяцанні
І былога запалу касцёр?

За вакном
Толькі вецер і снег,
Толькі вецер,
І снег,
І мароз,
І зноў горача хочацца мне
Слухаць сумныя песні бяроз.

І зноў ціха і сумна
Гаворыць яна:
— Бачу, й ты ужо з намі
Па-панску,
Мабыць, скажаш
Падаць табе чарку віна?
Не, браток,
У нас сэрца ў крыві,—
Не ў шампанскім.

Тут не горад.
І зноў забываю я ўсё,
За вакном пабялела начная дарога.
Раптам думка:
Зняважыў бабулі жыццё,
Яе мары,
І думкі,
І Бога...

І кажу я з надломам,
З адчаем кажу:
— Эх, бабуля!
Я знаю — не ўсё тут расказана.
На жыццё я па-іншаму сёння гляджу —
Ні з душой дармаеда,
Ні ката, ні блазана!..

*

Ты пытаеш, як жыў і што бачыў
Ў жыцці,
Чым гарэў я і чым захапляўся?
Што ў пакрыўджаным сэрцы насіў,
З чым ішоў
І над чым насміхаўся?

Прад вачмі выплывае ізноў Ленінград.
Ноч, і сінь,
І пажар ліхтароў,
Што як быццам бы выйшлі
К яму на парад
Ад скрываўленых жніўнем дуброў.

О, ці знаеш, ці знаеш,
Як шырак наш свет,
І ці ведаеш ты, што за той вунь гарой —
Маладое ёсць сонца,
Ёсць зор агняцвет,
І што ёсць непакорны народ?

Размяталася хворая ноч над Нявой,
І туманныя цені паўзлі.
Безудзельна,
Вышэй ад усіх галавой,
Рос жалезны асілак расійскай зямлі.

Ах, я знаю,—
Тудою прайшла завіруха,
Там нядаўна зарою крыві напаўнялі бакал.

Толькі вецер
Гарматныя выбухі слухаў
Ды братовае горла
Сціскала братова рука.

Абсыпаліся ружы дзявочых грудзей,
Вочы доўга глядзелі на захад,
Дзе гарматнае мяса каханых людзей
Пажыралі галодныя птахі.

Вецер выў, як і ў гэту вось ноч...
Вецер выў,
Галасіў
І маліўся...
І прасторы, залітыя смерці агнём,
Абрывалі дамы і капліцы.

Праз жыццёвую сцюжу, праз змрок і туман
Толькі вецер над полем,
Як п'яны, хістаўся;
І хварэла душа ад нацёкаў і ран,
Ў грудзі холад магіл
Уліваўся.

А ў раскошных палацах
Магнатаў былых
Надрываліся енкам раялі.
Быццам нехта узбураны, страшны і злы
Праклінаў свой народ
І сухія галодныя далі.

Быццам нехта ў апошні
Прадсмертны свой час
Ўзяў і выхапіў сонца
З туманных вышынь,
Каб прымусіць паўстаўшых баянаў маўчаць
І каб іншых
Душыць,
І душыць,
І душыць!

*

А народ усё йшоў... Усё рос...
Пелі новыя песні паэты,
Што прыйшлі ад сялянскіх самотных палос,
Што прыйшлі
Ад рабочага свету.

Разышлася душа — госць у сонечных дзён,
Вочы сталі напружнымі, сінімі...
І ў Венеры,
На выгнутых туга грудзёх,
Знак любові і здзеку пакінулі!

Потым білі
Нахмураных горда багоў
І Зевеса да столі са смехам прывесілі,
Быццам помсцілі ім
За радзімую голь
Пад усмешку
Забытага месяца...

Эх, бабуля!
Я знаю — табе не уцяміць
Гэту кроплю
Ў штодзённым жыцці й барацьбе.
Ты не плачаш, як мы,
Над пражытымі снамі,
Ты не знаеш,
Як сэрца у роспачы б’е,
Калі брат душыць брата
Сваімі рукамі.

Гэта сон счараваў...
Лепш табе раскажу я
(Сёння хочацца сэрца сваё расказаць),
Як на трупах
Жывых шчэ і мёртвых буржуяў
Пачынаем мы
Шчасце сваё будаваць.
Нешта холадна!..
Можа, запаліш чыгунку.
Фасфарысцэнцыя снегу варушыць мазгі.

Сыпле вецер бярозам
Свае падарункі,
І цалуе, і песціць, і носіць снягі...

*

Ізноў павеяла і блізкім, і далёкім,
Такім знаёмым,
Любым,
Дарагім.
На ўсё глядзець хацелася пагардным
вокам,
Хацелася таптаць
Былога шчасця берагі.

І я глядзеў, як ветла разгараўся
У карунках слёз халодны аганёк,
Як ён шаптаў,
Як рос ён і хістаўся,
Такі вясёлы й малады звярок.

І мне здалося, што я ў родным доме,
Паўзе за вокнамі халодная імгла,
І ў гэтай ціхай прадвячэрняй стоме
Мая любоў,
Мая зямля.

Я чую музыку далёкую і горкую,
Як быццам нехта плача за сцяной,
Як быццам хтось любімаю гаворкаю
Пераклікаецца з вясной.

І, як раней, трывожна і надрыўна
Заве старых стары пабіты звон.
Чаго жадаць, — за шлях пражытага мне
Крыўдна,
Яму — праклён!

Жыццё, жыццё! Дарогі і імкненні...
Вас шмат у тых,
Хто толькі сэрцам жыў,
Хто светлы сон балючага натхнення
Не абрываў
І не тушыў.

Які удар, які удар страшэнны!..
Я нават сам смяюся над сабой.
Няўжо мне так і сумна і так дрэнна,
Няўжо загублены
І шчасце,
І любоў?..

Ах, нездарма — нібы я ў родным доме,
Паўзе за вокнамі халодная імгла.
Ізноў шуршыць пад бокам змятая салома
І прад вачмі далёкі шлях.

*

Ах, так ты слухаеш ізноў?!
Дык слухай добра і не смейся.
Без кіслых слоў і здзекаў над сабой
Я раскажу
Жывое сэрца.

Усе ў жыцці мы верылі й кахалі,
І кожны нашу будучыню сніў.
Мы нараджаліся,
Ішлі і паміралі,
І за братоў гарэлі на агні.

Мы — гэта цені рыцараў-гігантаў,
Мы — гэта міг забытай пекнаты.
Мы — на малюнках Рэпіна і Рэмбрандта,
Мы — гэта песні і цвяты.

І вось затым мо галавы схіляем
Туды, дзе болей свету і цяпла,
Дзе над тужлівымі палямі
Любоў бяспечнай моладзі прайшла.

І я такім жа быў, я ў захапленні
Ўпіваў прыгожасць дальніх берагоў,
І смех начэй,
І песні летуценняў,
І дзіўны вобраз дарагой.

Я бачыў свет, жыццё і дагаранне,
Я бачыў любую карміцельку-зямлю,
І гэта ўсё, як сонечнае ранне,
Як маладосць,
Як родны край, люблю.

Я многа думаў зорнымі начамі,
Я быў адзін, затое гордым быў.
Я на жыццё глядзеў празрыстымі вачамі,
Сын змрочных сноў
І барацьбы.

*

Я захапляўся...
Кволымі рукамі
Махала шчасце мне не аднаму.
Я тых шукаў,
Хто меў душу — не камень,
Я песнь сваю
Хацеў аддаць таму.

І вось спаткаўся з ёй.
Над Ленінградам
Ноч цалавала сцены камяніц.
Яна была, як згубленая радасць
Маіх душэўных
Песняў-навальніц.

Ах, Клара, Клара!
Як усхвалявала.
Ах, як круцілася і млела галава!
І вось тады
З няведамым запалам
Я пачынаў і марыць, і спяваць.

Я славіў ўсё, што мне было знаёма, —
Зямлю вялікую,
І шчырасць,

І любоў,
І змрочны вобраз дарагога дома,
Дзе піў кахання
Песенную боль.

Хто не любіў
Туманнага жадання,
Хто прыгажосці цела не любіў,
Хто не гарэў,
Не верыў у змаганне,—
Той на зямлі
Усё роўна што не быў!..

Я браў усё, прызначанае людзям,—
Блакіт нябёс
І ўсмешку дарагой,
І хай падчас
Палалі помстай грудзі,—
Там жыў любві і шчырасці
Агонь.

Я бачыў свет, жыццё і дагаранне,
Я бачыў любую карміцельку-зямлю,—
І гэта ўсё, як сонечнае ранне,
Як маладосць,
Як родны край, люблю.

*

Глядзі, бабуля, там, на небасхіле,
Як ззяе зорка ціхая адна!
То быццам вобраз дарагой і мілай,
То быццам йдзе да любага яна.

Спявай ты, вецер, радасна і глуха,
Я — сын тваіх прастораў ледзяных.
Я буду доўга, доўга слухаць
Рыданне любых струн тваіх.

Ах, бачыш ты — на полі ўжо світае,
І у душы туманнасці няма.
Зноў наспявае песня маладая
І нікне дум халодная зіма.

Ляцяць пялёсткі снежных пацалункаў…
Я з іх спляту вясне сваёй вянок.
І дум і слоў празрыстыя карункі
Я распалю, як сэрца аганёк.

*

Ах, Клара зноў,
Зноў падышла нячутнаю хадой
І доўга ў вочы мне глядзела,
Як быццам вобраз сэрца
З песняй маладой
Хацела вырваць з маладога цела.

Зноў падышла, і я яе пазнаў.
Ўваскрэслі зноў пачуцці прада мной.
Была вясна.
Адцвітвала вясна
І радасць песні за вясной.

Вакол нас быў,
Як кажуць,
Земны рай…
Пад ласкай зор нямелі каласы.
Далёка дзесьці там, за небакрай,
Свой сум раскідвалі лясы.

Глядзела возера сваім халодным вокам,
Ішоў туман пагрэцца ля зары.
І ўсё было так хораша навокал,
Над чаркай возера,
Празрыстай і глыбокай,
Яна палала ў месячным кастры.

Я на яе глядзеў самотнымі вачыма,
Я жыў агнём, нязнаным для другіх,
І ўвесь дрыжэў,
Як над труной любімай,
Як над пажарам суму і тугі.

Мы прывіталіся надрыўна і трывожна,

Палотны ніў уздрыгвалі парой...
І белы сад,
Як рыцар-спадарожнік,
Ўпіваўся ціхай дзеўчынай-зарой.

Я слухаў песні
Ціхіх парыванняў,
Я іх любіў пад музыкі лістоў, —
Апошні сын
Душэўнага змяркання,
Апошні сын пашаны маладой.

Начныя фарбы дрэмлючых палёў...
Ах, гэта я сваёй рукой
Разліў між хмар
І над зямлёй
Агонь радзімых васількоў.

І я пытаю з нейкаю пашанай
І з нейкай ціхай крыўдай і журбой:
— Дык ты прыйшла
Пад наскія туманы
Піць нашых даляў песні і любоў?

Ах, глянь, як хараша! Няўжо не палюбіла
Вось гэту даль
Прастораў залатых?
Няўжо цяпер
У Беларусі мілай
Другіх краін не разлюбіла ты?

Тут нарадзіўся я ў вячэрнім дагаранні.
Таму й паэтам стаў
Туманных абразоў,
Тут першы раз
Зарніцы палыханне
Ў маіх грудзях пранеслася гразой.

Тут першы раз прачытаная кніга
Глыбокі след
Пакінула ў душы,
І гэты ж месяц,

Сумны, як растрыга,
Галодны сон фантазіі тушыў.

Тут першы раз падслухаў, як спявалі
Парой вячэрняй
Жнеі й пастухі,
Як засыналі жнівеньскія далі
І гэты край, туманны й дарагі.

Тут Каліноўскі — царшчыны ахвяра —
Краіны славу й гордасць старажыў,
І раннем тут
Праз туманы,
Праз хмары
Ёй песню дзіўную Чарот злажыў...

Глядзі сюды — зара ўжо адпалала...
Туман сагрэўся,
Ў возера нырнуў.
Няўжо без сноў трывожных, без запалу
Спаткала ты
І шчырасць, і вясну?

Хадзем уніз...
Там ў прагным захапленні
Мільёны кветак мараць пра любоў.
Ты мне расказвай
Сэрца летуценні,
Я сёння ўпоены прыродай і табой...

І мы пайшлі, абрызганыя пенай
Начных прыбояў месячнай страфы.
Там дзесьці ўнізе фіміям малення
Курыўся ў храме
Кветак
І травы.

З яго прагналі сёння фарысеяў.
Ах, як ўздыхнулі грудзі курганоў.
Тут ад былой,
Скрываўленай Расеі
Мы чуем плач разбітых кайданоў.

Яшчэ ярчэй,
Прывабней сталі зоры,
Бальзам паветра лёсткі рассыпаў,
І над туманнай даллю касагораў
Як наляцеў цягнік, так і прапаў...

Камедыянт, з душой камедыянта,
Бязродны сын упартасці людской,
Ён стаў для нас, як дзіўны вобраз Дантэ
І як прывабнасць дальніх берагоў.

**Клара:**

Ты ўсё такі ж і сумны, і бурлівы,
Я знаю, ў песнях ты не жабраваў, —
Кахання скарб
І светач дзён шчаслівых,
Як дыямент, ў грудзях сваіх хаваў.

Я чула шмат аб вашай Беларусі...
І аб журбе туманных вечароў.
І вось цяпер я перад ёй малюся
Пад скрыпкі зор,
Шыпшыны
І дуброў.

Я ўчора чула вашу „Калыханку“.
Ах, што за песня, —
Дзіўная, як сон!
Язмін душы забытай крывічанкі
І сотні тысяч дзіўных галасоў!

Я знала край ваш ў песнях і у казках,
І я казала:
Сумны Левітан
Любоў зямлі,
І воблакі,
І краскі
З краіны вашай ў фарбы перадаў.

Я шмат была дзе,
Многа я пазнала:
Блакітнасць неба,
Свет і гарады,
І песні бур,
І рокаты навалы,
І ўзлёты хваль на скалы і сады...

А ўсё ж скажу —
Прад алтаром прыроды
(Прад ім душа не здолее маніць),
Што гэту стому майскай асалоды
На жуць зімы
Сягоння не змяніць.

Што дзіўны край ваш,
Дзіўныя прасторы
Падчас краёў славутых прыгажэй.
Што гэта неба, дзе начуюць зоры,
Сапфіру мора, скалаў даражэй!

А вы, паэты,
Смешныя паэты,
Сябе ў краіне роднай не знайшлі,—
Вы ўсё гаворыце
Аб нейкіх дальніх мэтах,
Калі так многа цемры на зямлі.

Што гаварыць!
Ў надворныя палацы
Яшчэ ніхто не здолеў даляцець,—
Тут, на зямлі,
Патрэбны свет і праца,
А не уздыхі змучаных людзей.

Як сонца ёсць —
Ёсць смех і навальніцы,
І дзіўны геній вечна будзе жыць...
За чыстату душы,
За вобраз чараўніцы
Багам мастацтва ў храме іх служыць.

І ты такі ж і смешны, і наіўны,
Няўжо не знаў
Ні свету,
Ні людзей,
Бо спевам горкім роспачы надрыўнай
Да светлых сноў
Ты іх не павядзеш!

Хто у жыцці не жыў, не захапляўся,
Хто, як свяча, без часу дагарэў,
На паўпуці хто падаў і хістаўся—
Той ні сябе,
Ні іншых не сагрэў.

Эх, кінь пустое!
Людзі не каменні,
І камень з часам цягнецца к святлу,
А ты шукаеш ў змрочнасці збавення,
І студзіш ў сэрцы роспачы залу.

Ах, вось мой дом,
Душы маёй капліца.
Прыходзь.
Тут заўтра ўбачыш маладых...
Ужо на сон ноч разляглася чараўніцай,
І, бачу, ёй
Ўжо захапіўся ты.

Бывай, браток!
І сны... І захапленні...
Бывай здароў!..
Імкніся і жыві...

І я ў экстазе дум і захаплення
Не мог падняць туманнай галавы...

*

Я адчуваў ізноў
Прыліў надзей і сілы...
І так хацеў,
Хацеў імкнуцца і гарэць.
Зноў страшны быў спакой і ціш магілы,

Няма адтуль ні выйсця,
Ні дзвярэй.

Так добра тут —
Куды ні пойдзеш,
Усюды знойдзеш сонца над сабой,
І чаркай песні,
Чаркамі пародый
Тут распіваюць шчасце і любоў.

Што ж мне спяваць расстрэленыя песні?
Ім не развеяць роспачы туман.
Тут, на зямлі,
Другое сонца песціць,
Тут нейк умеюць жыць
І паміраць...

*

Радасны гармонік горда заліваўся,
Ў хаце шум гаворкі
Й тытунёвы дым,
І дзядок старэнькі не скакаў, хістаўся
З некім свежым,
З некім маладым.

І лілася песня,
Неба уздыхала...
На шырокай волі зорных берагоў
Гукі песні ночка успрымала,
Гэтай стомы дальняй,
Дарагой:

„Ой, каціўся з поля залаты вяночак,
Залаты вяночак
З поля на даліну...
Начаваў на ўсходзе,
Начаваў ў нядолі,
Непагоднай ночкай пакахаў ён волю.
Маладую долю,
Песні
І разводдзе,—
Залаты вяночак, сонейка вясны...

Выйдзем на даліну —
Выйдзем, прывітаем
Родную краіну з надыходам маю…
Абарвем,
Паложым залаты вяночак
Маладой на косы, чорныя, як ночка…
Каб ў душы дзяўчыны
Паразвеяць ночку,
Горкі сум,
І роспач,
І чужыя сны,
Каб ў вясновых чарах запалалі вочкі
Залатым вяночкам,
Сонейкам вясны“…

Эх, лілася песня,
Абрывала зоры,
На эстрадзе неба месяц выступаў…
І людскую радасць,
Боль,
І смех,
І гора
Падразаў халодным золатам сярпа.

Я стаяў ў экстазе, поўны захаплення,
І крычаць хацелась да далёкіх зор,
Дзе ў адвечнай сіні
Дзіўных светаценяў
Дзіка абарваўся горды метэор.

І ўлілася ў сэрца горкая трывога,—
Тут я ўсім далёкі
І усім чужы,
Тут ў прыгожых словах
Хтосьжадаў так многа,
А на справе нізка, здрадніцка душыў.

І мне стала ясна,
Што ў туманных нівах
Ні жадання шчырага, ні агню няма.

Гэта не каханне
І не спеў шчаслівы,—
Гэта ж на хвіліну, гэта дум туман.

Праляцяць ілюзіі буйнага вяселля,
Дагарыць лучына гордых пачуццёў,
І ізноў ад здрады,
Крыўды
І пахмелля
Будуць горам ўпоены песні і жыццё.

Хай ад роднай песні неба уздыхала.
На шырокай волі
Зорных берагоў
Гэту песню ночка успрымала,
Як каханне дальняй
Дарагой.

*

Прыйшла яна вясёлай,
Захмялеўшай,
Яшчэ хтось з ёй нязнаны мне прыйшоў.
І усміхнуліся,
Мяне чужым сустрэўшы
З такой разбуранай
І зморанай душой...

З яе пляча скацілася сукенка.
І мармур цела думкі захмяліў...
Яна была далёкаю паненкай,
І мы па-рознаму ўстрывожаны былі.

Ўсё ж падышла й халоднаю рукою
Ўзяла маю дрыжачую руку:
— Вось, будзь знаём,
Прыехаў ён за мною,
Таварыш мой,
Маіх жаданняў друг.

І адышла...
Скакала з захапленнем
І піла потым нечую любоў,
А я, забыты ў доўгім задуменні,
Тушыў трывогу горкую
І боль...

І вось тады балюча я падумаў,
Што ёй ўсё роўна, хто ні пакахаў,
Што пахавальнай роспаччу
І сумам
Ёй лёс рукой дацэнта не махаў.

Дык дзе ж мая вячэрняя святыня, —
Яна, з другім абняўшыся, пайшла
Туды, дзе ноч,
Дзе ноч пасцеллю сіняй
За туманамі тайнымі лягла.

Я не хацеў зрываць
Вячэрнюю заслону...
Хай так...
Так на душы святлей!..
І зноў пайшоў к сваім палям
З паклонам
Ад іх хвіліннай радасці далей.

І як ў далёкім,
Згубленым дзяцінстве,
Я доўга думаў, гледзячы ў туман,
Што ўсё ж пры ўсіх
І здрадніцтве,
І свінстве
Пачуцці-мары гінуць не дарма.

І я глядзеў, як ночка дагарала,
Як ранні свет азёрных дамавін
Чыясьці лапа ветла рассявала
Над дыванамі кветак і травы...

І дзесьці там,
Дзе плакалі зарніцы,—
Ў забытым сэрцы выбухнула боль
За ноч вясны,
За вобраз чараўніцы.
За гэту здраду,
Шчасце і любоў...

*

Дзіўная,
Прыгожая стома і спакой.
За вакном пачуццямі захлынуўся сад.
Чутна —
Плачуць сумна вербы над ракой
І каліна белая адцвіла ў слязах.

Эх, каліна дзіўная —
Дзеўчына вясны
Дальняга пазвала ўсмешкай прамяністай
Й хтосьці увaходзіць
Крокам ледзяным
Й бязудзельна кажа:
— Вось, таварыш, ліст вам.

„Дружа!
Дзе дальнія зоры
Грэюць уночы асфальт,—
Там нарадзіліся з гора
Здрада,
Каханне і фальш.

Там за заслонай сталеццяў,
Дзе каранован прыгнёт,
Золата думкі са смецця
Ўзняў чалавечы узлёт.

Людзі свядома кахалі,
Людзі ішлі на кастры...
Сэрца выкоўвалі з сталі,
Кроў здабывалі з зары.

Там ў залатым дагаранні
Я палюбіла твой свет.
Ты ж…
Ты не ведаў кахання,
Быў ты, як жоўты шкілет…

Што ж ты
Пакрыўдзіўся ў песнях? —
Лепш нам былое забыць.
Так нейк і душна,
І цесна,
Мёртвым між мёртвымі
Быць…
Клара“.
Сумна і трывожна разрываю ліст я.
Востры пах ляўкояў думкі расхмяліў.
Ах, няўжо я мёртвы,
Як апаўшым лістам
Быў падкінут к небу, а датлеў ў зямлі?

*

Ноч лягла на Менскія бульвары,
Чорным вокам
Падміргнула мне.
Дальні плач надломанай гітары —
Гэта крык
Аб раненай вясне.

Дарагія,
Блізкія чарцяты,
Сёння я паэт
Ці не паэт?
Плачуць клёны ў золата заката,
Скача нечый згублены шкілет.

Ўспомніў я забытае каханне.
Кожны з нас
І верыў,
І любіў.

У душы, як ў кратэры вулкана,
Нёс агонь
І песні,
І журбы.

І таму пад выстралаў раскаты,
Калі свет
Ўзнімаўся на дыбы,
Знаў я песню вольнай
І багатай,
Поўнай волі,
Шчасця й барацьбы.

Тыя дні пранесліся навалай,
Намялі магіл і курганоў.
І калі сягоння
Сумна стала,
Мы не кроў цалуем,
А віно.

*

Брэша трывожна у цемры сабака:
Я ўспамінаю свой край,
Сад ў залатых дагарэўшых накрапах, —
Першы і горац, і рай.

Ноччу вясновай пад месяцам дальнім,
У холад, і ў цемру, і дым,
Песню губляю надзей пахавальных,
Песню пяю маладым.

Прагна гудок праскакаў над дамамі,
Сэрца ахутвае жах.
Здэцца, хтось сцяў касцянымі рукамі
Неба далёкага дах.

Колісь тут раннем ў жыццёвую школу
Горда і смела пайшоў.
Быў я галодным і быў я паўголым,
Але з упартай душой.

Ўсё перанёс я — і здраду й каханне —
Й з кожнай нягодай смялей
Верыў, што прыйдзе сусветнае ранне,
Дружба і шчырасць людзей.

Сёння ж я сціх, я сягоння згубіўся,
Ў сэрцы і пекла, і рай.
П’ю за каханне вясны-маладзіцы,
П’ю за загублены май.

Плачуць фальшывыя скрыпкі уночы...
Ноч за вакном, як труна.
Плачуць таварыша дымныя вочы,
Плача былога вясна.

Ўспомніў я сэрцам былыя пакуты.
Чуеш, як сэрца?..
— Ах!..
Што прывяло нас з табой да атруты —
Радасць,
Ці боль...
Ці туга...

Тут ў рэстаране спаткаў я паэтаў...
Ў чадзе табакі й віна
Хтосьці крычаў
Аб бязмэтнасці мэтаў,
Хтосьці ўвесь свет праклінаў...

Доўга глядзеў я на іх ў захапленні.
Момант, і сэрца — вулкан.
Вось дзе крыніца
Начнога натхнення,
Вось дзе аазіс іх ран.

Хтосьці надрыўна і глуха да болю
Верш свой халодны чытаў...
Усё ў ім было —
І пра шчасце, й пра волю,
І аб цыганскіх вачах.

Слухаў — і крыўдна, і цяжка мне стала,—
Недзе за гэтай сцяной
Новае йшло непакорнай навалай,
Крыгамі ранняй вясной.

Душна было тут і нейк агідна,
Месяц глядзеў, як мярцвяк.
Досыць пачуццяў журбы паніхіднай,
Сёння спяваюць не так.

Сёння пад новым зарніц палыханнем
Песняў пытаюць жывых.
Сам я шукаю далёкага рання,
Толькі па сцежках не тых.

*

Я пакідаю сталы рэстарана...
Грубы праносіцца смех.
Як апынуўся я
Ў п'яных туманах,
Хто мне адкажа цяпер?!

Ах, я успомніў далёкія цені,
Лебедзь — закат на вадзе,
Дзе я
Жывыя крыніцы натхнення
Ў стройныя рыфмы адзеў.

Там я шукаў чалавека жывога,
Погляду светлых вачэй,
Там з маладой,
Непакорнай трывогай
Пеў пра каханне начэй.

Некалі там над бутэлькаю піва
П'яны на крэсла прылёг.
Помню —
Таварыш са смехам шчаслівым
Вывеў мяне на парог.

Сёння ж туманам накрыліся думы,
Я не гуляка душой.
Хай я падчас быў
І п’яным… і сумным,
Ўсё ж я і радасць знайшоў.

Ўсё ж перанёс я
І здраду, й каханне,
Й з кожнай нягодай смялей
Веру,
Што прыйдзе хоць нечае ранне,
Дружба і шчырасць людзей.

*

Была восень, падалі лісты.
Я стаяў на скверы і дзівіўся…
Хтосьці пеў аб нівах залатых,
Пад раяль і плакаў, і маліўся.

Хтось казаў аб шчасці і жыцці,
Аб каханні друга маладога.
Хтосьці зваў да лепшага ісці
Па другіх,
Нязнаных мне дарогах.

Слухаў я, агорнуты журбой,
Тую песню… Тыя парыванні…
І раслі на сэрцы
Шчасце і любоў,
У душы світала…
Налятала ранне.

Дарагія, блізкія,— ізноў вы!
Быццам нехта мудрае сказаў:
— Што ты талент — гэта безумоўна,
Толькі трэба жыць,
А не згараць.

Адгараць пачуцці і імкненні…
Згасне сэрца буйны аганёк,
І згарыш,

Як гэты дзень асенні,
Нашым дзіўным раннем і вясной.

Слухаў я, і сэрца замірала.
Вечар быў, як любае пагляд,
Быццам гэта любая сказала,
Што яе любоў я прагуляў.

Ах, не тое... Месячным узрыдам
Я і сам заплакаў на асфальт...
Плач, раяль, за цноту Афрадыты,
За распусту,
Здраду
І за фальш.

У мяне няма цяпер любімай.
Гэй ты, месяц-малпа, пачакай,—
Нафарбуем сэрца пудраю і грымам,
Скажам сонцу:
— Сонца, пакахай!

Адміралі гукі. Падалі лісты.
Я стаяў на скверы і дзівіўся.
Хтосьці пеў аб нівах залатых,
Толькі больш не плакаў,
А маліўся...

*

Шукаючы жыцця надзей вялікіх,
І зор святла,
І месяца узрыд,
Я закапаўся ў кнігах
І ў заліках,
Я стаў студэнт — пакорны ангідрыд.

І ў той душы,
Дзе зоры расцвіталі,
Дзе рукі ночы кідалі закат,
Там узняліся думак сэнкліналі,
І стала неба — вольнасці плакат.

Там па стапах
Былых маіх жаданняў
Прайшоў гальфстрым нязнанага
Жыцця,
І быццам зноў растручаныя раны
Панёс я ў сэрцы —
Сэрцы мерцвяка...

Там дзесьці людзі
Горда успрымалі
Цяпло вясны,
І музыку,
І свет,
А я над тайнай злой дыяганалі
Сядзеў, як дрэўні мудры Архімед.

Я ўвесь палаў нязнанаю мне сілай...
Тут косці прадзедаў
Расшырвалі мазгі;
І кожны твар,
Нібыта крыж пахілы,
Па-свойму стаў мне блізкі,
Дарагі...

Я надламіўся хутка да бяскраю,
Я, як агарак, хутка дагарэў.
І нехта раіў,
Доўга гэтак раіў,
Каб я шукаў другіх сабе дзвярэй.

Я захварэў і цёмнымі начамі,
Забыўшы ўсё: і кнігі і пяро, —
Я жыў гарачымі ўстрывожанымі снамі,
Ганяў на выган з хлопцамі
Кароў.

Там пад пякельным сонцам,
На прасторах
Маіх вясновых дум і пачуццёў,
Я зваў былыя радасці і гора,
Былыя песні,
Дружбу і жыццё...

Я бачыў свет усходаў і закатаў,
Я слухаў доўга песні пастухоў,
Я бачыў з пугай Дантэ
І Сакрата,
Што гналі ў рай пакорных ім кароў.

Ах, там, ў раі палі зазелянелі.
Гані туды, там паша багацей.
І раптам чуў я лёгкасць
Ў хворым целе
І галасы знаёмых мне людзей...

І адчыняў я вочы з заміраннем...
Душа ляцела ў вольны небакрай.
Ізноў вясна,
Ізноў і смех, і ранне,
І недзе там гармонік зноў іграў...

Зноў пацягнула жыць і захапляцца
Ўсім тым,
Чым людзі верылі ў людзей.
Наноў за песні
Й за навуку брацца,
За мудры вечар дум іх і надзей.

Даволі спаць!
Жыццё не дамавіна.
Жыццё патрэбна ўзяць і палюбіць,
І маладой вясной,
Любоўю сына
Нягоды путы скінуць і разбіць!..

*

Мяне спаткалі, быццам мерцвяка, —
Ніхто ўжо больш
У мой усход не верыў,
І друга лепшага халодная рука
Не адчыніла зноў мне
Радасныя дзверы.

І хтосьці
Здзекавацца тады з мяне пачаў.
Для іх я быў
Гуляка і гультай...
І я, як труп,
Як труп жывы, маўчаў,
І, як магіла, здушаным я стаў...

Я зразумеў: нахлынула бяда,—
Я шмат забыў і многага не знаў...
І хтось сказаў:
— Дакуманты аддаць,
Ён не дагоніць, як і не дагнаў!

*

— Эх, брэшаш, чорт!..
Яшчэ не адгарэлі
Ў маіх грудзях уздыхі навальніц.
І покуль ёсць
Хоць кропля сілы ў целе,
Я перад лёсам не схілюся ніц.

Я перад ім не стану на калені,
Мая душа — ўстрывожаны касцёр,
І хай мяне абсыпалі каменнем,
Дык гэта
Й ёсць сапраўднае жыццё.
Я працаваў надрыўна і трывожна,
І я па праву горда перамог.
Я,
Як адсталы ў полі
Спадарожнік,
Не шкадаваў ні рук, ні галавы,
Ні ног!..

Дзівіўся чорт,
Нібы Шукайла з гора,
Яму па гэтых сцежках не прайсці.
Яму, як мне, разгойданае мора

Ў бетон грудзей,
Як друга не прасіць.

Вячэрні змрок…
Цяплынь і заміранне…
Ўстае туман над возерам душы…
І ў гэтым цёплым ўдуманым тумане
Сваіх надзей
Разбурваю крыжы.

Ах, як усё вакол зазелянела…
Мой родны край — карміцелька-зямля.
Цяпер па праву
Радасна і смела
Заву дзяўчат і хлопцаў пагуляць.

*

Прыйшлі хлапцы з дзяўчатамі увечар.
Эх, грай, гармонік,
Д’ябал, не маўчы…
І жыў прастор жаданнем чалавечым,
Згубіўшы ў сінь
Ад месяца ключы.

І толькі Рая сумна і трывожна
Глядзела ў даль сумуючых палёў…
— Скажы, браток,
З табой за горад можна? —
Мне душна тут, нібыта пад зямлёй.

І мы пайшлі…
І доўга мы блукалі…
Навіслі хмары…
Вецер узрастаў…
Начных палёў разгойданыя хвалі
Хісталі труп памёршага Хрыста…

Цалуй, маланка, вусны да бяскраю,
Я іх не ўмеў ніколі цалаваць.
Я пакахаў цяпер студэнтку Раю
І вось аб ёй,
Аб ёй хачу спяваць…

Глядзі — сягоння
П'янствуе прырода,
Яна спраўляе вечны юбілей...
Яе змаганне — бура-непагода —
Расце штодзень упарцей...
І смялей...

Глядзі — заплакаў нехта на дарогу,
Пабеглі слёзы-іскры
Па палям...
І боль...
І радасць...
Шчасце...
І трывогу
Падзелім сёння з бурай папалам.

— Эх ты, паэт...
Я не люблю паэтаў,
А ўсё ж што-небудзь,
Хочаш, пачытай,
Аб тым, чым сэрца палкае сагрэта,
Хто гэты верш парой табе шаптаў.

Я новы ліст зачытваю ад Клары,—
Ён зноў ўстрывожыў думы
Й пачуцці...
..............................................

„Бывай...
Прабач...
Я паміраю ў бары,
Згубіўшы свет жыцця на паўпуці.
Прабач...
Такая чорная навала.
Цяпер я бачу шлях куды ясней.
Я аднаго даўней цябе кахала,
О, гэта слова дзіўнае — даўней...
Я не хачу растручваць
Тваіх ранаў,
А ўсё ж скажу,
Як нізкая змяя,—
Ты помніш, той смуглявы ў чадзе

П’яным
Мяне пакрыўдзіў горка, асмяяў...
О, я была рабой сваіх імкненняў,
Ты знаеш, гэта —
Даўняга надлом,
Я для сябе,
Для мірных летуценняў
Цвіла над кожнай ніткай і рублём.
І як другія, жыць
Я не умела...
Дзе людзі йшлі вялікай грамадой,
Там я п’янела стомай свайго цела
І п’янай ўладай сілы маладой.
Яго я звала
Блізкім і любімым,
І я ўзяла,
Як бачыш, цераз край,—
Мы не кахаць...
Не верыць не маглі мы,
Мы толькі йшлі ў мяшчанства
Дагарань...
Жыві шчасліў...
Ідзі сваёй дарогай...
Мой кавалер задумаўся... замоўк...
...І так усё!..
Жадаю многа... многа...
О, любы мой... бывай, каханы мой“.

— І ты кахаў такую песімістку?..
Эх ты, паэт!..
Ты сам расцяпай стаў.
Ёй нат памерці боязна без піску,
Нашто ты дрэнь такую мне чытаў?
.............................................

О, я не меў патрэбнага адказу,
Я нахіліўся нізка галавой
І гэту споведзь,
Крыўду і абразу
Схаваў на тайным дне душы сваёй.

*

Залатымі хвалямі зашумела возера,
Край ты мой бацькоўскі,
Мой ты родны край, —
З маладымі песнямі,
З маладымі крозамі
Нехта выйшаў ў поле пра вясну
Сыграць...

Чуеш песню дальнюю...
Песня тут калосіцца...
Разгарні гармонік, грудзі разгарні,
Сэрца к новай радасці,
На прыволле просіцца,
На прастор шырокі маладой вясны.

Сам я песню любую
Падпяваю дальняму...
Сам такую ўмею сёння я злажыць.
Сам складу сягоннячы мёртвай
Развітальную,
Ўсё ж аб ёй калісьці пеў і варажыў.

І я не буду гэтым п’яны,
Вясновай хвалі меж няма.
Яна мне любай
Больш не стане,
Як труп,
Як смерць...
Як смерць сама.
Што сумаваць
Пад сінім небам,
Яно не стане маладзей...
Кахаць і жыць
Іначай трэба,
Ўсё ж нейк упарцей
І сталей...
Што пажадаць!..
О, лепш нічога!
Жаданнем мёртвых
Не падняць,

Дзе ля магільнага парога
Не грэе сонца,
Ні вясна!..

Залатымі хвалямі зашумела возера.
Ўзяў пад руку вецер,
І мы ўдвух пайшлі,
Каб паэмай новай і другімі крозамі
Прывітаць далёкія, любыя палі!..

## Я ВЕРУ

Зямля... Зямля...
Вячэрняя маўклівасць.
І шлях адзін — далёкі і цяжкі...
Вітанне вам,
Краіны роднай нівы,
І вам, надзей ўваскросшых васількі.

Была пара
Надзей і парыванняў,
Была пара уздымаў маладых.
І сам я йшоў
Без болю і без ранаў
Шукаць жыцця і шчырасці сляды.

Спявалі мне
Увечары дзяўчаты,
Увечар месяц лашчыўся з аддаль.
Я быў юнацтвам горды
І багаты
І вось яму ўсё лепшае аддаў.

Я жыў і верыў гордым і упартым.
Ласкалі нівы
Сонечнай красой...
Ах, што са мной?
Ці гэта сон, ці жарты,
Ці стала смерць халоднаю касой?

Ах, я не знаю...
Хмары набягалі,
Ўставаў туман над дрэмлючай ракой.
Душа, як камень,
Здрадніцка маўчала,
Ў вачах згасалі іскры васількоў.

І гаварыў мне нехта пра мастацтва,
Што я халодны,
Жорсткі песіміст,
Што гэта поза ранняга юнацтва —
Яна памрэ, як ўвосень жоўты ліст.

І помню я...
Мне маці гаварыла...
— Каго пакрыўдзіў, сынку, раскажы,
Што так цябе
Бяссорамна пакрылі,
Як быццам ты ў сям'і буржуя жыў.

Скажы, мой сын?..
О маці, маці, слухай!
Ідучы удаль, на ранне, па начах
Пад песні грознай ведзьмы-завірухі
Жыццё бяруць тут радасна,
З пляча...

Таму не ныць,
Не кідацца,
Не плакаць...
Я знаю сам — жыццё, як акіян!
.................................................
Дзе людзі ёсць з сумленнем грамадзян.
.................................................
І за стварэнне
Шчасця і свабоды,
Дзе задыхаюцца над мукай
Чарцяжоў,
Дзе не гандлююць
Воляю народнай
І дзе жывым не дораць сум крыжоў.

Таму ёсць мэта
Верыць і змагацца,
За край свой родны падаць і гарэць!
Ў змаганні толькі
Можа нараджацца,
Што здольна жыць не марамі
Звярэй!

Ах, я гарэў...
Вітанне, край радзімы!
І вам, надзей ўваскросшых василькі.
Я веру —
Хутка ў чорнай дамавіне
Звязем мы ноч з прастораў дарагіх!

# 1930



*Ў полі вецер і ў полі туман,*
*Ў полі месяц,*
*Закованы хмарай:*
*Мабыць, хутка настане зіма?*
*Мабыць, хутка марозы ударацць?*

* * *

*Па радках прачытаюць дзеці,*
*Як жылі іх бацькі і дзяды.*
**Міхась ЧАРОТ**

Там,
Дзесьці там, ў стапох жаданняў,
Пад ветру свіст
І завыванне
Стаяла вольха на кургане
З прабітай сонцам галавой...
А навакол,
Як кінуць вокам,
Сінела поле,
Сніўся гай,
І ўсім нязнаны,
Ўсім далёкі
Ён плыў і плыў за небакрай...

Крычалі качкі недзе ў лузе.
Ах, як даўно я тут не быў.
Ці гэта
Дальні сон ілюзій,
Ці гэта, можа, толькі быль?

Мне ўсё адно... Я толькі рады,
Што зноў пабачыў
Сінь нябёс,
Падгніўшы дом... А з домам разам
Забыты рой юнацкіх кроз.

Што любы край вясной вялікай,
Увесь, як май, як песня,
Край,
Пад гранне тысячы
Музыкаў
Зламаў навек адзенне крат.

Што дзесьці там,
Ў стапох жаданняў,
Пад ветру свіст
І завыванне
Губляюць людзі па курганах
Адвечны боль і смутак ранні...
І што не дальні сон
Ілюзій,
А долі новай сніцца
Быль...
І што стаяў, што марыў ў лузе,
І гэты луг я не забыў...

* * *

Пракрычалі пеўні ўночы,
Месяц зноў, як твар каханай...
Хто мне сёння напрарочыў
Пра журбу і пра туманы?

Я пішу ў сваім пакоі...
Ноч, як снежная русалка...
Сніцца мне зусім другое,
Што жадаю гэтак палка.

Сніцца сон далінных кветак,
Родны край ў вянках змагання.
І, наіўны сам падлетак,
Спатыкаю ў полі ранне...

## ЯНКУ КУПАЛУ

Па песнях і думах
Мы любім паэтаў,
Мы з песняю творым
І ў бойку ідзем.
Мы мудрасць вякоў
І сусвету
Знаходзім ў паэтаў
Штодзень.

Мы белыя крыллі
Сваіх рыштаванняў
Авеялі тайнай
Напружных балад.
Мы творым
Вялікае ранне —
Камуну —
На ўвесь далягляд...

І хай навальніцы
Гуляюць часамі,
Хай нехта
Далёкаю крыўдай
Ілжэ, —
Мы кожную цэглу,
Мы кожны камень
Ўздымаем вышэй
І вышэй.

А калісьці сумнай
І крыўднай жалейкай,
Вялікім і змучаным
Шляхам жыцця
Спявалі Вы думы
Тугі-безнадзейкі,
А часам ўзнімалі
Узбураны сцяг.

У Вашых я песнях
Знайшоў навальніцы,
Ўсе фарбы і гукі
Палёў дарагіх,
Пазнаў і красы
Нечуванай крыніцы,
Яе неўміручых надзей
Берагі.

Праз сон на кургане,
Ад спаленых гнёздаў
Вы клікалі к зорам,
На вольны прасцяг,
Вы сэрца,
Вы кроў сваю,
Розум, —
Ўсё кінулі
Ў буры жыцця...

За песні і думы
Мы любім паэтаў,
За кожнае слова,
За кожны радок,
Што нашым агнём
І трывогай сагрэты...
Купала,
Вам гэты вянок!

* * *

Гукі матораў і радыё…
Ў бляску вячэрнім трамвай…
Сэрца працоўнага радуе
Права — свой лёс будаваць.

Былі навалаў дні,
Эшалоны на фронт ішлі,
І палалі пажараў агні
Па шырокаму твару зямлі.

Ля вялікіх і слаўных магіл
Прыгадаем свае дасягненні:
Дзе калісьці быў горад глухі —
Узрастае сталіца
Імкненняў.

Узрастаюць палацы увысь,
Дзень і ноч не сціхае праца,
Толькі вораг блукае, як ліс,
Ды па ім дамавіна плача.

Не спыніць яму гэтую радасць,
Гэта права і жыць, і тварыць.
Гукі матораў і радыё,
Дзе святло Асінбуда гарыць!..

## ПАРОГІ ПАМІРАЮЦЬ

Урывак з паэмы

Не блукаць ў палёх і не губляцца,
Гэта ноч дарыла многа сноў:
Не пад снегам,
А дажджом акацый
Адчынілася маё акно.

Ударыла ветрам ўраз,
Пацягнула з палёў навальніцай ,
Гэта песня —
Апошні сказ
Пра тое,
Што больш не прысніцца.

Стаў апошні ў палях паравоз.
  Дзесьці пеў кулямёт
Аб ахвярах.
Ўзяў вінтоўку
І сцяг
Пралетары...
Ўзяў вінтоўку батрак
І матрос...
Пелі ветры ў крывавых палёх,
І хаўтурна
Й балюча так пелі
Тым, хто сэрца сваё не збярог
Ў непакоі вялікіх мяцеліц.
Пралятайце, вятры, у туман...
З шумам лісця ў даль пралятайце...
Вашы сінія
Тонкія пальцы
Душаць горла зары нездарма.
Вы раскажаце мне другое,
Што я сэрцам сягоння ўзяў, —
Непаўторнае,
Дарагое,
Нечаканае ад жыцця.

Запяваюць гудкі перамогу...
Сонца ў полі і сонца
Ў вачох...
Пралетарыям шырай дарогу —
І адну,
І мільёны
Дарог!
Памірае парог за парогам,
Днепрастан,
Дзе імкненнем прадрог.
Запяваюць гудкі перамогу,
Запяваюць па ўсіх франтох.

* * *

Там дзесьці у цемры туманных вякоў
Паўстала імя — чалавек,
У сэрцы што нёс
Парыванняў агонь,
І нёс яго з веку у век...

Дзе нараджалася слова,
Дзе нараджаўся спеў —
Веяла заўжды новым
Удумлівей
І глыбей...

Там,
У тумане стагоддзяў,
Геній палаў на кастры...
Буры ішлі
У народзе,
І ўзнімаліся правадыры.

Жахі смяротных
Пажараў,
Шыбеніц чорны жах,
Дзікія мукі
І мары,
Мускулы — сталь пралетара —
Усё гэта кніжкі душа.

Сёння, дзе новыя думы
Полымем дзіўным цвітуць,
Я ўспамінаю аб дальнім
І сумным,
Тым,
Што навеяла жуць...

Што ж?
Па-другому сягоння
Скарбніцы дум берагуць.
Там,
Дзе зруйнованы гоні,
Там, дзе паўстаў Волхаўбуд.

Да новых і светлых
Жаданых вякоў
Ідзе новы творца — працоўны.
Гарыць ў яго сэрцы агонь
І полымя дум цудоўных.

Пра нашу творчую,
Гордую быль
Раскажуць мільёны паэзіі.
Мы створым
Эпохі стынь
З бетону, з агню і жалеза!..

* * *

Ах, спявай, дарагая, спявай...
Я люблю твае песні, твой голас.
Захмялела табой галава,
Маладой і такою вясёлай.

Ў полі вецер і ў полі туман,
Ў полі месяц,
Закованы хмарай...
Мабыць, хутка настане зіма?
Мабыць, хутка марозы ударац?

Я баюся напеваў зімы.
Не схаваеш ты сэрца па хатах.
Толькі светлай вясне
Верым мы,
Толькі першым надзеям, утратам.

Мы імкнемся туды,
Дзе вясной
Расцвітаюць вяршыні жаданняў,
Дзе забыты з табой мы даўно
Непагодамі бур

І туманаў.
Твая песня цвіце,
Як вясна,
І твой голас п'яней за Купалле.
Дык спявай жа,
Спявай давідна
Ты пра шчасце,
Прыносяць што хвалі.

* * *

Ты гаворыш, што сэрца прыстала...
Што рассыпаны юныя дні,
Што калісьці ты шчыра кахала,
Захапляўся табой не адзін.

Была сіла...
Успыхвалі мары...
Расцвітала вясна-маладосць.
Вечна сніўся
Ў пачуцця пажарах
Незнаёмы і ласкавы хтось.

Ён прыйшоў і па возеры шчасця
Вёз цябе у краіну жыцця,
Дзе закат
Ярка-ружай быў масці,
Малады й неспакойны рысак...

Ўвечар пелі аб шчасці
Дзяўчаты...
Ах, дзяўчаты гадалі па снох,
Ці не прыйдзе ў іх сумныя хаты
Той, хто ім сваё сэрца збярог.
Там цвіло і там сэрца палала.

Там краіна была — маладосць...
Там
Ты першае шчасце пазнала,
Што прыйшло,
Нібы сонечны госць.

Ну, дык што,
Калі сэрца прыстала
І рассыпаны
Юныя дні, —
Знаю, ўсё ж ты калісьці кахала,
Захапляўся табой не адзін.

* * *

Пазнаў і я, што ёсць прырода
Не толькі
Ў дагаранні зор,
Што ёсць у мудрага народа
Ў грудзях і сонца
Свет,
І золь...

І я пазнаў трывожным сэрцам
Прыроды рух,
Яе любоў,
Яе закон няўхільнай смерці,
Яе жыццё, імкненні, боль.

Пазнаў гіпотэзы,
Законы...
І мудрасць тысячы вякоў
Нясу ў мазгах сваіх сягоння

Для тых, хто сэрцам не памёр…

## АДЫШОЎШЫМ

На вашых магілах мы справім вяселле
І душы зальем старадаўнім вiном.
Успомнім, як дні нашы ў нетры ляцелі,
Каб больш не вярнуцца ніколі ізноў.

Мы ў майскія ночы паплачам над вамі,
Раскажам вам вашы пачуцці і сны,
Як сэрца квітнее зарой і агнямі,
Як граюць жаданні на струнах вясны.

А ў доўгія ночы зімовых ігрышчаў,
Пад дальнія скрыпкі начных палазоў
Раскажам, як вецер бязлітасна свішча,
Цярушачы ў полі змярцвелы свой боль…

Там хвойка упала з надломаным крыкам.
Там свежай крывёй пралілася зара.
На захад узняў хтось марозныя пікі
І кліча у бойку узбураны край.

Мы вучымся жыць. Мы стварaем законы.
Мы марым аб дальняй нязнанай красе.
У бойку ідзём, паміраем з праклёнам,
І смерць нам вянкі на магілы нясе.

А можа быць, такжа праз слоту нядолі
Мы пойдзем, памром і не вернемся зноў.
Хтось будзе на нашых магілах вясной
Спяваць з захапленнем пра шчасце і волю!

* * *

Я ўспамінаю дні змагання,
Крывавы выбух навальніц,
На дарагія сэрцу раны
Нясу бальзам
Сваёй вясны.

Шчэ так душа не расцвітала,
Зялёны сад
Маіх надзей...
Я быццам вырваў суму джала
З сваіх
Ўстрывожаных грудзей.

Заціхлі трубы, спяць гарматы.
Давайце песню — гімн лясоў,
Хай, юнай мудрасцю
Багаты,
Ён пройдзе роднай паласой.

Я доўга буду,
Да бяскраю
Ўпіваць агонь сваёй тугі,
Каб над маім
Ўваскросшым краем
Ніхто не смеў узняць рукі!

За кожны крок маёй Айчыны,
Ў цяжкія дні, паўстанняў дні,
Я з сэрцам раненага сына
Расстрэльваць буду
Спячых сны.

І з гордай верай ў перамогу,
Згубіўшы дум сваіх
Крыжы,
Выходжу сам я на дарогу
Ісці, змагацца, верыць, жыць!

І калі ўспомніў мімаволі
Крывавы выбух

Навальніц,—
Я гавару: за свет... за волю
Аддам бальзам свае
Вясны!

* * *

Цені бягуць другія,
Сніцца сэрцу другі экран...
Дзе ж вы, мае дарагія,
Дзе ваш раскінуўся стан?

Песні спяваюць навокал.
Вецер звініць і звініць.
Мабыць, яшчэ далёка,
Мабыць, аб іх мне не сніць.

Вочы туман засцілае.
Ў гэтым тумане вясна...
Нейчая зорнасць былая,
Нейчая казка адна.

Ў казках, песнях, і ў думах,
Ў шуме і звоне дарог
Сэрца, сагрэтае сумам,
Роднаму краю збярог...

Край тумано́ў ды балотаў...
Рэчак, азёраў, лясоў —
Скінь сваю ціхую цноту...
Крыкні гранітнай красой...

Гэты мне голас знаёмы.
Хто ж яго тут абагрэў?..
Можа, магіла былому —
Скрып атрупелых дзвярэй?

Новаму, можа, ажары
Грозных і злых навальніц?
Новых і новых аварый
Радасных, сочных зарніц?

Там вось, мае дарагія...
Там, за гарамі гадоў,
Песні складу я другія
Чыстых, жывых гарадоў.

* * *

Вецер гуляе па даху,
Дах жа звініць і звініць.
Вось ён згубіў адну бляху,
Тую, што марыла жыць.

Вось падхапіў яе далей,
Кінуў праз вал
У ваду.
Цела жалезнае хвалі
Ўніз на забыцце вядуць...

Покуль яна яшчэ сніла
Зранены ветрамі дом,—
Нейкая тайная сіла
Біла ўспамінаў крылом,

Некалі там,
Пад гарою,
Вунь, дзе бярозкі шумяць,
Была малодшай сястрою
Срэбная бляха... на яць...

Ўнізе паны там шчасліва
Век пражывалі ў цішы.
Ў чыстых пакоях
Каміны... ды піва,
Ўверсе вятры ды дажджы.

*

І вось нечакана...
Аднойчы,
Пад гром
Ці пад рогат гармат
Тут смутак
Ашчэрыўся воўчы,
І тых,
Што былі тут, няма...

Пагаслі каміны
Ды печы,
І піва застыла на шкле...
І толькі
Ў нахмураны вечар
Зноў хтосьці гуляе
Ў імгле...

Так марыла бляха
На хвалях,
Пакуль не упала на дно...
Быў вечар,
І ветры хавалі
Забытыя цені даўно...

І вецер
Біў зноўку па даху,
Такі незнаёмы, другі...
І засталіся
Ад згінуўшай бляхі
Толькі на хвалях кругі.

*

Новае сёння красуе,
Новыя песні
І час...
Гляньце, навокал будуюць
Ўраз за калгасам
Калгас.

Нетры сталёвых багаццяў

Мы пераплавім
Ў плугі —
З цемрай і брудам
Змагацца,
Біць па магілах тугі...

Кожная кропля
Жалеза
Пойдзе для гарту зямлі.
Што залатыя нам
Крэзы, —
Ў нас залатыя палі!

Ўзрыем мы горы
І нетры,
Пусцім экспрэсы ў разбег.
Гэтая песня
Пад ветры
Складзена, бляха, табе...

## ЗАЯЦ

Заяц упаў на снег,
Стрэл быў сухі і кароткі...
І, задуменнаму, мне
Сніцца ў крыві барodка.

Круціцца дым ад крыві,
Сэрца кранулася
Й стала...
„Быццам і жыў і не жыў“,
Глуха зямля запытала.

Выйшаў стралок да яго,
Узяў і закінуў
За плечы.
Веяла поле тугой...
У полі і вецер,

І вечар...

У сінюю скрынку душы
Раптам ударыла снегам,
Заяц для смажання
Жыў,
Толькі для шчасця бегаў.

Знік той стралок,
Не відаць.
Што я стаю ў задуменні?
Можа быць,
Зайца шкада,
Можа, сваіх летуценняў...

* * *

Сягоння сонца ўстала маладое
І запалалі золатам снягі.
Спаткаць вясну
Мы выйдзем грамадою,
Адной сям’ёй братоў і дарагіх.

Былі віхуры,
Ветры,
Завыванні
Галоднай зграі

# 1931



*З кожнаю вясною ўсё кароткшы шлях,*
*І мінае смутак, і прыходзіць жах.*
*Толькі застаецца па мінулым боль,*

* * *

Я помню, — яблыні цвілі,
І вецер заліваўся смехам
Ў расой апырсканай далі.
Пад месяцам гарэлі стрэхі
Халодным колерам сваім.
Палала ноч, і вёска спала,
Спявалі ціха паплавы,
А мне чагосьці не ставала.

Я абыходзіў сад вакол
І вуснамі кранаўся кветак,
Якія колісь рваў рукой
Другі, асмеяны паэта.

Усё праходзіць чарадой,
І ўсім даецца сум і радасць,
І ўсе спазналі горыч здрады,
Калі стыкаліся з бядой.

Я ведаў ўсё. Ўсяму цану
Спазнаў за словамі чужымі,

І я нікога не кляну,
Не называю й дарагімі.

Шляхі вялі мяне ў туман,
А я імкнуўся да сузор'яў.
Таму мо й хцівасці няма
Ў маіх нявыказаных творах.

Прайшлі жалезныя гады
І ўзварухнулі ў сэрцы нешта,
І я сягоння, як заўжды,
Сябе выказваю да рэшты.

Інакшы сад цвіце кругом,
І нашы песні іншым складам
Вядуць да новых берагоў
Свае ударныя брыгады.

Які далёкі, грозны шлях,
А колькі ж вёснаў адпалала!
І мне чагось (ну, проста жах!)
Ўсё не стае, як не ставала...

* * *

Страшныя сны навеяла гісторыя,
Крывавы выбух колішняй вайны,
І гавару: не лечым край, а творым мы,
Той край, што быў у агні.

Назад вады не вернеш ў вадазборы
І не абудзіш сонмы мёртвых цел.
Няхай не йшлі да Магамета горы,
Мы горы возьмем на прыцэл.

Адчуў я сэрцам будучага поступ,
І сэрца зноў — агонь і дынаміт —
Злучы, — і ты адчуеш проста
І кроў дынам, і цемру пірамід.

Шумяць вятры, і б’юцца ў скалы хвалі,
І я стаю на ўзвышшы нашых дзён.
Няхай мяне часамі і не хваляць,—
Не для мяне пахвалаў звон!

Я гавару, што знаю і люблю я
Свой край, зямлю і рухі творчых сіл,
І што паэт, калі на ўсё гаворыць „алілюя“ —
Ён сын адных магіл.

І кляса тая, дзе паэт ў загоне,
Дзе думка смелая страшней за смерць зямлі,
Пустая, бедная, якою быць сягоння
Не можа кляса наша, нашы песняры.

Таму пад сны абуджанай гісторыі
Кажу ўсім сэрцам, ўсёй сваёй істотай,
Што вось не толькі лечым край, а творым мы,
Той край, што быў пад ботам.

* * *

Сінімі шляхамі на ружовы шлях
Плыў жалезны волат, мнагатонны птах.

Людзі йшлі ў чырвоным, поўныя агню,
Спатыкаць харошую, слаўную вясну.

З светлымі вачыма, з русаю касой
Йшла вясна ды з песнямі першай баразной.

Йдзі, спявай, пасвіствай, росная мая,
Для жывых праходзіш грозна недарма.

З кожнаю вясною ўсё каротшы шлях,
І мінае смутак, і прыходзіць жах.

Толькі застаецца па мінулым боль,
За былыя песні і тваю любоў.

І яшчэ за тое, што не ўмеў, як ты,
Сыпаць поўнай жменяй сонца на сады,

Што у кволых песнях абмінаў свой час
І ў сцюдзёны вечар шлях губляў не раз.

А цяпер вось, поўны творчых дум і сіл,
Спатыкаю ранне — першае ў жыцці...

Ах, якое сонца, яркі поўдня цвет,
Па табе заплакаў першы раз паэт.

Дык гары ж, як сэрца стомільённых мас,
Я вітаю першы й мо' апошні раз.

І туманным шляхам на ружовы шлях
Падпіхаю трактар, твой жалезны птах.

* * *

Горад грыміць і грыміць.
Вуліца — проста да славы.
Грузка паўсталі дамы, —
Постаць высокае справы.

Стаў я адзін на рагу,
Слухаю музыку руху...
Гулка трамваі бягуць,
Стогнуць аўтобусы глуха.

Ў нашай краіне вясна.
(Дадзена права на сонца!)
Й ты не адзін ля стырна,
Гэткіх, як ты, бясконца.

Сам ты адчуеш зямлю —
Поступ шырокага траўня!
Сам ты ім скажаш — люблю
Гэткіх і любых, і слаўных.

Мне бы стаяць і грымець
Ў грохаце вуліц, ў натоўпе,
Мне бы смяяцца з агіднага — смерць,
Што пралятае ў Еўропе.

Чую я гукі сірэн.
Гэта наступнага поступ.
Гэта інакшы Шапэн,
Іншае музыкі россып.

Будзем жа славіць жыццё —
(Творчую песню прыбою).
Будзем ісці па касцёх
Тых, што памерлі без бою.

Будзем, як волаты, мы —
Нашае права за намі...
Горад жыве і грыміць,
Камень кладзецца на камень...

* * *

Стаю прад Пушкіным адзін
І думу думаю сурова.
Тут кожны камень мне гаворыць
Пра дні вялікіх пуцявін.

Я знаю, Пушкін, Вы паэт,
І Вашай музай акрылён я...
Вы лепшай славы лепшы цвет
Ад Місісіпі і да Дону.

Ваш грозны шлях прывёў ў туман,
(І гэта заўжды нам знаёма).
Вам апяваць бы новы стан
Больш і упарцей, чым другому.

Вы першы з першых. Вашу кроў,
Што дагарэла ў дзікім снезе,
Завём мы песеннай зарой,
Сатканай з сонечных паэзій.

Прад Вамі й я схіляюсь ніц
І гавару ў натоўпе вуліц,
Што Вы з металу і зарніц,
І мы па-свойму Вас адчулі...

Мы знаем, Пушкін, — Вы паэт,
І ваша слава — меч крылаты...
Вы лепшай славы лепшы цвет,
І гэтай славай мы багаты.

## МІХАСЮ ЛЫНЬКОВУ

„Шануй, мой голуб, маладосць“ —
Ты мне сказаў у змроку сінім.
З нас кожан брат і кожны госць
Залітай зорамі даліны.

Дык пройдзем хораша па ёй
Дарогай чэснай і шырокай,

Каб сонца новага прыбой
Адчуць і шчыра, і глыбока.

Вятры хай пройдуць над зямлёй,
І скалануць яе, старую...
Мы знаем ўсё: дабро і зло,
І мы, быць можа, ўсім даруем.

Але, знікаючы ў туман,
Мы з кожным крокам ўсё нервовей
Ў душы смяемся з даўніх ран
І спатыкаем сотні новых.

Сябе не ўмелі зберагчы
І... зберагчы не ўмелі нас...
І пра юнацтва ты маўчы,
Маўчы, прашу цябе, Міхась.

Бо сэрца вырвецца з грудзей
І ўзварухне зямную кулю.
Няхай, хто сёння маладзей,
Сваё юнацтва к сэрцу туліць.

А я гляджу вось на цябе,
І мне здаецца ўсё упарцей,
Што ты жыццё з агнём прабег,
Каб сёння стаць на яго варце.

Бо ты прайшоў вялікі шлях,
І... бачыш, — срэбра галаў кратае.
Ты ведаў ўсё: і сум, і жах —
І маладосць твая багатая.

Ну, дык навошта шкадаваць
Яе такую ў змроку сінім,—
Калі так многа можна даць
Сваёй і клясе, і Айчыне?

## 1932



*Чалавек —*
*гэта вам не мумія,—*
*ўзяў са склепу і выштурхнуў вон,*
*чалавек —*
*гэта сад з залатымі думамі,*
*дзе па жылах праходзіць*

### ЛЯ КАСТРА ЧАЛАВЕЧАГА ЎСХОДУ НАДЗЕЙ

Мы едзем,
і хлопцы спяваюць:
„Белая армія,
чорны барон
зноўку рыхтуюць нам
царскі трон“, —
над полем грыміць
і світае.

Цытрынныя зоры
упалі ў ваду
і там паміраюць
адна за аднэю.
І гэта, таварышы,
ўсё на віду,
у нашых пачуццях,
што днеюць.

Трэба да ўсяго
падыходзіць цвяроза:
да сіняй начы,
да яе вышыні,
трэба ісці,

не губляючы розум,
каб ззялі паэмай
высокія дні.

Стаіць семафор
з зялёнай ухмылкаю:
адчынены шлях —
крый на поўны ход,
каб грала жыццё —
светазарны усход
кожнай нязначнай
і значнаю
жылкаю.

Гляджу і дзіўлюся:
юнацтва, як сон,
як слаўная песня
барвовага краю, —
і мы —
аскабалкі смарагдавых дзён —
на струнах лятункавых
граем.

Праступе цягнік
у імпэтную веліч,
і з грукатам кол
нараджаецца сказ:
„Мы людзі
вясновых паселішч,
акраса
найвышшых акрас“.

Дазволь, дарагая,
дазволь,— пагаворым.
Ты мяне знаеш
і ты мне прабачыш,
за тое, што быў
безуважны учора,
за тое,
што думаў учора
іначай.

Мы не знаёмы? —
Якая розніца? —
Нас жа
адна гартавала эпоха.
Дружа! —
Лета бярэцца
і возьмецца
за нашыя твары
жахліваю
вохрай.

І тады гарады
з іх садамі і скверамі,
з музыкай зор
і з пялёсткамі руж
будуць для нас,
як і дні нашы,
шэрымі,
схаванымі ў смутку
пад свой капялюш.

Жыццё для жывых,
каб спявала краіна,
гарэла вясна,
палыхалі сады,
будземісці
намі ўзнятай пуцінай,
мінаючы роспачы
дні і гады.

Не заўжды патрэбна
суровая ўдумнасць
і зморшчкі чала
не рашаюць ўсяго.
На бруку жыцця,
растрывожана-шумным,
ёсць права на вусны
і смех дарагой.

Няма без красы
у наступнае візы,

няма без кахання
правоў на жыццё,
і ты, што ідзеш
на шляхі камунізму,
ты ўвесь
чалавек-пачуццё.

Машын для машын
не патрэбна нікому.
Заводы растуць
перш за ўсё для людзей,
каб ты узнімаўся,
як волат-нязломак,
як песня паэта
і заўтрашні дзень.

Мне дваццаць тры
і мне хочацца жыць,
спявае ў грудзях
навальніцы паэма.
Тут край мой
на самым стаіць рубяжы
і тут вось —
маё
непакорнае
племя.

Ідуць, нібы казка,
лясы і узгоркі,
ляжыць
паўнагрудай каханкай зямля.
Нямеюць жыты
і удумнасць лягла
у гулы людской
і птушынай
гаворкі.

Люблю
анямелым стаяць ля кастра
высокага ўсходу
надзей чалавечых,

каб падалі ружы
на дужыя плечы
і ў вочы ўлівалася
заўжды зара.

Я за Бетховена:
ўзлёт
і падзенні,
я за блакітную
постаць зямлі,
дзе нараджаліся
й падалі геніі,
і дні
па касцях чалавечых
ішлі.

І хоць я не геній
(не гэта мне трэба!),
я знаю —
рэспубліцы трэба зашмат:
жалеза і вугалю,
нафты і хлеба,
і шчырага слова,
і, нават,
гармат.

І гэта затым,
каб мае аднагодкі,
мае маладыя
сябры-муляры
надзейна змаглі
вартаваць і тварыць,
эпохай
узнятыя ў бой
пяцігодкі.

І гэта затым,
каб гарэла каханне,
сяброўства
на ружы схіляла чало,
і ты не смяяўся

над ўсім, што было
за тое, што ты — чалавек,
а не званне.

Любоў і паэзія
йдуць праз вякі,
праз краты улад
і кароны цароў,
праз хітрыкі ворага,
здраду сяброў,
і дораць зямлі
залатыя вянкі.

Я за няўтомную музыку
ўсходу,
я за усход —
справу сэрца й крыві,
я за найвышшае ў эрах
жывое-жывых,
за маладую вясну,
не скаваную лёдам!

Толькі не мумію.
Дружа, паслухай,—
хмара кране
над табою брыво,
і ты захлынешся
у рогаце руху
над непаўторным
зямлі хараством...

Ўсё далей цягнік,
і імпэтная веліч
выростае ў бляску
барвовай зары,
каб мы —
захаплення свайго разьбяры —
ва ўсім разабрацца змаглі
і умелі.

І знаем —
рэспубліцы трэба зашмат:
жалеза і вугалю,
нафты і хлеба,
і рэк мнагаводных,
і яснага неба,
і шчырага слова,
і, нават,
гармат.

# НОВЫЯ ВЕРШЫ

## 1. ЗА ТЫСЯЧЫ НОВЫХ ТВАІХ АСІНБУДАЎ

Ідуць цягнікі
між балот і азёр,
і ветлыя ветры
на поўдзень за імі.
Ў красе і у бляску
прадранішніх зор
з вінтоўкай,
і з песняй,
і з воляй
ішлі мы.

І вось паўстае,
аквечаны зарывам,
ўзгадованы воляй
высокі разгон,
і мы —
па крыві і чуццю

пралетарыі —
гатовы ісці
У ваду і ў агонь.

У нас за плячыма
(як толькі глянуць)
б’юцца хвалі
чужых марэй,
і адкормлены
крывёю працоўных
паганец
там паўсвета
за горла
бярэ.

Для каторых
вайна — акраса,
і ўзнімаюцца гарматы
на кітайскія парты,
і руйнуюцца вёскі
і гарады,
і горы ўстаюць
чалавечага
мяса.

Ў грудзі упёршыся
кастылямі,
крывавая постаць
новай вайны
кідае першы
звар’ёваны камень,
першы набой
векавечнай маны.

І, здаецца, не людзі
бразгаюць зброяй
абняслаўленым шляхам
людскога адчаю.
Гэта забойцы,
так званыя героі,

гэта рабы
з міліёнам пакут
за плячамі.

Але нас не спужаеш
ніякаю карай,
і той, хто з бядою
быў колісь знаём,
умее адным,
але моцным ударам
крывавую спадчыну
весці
на злом...

Сябры мае!
Нашае права за намі.
Ўзнімайце ж песню
(паўстань і грымі!).
Ад крыўды былой
на камені камень
для нашых нашчадкаў
не кінем тут мы.

Былое агіды
пляўкі ды акуркі
змяцем і зарыем
ў ганебны курган.
Стаю я ў раздум'і
на слаўным падмурку
і мыслю:
агні праразаюць
туман.

І йдуць цягнікі,
і спяшаюцца людзі,
дымяцца вазёры,
гамоняць лясы:
Тут сонечны горад
наступнага будзе,
высокі, табою нязнанай
красы.

Ударныя тэмпы!
(Ударым жа дружна!)
Няхай наш завод,
нашы песні звіняць.
Мы ў бойках і шахтах
выкоўваем мужнасць,
мы мужна і шчыра
стаім ля стырна.

І хто калі з шляху
схіснецца на момант,
ўзнімі яго песняй,
каб сэрца ў агні
не ведала, дружа,
ні болю,
ні стомы,
і дужым, і моцным
дайшло ў нашы дні...

За кожнае слова,
за кожную шрубу
змагаемся поплеч —
ударнік, паэт.
За тысячы
новых тваіх Асінбудаў
адноўлены намі
у бойках
сусвет.

## 2. НОЧ ТРЫВОГІ
## І ПАЭТЫ НА ПРАРЫВЕ

Гэту ноч
ці выкажаш нанава?
Вось яна
цёмнай заслонай
раскінула змрок

(пачынае трывогу гудок),
і выходзім
ў парадку мы планавым.

І ідуць,
і хістаюцца
хмары-плыты,
і сінімі вуснамі
вецер
скуголіць.
Зялёныя,
злыя
ад крыўды і болю,
нямеюць без торфу
і нафты
катлы.

І ідуць ваганеткі
жалезным крокам,
і граблі рук
заграбаюць торф.
Над балотам,
ахутаным змрокам,
ўстала чорная цень —
Бэнкендорф.

Бэнкендорф, —
гэта нам знаёма!
Вось крывавыя пальцы
і збіты рот.
Вы гramілі нас калісь
мячом і громам, —
высокапастаўлены
ідыёт.

І цяпер дзе-небудзь
ў палацах Версаля
паціраеце рукі,
даючы наказ.
Вы марыце:
фабрыкі сёння сталі, —

заўтра вы кажаце:
— Ў добры час!

Многа ёсць хлеба
на тых палетках,
і лесу, і золата
аж праз край.
Цэлься, дружыннік,
сурова і метка,
гэта ж і ёсць
твой няказачны рай.

І вось
узнімаюцца пальцы
гарматаў,
і ангел-збавіцель
узводзіць курок,
і ангел-збавіцель
штурхае за краты
таго, хто ‘шчэ мае
і сэрца,
і зрок.

Ў блёк-ноце Пілсудскага
мы занатованы.
Распесціцца вусам,
і скажа: — Вунь той...
І пойдзеш краінай,
жандарам зруйнаванай,
як кара
за кожны прагул
і прастой.

Таму так і ўзняты
няўтомныя рукі,
і ў гэтую ноч
і праз вецер, і стынь,
здаецца,
пракладваем рэйкі да ўнукаў
і людзям наступнага
ўзводзім масты.

Ох, як жа звіняць,
захліпаюцца рэйкі,
ты чуеш —
адбою ўрачысты гудок?
І зноўку магутны
і радасны нейкі
ўрываецца ў вёскі
і ў фабрыкі
ток.

Мы самі здабылі
высокае права
ударнае працы,
бо волаты мы.
І новы паэта-ударнік
другому уславіць
узнёслы наш дзень
між краінаў чумы.

Ідуць міліёны
ўстрывожаным крокам,
каб новую песню
нанова тварыць.
Слаўнай эпохі
ідуць разьбяры
з сэрцам гарачым
і сонечным зрокам...

А тут вось —
паглядзіш —
балюча і крыўдна —
складаюць паэмы,
як быццам назло,
за дзве або тры
звышбюджэтныя грыўні
паэта Лявонны
і нейкі Мурзо...

Яны прапісалі
і зоры, і месяц,
хоць, здэцца,

не бачыў ніхто іх тады.
Чаму б ім і сонца
куды не падвесіць? —
І ім, і рэдактару
меней бяды.

А потым жа крытык
(і гэта вядома!)
падпусціць слязіну
(а ва Кабакоў),
улічыць і талент,
улічыць і момант,
і трохі паганіць
за сувязь з тугой...

Рабочы-ударнік,
змяці гэту дробязь.
Ты вырасціў
сонца свайго гарады,
яны ж
з цябе ляльку якуюсьці
робяць
і думаюць —
лялькай застанешся ты.

Я знаю — за ноч,
што не выкажаш
зноўку ты,
што намі узята ў агонь
і штыкі,
адорыш паэта
высокай пуцёўкаю
у слаўнае заўтра
без слёз
і тугі.

## 3. РАХУНАК ПАЭТА, ПАДАДЗЕНЫ ДА АПЛАТЫ

*Камсамолка Каця Крычэня скончыла жыццё самагубствам, уключыўшы сябе ў лінію электрычнага току... Прычына самагубства — няправільнае зняцце з работы і прыпісванне ёй шкодніцтва, якое ўтварыў рабочы; з гэтым рабочым Крычэня жыла некаторы час.*

Сэрца скажа:
даволі, скончана,
і не дрогне, напэўна,
рука.
Не заўсёды ж
з усмешкай блукаць
па дарогах
любві
неаплочанай.

Дужа ясна
і дужа сціпла —
восень ў сэрцы
ўзрасціла змрок,
і за твой,
гэты дзікі крок,
вораг, пэўна,
з усмешкай
вып’е.
. . . . . . . . . .
А гавораць:
— Ну, што ж, самагубства:
той прынадзіў,
а той абмануў...
І нясуць
несусветнае глупства
і пра смерць чалавека,
і — нашу вясну.

Я гляджу
на маўклівае гэта
аблічча,
дзе прайшло
дзесяць тысяч
шалёных вольт,
і яно да адплаты
бязлітаснай
кліча,
і яно узнімае і гнеў,
і боль.

Хто расціў
у грудзях канцылярыі?
Хто ў партфелях
пачуцці насіў? —
патрабуюць адказу
ад вас, пралетарыі,
аб загубленым вамі
у „справах“
жыцці.

Чалавек —
гэта вам не мумія,—
ўзяў са склепу
і выштурхнуў вон,
чалавек —
гэта сад
з залатымі думамі,
дзе па жылах праходзіць
блакітны агонь.

І вось тут,
дзе грыміць дыяратар
ўстрывожаным гулам,
і голас дынама
ўстае над табой,—
таварыш, трэ' быць
і суровым, і чулым,
і заўжды гатовым
выходзіць на бой...

Мы новыя ўзводзім
падмуркі і сцены,
а нехта рукою нахабнай
іх пляміць,
як быццам з палацаў
Парыжа ці Вены
над краем ўзнімаецца
даўняга замець.

Налева піўнушка.
Там вые гармонік,
над вуліцай б'ецца
стотонны туман,
і ты галавою
аб злы падаконнік
сябе разбіваеш
да крыўды
і ран.

Ўстае над табою
руінамі згуба.
Тут вораг
штурхнуў цябе ўчора на дно,
і смокчуць нямыя
зялёныя губы
шалёную шклянку
з крывёй
і агнём.

Ты робішся ворагам,
злосны прагульшчык,
спыняеш вагоны
і крышыш станкі,
і далей,
ўсё далей
з надломанай кручы,
куды не падаць
ні агню,
ні рукі.

. . . . . . . . . . . . . . .
Змагайся, мой сябра,
з прарывамі ў сэрцы
за тых, хто упаў
і хто падае ўніз.
Грамі
канцылярскіх натхніцеляў
смерці,
так званых пралаз
і падліз!

Ніякай нам літасці
сёння не трэба,
мы проста і шчыра
свой край беражэм.
Над намі, як вечнасць,
шырокае неба,
і слаўныя дні
нашых слаўных паэм...

І мы аддамо
усю сілу змаганню,
ўвесь розум і сэрца
нашчадкам вясны.
Мы будзем лячыць
і смяротныя раны,
каб пляміць усход наш
не смелі яны.

## ПЕРШЫ ДЗЕНЬ НА ЗАПАЛКАВАЙ ФАБРЫЦЫ

Да жахлівасці
жорсткае цела станка,
і іграе вачыма
сяброўка ў зялёным,
і гудуць,

і праходзяць
па сэрцы цыклоны,
абрываючы дні
залатога вянка...

Я схіляюся да жалеза і дрэва
бліжай,
і раптам
з адвечнага мора імглы
завітвае вецер —
сляпы чарнакніжнік —
прычытаннем асіны
і енкам пілы.

На палі пралілася
зімы сівізна,
смерць прыйшла
беспадстаўна і жорстка.
Ах, людзей гэтых
чортава горстка
працавала без літасці
аж давідна!

А раннем
па рэйках скакалі вагоны
(бязмежнасць шляхоў
і бязмежжа шляхі!),
нас вецер праводзіў
і ныў, як шалёны,
зняслаўлены творца
жабрацкай тугі.
. . . . . . . . . . . . .
І вось ён прыйшоў,
і ударам ў вакно
парушыў спакой,
узбудзіў успаміны
дрымотнага лесу
і зорнай даліны,
і тых, што жывуць,
і памерлі
даўно.

Ляжыць прада мной бервяно —
не ахопіш,—
стаю і дзіўлюся:
сінь кідае ў жах,
і слаўны,
і заўжды задуманы хлопец,
гаворыць паэта
і сябра мой —
Стах —
пра наша юнацтва
і старасць
Еўропы.

Сінь дрэва,
я знаю,
і гэта няйначай,
з’яднана ў адно
з сівізной валасоў,
з зімою,
з мяцеліцы
рыкам і плачам,
ганебнаю песняй
нядолі жабрачай,
і з панскай пятлёю,
і з выгукам
соў.

І гэтае дрэва,
пшэпрашам, за дзверцы!
Ў агонь! —
каб эпоха
свяціла ярчэй!
Каб нашай рэспубліцы
дужае сэрца
не знала змяінай атруты
начэй.

Каб сонца і птушка
ўрываліся ў вокны,
Каб промні шугалі

з кутка у куток,
каб заўжды ўключалі
як быццам знарок мы
у нашыя сэрцы
вясны сваёй ток...

Я ж з песняй
праз дымныя рэкі
і кручы
праношу свой лёс,
як жалезны набой,
каб нашай эпосе
быць заўжды сугучным
і гэту эпоху ўзнімаць
над сабой.

Другой пяцігодкі
смарагдавы выбух,
як дзень малады
над краінамі крат,
заліў
залатымі праменнямі шыбы,
і так, як, напэўна,
зрабілі і мы бы,
так робяць — кітайскі гарняк
і салдат.

Нам поруч змагацца
і поруч ісці нам,
каб ў новым
сусветным саюзе краін
ні маткі,
ні сёстры
не неслі асінам
да бацькі ці брата
надломленых спін.

Мы лепшае дрэва,
без сіні, без зломаў,

як наша юнацтва,
бярэм у станкі,
і шчырасцю песцім,
як сонцам і громам,
і поім
крыві сваёй
вогненным ромам,
каб класці набоем
агонь ў карабкі.

Маленькай запалкай
пажар рэвалюцый
падпалім
на чорных раўнінах зямлі,
каб нашыя думы
і нашы пачуцці,
як танец на ружах,
на зоры
раслі.

*

За гэтую працу,
за дружбу і шчырасць,
за кожнае слова,
за кожны наш
выраз —
вітае дзяўчына
ў зялёным агні,
каб сэрцам ішлі
маладыя
цыклоны,
па моры — эскадры,
па рэйках — вагоны,
ўсё далей,
ўсё ўперад —
на грудзі вясны...

## ПАВОДКА І ПАЭТ РАСПЛАЧВАЮЦЦА ЗА МАЛАДОСЦЬ

*Яны не журыліся ад гора і не дзівіліся смерці. Яны ведалі: жыццё — не сенажаць з кветкамі, жыць — не кветкі на сенажаці збіраць.*

**Л. Лявонаў**

Шуганула сонцам,
ударыла цёплым ветрам
знячэўку,
і пайшло і пайшло —
без граніц,
цераз берагі.
Хвалі наладзілі
нечуваную спеўку,—
гэта вясна-чараўніца,
мой дарагі!

Падставім грудзі
барвоваму промню:
пяшчоце і гневу,
і смутку яго,
каб наша любоў,
маладых і нязломных,
ішла, як вясна
ля сваіх берагоў,—
гэта адчуй і запомні!

Ў сэрцы людскім,
як пад снегам і лёдам,
б'ецца жывы
і гарачы струмень.
З ім нам крышыць
і ламаць перашкоды
дарогаю мужнай
у заўтрашні дзень...

Туманы, як вапна,
калі на яе

ты пырснеш
гаючай вадою.
Яны адыходзяць
сваёй чарадою,
як дзеды і прадзеды
па даліне.

Дзівак!
Ты стаіш ў асвятленні
вясны няўтомнай,
ты любіш жыццё
і ты творыш жыццё,
каб грала паэмай яно
мнагатомнай,
як грала калісьці
тваё пачуццё.

За ўсё,
што належыць табе
й наканована,
за жорсткасць эпохі,
за дружбу жанчын,
за ночы пакуты,
жыццём не падкованай,—
ты будзеш плаціць,
і плаціць
не адзін.

Прачнешся аднойчы,
і ў смешнай каморцы
адчуеш, як кроў
пачынае мярцвець;
маленькі агеньчык,
падобны зорцы,—
сціскаецца, й тухне,
і стыне,
як медзь...

Ўсё гэта так проста
і ўсё так звычайна.
Прыйдзе халодны
і жорсткі загад,

і ты прагаворыш,
як некалі Гайнэ:
„На кудры і сэрца
ідзе лістапад“.

Мы будзем судзіцца
па песнях
і справах,
і мы вось не скажам,
як дальні паэт:
„Трыста год славы
за добрую страву,
за смачна табой згатаваны
абед.“

Мы знаем, за што нам
змагацца,
ў што верыць,
і мы, набываючы сталасць,
вядзем
сваю маладую эпоху
наперад,
як стройныя шэрагі
слаўных паэм.

З якім захапленнем,
з якою трывогай
кіпіць тут работаю
кожны куток:
ўсё стройна, размерана,
проста і строга,
давай жа за гэта,
браток!

Наступнаму ўсё
ахвяруй без адчаю,
і жорстка праўдзівы,
і кволы заўжды,
эпоху ўзнімай
баявымі плячамі,
каб заўтра праз шчырасць,
зямлю і гады
цябе, як жывога,
як сына стрэчалі…

Ты рос са стыхіяй,—
з вясной і паводкай,
і сёння,
кратаючы сонца крыло,
выводзіш абрысы
сваёй пяцігодкі,
каб, можа,
дарогаю самай кароткай
трухлявую спадчыну
весці на злом.

Ты меней зямлі
і старэй рэвалюцыі,
і сёння,
юнацтву сказаўшы — бывай,—
ідзеш
і ўліваешся ўсімі пачуццямі
ў бурнай вясны
залаты карнавал...

І калі зразумееш,
што справе аддадзена
наша юнацтва
(без крыўды бяры!),
ўстане яно
агнявой аграмадзінай,
так жа, як мора ўстае
на зары.

Шуганула сонцам,
ударыла цёплым ветрам
знячэўку,
і пайшло і пайшло —
без граніц,
цераз берагі
хвалі наладзілі
нечуваную спеўку,—
гэта вясна-чараўніца,

мой дарагі!

## МОЙ СЯБРА КАПУСЦІН

*...Ёсць толькі адна радасць— творчасць. Усе астатнія — цені, што праходзяць па зямлі, не пакідаючы слядоў,— чужыя жыццю. Усе радасці жыцця ў творчасці. Любоў, геній, праца — усё гэта ўзлёты сіл, што выйшлі з аднаго полымя.*

**Р. Ралан**

Дзень ударыць блакітным прыбоем —
ўзварухне пыл і бруд.
Загамоняць
шляхі.
Кожны дзень, нам прызначаны, любы,
з табою
трэба песціць і браць у штыкі.

I

Шуганула святло
над заводам.
Першая змена.
Аўтаматны цэх.
Дрэва і серкі
знаёмы водар,
і за плячыма гады
няўдач
і уцех...

Стаяць аўтаматы,
вялікія, як сланы,
вогненныя,
як дынаміт.
Толькі спрабуй няўважна крані,—
і пойдуць яны граміць.

На вокны і сцены
кладзецца дым
валасатай
такой
рукою,
і на сэрца тваё
людское —
аскабалачак
сернай
руды.

Вокны тваіх
вачэй
пачынаюць слязіцца
(доўга, цьмяна!)
у зялёныя глыбы
халодных начэй,
праз імглістую
сетку тумана.

А бывае і так:
шугане агонь,
як абразай
ударыць па твары,
і з твайго
адранцвелага сэрца,
таварыш,
вырываецца глуха,
па-воўчаму —
стогн.

Гэта падае
на халодны дол,
на каменны дол
будаўнік.
Гэта рукі яго,
гэта скроні яго,
гэта сэрца яго
у агні.

Каб заўсёды
пульс фабрычны біў
і каб знішчыць
прастоі, аварыі,—
трэба машыну
умець любіць,
трэба ведаць яе,
таварышы.

Будзь уважным,
падрэзчык,
макаль:
гэта жарты з агнём,
можа, жарты
і здзек,—
і на вецер ўзлятае
заморская „stal“,
а галоўная справа,
што наш
чалавек!

II

Крывавы алмаз
начапіўшы на грудзі,
закацілася сонца
за дымныя далі ракі...
Вось скончана праца.
Вяртаюцца зоры і людзі,
і вечар ва ўсе пралязае
куткі.

Ідуць над сусветам
радыёхвалі,
палыхае каханне
на скрыпках імглы
ад растручаных крыўдаю
выспаў Італіі
да адзінай у свеце
Савецкай зямлі.

Ў гарадах,
пад распаленым сонцам
чужыны,
зліваюцца разам
у дзікі прыбой:
удар бізуна,
спеў галоднай жанчыны,
і руж палыханне,
і смерці
набой.

Сухотных падвалаў
пахмурыя плямы
кладуцца на шлях,
як на сэрца адчай...
Там кожная вуліца —
вынятак з драмы
для п’яных раскош
залатога лыча.

Ламі яго!
Глушы яго!
Грамі яго!
Бі нянавісці жорсткім кінжалам.
Па варожаму стану —
агонь!
Па ганебнай
крамніне —
агонь!
Каб рэвалюцыя
не памірала.

III

Мы слухаем радыё.
Зорная сетка
ухутала ноч
залатою чалмой,
і месяц нас мучыць,
як выцяты сведка,

народжаны
дзікай турмой...

Куды вы пытаеце,
пане, пуцёўку? —
Хіснуліся банкі?
Стаў новы завод?
— Вяроўку? —
адзінае выйсце —
вяроўку!
Вяроўку
ад чорных клапот!..

IV

І раптам —
праз белыя грудзі
туманаў,
як мора прыбой
на світальнай зары,
выростае гімн
пяцігодняга плана
ў адзін баявы,
неўміручы
парыў:
„Аддай увесь розум,
ўсё сэрца,
ўсю сілу
наступнаму дню,
што ідзе на шляхі,
каб ў краі магіл,
дзе журба галасіла, —
высокія ружы
пад сонцам цвілі“.
.........................
Ўсё гэта пра нас
і пра нашую працу:
„Мы выканалі
свой прамфінплан на 103.
Мы змагаліся за 1040
і 518 —

маладога жыцця
змагары“.
„Капусцін Мікола
на фабрыцы „Сталін“
ўзяў сеткаю нораў
асілка-каня:
дыхне ён агнём
на жалезныя струны прагалін,
дыхне і нямее —
смяротная
гіне гульня“.

*

Ноч кідае ў нетры
свой метэор,
дымяцца туманы
над злымі азёрамі свету.
Вітаем друг друга,
і музыка зор
акампануе паэту.

Ўсё лепшаму — лепшыя.
З вуліцы зоры
ўрываюцца ў хату,
на вуліцы пуста,
і песню заводзіць
пра „Сонечны горад“
мой сябра-ударнік
Мікола
Капусцін.

## ЛІСТ ДА ПАЭТА ПЕТРУСЯ БРОЎКІ

Я повен энергіі —
груды работы,
хоць тут

не сталіцы грымлівы разгон,
і ты не адкажаш,
быць мо, праз клапоты,
я ўсё ж ткі чакаю,
а покуль —
паклон.

Я гутарку меў пра цябе
ў перапынку:
пра росквіт краіны,
пра мужнасць шляхоў,
і вось,
стаючы
прад „паштоваю скрынкай“,
надумаў паслаць табе
некалькі слоў.

Ты помніш,
як білася ў бераг Дзвіна,
і хвалі гулі
і ўставалі, як горы?..
Там нашага сонца
і песні вясна
між нізін і узгоркаў
праходзіла ўчора.

Палыхалі прад ёй
залатыя сады,
асыпаліся зоры
і падалі ружы,
і шлях
неутомнае
нашай хады
быў промнямі дружбы
асветлены,
дружа!

І горад князёў
з яго славаю княскай
прад поступам нашым
ляцеў дагары,

і горад другі,
бы чароўная казка,
як рэха музыкі,
ўставаў на зары.

Як дзіўна ўсё гэта:
вясна і юнацтва,
і яблыні белай
нясплямлены цвет,
і ты,
што выходзіў з пацёмкаў
змагацца,
стаіш прада мною,
мой сябра,
паэт.

У змятай шынельцы,
у кепцы і ботах,
і з зорамі воч
над раўнінай вады,
салдат
неўміручае
сонечнай роты,
ў вялікім паходзе
ці спынішся ты?

Такім цябе помню
і гэткім прымаю,
каб заўжды
на шлях агнявейных раўнін
выходзіць пад сонцам
высокага маю
на твой малады
несціхаючы гімн...

І сёння
вось тут —
на заводзе дубільным,
дзе гул шасцярон,
бы трывога Дзвіны,—
вітаю цябе я
за гонар і пільнасць

і слаўную вернасць
да нашай
вясны.

Як дадзена новым
нам права на зброю
шчырага слова
і звонкіх цягліц,
права на слаўную назву
герояў —
ўзнімем яго ж —
хай жыве і грыміць!

Я самы суровы
і ўдуманы крытык
і плямы прарываў сваіх
не таю,—
давай жа з табой
пагаворым адкрыта
пра заўтрага песню
маю і тваю.

Так многа
патрэбна сказаць нам,
так многа,
каб песня пяшчотай
і куляй была...
Каб нашыя сэрцы
над слаўнай дарогай,
якой мы ідзем,
не кранала імгла.

Мы ж часта губляемся,
з гулам і звонам,
з вянкамі агнёў,
з палыханнем надзей
праходзяць прад намі
байцоў эшалоны,
што ўпартая воля
наперад вядзе.

Стаіш
з адчуваннем забытага руху,

што б кідаў у бой
і жывіў у баі,—
ад слова „забі“,
што гавораць так суха,
да самага кволага слова:
„Любі“...

Ўсе сілы на бойку
за мужнае сэрца,
што дзіўным агнём
аздабляе наш стан,
за песню вясны,
супраць бруду і смерці,
за нашу краіну —
усход хараства!

І ты мне прабачыш
за шчырыя словы,
за шчырыя словы,
што сказаны мной
у рогаце буры
дынамы суровай,
як колісь над грознай
і злою Дзвіной.

На гэтым і скончу.
Так многа работы,

# 1933

*Бывай, вясна мая, бывай.*
*Агнём любві тваёй сагрэты,*
*не адцвіту я пустацветам,*
*перада мною ж не дрыгва,*
*мае сябры, мае паэты...*

## ЯШЧЭ РАЗ ПРА ПАЭЗІЮ І РУЖЫ

*Для таго, каб складаць песні,*
*патрэбна быць самому песняй.*

**Р. Ралан.**

Майму сябру і аднагодку
прынеслі ружы
чырвоныя і белыя —
кроў і сляза,
і вочы бліснулі —
два промні ляза,
зразаючы думак
суровасць
і сцюжу.

Гэта яго
надарыла каханне,
музыка блізкай
і роднай істоты,
шчырасць зямлі
і зямныя клапоты
ў момант
вясновага іх
развітання.

Любая дзяўчына! —
гэта не словы,
гэта
алмазныя кроплі крыві,
і ты не нахмурыш
журлівыя бровы,
не станеш ухмылкаю
вусны крывіць.

Не! Не табе
жабраваць у тумане
з просьбаю сонца
вышэйшай ясноты...
Гэта з табой,
і не будзе змяркання
ў часе прыліву
тваёй адзіноты.

Хто ж там смяецца?
Хто плача з дакорам? —
Наша за намі...
Галіна, пастой:
цябе хвалявала
нялюдская змора,
а час супакоіць
гаючай
вадой.

Іграе вада
белапеннай імглою,
мінаюць гады,
адыходзяць сябры.
Юнацтва, як песню,
на шпальты бяры
і вырасцеш казкай
над дымнай зямлёю.

Зямля — гэта база,
жыццё ж — надбудова,
і ты, чалавек,

толькі частка зямлі,
ствараеш законы
на думкі і слова,
каб лепш твае ўнукі
і дзеці жылі.

Заўсёды магчыма
суладзіць з патрэбным,
з сабой жа суладзіш
да пэўнай пары.
Хай славяць курорты
Барашкі сябры,
блукаючы ў горах,
пад месяцам срэбным...

А горы дымяцца,
красуе Каўказ,
і хмарка
на чыстым ўстае небакраі,
дзе Лермантаў вёў
свой нярадасны сказ
пад гыркат і смех
груганове зграі.

Там Пушкіну
родным быў Церака гул,
і глыбаў каменных
ўстрывожаны рогат,
і песні грузінкі,
і ворага скогат,
і ўсё, чым хварэў
чалавечы аул.

Там быў і Купала,
і дзіўным святлом
праменілі вочы,
і сэрца спявала,
і песня, як мора,
арліным крылом
будзіла ў надранні
ружовыя скалы.

І скалы гарэлі,
і ўвесь, як алмаз,
у слаўнай красуні-зямлі
на далоні
іграў сваім гневам
суровы Каўказ,
і дні сівізну праліваліі
на скроні.

Стаіш, апраменены
вечнай зарой,
гарадь твае думы —
агні-самацветы,
і тыя,
што кінуць цябе без прывету,
табой жа асветлены,
ўведзены ў строй
на шпальты жыцця
змагара
і паэта.

І ты не мыляешся, Галя,
ані,
бо справа не ў дробязях,
гэтак і трэба,
каб наша юнацтва,
як майскае неба,
расло і спявала
на зорным агні.

Навокал світае,
і вусны зары
кратаюць усмешкаю
цені шпалераў,
і хочацца верыць,
мае вы сябры,
што ўсё гэта,—
поўнае сэнсу і веры,
іграе жыццё маё,

чорт падзяры!

* * *

Бывай, вясна мая, бывай.
Агнём любві тваёй сагрэты,
не адцвіту я пустацветам,
перада мною ж не дрыгва,
мае сябры, мае паэты.

Я знаю,— ў кожнага ёсць блізкі,
і для мяне быў блізкім хтось,
хто кожны дзень, як у калысцы,
маю журбу над светам нёс.

Таму й схіляюся у пояс
ўсяму, што звязана з вясной,
і юных дум адчай і боязь
я узнімаю, як набоі,
калісь гартаваныя мной.

* * *

Эсфіры ГЛІКМАН

Ударыць сэрца раз —
штуршок адзін… другі…
З вачэй спадзе алмаз
і пад вачмі кругі.

І ты адна. Адна
ў цяні сівых бяроз.
Памеркла сінь вакна
ад кроплі зорных слёз.

Складзі мне песню ты,
старынны, сумны спеў.
Хай гэты зорны дым
напомніць часу
бег.

Я знаю, прыйдзе час —
штуршок адзін, другі...
Памеркне воч алмаз,
спадуць з вачэй кругі.

## ІЛЖЭУДАРНІК АБРАМАЎ З ФАБРЫКІ „ДЗВІНА“

*Чорная дошка — эмблема пячалі.*
**З**
**фабрычнага**

Фабрыка ўзніме
жалезную лапу
і будзе працягла,
па-воўчаму выць,
а ён? —
ён не зрушыць сваёй галавы,
і сімвал спакою
плыве над канапай...

Дзіўная музыка
учарайшага вечару
яшчэ жыве ў ім,
яшчэ не патухла
надзея —
смяяцца,
спяваць
і слухаць
таксама
надрыўную песню

нечую.

Зялёныя твары
незнаёмай казкі
крывяць ухмылкаю
вусны ў дым.
Нашто на сталах
зажурыліся краскі? —
як быццам труну
убіраюць браты!

Дымнае возера,
і, склаўшы рукі,
ён кідаецца туды
і нырцуе да дна,
і робіцца гэтак:
ні крыўды, ні мукі,
як быццам падаў хто
кілішак віна.

І думае так:
„Нашто парыванні? —
я самы шчыры змагар
за жыццё,
бо толькі праменным
даецца змярканне,
і толькі бурным
даюць забыццё!“

А сонца б’е ў вокны
шырокай ракою,
і муха назойліва
кратае лоб...
Ён супраць яе...
Ён штурхае рукою...
Зацішша ізноў,
абы добра
было б.

І раптам
зрываецца
чорнаю хмарай

жалезнае
жорсткае слова — прагул,
і горада
раннем абуджаны гул
у міг разбівае
салодкія мары.

У сэрца заглянеш —
як быццам хто плюнуў
і ботам расцёр
свой крывавы плявок,
і сплямлены думы,
і сорваны струны,
і хітрыкі нейчай
заграз паплавок.

Ён будзе шукаць
па кішэнях на піва,
і, не знайшоўшы,
на скрыдлах тугі
стане выдумваць
байкі і дзівы
за куфаль, пастаўлены
некім другім.

А горад грыміць
і спявае так шумна,
за працай ударнай
спявае зямля,
і белыя вішні
ў чыгунныя струны
ўліваюць варожасць
пчалы і чмяля.

Спяваюць станкі
і за вокнамі — птушка,
спявае нутро,
бы у першы усход,
а недзе ў далёкай піўнушцы
асушка
бярэмя бутэлек,

цяжару, клапот.

Тут так жа асушка,
асушка гнілога,
ўсяго,
што за дваццаць стагоддзяў імглы
лягло, як растручаны звер,
ля парога
наступнага дня
найпрыгожай зямлі...

Тут вечна асушка,
і сонца кратае
сваё залатое
над краем крыло,
каб ў песнях рабочых
і ў песнях ратая
жыццё, нібы танец на ружах,
расло.

Тут вечна асушка,
былога асушка,
і вось,
апранутая сонцам вясны,
ганебнага бацьку
змяняе дачушка,
каб сэрца не дрогнула
гулкай „Дзвіны“.

Час выкрасліць гэта,
як чорную драму.
Наступнае йдзе
і нямеюць шляхі,
і ён застанецца аднойчы
за брамай
высокага ўсходу —
сляпы
і глухі...

На гэта найвысшае шкодніцтва

часу
фабрыка ўзніме
апошні удар,
каб ззяла жыццё
нечуванай акрасай
над чорнай магілай
калек і няздар.

## МАЯ КАХАНАЯ — РЭДАКТАР ГАЗЕТЫ

*А у нее от луны ресницы видны,*
*большая берёт грусть.*
**У. Лугаўской**

Мая каханая —
рэдактар газеты.
Тонкія бровы
над блакітнай раўнінай вачэй —
два кавалкі
іспанскіх мячэй,
накановаsucces сэрцу
паэты.

За капейкі
свайго ганарару
я хадзіў з ёй ў кіно,
скіглеў у яе пад дзвярмі.
Я высокае і кволае слова —
дарагі таварыш —
дыяментамі сэрца карміў.

Лёгка падае на каменні
прамень усходу,
але слёзы дажджоў
не расчуляць адвечных глыб.
А вось як жа мне —
юнаку чалавечага роду —

ўгаманіць мнагатоннага сэрца
Турксіб?!

На тысячы вёрст
маё каханне.
Рэйкі аорт
узнімаюць гарачую кроў...
Міліёны крывінак
у пакутна-балючым тумане
Загараюцца вечнай зарой.
Я пішу ёй
сагрэтыя сонцам гімны,
За вокнамі ж мяцеліцы
б'ецца глухі вадаспад.
Белыя цені
заходзяць у белы
застуджаны сад,
і скокі вядзе карагод іх
нястрымны.

„Аня, родная, —
зоры бягуць,
танцуюць ружы —
і я люблю.
Вецер-гарэза
упаў на зямлю,
вечар на рэйках
пакінуў нагу".

„Ў сінюю ноч-туман
плача юнацтва
забытаю скрыпкаю.
Песня ж і сэрца
адзін акіян,
дзе ты жывеш
златазлітаю
рыбкаю".

„Пакрыўджаны дружбай,
прыйшоў да цябе.

Злітуйся —
вярні мне
далёкія зоры,
хай мора пачуццяў
грыміць,
і гаворыць,
і ў грудзі паэты
гармонікам
б’е“.

„Мне хочацца жыць
і не крыўдным жыццём,
хай горныя птушкі
жахлівае думкі
не лягуць на сэрца
апрыклым асцём,
каб радасці плётак
не ведалі кумкі“.

„Ты зможаш усё,
нат вярнуць да жыцця.
Жаданая дзеўчына!
Сэрца не хлусіць,—
давай за сяброўства
з вясною ў хаўрусе
блакітную казку
твайго пачуцця“.

„Я многіх пакрыўдзіў
і цяжка мне,
што, крыўджаны сам,
не ўмеў разабрацца:
ці па сваёй
ці чужой віне
вырас на гора
роднае матцы“.

„Аня, родная,—
зоры бягуць,
танцуюць ружы —
і я люблю.

Вецер-гарэза
упаў на зямлю,
вечар на рэйках
пакінуў нагу“.

Яна прачытала,
нахмурыла бровы,
глянула скоса,
запаліліся дымна агні.
Яна кінула жорсткае
і ганебнае слова:
— Не... ма-ні!..
„Не гэткія
сэрца хвалююць
турботы,
і ты ўжо
не гэткі гарэза з гарэз!“
Ах, вузкіх вачэй
няўважны разрэз
бліснуў аганькамі
чужой адзіноты.

Два кавалкі
іспанскіх мячэй
прарэзалі глуха
паэтавы грудзі...
І тады я прыпомніў:
за вокнамі студзень
вадаспадам мяцеліц цячэ.

Я кідаю ў кошык
выцяты верш,
я разразаю на часткі
вякі і планеты,
і сэрца,
шалёнае сэрца паэты
у клетцы грудзей
вар’яцее,
як звер.

Лёгка падае на каменні
прамень усходу,

але слёзы дажджоў
не расчуляць адвечных глыб.
А вось як жа мне —
юнаку чалавечага роду—
угаманіць мнагатоннага сэрца
Турксіб?!

Гэта так не мінае,
і я, закаханы,
іншы верш ёй складу
(што было не было!).
Вецер стукае ў шыбы
касцянымі нагамі
і трывожыць мой сон...
Запаліце святло!

## ПАЧАСТУНАК

Вечары, ой, падпалены ж смуткам,
Як вочы палескіх дзяўчат.
Па вёсках рассыпаны чуткі:
Сягоння ўраджайны закат.

Напоўнена сэрца да краю,
І зорнага млека збаны
Да купы у песню збіраю,
Каб поўнымі сталі яны.

Журліва заводзіць гармонік,
Што ў лагеры вечар-юнак
На зорны прыпаў падаконнік
І ціха задумаўся так.

Эпоха ні з кім не жартуе,
А дружба не церпіць маны,

І мы за вясну залатую
Гарым у сусвеце адны.

За дзень ля грымлівай жняяркі,
Ля домнаў тваіх і гармат
Табе усміхаецца ярка
Надзей залаты вадаспад.

І п'юць яго прагныя вочы,
Як вочы каханкі-вясны,
І хочаш адно, ці не хочаш,
Ўсё роўна ўсміхнуцца яны.

Калі ж над садамі бясшумна
Зноў лягуць сцярвятнікі хмар,—
Угледзяць яны пачастунак,
Як лепшы ў краі гаспадар:

Гарматы дадуць караваі,
Спякуць кулямёты бліны,
І шаблі, што мы гартавалі,
Нальюць ім віна у збаны.

І зноўку з палёў ураджайных
Дажджом агнявейных зярнят
Азначаць вінтоўкі на жаль ім
Грудзей медалёвы плакат.

І ў вечар, што вырваны з кратаў,
Там танкі — заводаў сыны —
Напішуць другія плакаты:
„Вайна гэта — супраць вайны!“

# 1934 — 1935

*...І сад надзей, сад віхраў зорных*

## ПЕРШЫ СНЕГ*

Дзе лясы,
дзе воўчы перабег,
лебядзіным пухам
першы снег
лёг на голле дрэваў,
на палі.
І, здаецца, сосны —
расцвілі.
Заіскрыўся
пышны самацвет,
дзе лясы,
дзе хітры воўчы след.
Пчолы не лятуць
на сенажаць,
больш мядзведзю мёд
не каштаваць,
галаву ён ніжай
апусціў —
дзікіх пчол мядзведзю
не знайсці.
Апусцеў і лес,
і сенажаць,

---

* Разам з Т. Кляшторным і А. Дударом.

і мядзведзь залёг
ад гора спаць.
Смокча лапу ён
і бачыць сны,
так праспіць
да самае вясны.
Дзеці ў лес
на лыжах пабягуць,
звонкі смех па лесе
разнясуць.
Будзе снег пад лыжамі
рыпець,
не пачуе гэтага
мядзведзь.
Будуць дзеці
жартаваць і пець,
не пачуе гэтага
мядзведзь.
Будзе лес
шумець і шалясцець,
не пачуе й гэтага
мядзведзь.
Будзе снег іскрысты
зіхацець,
не пабачыць гэтага
мядзведзь...
Дзе лясы,
дзе воўчы перабег,
заіскрыўся першы
лёгкі снег.

## ПІЛОТ

І ў сэрцы дрож,
і ў прапелеры дрож.

І вочы —
сто тысяч братоў алмазных.
Песню
на сэрца,
на сонца памнож,
і выйдзе блакітнай
яна адразу ж.

У нашай краіне
такая вясна!
І моладзь такая
крылатая!
Калі узнімаюцца
два крыла,
на іх узіраецца
ўся страна,
самая прыгожая
і багатая.

І вочы, як неба,
і вочы агнём,
блакітным агнём
апраменены.
Ты ў неба ўзлятаеш
мяцежным арлом,
ты ў небе іграеш
бліскучым крылом,
дачка
агнявога натхнення.

І зорным дыванам
паўзе зямля,
зямля ў адзінаццаць
і ў дваццаць два,
ластаўкай бурнай
узлятае зямля, —
туды, дзе на сонцы
гарыць сінява,
туды, дзе крылатая
рэе братва.

Ты ўчора скакала на дол
з самалёта,
а сёння вядзеш самалёт.
Ты ўся залатая!
Ты з сэрцам пілота!
Ты ўся залатая!
Ўся сэрцам пілот!

Такая прыгожая! —
быццам зара.
І вочы пятліц
загараюцца небам.
Такая прыгожая! —
песня-зара,
такая прыгожая! —
сонца-зара,
такая прыгожая! —
ў золаце неба.

Расла ў камсамоле.
Цвітлівай вясной
ты марыла быць —
і пілотам ты стала.
Над самай прыгожай
маёй старaной,
над слаўнай краінай,
краінай маёй
вышэй ты за неба,
за сонца ўзлятала.

Ты ўся залатая
з вачмі залатымі,
з алмазным кастром
ў бліскучых вачах.
Над стэпам, над морам,
над дзікай стыхіяй —
герой-пераможца,
блакітны птах!

## З ЦЫКЛА „ПАЛЬМЫ ДАЛІНЫ“

### I

Б’ецца мора аб бераг круты.
А ці ж скажа аб тым, што не трэба
(Калі мірна, так хораша неба)
Біцца мору аб бераг круты?

Быццам другу, так дораг яму.
Я прасцёр свае рукі і крыкнуў: сюды!
Я ж пазнаў яго боль, прывітаўся на ты,
І, як другу, быў рады яму.

Не па назве ж адной мы свае.
Быў і я ж непакорны,
Быў ласцы чужы.
Знаеш, мора, ты шчыра скажы —
Не па назве ж адной мы свае.

Многа дзіўнага ведаеш ты.
Ува мне ж дзіваў сад
Патаемна жыве.
Песняй братняй аддам я табе
За твой бляск, за клапоты,
За стынь і агні.
Не пакрыўдзіш мяне ты,
Не згасіш ні-ні —
Песняй братняй аддам я табе.

Я прывёз прывітанне здалёк.
І яно твайго дна, тваіх нетраў глыбей.
Схамяніся і слухай — ўсім сэрцам табе
Я прывёз прывітанне здалёк.

## II

Ляжу і слухаю уночы
Званочкі ціхія цыкад.
Зачараваць як быццам хоча
Сваёй красой цвятлівы сад.

І льецца тонкі кветак чад.
І зорны змрок на зорны ганак
Бруіцца, быццам вадаспад.
Ўсё поўна ласкавага міру.
За цеплату, за ночы шчырасць
Я, як дзіцёнак, сёння рад.
Ўсё палымнее славай новай.
І хто б сказаў, што золкі град
Тут гаварыў смяротнай мовай,
Набатам жудасных гармат?

Калісь Шкуро* з ватагай чорнай
Тут сеяў смерць і смерці чад.
І сад надзей, сад віхраў зорных
Стаў садам шыбеніц і крат...
Нястомны ж ў бойках наступ бурны,
І ясны быў, як дзень, загад...
Байцы заводаў, хатаў курных
Ішлі на смерць, як на парад.
Ўсё неба ў зорах, светла, ясна.
Ледзь-ледзь шуміць зялёны сад.
І я, ўсхвалёваны і шчасны,
Упіўся музыкай цыкад.

## III

Было кругом, як у цудоўнай байцы:
Вада, паветра, кветкі і зямля,
І нават сонца дня у жоўтай майцы
Ішло з усмешкай ветлаю на пляж.

---

* Белагвардзейскі атаман.

Каралі золата на доле ўпалі.
Як палкі сон, каменні і пяскі.
Мора цвіло, спявалі звонка хвалі,
І чоўны кідала вакол ў бакі.
Званочкі радасныя песні-смеху,
Як вадаспад у мірны час начны,
Гучалі ў сэрцы доўгім-доўгім рэхам,
Такое шчасце толькі раз гучыць...

## НА ДАРОЗЕ

За працай
Радаснай і дружнай
Нам сонца шле
Сваё святло.
Вятры спяваюць
Славу мужным,
Пераліваюць зоры шкло.

Мы пракладаем
Шлях шырокі,
Каб маладосць прайшла па ім
Натхнёна лёгкакрылым крокам
У парыванні баявым.

Дзе панавала гразь адна
І ліўся дзедаўскі праклён,
Ляжыць ў прасторы, як струна,
Надзейны шлях
Да новых дзён.

Нібы красуня маладая
Ў вячэрнім змроку пад зарой,
Бярозка белая вітае
Сваіх гасцей,
Сваіх сяброў.

Калісьці
Волі мы не зналі.
А вось цяпер
Такі прастор!
На палатне зямлі
Мы ткалі
Яго дарог
Жывы узор.

Як сімвал
Нашае адвагі,
Як сакрамент
Людскіх надзей,
І вечны пал
Жыццёвай смагі
Ён нашы дні
З сабой вядзе.

Машыны
З збожжам прамяністым,
Каменнем,
Нафтай
І рудой
Імчаць наперад
Урачыста,
Як кроў
Краіны маладой.

І ў гэтым сходзе,
Бурным сходзе,
Над неабсяжнай стараной
Праменне сонца
Шчасце родзіць
І з ім сядае за стырно.

Наш ясны шлях
Ляжыць бясконца:
Той шлях бязмежны у жыцці.
Імчы ж наперад, шчасце, сонца,
І не спыняйся на пуці.

## БАЙКА
## ПРА МІШУ І ЗАЙКУ

Зайчык поле перабег,
Пакапыціў следам снег.
Снег глыбокі вельмі быў,
Зайка лапкі застудзіў.
Замарыўся, бедны, сеў,
Эх, каб лыжы зайка меў!
Ён скарэй бы мчацца мог,
Не марозіў бы ён ног.
А каб даць яму канькі,
Быў бы ён герой такі,
Што і Міша Траснікоў
Ад яго адстаць гатоў.

Выбег Міша за сяло,—
Поўна снегу намяло.
Мчыцца Міша, раптам — ах!
Што за звер такі ў кустах?
Вушы доўгія тырчаць,
Вочы косыя блішчаць.
Міша быў гатоў самлець:
Ён падумаў, што мядзведзь.
Міша лыжы пагубляў,
Звер таксама ходу даў.
Ратаваўся — хто як мог,
Уцякалі з усіх ног.
Потым Міша расказаў,
Як мядзведзя ён ганяў,
А прагнаў ён усяго
Толькі зайку аднаго.

## 1925—1935

# ІНАКШЫЯ ПЕСНІ*

### ПІЯНЕРСКАЯ ВОСЕНЬ

Хай восень плача, вецер стогне,
І хмары сцелюць цемрай дол —
Мы піянерскі сцяг сягоння
З табой узнімем, Камсамол!

І нашы песні юнай раці
Запаляць чырванню блакіт,
І ясным сонцам кожнай хаце
Адчыняць новыя вякі.

Мы праз навуку шлях праложым,
Дзе ззяе свет — душа гарыць,
Ніхто спыніць ужо не зможа
Юнацкай вольнай грамады.

Хай восень плача, вецер стогне,
І хмары сцелюць цемрай дол —
Мы піянерскі сцяг сягоння
З табой узнімем, Камсамол!

* * *

* Так сам паэт з горкай ironіяй назваў гэтыя творы, напісаныя мусова, калі даводзілася перацінаць уласнае горла.

О, выходзь, маладняцкая раць,
На прасторах маёўку спраўляць.
Наша сонца сягоння гарыць
Цветам яркім румянай зары.

На прасторах зялёных палёў
Ўсё цвіце-расцвітае, жыве,
Ўсюды радасць і звон галасоў,
Ўсіх прыволле сягоння заве.

А яшчэ так нядаўна, учора
Тут лілася рабочая кроў
І стагнаў пад ударамі горад,
І стагналі прасторы дуброў.

О, цяпер, мы цяпер не забудзем,
Не забудзем аб тым, што было,—
Хай абнімуцца новыя людзі
І абнімецца горад з сялом.

Сёння радасць б’е ў грудзі,
Сёння людзі, ўсюды людзі...
Сёння родны край цвіце,
Сёння вольны май заве!

**ЗА ШТО?**

(Памяці Сако і Ванцэці)

Мы бачым іх —
прыдушаных і збітых,
мы бачым іх
у роспачы глухой —
не ім насіць
імя бандытаў,
а з сэрцам вольным
і адкрытым

ісці да лепшых
берагоў.

І чым на свеце
можна апаганіць,
чым толькі можна
ў свеце асмяяць;
паны ў сваім
залочаным тумане
пусцілі байкі
аб смяротнай ране,
і што забойцы іншага
няма.

І вось цяпер
на электрычным крэсле
яны, як каты,
згінулі навек.
Паны смяюцца
пры смяротных весцях,—
для іх капейка
чалавек.

Няхай падчас
у нас яшчэ і сумна,
і песні радасці падчас няма,
затое мы
ў цяжкіх і прагных
думах
кладзём ўсё лепшае
на ласкавыя струны
і знаем, добра знаем,—
не дарма.

І я пяю
пра іх, глухіх і збітых,
пяю ўсім сэрцам
(слухай і любі!),
каб пад напеў мой
сакавіты:

— За што? — спыталіся
ў баі.

## ДЗЕСЯЦЬ ГОД

Ад палёў залатых і прастораў жалезных
І ад роспачы дзікай
Трывожных гудкоў
Я прынёс прывітанне
Пачуццяў мяцежных
І цнатлівую радасць маіх васількоў.
Дзесяць год маладых
І мяцежных, як песня,
Дзесяць год
Нашай песні
І нашай вясны,
І юнацкаму сэрцу ў грудзях стала цесна
Біцца пульсам кіпучым
Жыццёвай струны.
Веру ў песні свае і ў жыццёвую сілу —
Абудзіў нас Кастрычнік
Між творчых надзей.
Хай жа сёння не холадам прагнай магілы,
А вясной
І вяселлем
Квітнее наш дзень.

## ЯШЧЭ АДНА

Яшчэ адна бандыцкая расправа,
Яшчэ адзін бязлітасны удар.
Ў краіне, горам змучанай, крывавай,
Сябе на смерць за праўду ён аддаў.

І можа, там, за нашым даляглядам,
Жадаюць зноў і боек, і ахвяр,
Каб нашу волю, наш прастор і радасць
Пусціць на вецер к чорту, на пажар!

Няхай жа знаюць: бруднымі нагамі
Ім не прайсці над нашай галавой,
Бо ўсе мы, ўсе адзінымі шляхамі
За кроў сваіх адплоцім ім крывёй.

І ўсе адной вялікай пуцявінай
Яшчэ упарцей пойдзем і смялей,
А нашым ворагам не быць у той краіне,
Дзе будзе жыць краіна БССР!

* * *

Загараўся крывавы усход,
Я і сам барацьбой загараўся.
Мяне клікалі
Ў дальні паход,
Ў запазнёныя госці
Кітайцы.

Там далёка на жоўтай зямлі
Рэкі жоўтым вінам наліліся.
І, знікаючы,
Ўдаль паплылі
Трупы жоўтых людзей
Ад сталіцы.

Зноў паўстаў
Рэнегат Чан-Кай-шы —
Белы звер свае лапы
Скрывавіў.
І расце —
Загараецца бура ў душы,
Бура жоўтай нязвержанай
Лавы.

Трэ забыць і любоў, і спакой,

І вясны сваё сонца пакінуць.
Толькі мы
Сваёй львінай рукой
Можам львінае шчасце
Ім кінуць.

Цяжка сэрцу паэта маўчаць.
Сёння нашых братоў
Распінаюць.
Гляньце,— вобраз паўстаў
Ільіча
І зноў кліча на бой,
На змаганне.

Клічуць зноў у далёкі паход,
Ў запазнёныя госці
Кітайцы...
Ўсё ярчэй загараўся усход,
Я і сам ўсё ярчэй загараўся!

## ДВА ФРАНТЫ

Мінскай канферэнцыі ўдарнікаў прысвячаю

### І

...Помню ў агні рэвалюцыі
Вестку:
„Ўзялі Перакоп“.
Песні цвілі неўміручыя,
Марылі —
Ворага ў лоб.

Там, у палях, непаўторную
Склалі рамантыку
Куль...
Горда ішлі
Непакорнымі
На векапомным шляху.

Там здабывалі
У муках
Сонца жаданых вышынь,
Там загрубелыя
Рукі
Неслі з агнём карабін.

## II

Праляцелі за днямі дні,
Адпалалі агні па акопах,
І заместа агнёў
Перакопа
Асінбудаў палаюць агні.

Горда моладзь
Да працы ідзе,
У вачах нестухаючы промень —
Вось рамантыка
Новых людзей.
Вось рамантыка новага дому!
Гэта — дзіўная музыка
Дзей,
Гэта — фронт неўміручай працы.
Гэта — права
Працоўных людзей
Будаваць, і спяваць, і змагацца.

* * *

Калі растручаны пачуцці
І буры спеюць ў цішыні,
Ідуць зруйнованым бяспуццем
І паляць ўперадзе агні.

І гэтай праўды чалавека —
Быць чалавекам, не рабом —
Шукалі людзі век за векам,

Ў ноч ахвяруючы гарбом.

Ішлі, ішлі ў тумане,
Закуты ў кайданы.
Раслі сляды — курганы
Крывавай старыны.

Калісь была тут гільятына,
А ўчора створан дынаміт
На страх рабочых, селяніна.
І пан, падпанак, і наймiт —

Усе ўзнімалі дзіка рукі,
Як іх ўзнімаюць ў нашы дні
Ў краінах барбараў паны,
Калі вядуць на смерць, на мукі.

Прагрэсам і культурай
Там лічаць Лінчаў суд,
Але ўжо спеюць буры —
Ўстае працоўны люд.

Вайны не хочам мы сягоння,
Супроць крывавых боек мы.
Калі ж ў агні глухіх агоній
З краін і рабства і турмы

На нас узніме вораг лапу —
Мы наш савецкі горды штык
Крывёй паноў прымусім капаць,
Бо кожны з нас тут бальшавік!

Тады ў агні сусвету,
За новай песні дзень
Мы ленінскую мэту
Ў край змроку панясем.

## ЧУЕЦЦА МОРА ГУЛ...

Чуецца мора гул?..
Гэта працоўных калоны
Выйшлі нага у нагу
За светазарнае сёння.

Песні лятуць па-над дахамі,
Па-над бунтоўнай гурбой:
„Далоў, далоў манахаў,
Далоў, далоў папоў...“

Вочы цвітуць зарніцамі,
Горад сцягамі ажыў.
Час развітвацца з бажніцамі,
Пераламаць крыжы.

„Досыць у бляску вячэрнім
Бачыць праз краты званы.
Збіць іх адзіным імкненнем
І перадаць нам, яны

Хай узрастаюць,
Працоўных
Хай варштакі гудуць.
Тых не вучыць
Змагацца,
Хто узнімаў Асінбуд...“

Чуеце, чуеце гул?..
Гэта працоўных калоны
Выйшлі нага у нагу
За светазарнае сёння.
Горад. Грыміць акіян:
Знішчыць рэлігіі дурман.

## ПРЫЙШЛА ТРЫНАЦЦАТАЯ ВОСЕНЬ

Над полем
Дождж асенні росіць,
А пад палотнішчы сцягоў
Прыйшла
Трынаццатая восень,
Каб стаць
У шэрагі байцоў...

Яна прыйшла
Ў красе барвовай,—
Як свет старой
І заўжды новай.
І ў золата
Убрала край,
І ўскаласіла ураджай.

Мы ёй прыносім
Скарбы думак,
Мы аддаём ёй
Цвёрдасць рук.
Мы з ёй
Падлічваем падсумак
Вялікіх ДВУХ...

Дабрыдзень,
Восеньскае поле
Без меж й куколяў...
Дабрыдзень,
Фабрык карпусы,
Вам, неўгамонныя пасы!

Мы спалім
Даўняга атрускі,
За новы
Прымемся пасеў.
І над далінай беларускай
Мільёны гмахаў узнясем.
 Не першы раз
Ісці праз буры,

На Перакопе,
На Амуры,
Ў глухіх стэпох,
Сярод тайгі —
Нямала кінута магіл.

І так
Праз дні вайсковых стычак
І годы
Мірных заваёў —
Прыйшоў
Трынаццаты Кастрычнік
І стаў
У шэрагі байцоў.

І вось
Пад шолах лістапада
Мы бачым —
Новых даляглядаў
Гарачь жывыя маякі
І клічуць зноў
На шлях цяжкі.

Цяглiцы нашы
Сталлю стынуць,
І вораг нам
Не будзе ў страх —
Артэрыямі Асінстанаў
Мы апляцем
Палёў размах.

Па ўсіх кутком,
Па ўсёй краіне
Адзіны ток
Крывёй ліне —
Ад сэрца палкага
Дынам —
У маладое сэрца нам.

...Хай дождж
Над полем

Холад носіць,—
Яна, чароўная,—
Прыйшла.
Прыйшла,
Ўся поўная святла.

Яна прыйшла
Ў красе барвовай —
Як свет старой
І заўжды новай,
І ў золата
Убрала край,
І ўскаласіла ураджай.

## ЧУЕЦЕ ГОЛАС АНТЭН*

За акіяны другіх планет
Неўгамонны жах навальніцы
Свой векапомны імпэт
Кінуў
На плечы традыцый.

Сонца вялікіх дзён...
Буры сусветных пажараў...
За эшалонам
Эшалон...
— Наперад,
У бойку,
Таварыш!

Бачыш,
Паўнеба ў агні,
Чуеш,

---

* Разам з Ю. Таўбіным.

Прасторы ў мучэннях —
Гэта нясуць
Рэвалюцый сыны
Сонца другім пакаленням.
Леніна постаць ў вяках,
У кожным працоўным сэрцы.
Шчэ не было
Такой,
Больш немагчымай смерці.
Па сэрцах прайшоў навальніцай
Шапэн,
Крануў міліёны трагедый.
— Таварышы,
Чуеце, голас антэн
Надрываецца хрыпла і дзіка
Недзе...
Тысячы тысяч
Новых працоўных
Горда і смела ў камуну
Ідуць...
Ленін памёр,
Але новым,
Цудоўным
Полымем
Справы яго цвітуць.

.....................................

І дзень і ноч гудуць антэны
Сваёй вялікасцю зямной.
Сягоння ж плачуць
Пад Шапэна
Перад Крамлёўскаю сцяной.

Там дзесьці людзі
Ў сутарэннях
Другіх няведамых краін
Вось гэты дзіўны
Слаўны геній
Успрынялі за марш адзін...

Ён там,
Дзе мукамі акацый
Зямля цвіце,
Дзе раніцой
Над трупам сына плача маці
І сын над матчыным жыццём...

Я ж зразумеў яго інакшым,
Такім,
Як ў буру акіян,
Таму,
Што ў буры будняў нашых
Загінуў творца-капітан.

Таму,
Што ленінскім пажарам
Ахоплен поступ ўсіх краін,
Таму,
Што здзейсніліся мары,
І мы пачулі гул турбін.
Няхай паны пускаюць пену,
Хай цягнуць лапу
На Маскву —
Другія песні льюць
Антэны,
Другія дні цяпер цвітуць.

.................................

„Шырэй,
Напорней крок...
За крокам
Крок
Наперад...
Мацней ударыць
Кроў
Турбінамі артэрый.
Мы шырым наш
Імпэт,
Мы

Пяцігодку творым,
З нас кожны тут
Паэт
І злой нядолі
Вораг...“

.................................

Бачыш,
Паўнеба ў агні,
Чуеш,
Прастораў імкненні —
Гэта нясуць
Будаўніцтва сыны
Сонца другім пакаленням.

Леніна постаць ў вяках,
У кожным
Працоўным сэрцы...
Шчэ не было
Такой,
Больш немагчымай смерці...

Геній ўсіх дзён і народаў,
Першы таварыш
І правадыр,
З ім,
Як і ў дні непагоды,
Усё узрастае працоўных уздым!

## ЗЯМЛЯ БУНТУЕ

(Фрагменты паэмы)

*„...а дальше коммуна,*
*во весь гори-*
*зонт...“*

## У. Маякоўскі

### I

Сотні і тысячы год
Драмала зямля,
Веяла боль
Палыновая.
Заўжды выходзілі людзі
На шлях
І падалі к сонцу
Галовамі.

Вылі вятры
Над краінай маёй,
Кідалі жах
Па зялёнаму полю,
Тут панавалі
Царква з турмой,
Тут прапівалі
Мужыцкую долю.

Крыж падламіўся,
Дзе два шляхі
Рукі цягнулі
На ўзвышшы.
Чуеце, мора
Пайшло ў берагі,—
Гэта мільёны працоўных
Выйшлі.

Чуеце вы,
Як бунтуе зямля,
Плечы ўздымаюць
Магутныя постаці.
Сёння другое
Выходзіць на шлях,
Іншае, новае
„Вогнішча босых“.

II

Было цяжка зімой між бандытаў,
Дзе гулі толькі вецер ды снег,
Дзе штодзень забівалі адкрыта
І ніхто не сказаў: гэта грэх!

Пелі ночы на струнах мяцеліц.
Лёг бандыцкі на вуліцах свіст.
Часта пілі і часта шумелі,
І над ўсім гэтым пан — гарманіст.

Лозунг быў: пражывай да адчаю
Ўсё, што толькі нажыў і збярог.
І гарластымі часта начамі
Сніўся ім самагонкавы бог.

Вораг кідаўся з краю да краю,
Злосны вораг у шапку не спаў,
Ад кулацкай ды нэпманскай крамы
Стаўся вогненным лозунгам — пан.

І вось ў гэтай імгле, ў завірусе,
Стаў на варту савецкай зямлі
Сын станка, КП(б) й Беларусі,
Старшыня калгаскульту Ільін...

Не адзін, а гэткіх мільёны,
Толькі мэта і думка адна,
Каб працоўных яднаць у калоны,
Што ідуць ад станка да стырна...

III

І ўжо бачыш, над краем пакуты,
Дзе гуляў вечна панскі бізун,
Замест роспачы, бруду і смутку,
Што горка аплакваў Гарун,
Выйшла шчасце жабрачых закуткаў
І кранулася сонечных струн.
І ты бачыш у хатах трухлявых,

Дзе стагоддзі і роспач і дым
Грызлі вочы трывогай крывавай,—
Токам сталі гудуць правады.

І ты бачыш агні Волхаўбуду,
Гэта Леніна сэрца гарыць,
Тут мільёны мільённыя будуць,
Што пачата ім, далей тварыць.

І ты бачыш, пракладзены рэйкі,
Тут экспрэсы на поўнач прайшлі,
Глоткі труб над Еўропай зладзейскай
Марсельезу, як сцяг, узнялі.

IV

А пакуль мы тварылі ў старонцы,
Вораг, поўны і зла, і надзей,
Часам ў нашым хадзіў адзенні,
То глухі, то старанны бясконца.

Умеў часам ён так раскулачыць,
Што патыліцу чухаў бядняк.
Забіраў ён усё, не іначай,
І спускаў для сябе за пятак.

Ну, а потым дзе-небудзь на сходзе
Ці ў закутку дзе-небудзь сырым
Гаварыў аб крыжовым паходзе
Й для яго пажаданай пары.
Ён казаў, што мы творым злачынствы,
Што сілком заганяем ў калгас,
І вось тут ўспамінаў пра дзяцінства,
Пра кароўку, мяжу і папас.

Ён выходзіў наіўнейшым хлопцам,
Ўспамінаў пра Хрыста і пра рай.
Ўсіх жа браўся трымаць у каробцы
І казаў нам пра гэта не раз.

V

Б'ецца мяцеліца белымі крыллямі,
Гэткіх завем мы варожымі сіламі.
Б'ецца мяцеліца ў тысячу сіл,
Цяжка мяцеліцай ў полі ісці.
Поле, як снежны халодны экран,
Там, дзе разгорнут вялікі раман...
Сумна блукае вачмі па шляхах,
Так ён блукаў па мяцежных радках.
Ўсюды знаходжу свой песенны край
Ў наступе белых раз'юшаных зграй.
Колісь даўно тут праходзіў атрад,
Белая банда крывавых салдат.
Сэрца краіны ўсё зранілі кулямі,
Плёткай яе частавалі і дулямі.
Сэрца краіны саслалі ў Сібір,
Розум прымусілі шлях свой забыць.
Сёння я ўспомніў пад белымі крыллямі
Тых, што завем мы варожымі сіламі.
Тых, хто ў халоднай і змрочнай турме
Сэрца краіны вёў к вечнай зіме.

VI

Была справа, адданасці словы,
Просты, ясны адказ Ільіна
Аб жаданым і радасным новым,
Што ўжо творыць мая страна.
Ў асвятленні сусветных пажараў,
У змрок ночы, пад рогат і свіст
Нараджалася слова — таварыш,
Слова творчых пуцін — камуніст.
.............................................
Залатая прыйшла вясна,
Ды блакітнымі пела наваламі,
Ўсё жыццё ўскалыхнуўшы да дна,
Загула па Еўропе скандаламі.

Рымскі папа узняў кінжал,
Ды прарочыць Хрыстовымі словамі,
Як калісьці расійскі жандарм
Нам нягоды і мукі нам новыя.

А вясна ўзняла сонца прамень,
Ды разносіць трухлявае з посвістам.
І я веру, квітнець будзе дзень,
Дзень, праверaны нашымі ростамі.

Бачыш, глеба так прагне людзей,
Творчых дум ды напружнымі тэмпамі.
Вось сігнал. Гэта трактар ідзе,
Міліёны ідуць доўгай лентаю.

Гэта першая наша вясна,
Глянь, ідзе бальшавіцкімі крокамі,
Лепшых дзён і жыцця баразна
Ўжо ўзарана плугамі глыбокімі.

Каб у краі абуджанага сонца
Не згрызалі шчасця плесень ды іржа,
Каб гулі маторы тут бясконца
І расла упэўненасць чырвонца,
Нам патрэбен вечны ураджай.
І вось кліч разнёсся сонца гулам
Па кутках далёкіх і глухіх,
Ад станкоў фабрычных да сахі:
„Трэба нам засеяцца агулам!“

І ўжо бачу бераг, поўны шчасця,
Аб якім і сніў і думаў часта.
Ў бераг б’е зялёнай хвалі пена,
Буйны колас гнецца да зямлі,
Токам зор артэрыі і вены
Маладой краіны б’юцца пенна,
Гэта бачыў так жа і Ільін…

Бачыў ён жыццё шырокім морам,
Што з стыхіі ў шчасце наша творым,
І ў агні напружнай творчай працы
Ён над кожнай дробяззю дрыжаў,
Ён ішоў за новы быт змагацца,
Дзе збудуем новыя палацы
І ўзрасцім наш вечны ураджай.

VII

На свята першай баразны
Калгаса „Наша ранне“
Сышліся з воклічам вясны
Калгаснікі-сяляне.

Палала сонца ў сотні сіл,
І сэрца сотным сонцам ззяла,
І толькі збоку галасіў
Кулацкі нейкі падпявала.

Ільін праехаў па мяжы
Вясны і сонца другам
І для каторых гэты ўздым,
Нібы па сэрцы рэзнуў плугам.
І ўспомніў я, другой парой
Знімалі ў хатах Бога,
І дзве дзяўчыны — млека й кроў —
Глядзелі ўдаль з трывогай.

Як ім хацелася сказаць,
Што там, за гэтай праўдай,
Дзе ўзнята песні баразна,
Дзе ўжо ўстае жыцця вясна
І б’е жывой крыніцай радасць.

VIII

Як сіні вечар паў расою
На рана ўзвораныя далі,
Як толькі ветры замаўкалі
І моўкла ўсё па-над зямлёю

У нейкім гордым задуменні,
У прыгажосці чар жывых,
Тады Ільін туманнай пенню
Ішоў дамоў праз паплавы.

І ўспомніў ён тады з журбою,
Што дзесьці там сям’я і дружба,
Што кожны поспех ўзят там з бою

Вялікім еднасці аружжам.

І раптам ноч крывавай плямай —
І дзікі стрэл, і дзікі лямант.
Паміж кустоў ў імгле туманнай
Сядзеў бандыт і злы манах
З абрэзам дымных рук паганых,
Што неслі смерць, агонь і жах.

І раптам неба стала цёмным,
Прайшоў па полі страшны свіст.
Тут жыў, змагаўся неутомна
Й памёр рабочы-камуніст.

### І Х

Чуеце, б’ецца трывогай краіна,
Творчай трывогай вялікай пары.
Сёння згубілі мы партыі сына,
З намі што жыў і тварыў.

Чуеце, маршы Шапэна на сэрцы
Клічуць быць вечна і вечна жывым.
Ў творчасці нашай не можа быць смерці,
Ў сэрцы адчаю і лёду ў крыві.

Вечны агонь б’е ў распаленых горнах,
Вечная мудрасць цвіце у вачох,
Сёння краіне балюча і горка,
Што стаў аднаго пралетара станок.

### Х

Не трэба слоў пустых і лішніх,
Не трэба слёз. Глядзі вакол:
Сто тысяч новых ў поле выйшлі
Вагнаць старому ў корань кол...

Гудуць гудкі, гудуць маторы
І трактар песціць твар зямлі,
Мы па-другому сёння творым,

Як загадаў нам сам Ільін.

І светлай еднасцю працоўных,
Ў дні перамог, змагання дні
Мы створым горад-сад цудоўны,
Імя якому — Камунізм...
..........................................

І я ўжо чую грозны голас
Мільённых мас, працоўных мас:
„Нам не схіліць прад цемрай галаў,
Бо бальшавік тут кожны з нас“.

XI

Там, дзе зямля
Маладосцю бунтуе,
Мы пераможам
І гэты вось фронт.
Сёння тут славім
Вясну маладую,
„А дальше коммуну
Во весь горизонт“.

Частыя пройдуць
На поўнач экспрэсы,
Ўстане асветлены
Мудрасцю дзень.
Хутка зруйнуюць
Усякія крэсы,
Й песня свабодна
Павее з грудзей.

Партыя кліча,
Ты чуеш, таварыш!
Ўстала зноў з песнямі
Босая голь,
Так жа, як ў дні
Барыкадных пажарышч,
Новы ўзняць дзень
Мільённай гурбой.

## ЛЕНІНУ

Я помню — плакала зямля
Надрыўным голасам Шапэна...
І ноч глыбокая лягла,
І снег халодны па калені.

Мільёны рук яго няслі,
Мільёны згорбленых трагедый.
І сэрца грознае зямлі
Змаўкала раптам недзе.

І ўсім здавалася тады,
Што ён унёс з сабою вечна
Змагання светлага гады
І нашай праўды чалавечнасць.

І кожны думаў, што адны
Мы засталіся сіратамі,
Што частку нашае вясны
Няслі мы з ім ў магілу самі.

І вось халодны Маўзалей
Зацяў каменнымі рукамі
Таго, хто сонца быў святлей,
Таго, хто заўжды жыў між намі.

Але адтуль, з цішы жалезнай,
З адвечнай грознай цішыні
Ізноў жывы, ізноў мяцежны
Ён устае, як ў даўні дні.

І узрастаюць зноў палацы,
І дзень і ноч — агонь і дым...
Вякі не зналі гэткай працы,
Што нашы ўздыбілі гады.

Прад тым, кім свет заваяваны,
Хто бессмяротным быў заўжды,
Схіляюць голаў днепрастаны,
Растуць пад песні гарады.

Няхай жа будзе лепшай песняй
І лепшым помнікам яму
Мільённых мас жывая чэснасць,
Жаданасць гордая, без мук.

І наша слаўнае змаганне,
Уздымы фабрык, гул машын,
І ўжо квітнеючае ранне,
За што змагаўся ён і жыў!..

## АДТУЛЬ, ДЗЕ ПАЛЫХАЮЦЬ ДОМНЫ

Адтуль,
дзе агнём палыхаюць домны,
Адтуль,
дзе з’яднаны мільёны сіл,—
Воляй партыі нязломнай,
Што ў агні
і ў крыві, што
Кастрычнік расціў,
Паўстае
ў бляску цудаў
наш дзень няўтомны,
І грыміць,
і ўзнімае напружаныя рукі,
Каб рэспубліцы даць
і жалеза,
і сталь.
З гэтым днём мільёны,
пад дым
і пад грукат,
Здабываюць
гарачы, як сэрца, метал.
І адтуль,
дзе прыходзіцца, нібыта з жалеза,
І дзе вочы людзей —

дыяментаў гульня,
Дырыжабль, што вартуе
савецкія межы,
Прывітаў камсамолец,
рабочы-юнак.
А таму,
што наш вораг,
і бачыць без грыму,
Ў дзікай злосці на нас
свае пальцы пагрыз
—
Пабудуем
яшчэ дырыжабль не адзін мы,
Каб бяспечней
тварыць
сацыялізм!

## ДАРОГАЮ Ў ШТАБ

Максіму ГОРКАМУ ў дзень саракагоддзя служэння пралетарыяту

**ЛУКА**: — Чалавек не верыць... Павінна, гаворыць, быць... лепш шукай. А то кнігі твае і планы твае нічога не варты, калі правільнай зямлі няма. Вучоны ў крыўду. Мае, гаворыць, планы самыя дасканалыя, а правільнай зямлі не існуе зусім. Ну, тут чалавек і раззлаваўся — як так? — Жыў-жыў, пакутваў-пакутваў і ўсё верыў — ёсць! А па планах выходзіць — няма! Ды што ж гэта?.. І гаворыць ён вучонаму: — Ах ты, сволач горкая, падлюга ты, а не вучоны...— ды ў вуха яму — раз! Ды яшчэ!..

## М. ГОРКІ

Рабочыя ствараюць ва ўсім свеце сваю інтэрнацыянальную культуру, якую даўно падрыхтоўвалі прапаведнікі волі і ворагі прыгнёту.

У.І.ЛЕНІН

Спявалі каменні,
танцавалі ружы,
дымілася неба
на зорным агні,
тады вы выходзілі,
малады і дужы,
шукаючы сонца
сваёй вышыні.

Смяялася мора,
і плакалі людзі,
праменіў праклён
і алмазамі смутку гарэў,—
там сэрца, як ластаўка,
стукала ў грудзі,
як веснік зарніц
ля турэмных дзвярэй...

Арлу падуладны
і нетры і горы,
падзенні і ўзлёты
падуладны арлу,
і вы
над шалёнай раўнінаю мора
імперыю смерці
вялі на скалу.

Вы лепшыя іскры
крыві чалавечай
ўлівалі ў імглу
безнадзейных раўнін,
каб радасць, і гора,

і смутак галечы
ўзнімаць над сабой,
як салдат карабін.

І дужым крылом
ахіналі вы скалы,
дрыжэлі
каменныя глыбы зямлі.
Там мора спявала,
гуло і стагнала,
і падалі троны
і каралі.

Ружовая восень
праходзіць з пяшчотай,
і мудрасці яблыня
грэе сады,
і ўсё ж мы гаворым,
што вы, як ніхто тут,
такі, як вясна,
без граніц малады!
Вы наш!
Мы гаворым і шчыра
і цвёрда,
што вы —
наш таварыш і бацька,
і брат,
бо Горкі „гучыць гэта
слаўна і горда“,
як дзвюх рэвалюцый
суровы набат.

Вас бачыў я раз…
Я стаяў ля вагона…
Ігра залатая
юнацкіх надзей
  вам несла
  мільёны лістоў і паклонаў
  і дружбу народаў
  на заўтрашні дзень.

Я так жа вітаў вас,
хоць вы не пачулі,
ішла пада мною
у танцы зямля,
і я, непрыкметны,
ў стотысячным гуле
правёў вас
да слаўнага штабу —
Крамля.

## КАМІСАР

У Ганулі вочы — агнявыя стрэлы:
Грымнулі па сэрцы — і тушы пажар!
Порахам апалена у Ганулі цела,
Залатым загарам апалены твар.

У Ганулі воля і рука чэкіста,
Сэрца ані жадны не парушыць зман:
У Ганулі шабля на кантрабандыста,
І на афіцэра — баявы наган.

У Ганулі ордэн на грудзях, як ружа,
Агнявая ружа, што расла ў баёх.
У Ганулі дочка радасць — памяць мужа,
Ды таго, што ў бойцы пад Варшавай лёг.

Злая справа — старасць з адзінотай смерці!
І хоць ззяе ў кудрах смутны лістапад,—
Знаю — будзе трэба — зноў не здрадзіць сэрца,
І не будзе ведаць чорнай мукі страт.

Маці рэвалюцыя! На тваіх палетках
Многа камсамолак, агнявых дзяўчат,
Што за свет камуны (маладосць тым сведкай)
Пойдуць у Ганулін баявы атрад.

Ад таго і вочы — залатыя стрэлы —

Грымнулі па сэрцы — і тушы пажар!
Ад таго і песня аб табе паспела:
Баявы таварыш, слаўны камісар!

## АДНА ПАРТЫЯ Ў ВАЛЕЙБОЛ ЛІТФАКУ

Дай удар свой
і проста, і смела,
і твой мяч абміне
небяспечны прыпын.
Паглядзі, як у „ворага“
спрунжыніцца цела,
гэтых рослых мужчын
і жанчын,
як праходзіць агонь
па шчацэ загарэлай
і барвовае полымя
па шырокім
плячы.

Першая справа —
змагацца за якасць,
першая справа —
абязлічку далоў,
каб высокага сонца
вясновая яркасць
прабягала па моры
курчавых галоў.
Абрываецца мяч на мяне,
як граната,
і яшчэ, і яшчэ,
я напружваю зрок,
разгінаю спіну —
перамогай дзесятай,
урачыста вітаю

дзесяты наш крок...

Фізкультурніца Валя
з „варожага“ стану
ў захапленні з пяшчотаю
дзівіцца з нас:
першая справа —
змагацца па плану,
і „вока за вока,
газ за газ!..“.

І калі надыходзіць
суровая хмара
і вораг задумляе
апошні удар,—
глушы яго разам,
мой добры таварыш,
адзіны будаўнік
і адзіны ўладар...

Ура! Колькі ў сонца работы —
без краю,
сіла ж ветру аддасца
пругкасці рук.
Фізкультура —
баявы палітрук
на франтах пяцігодкі
нашага краю!

Яна узнімае гарады,
штурхае заводы,
праносіць энергію
гарачымі турбінамі аорт.
Таварышы!
Хай жыве рэспубліка
сям'і народаў,
хай жыве
сацыялістычны спорт!

Ён за дужае сонца
і дужае племя,

за зялёнае племя бальшавікоў,
ён за радасць вясны,
што праходзіць
бурлівай ракой,
за жыццё і паэмы...

Ён узняўся пад зоры,
праходзіць марамі,
сілай розуму твайго
і сілай цягліц
разбівае
сусветнай апрыкрасці
крамы,
крамы смерці
адвечнай хлусніцы
хлусніц.

Наш спорт не гульня,
і наш спорт не забава,
за пабітыя зубы
не клічам мы тройчы на біс.
На пабітых зубах
не будуем мы славы,—
наша слава —
Сацыялізм!

А дзесьці там —
танклява і дзіка
скрыпка зачынае
вяртлявы факстрот.
Там тонкія пальцы,
апраменены золатам пікі,
кладуцца з усмешкай
на звар'яцелы кнот.
Ўсё для вайны,
для крывавага выбуху,
ўсё для забойства...
(знішчай і крышы!)
Еўропа, як ноч,
на падбітым крыжы

рушыцца долу
статоннаю глыбаю...

Ўсё для вайны:
узнімайце ж гарматы,
браняносцы,
кідайце родны порт,
бунтароў і паўстанцаў
шпурляйце за краты. —
Гэта ж і ёсць іх,
так званы,
спорт.

Культура? —
якая культура у звера?!
Дэмакратыя? —
прыгожая справа яна!..
А вера? —
зняверана!
Нечаму верыць,—
і, калі ласка,—
вайна!

Дзе ты знойдзеш
найлепшую справу для рук? —
„сотні школ ў СССР
найвышэйшага рангу,
і ці гэта магчыма —
савецкі там друк
і зусім не ў пашане
факстроты
і танга?!“

.........................

І раптам
дзесьці там,
дзе вуліца Леніна,
дзе вясна
і дзе ў вокны ўрываецца дзень,
праходзіць атрад

юнакоў, дзяцей,
маладосцю сваёй
апраменены.

„Раз, два, тры,
мы бальшавікі,
мы фашыстаў не баімся,
пойдзем на штыкі“.

Любыя! Родныя!
Я прачынаюся,
быццам ад сну.
Суддзя налічыў
перамозе 15.
Вітайце ж маршамі
нашу вясну
і права будаваць
і змагацца.

Гульня даіграна!
Праменні усходу
вітаюць сталёвасць
юнацкіх кагорт.
Ўсё ясна:
жыве хай рэспубліка
сям’і народаў,
жыве і мацнее
савецкі
спорт!

## МАЙСКІМ МАРШАМ

Мы палюбілі сваю вясну!
З холадам, з цемрай
Ішлі на вайну,
На белую банду
Ішлі вайной.
І змогшы у бойках
Адчай і гора,
Мы убіралі сваю вясну

У зелень,
У цвет,
У зоры.
Мы паднімем сваю старану,
Як адбівалі учора.
Мая Бацькаўшчына —
Са мной.
Мая Бацькаўшчына —
Ува мне.
Народжаная вясной,
Народжаная на вясне —
Мая бацькаўшчына
Для мяне!

Яна красуе
У сэрцы працоўных.
У сэрцы працоўных
Усіх краін.
Яна завецца
Любімай і кроўнай,
І я ж
Яе родны сын.

Іду і спяваю,
І выраслі крыллі.
Я сэрцам — пілот.
У падзоравы край —
Байцом
Паэтычнай, цяжкой
Эскадрыллі!
Запісаны ў полк Акцябра.
Мы мужныя крочым,
Як наша вясна,
Мы майскім парадам
Праходзім сусветам.
Ля домнаў,
                        ля плуга,
                                    станка
                           і стырна
Нязрушна і цвёрда

Стаім, як сцяна —
Мы людзі Краіны Саветаў.
Ад палкага Поўдня
Да лагера Шмідта,
Ад гулкіх марэй
Да гранітных высот.
Імёны герояў,
Як гул дынамітны,
Грымяць над сусветам
Штогод.
Халоднае неба
Ўстае над табой,
Ўсё стыне
Ў студзёным тумане,
Ды смела пускаецца
З віхрамі ў бой
Адважны пілот
Каманін.
Адважны пілот
Сляпнёў
У бляску
зорных агнёў.
Сэрца патроім
на песні паэтаў —
Слава героям
Краіны Саветаў!
Слава
адважным байцам

рэвалюцыі,
Ўсім пераможцам
пустынь ледзяных.
Розумам,
сэрцам,
крывёю,
пачуццямі
Ў славе расцем за іх.
Яны родныя сэрцам,
Яны дарагія,
Мы любім іх,

І шануем іх —
Пераможцаў жыцця,
Пераможцаў стыхіі,
Камунараў-байцоў
Агнявых.
Героі-байцы
Вызвалялі герояў,
Як вызвалім заўтра сусвет,
Каб ён расквітаў
Пад нашай зарою,
Зарою камуны
Ў чырвоны цвет.
Адвага ж, геройства з намі
І нашы —
Праходзяць над светам
У майскім маршы.

## ЖЫЦЦЁ ЗА НАС

Мы йшлі ў радах,
Цвіла вясна.
Мне сказала ты вясной вясёлай,
Што ты сёння марыш не адна
Стаць лепшым другам
Камсамола.

Я глянуў —
Сонца гарачэй
З тваіх вышынь сыпнулі перлы —
Іскры
На моры сінія тваіх вачэй
І зрэнкаў іх
Сярэбраныя выспы.

Людскім струменем цёк завод
На Волі пляц,—
Велізарны і светлы,

Дзе сонца ўжо шаснаццаць год
Зайздросціць нам
З усмешкай ветлай.

З усіх завулкаў,
Вуліц,
Хат
Лілася песня —
Голас звонкай сталі,
І ўсё цвіло,
Як яблыня ў закат,
А яблынь цвет —
Людскіх надзей каралі.

Да іх прыглледзься
І збірай —
Яны ярчэй за сонца і за зоры,
Бо мы ўзнімаем родны край,
Каб рос-дужэў,
Як акіян
Ў прасторы...

Так хараша
Ісці удвох
У грамадзе,
Сярод хлапцоў фабрычных,
Пад грукат сотні
Цвёрдых ног,
Пад вечны гул іх
Стройны і рытмічны...

Так добра жыць у гэты час,
Асветлены стокаляроваю
Вясёлкай.
Мы будзем жыць! Жыццё за намі,
Сястра мая, падруга, камсамолка!

## ГОЛАС ПАЭТА

З'езду пісьменнікаў СССР

І сэрца,
І скрыпка,
І тысячы скрыпак,
І наша юнацтва —
Смычок залаты.
Ў каралавым моры
Каралавы злітак
Гарачым дыханнем
Хвалюе сады.

І слова,
І песня,
І сонцам над намі —
Ўзлятае паэма
На крыллях вясны.
Край эры чырвонай
Стаіць над вякамі,
Свавольства паноў —
Над вякамі маны.

Пішыце вы праўду —
Так сказана мудрым,
Праверым сябе ж,
Чым жывем мы,
Гарым.
Мой дружа!
Мы шчокі паэта не пудрым.
На вусны не ложым мы
Здрадлівы грым.

Нам дадзена многа,
Каб проста і чэсна
Ісці ўсё наперад
Да мэты адной
І лепшай на свеце
Цвітліваю песняй
Праліцца над светам

Цвітлівай вясной.

## ЖЫЦЦЁ Ў ЦВЕЦЕ

### I

Жыццё у цвеце,
Жыццё у цвеце,
Цвіце жыццё
І рань.
У малінавым берэце
Ідзе па праву
У камсамол.

Якія пышныя палі!
Зямля ўся — мора залатое!
Плывуць калоссяў караблі
Да сэрца дружнай чарадою.

Сягоння тутака жніво,
І вуснаў смех, і гул жняяркі
Растуць ў цябе над галавой
І запрашаюцца у паркі.

Мільёны бронзавых снапоў
Ляглі ў палях, як пасля бойкі,
І радасць лёгкаю ступой
Падводзіць сённяшнія тройкі.

Багаты, плённы ураджай!
Дар калектыўнай дружнай працы!
Больш не затуліць воч імжа
Жахлівай музыкай
Жабрацтва.

Тут век
Здружыліся з бядой,
Яна ішла у чорнай масці
І сабірала свой удой,
Дзе межы —
Загарадкі шчасцю.

Не ўзяць ім болей у палон!
Калгас не можа быць убогім!
Ён гулам трактарных калон
Сваю ўслаўляе перамогу.

А збожжа шырыцца ў прыбой,
Як акіян у час прыліву,
І сонца меднага трубой
Выводзіць марш
За калектывы.

Наш, бальшавіцкі
Наш калгас
Свой ураджай збярэ дарэшты,
Бо знаем мы — жыццё за нас,
І што пасееш — то збярэш ты!

На поўны голас песню браць!
Каб хлеба больш і болей сталі нам!
Ў баях нястрымна ж наша раць
Пад кіраўніцтвам Сталіна.

Усюды, ворагу на страх,
Шпурляе сонца поўнай жменяй
Зярняты мужнасці на сцяг
Найагнявога пакалення.

Жыццё у цвеце!
Жыццё у цвеце!
Ты дар жыцця свайго збірай!
Бо лепшы край з краёў на свеце —
Камуністычны родны край!

## II

Грыміць магутны Днепрастан,
Шлючы ў прасторы сонца іскры
Праз дождж,
Праз вецер і туман
На воч сярэбраныя выспы.

Ён воляй партыі узрос,
Магутны ленінскі асілак,
Каб красавала радасць скрозь
І сонцам век наш
Напаіла.

Яго карміў рабочы клас
Агнём свайго энтузіязму,
Каб намі зроблена, для нас
Ззяў міліёнам зор алмазных!

Ён узнімаў свой бурны час
На недасяжныя вяршыні.
З ім рос запал
Працоўных мас
У вечных рухах,
Вечнай плыні.

І ты, наш слаўны правадыр,
Ў агні атак сярод пажараў,
Сярод клапот за хлеб і мір
Аб ім трывожыўся і марыў.

І наш магутны Днепрастан
Ёсць помнік лепшай ўзнагароды
Табе, вялікшы капітан
Усіх часоў
І ўсіх народаў!

Глядзіць ў вякі праменны птах,
І сэрца-волат не здранцвее
Ні ў дужай працы, ні ў баях,

Ні ў бездарожжы, ні ў завеях.

Яно ўлівае ў грудзі кроў
Маёй рэспублiцы-красуні,
Каб быў ты весел і здароў,
Нашчадак сонца і камуны.

Дзе гордасць рускіх — рускі змрок
З мужыцкім лапцем і лучынай?
Яго ўзялі мы пад курок,
Як горшых ворагаў краіны.

На ўвесь зямны, бяскрайні пляц,
Як сонца сонц заўжды яскравы,
Мы узвялі Святла Палац,
Дар бальшавіцкай нашай славы!

## МЫ ЎКЛЮЧАЕМ СВАЮ МАЛАДОСЦЬ

Камсамолу — шэфу электрыфікацыі

Сэрца будзе
Устрывожана біцца,
І як родны, жаданы мой госць,
Ў залатую ігру навальніцы
Пойдзе з смехам мая маладосць.
Нашым песням
На дол не схіліцца —
Ты пачуеш ў іх радасць жніва,
Агнявая красуня-сталіца,
Сэрца свету ўсяго — Масква!
Ты дала шчасце-долю краіне,
Каб раслі і каб спелі сады,
Гэта неба ярчэйшае сіні
Ззяла сонцам над намі заўжды.

Правадоў

Вечна палкія струны
Льюць агні над краінай скрозь,
І ў вясну светазарнай камуны
Мы ўключаем сваю маладосць!

* * *

Бліскучых лямп
Шкляныя яблыкі
Так буйна спеюць па начох.
Тут узнімаем вежы фабрыкі,
І край расце, як на дражджох.
На залаты,
На земны
Пляц
Узводзім светлы мы палац.
Не для пацехі „моднай публікі"
Гудуць над краем правады,—
То маладая кроў рэспублікі
Ліецца ў вёскі
Й гарады.
Патрэбна шмат
Краіне-волату
Электрасонечных надзей,
Каб ноч радзіла іскры золата
І малатаркай стукаў дзень.
За гэту справу
З фабрык,
Сёл
Паўстаў на варце камсамол.
Сюды паклікаў нас Гікала.
Й, як лепшых мар здабыткі-сны,
Тут моладзь край свой падымала
На агнявых плячах вясны.
Раскошных год
Красуня светлая,
На ярка-вогненным шчыце,

Ўключае ток з усмешкай ветлаю,
І родны край, як сад,
Цвіце.
Такіх вялікіх перамог
Мой камсамол дабіцца мог!
Уславім песняй,
Поўнай гордасці,
Цябе, вялікі шэф святла,
Каб ў дні камуны цвёрда йсці,
А ЦЭЦ дужэла і расла.

## СЛАВА БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ РЭСПУБЛІЦЫ

*„Асабліва вялікія дасягненні мы адзначаем за апошнія два гады пад кіраўніцтвам КП(б)Б, на чале якой стаіць моцны бальшавік тав. Гікала“.*

(З даклада на XV з’ездзе КП(б)Б)

Краіна ўзнімае жалезныя плечы
Пад мужнасць сірэны фабрычнай трубы,
І гэта ўжо знае і помніць, дарэчы,
Любы непрыяцель наш, вораг любы.

Нас партыя наша ў баях гартавала:
Шчыльней і шчыльней камуністаў рады,
Так вучыць, вядзе так таварыш Гікала,
І Сталіна поступ — шлях нашай хады.

Пад сонцам, ў залітыя золатам нівы
З’язджаюцца слаўнай камуны сады,
І граюць на ранні буйныя іх грывы,
І зорныя сыплюцца ў вечар плады.

Краіна-жабрачка заможнаю стала,
Калгасы й саўгасы — шлях нашай хады.
Нас партыя наша ў баях гартавала,
І знаю — не дрогнуць Саветаў рады.

Грымяць, палымнеюць даліны і горы,
Тут з мэтай адзінаю выйшлі ў дазоры
Вучоныя, творцы, байцы, муляры.
Стаіць у здзіўленні ўся земная гала:
Нас партыя з фабрык і з сёл падымала,
І шлях камунізму — шлях нашай хады.

І сёння, у дзень бальшавіцкага злёту,
Праз вёскі, лясы, гарады і палі
Мы шлем прывітанне найвысшай ясноты
Ўсяму бальшавіцкаму штабу зямлі,

Бо партыя Леніна нас гартавала,
Растуць і шчыльнеюць камуны рады.
Так вучыць, вядзе так таварыш Гікала,
І Сталіна поступ — шлях нашай хады.

## ЗА КРАЙ КАМУНЫ

Быццам гальштук, край усходу
На грудзях зямлі.
Мы, як кветкі, год за годам
Ў садзе дзён раслі.
Нашы песні дружных ладаў
Шырацца ў прыбой.
Добра йсці ў сваіх атрадах,
І вясна з табой,
Маладое племя працы,
Як касцёр ўначы.
Будаваць, расці, змагацца —
Ленін так вучыў.
Нас бацькі паслалі ў школы,

Там ты не гультуй —
Песню шчырасці вясёлай,
Хлопча, не зганьбуй!
Сонца яблыкам румяным
Толькі тым расце,
Хто страчае школьны ранак
У агні надзей.

*

У Вене кроў і слёзы льюцца.
Ходзіць грозны вал.
Ў гуле новых рэвалюцый
Бурны карнавал.
Дольфус танкі і гарматы
Кінуў на народ.
Палюбіў ён справу ката,
Шыбеніц факстрот.
На рабочыя кватэры,
На натоўп руін
Выйшаў дзень пахмура-шэры
Жахам дамавін.
Ходзяць горадам завеі.
З вуліц і пляцоў
Смерць бязлітасна заве іх,
Здраджаных байцоў.
Ў сутарэннях чорнай ночы,
Пад мяцеліц свіст,
Ў дзікай злосці на рабочых
Помсціцца фашыст.

*

Дзень з яснотай камуніста
Ходзіць па зямлі.
Мы змагаліся агніста
І перамаглі.
Нашым фабрыкам, заводам
Красаваць, расці
Ў пышным золаце усходаў,

Ў агнявым жыцці.
Мы прыдбалі песні права.
Грай, мой родны, грай, —
Справа гонару і славы
Наш савецкі край.
У Парыжы ў злосці чорнай
Белы генерал
На камуны росквіт зорны
Точыць свой кінжал.
У семнаццатым барвовым
Выштурхнуты вон,
Хоча ўзняць у бойках новых
Свой крывавы трон.

*

На прасторы сёл зялёных,
Гулкіх гарадоў
Стаць на варце абароны
Піянер гатоў.
Ён страляе гэтак лоўка,
Ў яблычка якраз.
Лепшы друг яму вінтоўка
І процівагаз.
Ён не знае чорных страхаў,
Грозных перашкод.
Падружыў з жалезным птахам
Піянер-пілот.
Захлынецца ў злосці дзікай
Крыважэр-фашыст,
Калі вырасце і будзе
Піянер-танкіст.
За вялікі край камуны
Стане ён гарой,
Светлы, радасны і юны
Малады герой.

*

Хай растуць, як сад зялёны,
Калгасы й гарады,
Нашай Арміі Чырвонай
Агнявой рады!
Мы стаім гарой-уцёсам,
Пойдзе ж вораг-кат,—
Мы яго ды так папросім,
Што не будзе рад.
Мы пакажам чорным змеям
Гарт сваіх брыгад,
Мы пакажам, як умеем
Ўсіх перамагаць.
Нашы песні дружным ладам
Шырацца ў прыбой.
Добра йсці з сваім атрадам,
І вясна з табой.
Быццам гальштук, край усходу.
Ўсё цвіце кругом.
Мы, як кветкі, год за годам
Ў садзе дзён расцём.

## ПАМЯЦІ ТАВАРЫША КІРАВА

Цвілі сцягі жальбой праменнаю,
І пад развой страшной жуды
Жальба лягла труной каменнаю
На грозна стыўшыя рады.

Рука забойцы стогны вырвала
З грудзей працоўных ўсёй зямлі —
Не! Не патухла сэрца Кірава,
Бо не патух сацыялізм.

Гарыць зара яго пунцовая
Ва ўсёй красе сваіх надзей,
Бо лепшы друг хадой сталёваю

Да перамог байцоў вядзе.

А вам, нашчадкам чорнай злыбяды,
Падняцца зноў — дарэмны труд;
Мы патрабуем вашай гібелі
І свой падпісваем прысуд.

## МАЛАДАЯ КРОЎ РЭСПУБЛІКІ

### 1. АГНІ ЗАВЕЙ

Ўстане раніцай сонца. Юнак
песняй працы яго спатыкае,
каб грымела навокал вясна
і вясна не стухала такая.
А яна ж
у мільёнах гарыць,
яна —
наша,
яна —
маладая,
яна ўся —
як легенда і быль штурмавая,
агнявую ж з запалам бяры!
Ўсемагутную гэту вясну
мы з вясною рэспублікі нашай
знітавалі ў музыку адну,
у магутныя выбухі
маршу.
Так жалезны расце салавей,
быццам гром вечна юнай навалы.
Пройдзем мы і праз моры, і скалы
на агні светазарных завей.

## 2. КАМСАМОЛ НА ВАРЦЕ

І мы будавалі ў дзве змены,
Наша сэрца не знала змог.
Мы ўзносілі волаты-сцены,
як меч баявых перамог.
Я слесарам быў
на заводзе,
а гэты паходзіць з сялян.
Ў гікалаўскім слаўным паходзе
мы ўдвойчы выконвалі план.
А раз,
па згавору з хлапцамі,
мы гэткія тэмпы ўзялі,
што й зоры, што ззялі над намі,
дзівіліся ў дымнай далі.
Тэхрук жа,
нахмурыўшы бровы,
узяў ды ўляпіў у загад:
„Даю табе, Шуцік, вымову
за змору найлепшай з брыгад“.
Па-мойму, ўзяліся, дык трэба,
каб кожны змагар і тварэц
рос сэрцам, штурмуючы неба
за камсамольскую ЦЭЦ.

На грудзі зары-эстакады
мы ўзводзілі бэльку за дзень
і нават былі яшчэ рады,
што гэтак нам ў працы вязе.
Ноч луснула сінім арэхам,
лёг месяц у зорнай траве,
і кажа Арцюх, нібы смехам:
„За змену брыгадай дам дзве“.
І мы паспрачаліся строга,
паўсотні кладзем аб заклад.
Сам тэхнік, не думаўшы доўга,
дае тут яшчэ пяцьдзесят.
І толькі на ранні
друг дружцы

міргнулі на стрэчу зары
дзве зоркі — два лепшых сябры.
Глядзім, і — на самай вярхушцы
заместа дзвюх бэлек —
тры.
Смяюцца: ўзяліся, дык трэба,
каб кожны змагар і тварэц
рос сэрцам, штурмуючы неба
за камсамольскую ЦЭЦ.

На палях,
на нашым канале
і ў вецер, і ў дождж, і ў мароз
ні зморы,
ні смутку
не зналі,
і кожны з нас
ў радасці рос.

Выходзіла Свіслач на бераг,
плён працы, здавалася, нік,
ды йшлі мы за шэрагам шэраг,
і кожны з нас быў бальшавік.

Мы працы лягчэй
не шукалі
і, цёплы пакінуўшы кут,
ў сваім камсамольскім запале
ўпарта змагаліся тут.

Мы зналі — ўзяліся, дык трэба,
каб кожны змагар і тварэц
рос сэрцам, штурмуючы неба
за камсамольскую ЦЭЦ.

## МЫ ДЗЁН ШЧАСЛІВЫХ КАВАЛІ

## Камсамолу Жлобінскага раёна
## (Песня)

*Тэкст Валерыя МАРАКОВА*
*і Тараса ХАДКЕВІЧА*

Далі на сонца права нам
Бацькі ў баях крывавых.
І наша творчая вясна
Грыміць нястрымнай славай.

*Прыпеў:*
Народжаны бурай разліў:
Расці, камсамольскае племя,
Найлепшае племя зямлі,
Ўзнімай, камсамольскае племя,
Змагання агнёвы кліч.

Бадзёрай песні не згасаць
У будаўнічым росце,
Яе мы будзем узнімаць
Запалам маладосці.

*Прыпеў.*

Хай гулкай музыкай жыцця
Яна ўвесь свет агорне
І кліча ў яснату быцця
Мільённыя кагорты.

*Прыпеў.*

Мы — дзён шчаслівых кавалі —
Ідзем чаргой бясконцай
На ўсёй планеце запаліць
Сацыялізму сонца.

*Прыпеў.*

У будучыню мчыць цягнік
Па ўсіх шляхах краіны.
Вядзе нас мужны бальшавік,
Наш правадыр любімы.

*Прыпеў.*

## З ЦЫКЛА „ПАЛЬМЫ ДАЛІНЫ“

...Я горача вітаў гасцей крылатых.
І ўсе яны віталіся са мной,
Як з лепшым сябрам
І найлепшым братам,
Як з адышоўшай дружбай дарагой.
Былі тут людзі розных год і нацый.
І ўсе, усе былі яны браты,
Усім хацелася ісці, смяяцца,
Таму што кожны быў бадзёры, малады.
Людзей рэспублік: чукчаў і грузінаў,
Татар і рускіх — ўсіх вітае вас
Ад ніў мае савецкае краіны,
Ад фабрык БССР — рабочы клас.
Як хораша вакол. Смяецца неба.
Цвітуць сады і пеніцца прыбой.
Як хочацца сказаць,
Што людзям трэба
Ўзмацняць сябе, выходзячы на бой.
А заўтра там, ў разгары
Плённай працы
Мы не здадзім, не здрадзім
Ні на крок...
І мора мкнецца ў вусны цалавацца,
І чутна ў моры, як звініць пясок.

## НАСУСТРАЧ ВЕТРУ

(Фрагмент паэмы)

Зорным шляхам, як на рэйках,
Мчыць наперад на хакейках
Моладзь слаўная такая.
Вечар. Зоры.
Цень знікае.
Ў людскім моры
Смех блукае.
А лёд, як шкло,
І звонка ходзяць пары,
Давай, усім на зло,
Катнём з табой, таварыш.
Крыж-накрыж рукі,
Давай разгон
Пад вальса грукат
І перазвон.
Каток іграе ў жмуркі,
Ў агні увесь каток,
І ўдаль твае снягуркі
Нясуць цябе, браток.
Ты ўся, нібы са сталі,
Ўся — вогненны жмуток.
На ночы зоры палі,
І ў сэрца ўключан ток.
А ты, мой „Нурміс“ слаўны,
Давай, давай свой ход
І другам будзь, як здаўна,
Хай гэта знае лёд.
З табой мы зналі шчасце
І дужасць родных рук,
З табой, бывала, часта
Такі адколем трук,
Што толькі... помніш, друг?!
Гарадь, як ружы, шчокі,
Праменіць воч алмаз.
Ляці ж, ляці, мой сокал!
У добры час!..
Прамчацца люба з любай.

Што ж ты, аркестр — сыграй!
А ў Любы, братка, губы,
Дык гэта ж... Ай-ай!
Унізе гулкі горад,
Бягуць, звіняць агні.
І знаю, песняй скора
Дамчаць з далечыні,
Яна на сэрцы спее,
З нас кожны з ёю рос,
З сяброўкай зорнай веі,
З падругай лепшых кроз.
Яна звініць у высі,
Кладзецца зноў на дол,
Яна вядзе на прыступ,
Яна — за камсамол.
Яна усё агнісцей,
Глядзі — дайшла да зор.
А тут жа быў калісьці
Магільных плітаў збор.
Тут чорны пень узносіў
Людской пакуты стык,
І плакаў, быццам ўвосень,
У смутку вадзянік.
Было — мінула,
Цень знікае,
І ці адчула
Ноч якая?!
Насустрач ветру,
Метр за метрам
У сінім моры
Срэбнай змейкай
Ходзяць зоры
На хакейках.
Хутчэй!
Хутчэй!
Хутчэй!
Так радасна!
Так слаўна!
Добра так!

# *Проза, публіцыстыка, крытыка*

# ПА БЯРОЗАВЫМ ШЛЯХУ

Шырока разлілася вясковая рэчка. Яна несла свае люстраныя хвалі туды, дзе над лесам узыходзіла залатое сонца, раскідаючы ў нівах праменні: светлыя, цёплыя і чаруючыя, як першая кветка маладой вясны...

Над прасторамі ветры пелі асеннія песні пажоўклых дуброў, што прасілі вясны і маладога жыцця...

Была раніца... ясная раніца, як румяная маладая дзяўчына, што першы раз пакахала хлапца... Я ішоў тады шырокім, песнямі зачараваным шляхам, над якім нахілілі свае галовы старыя, вечна шумлівыя, вечна тайначаруючыя сэрца чалавека бярозы...

Я думаў... І думкі мае, як пякучыя шчырыя песні, вырываліся на волю, на шырокі прастор залатога сонца, каб абмыцца ў яго праменнях і зрабіцца чыстымі, як свежая ранняя раса, аблітая полымем чырвонарумянай зары...

*

Была раніца...

Усё дыхала жыццём, усё смяялася, усё хацела як больш напіцца жыватворчай цеплыні сонца. Толькі мне аднаму сярод гэтай ранняй прыгажосці прыроды хацелася плакаць... І я плакаў. Чыстыя дзіцячыя слёзы скідаліся срэбрам на чырвоныя галоўкі кветак, якія ўсміхаліся светлым і чаруючым смехам залатому сонцу... Навокал стройныя, высокія бярозы абступалі мяне. Яны шапталі і сваім шапаценнем навявалі сны даўно мінулай славы дарагой Бацькаўшчыны, дарагой Беларусі-зямлі... І не верылася, каб гэтая слава калі-небудзь загінула... О, не! І цяпер, калі буйным цветам паланее зара Кастрычніцкай рэвалюцыі, не дарма я ўспомніў тыя шчырыя словы беларускіх бяроз, што распалілі маё

сэрца невыказным каханнем да роднай беларускай зямлі... Што сказалі мне першы раз у сваіх зачараваных казках жыцця, што не толькі я плакаў пад сонцам той чырвонай раніцы... Тады плакаў... горка плакаў працавіты беларускі народ...

**1926 г.**

## Я ВЕРЫЎ ТАДЫ

Верш у прозе

О, як блізка мне мая хатка!

Колькі сноў навявае яна...

Колькі ўспамінаў лепшых дзён майго жыцця і маладосці звязана з ёй! Вось пад гэтай самай старэнькай бярозкай яшчэ так нядаўна я марыў абняць увесь свет, зліцца з ім душой і заплакаць ад радасці і надзей...

Я тады верыў, усяму верыў, нават недасяжнаму шчасцю, якое жыло ў маіх грудзях, як нейкі смутны неразгаданы сон, якое трывожыла і непакоіла сэрца, клікала мяне з цішыні залацістых палёў на жыццёвыя плыні, на брук гулкіх прастораў, пад трывожна-сіняе неба непрыветных камяніц...

Я тады жыў...

Я хацеў жыць...

Я любіў, нявыказна моцна любіў жыццё, я верыў усім сэрцам яму!..

*

Былі дні непрыветнай восені.

Былі хмурыя чорныя ночы.

Былі слёзы пякучыя і пралітая кроў асін і бярозак.

А пасля.

Усё жадала жыватворчага адпачынку і спакою, каб з новымі сіламі ўзяцца за жыццё і жыць... жыць, пакуль сэрца нястрымна стукае і заве, каб любіць і імкнуцца зрабіць наша жыццё прыгожым, радасным, поўным надзей светлай будучыні.

І я жыў.

Не глядзеў на тое, што жыццё ўсё болей і болей прыціскала мяне да зямлі, а наадварот, — чым цяжэй стала жыць, чым ніжэй нада мной навісалі хмары, тым мацней паланела душа, раздзіралася сэрца ад болю і лілася родная песня, поўная смутку, надзей і прастору... Тым мацней і рашучай рабіўся крок, разгіналася спіна, і было лёгка, радасна жыць...

І калі хацелася плакаць пад тужлівыя напевы восені, дык я верыў, што кожная сляза, якая праліецца на зямлю, зацвіце васільком.

Я верыў, што за часам глухой непагоды восені расцвіце залатая вясна...

Заіскрыцца сонца на галлі зялёна-кучаравых дрэў задуменна-тужлівай дубровы...

О, тады чулае сэрца паэта ўп'ецца сонцам, уп'ецца зарой васількавага рання жыцця.

*

І тая пара прыйшла.

Яна прыйшла маладая, поўная надзей...

Гэта была вясна...

Ажыло і застукала мацней сэрца.

Сэрца ажыло і застукала мацней.

І парой, — яно як бы хацела вырвацца з грудзей або крыкнуць моцна, голасна ўсім:

— Людзі... Таварышы... Добры дзень!

— Добры дзень, дарагая вясна...

І табе, чырвонарумяная зара, якой я так хацеў упіцца, аб якой гэтулькі марыў.

Якую кахаў,
якой верыў, —
добры дзень!..

**1926 г.**

# МАЛАДНЯКОЎСКАЯ ЎДЗЯЧНАСЦЬ

Экскурсія, наладжаная рэдакцыяй „Чырвонай змены“ ў Ленінград, Кранштат і Волхаўбуд, скончана. 120 чалавек рабоча-сялянскае моладзі ўжо раз’ехаліся па розных кутках нашай Беларусі і панеслі з сабою самыя найлепшыя, прыгожа-яскравыя ўражанні...

Гэтая моладзь цэлымі днямі будзе расказваць аб Ленінградзе, аб вольных вадзяных прасторах Кранштата, аб гіганце-цвярдыні лінкара „Парыжская Камуна“, аб брацкім прыёме матросаў, аб цудоўнай казцы, стаўшай праўдай — Волхаўбудзе...

Не адзін з іх пахваліцца, што яго юхтовы бот ступаў па казачнай цаны падлогах Царскасельскага палаца, сваімі вачыма бачыў кабінет Мікалая II...

Нагаворыць жудасці аб Трубяцкім бастыёне ў Петрапаўлаўцы, і слухаць будуць старыкі за працай у полі, на сенажаці, пры вогнішчы на начлезе, маладзіцы будуць шмат дзівіцца, у некаторых сляза затуманіць вочы пры апавяданні аб тых барбарскіх пакутах і жудаснай смерці курсісткі Ветравай у Трубяцкім бастыёне...

Гэта паездка застанецца ў памяці на ўсё жыццё, і калі хлопцы будуць успамінаць малюнкі ленінградскія, яны не прамінуць успомніць і перадаць аб той моцнай спайцы, якая была ў час супольнага жыцця... А разам з гэтым у галаве кожнага экскурсанта пранясецца вялікая ўдзячнасць арганізатарам гэтай экскурсіі.

Мы гэтаксама не можам маўчанкаю прайсці каля гэтага важнага ў нашым жыцці факта, як паездка, і рэдакцыі газеты „Чырвоная змена“ выносім сваё шчырае, ад душы — дзякуй!...

Пажадана і надалей арганізоўваць такія моцна, па-камсамольску, спаяныя экскурсіі ўжо ў іншыя гарады СССР.

**М.Нікановіч. В.Каваль. В.Маракоў.**
**1927 г.**

## 12 ДЗЁН

З падарожжа маладнякоўцаў
па Украіне

... Паравоз засоп: — Пай-аш-шо-оў, пайш-шоў...

Пырскаў дождж.

Хмура глядзелі бязмежныя беларускія лясы.

Маланка цудоўным агнём праймала кожную істоту.

Сумную, далёкую і незнаёмую песню адстуквалі колы цягніка. І было радасна пад іх чароўныя тахты глядзець, як мігцяцца родныя прасторы Беларусі. Трывожныя думкі аб тым, як спаткаюць нас на Украіне...

За 12 дзён нам трэба зведаць гэты край...

Раніца...

Кіеў. Здалёку кідаюцца пазалочаныя купалы Кіева-Пячэрскай Лаўры, цяпер музея, які раскінуты цэлым гарадком высока над мутным і хмурым Дняпром. Праязджаем Дняпро. Гляджу на Дняпро, гляджу на горад, які зверху ўвесь топіцца ў садах, а знізу падмываецца вадою. Цудоўна. Мне чамусьці ўспамінаецца наша лясіста-азёрная Беларусь...

Яшчэ моста не пераехалі — некалькі хвілін, і перад намі аграмадны кіеўскі вакзал. Кіеў на нас

робіць іншае ўражанне, чым родны Менск. Дамы высокія, прыгожыя. Вуліцы prасторныя і чыстыя. А вакол дамоў сады і сады. Палкае сонца пасля халодных дажджоў не дае спакою...

Дзень нашага прыезду мы прысвяцілі і надворнаму агляду Кіева...

Парк і галгофа...

Высока на гары сярод раскошнай зелені стаіць аграмадны помнік Уладзіміру, а далёка ўнізе шырокай срабрыстай стужкай расцягнуўся Днепр... Вольны, спакойны, нікуды не спяшыць...

— Які разгон! Як прыгожа!... — гаворыць Васіль Каваль. Яго вочы пацямнелі, сталі глыбокімі і прыгожымі. Я зайздрошчу яму. Ён такі шчыры заўсёды ў жыцці і творчасці... Я гляджу і захапляюся гэтым юнаком. А збоку нехта ціхім і сумным голасам гаворыць дзіўныя словы Шаўчэнкі: „Няма на свеце другога Дняпра, няма другой Украіны“...

... Зачараваныя прыгоствам, накіроўваемся на галгофу. Мне былі далёкімі і незразумелымі тыя мастацкія рэчы, якія былі звязаны з жыццём і смерцю Хрыста. Я самы маладзейшы з маіх падарожнікаў, вучыўся толькі ў савецкай школе і ніякіх „боскіх запаветаў“ не вывучаў... Экскурсія па горадзе... Анатамічны музей... Жывыя дакументы той ці іншай хваробы чалавека. Усе яны робяць непрыемнае і патрасаючае ўражанне.

... Вечар украінскай культуры. Мы былі запрошаныя... Знаёміліся з пісьменнікамі...

Кіева-Пячэрская Лаўра. Нам паказвалі, каго хавалі ў Лаўры... Ёсць шмат старых магіл, па 200 і больш гадоў... помнікі... некалькі машчэй...

**1928 г.**

# І.Ю.КУЛИК. „АНТОЛОГІЯ АМЕРИКАНСЬКОІ ПОЕЗІЇ“. 1855 — 1925 гг.

Державне Видавніцтво України. 1928, ст. 344. Ціна 3 крб. 50 коп.

Украінскі паэт т. Кулік, які некаторы час жыў у Амерыцы, зрабіў, карыстаючыся дапамогаю некаторых амерыканскіх пісьменнікаў і літаратараў, вялікую анталагічную працу, маючы на мэце азнаёміць украінскіх чытачоў з сучаснай і наогул новай (за апошнія 70 год) амерыканскай паэзіяй.

У рэцэнзуемай кнізе, якая падзяляецца на ўступ і 4 раздзелы: „Предтечі“, „Демократичний ренесанс“, „Молода генерація“, „Піонері пролетарскоі поезії“, ён сабраў найбольш характэрныя творы самых выдатных трыццаці чатырох амерыканскіх паэтаў, пачынаючы ад Уолта Уітмена і канчаючы паэтамі нашага дзесяцігоддзя, групуючы іх часткова ў храналагічным парадку, а часткова ў залежнасці ад той плыні, да якой схіляецца творчасць таго ці іншага паэта.

Такім чынам, чытач мае магчымасць атрымаць больш-менш поўнае ўяўленне аб эвалюцыі амерыканскай паэзіі ад часоў геніяльнага песняра-прарока новае эры ў жыцці чалавецтва Уолта Уітмена да песняроў класавага змагання, сучасных амерыканскіх паэтаў-камуністаў, як Клод Маккей, Мікель Гольд ды інш.

Гэтаму дапамогуць у значнай меры і тыя даведкі біяграфічна-інфармацыйнага характару, якія падае аўтар амаль аб кожным паэце, і ўступ, у якім аўтар дае хоць беглы, але грунтоўны агляд сучаснай амерыканскай паэзіі і шляхоў яе эвалюцыі ад самай эпохі яе зараджэння.

Безумоўна, пазнаёміцца з усім гэтым будзе вельмі

карысна ўкраінскаму чытачу, які ў большасці выпадкаў нават і зусім не чуў аб тых паэтах, творы якіх аўтар выбраў для анталогіі, бо, як кажа т. Кулік, „на Украіне зусім не ведаюць сучаснай амерыканскай паэзіі“. Неабходна таксама рэкамендаваць гэтую кніжку і тым беларускім чытачам, якія валодаюць украінскай мовай.

Асабліва цікавымі і карыснымі, на наш погляд, будуць першы і апошні раздзелы анталогіі. У адным з іх змешчаны творы трох амерыканскіх класікаў: Уолта Уітмена, Эдвіна Маркгама і Гораса Траўбэла, у пераважнасці прадгаданні, пратэсты супраць сацыяльнага ўціску і яшчэ нясмелыя заклікі да змагання. Да лепшых вершаў гэтага раздзела можна аднесці „Людина з рискалем“ Эдв. Маркгама і „Народ є господар життя“ У. Траўбэла. Што тычыцца твораў Уітмена, пададзеных у анталогіі, то трэба сказаць, што яны якраз не з’яўляюцца лепшымі і найбольш характэрнымі ў яго творчасці, якая, будучы вельмі багатай, уяўляецца па гэтых урыўках вельмі бледна і бедна, што можна паставіць укладчыку анталогіі ў загану.

Што тычыцца наступных двух раздзелаў, то тутака чытач знойдзе і паэтаў-прадстаўнікоў дробнай буржуазіі з іх тугою аб мінулых ціхіх ды спакойных часах „дэмакратызму“ эпохі Лінкальна, калі развіццё капіталізму яшчэ не турбавала дробную буржуазію амерыканскіх невялікіх гарадкоў і мястэчкаў, і прыхільнікаў ідэі „мастацтва дзеля мастацтва“, паэтаў і інтэлігентаў, паміж якіх вельмі часта сустракаюцца і паэты-народнікі з настроямі пакаяння ды стыхійнай рэвалюцыйнасці.

Але вершы ўсіх гэтых паэтаў адлюстроўваюць у большай ці меншай ступені тыя гістарычныя працэсы развіцця амерыканскай дзяржавы і грамадства за апошняе паўстагоддзе і даюць багаты матэрыял для разумення гісторыі амерыканскай паэзіі.

Апрача таго, у іх досыць часта і часамі вельмі

ўдала паказваецца адваротны бок славутай амерыканскай цывілізацыі, а менавіта яе жорсткія супярэчнасці ў іншых да немагчымага адмоўных і часам дзікіх праявах, як праследванні і катаванні неграў, жудасная эксплуатацыя рабочых, усялякія палітычныя шантажы і ашуканствы ды інш., наяўнасць такога элементу ў гэтых вершах уяўляе таксама немалую карысць для нашага сучаснага чытача.

Пра тое, якую карысць і цікавасць могуць уяўляць для чытача Саюза Савецкіх Рэспублік творы піянераў амерыканскай пралетарскай літаратуры, здаецца, казаць не прыходзіцца. Гэта відавочна. Дарма, што шмат каго з аўтараў гэтых вершаў не прызнаюць за паэтаў у капіталістычна-буржуазнай Амерыцы, але „песні яго вы пачуеце ўсюды ад Аляскі да Нью-Йорка, ад Юкона да Тэхаса“, кажа т. Кулік пра аднаго з іх.

Гэтыя паэты не так даўно яшчэ нарадзіліся, але ім належыць будучыня. Цяжкім шляхам ім прыходзіцца ісці да яе, некаторыя з іх, як Джозэф Гілсторм і Ральф Чаплін, сталі ахвяраю праследванняў амерыканскай буржуазіі, іншых ёй удаецца падкупіць і перацягнуць на свой бок, як сусветна вядомага Карла Сэндборга, які за ранейшую пару сваёй творчасці даў не адзін каштоўны зборнік паэзіі, багатай індустрыяльнымі і пралетарскімі матывамі. Але ўсё ж нягледзячы на гэтыя сумныя выпадкі здрадніцтва і ахвяр капіталу, пралетарская паэзія ў Амерыцы нараджаецца і будзе расці.

Аб гэтым сведчаць новыя імёны, якія зусім нядаўна яшчэ прыйшлі ў літаратуру і творы якіх т. Кулік клапатліва пазбіраў са старонак розных амерыканскіх часопісаў.

Добра было б, каб нашыя чытачы мелі магчымасць знаёміцца і сачыць за развіццём пралетарскай паэзіі Амерыкі не эпізадычна, як у рэцэнзуемай анталогіі, а сістэматычна — шляхам сталай інфармацыі і сістэматычна-перыядычнымі перакладамі найбольш

выдатных яе твораў.

Наогул жа трэба сказаць, што гэтая анталогія з’яўляецца вельмі багатым і каштоўным укладам у сучасную ўкраінскую літаратуру, і застаецца толькі пажадаць, каб падобныя кніжкі пачалі з’яўляцца і ў нас на Беларусі.

Пакуль што прыходзіцца канстатаваць, што Дзярж. Выдавецтва Украіны ў галіне выдання перакладной іншаземнай літаратуры пайшло ад нас далёка ўперад, — аб гэтым сведчыць хоць бы тая самая інфармацыя аб новых кніжках на вокладцы анталогіі, у той час як у нас усе выдадзеныя кніжкі перакладной літаратуры лёгка можна палічыць на пальцах нават і адной рукі.

Трэба нашым выдавецтвам узяць прыклад у гэтых адносінах з украінцаў і звярнуць сур’ёзную ўвагу на працы ў гэтай галіне літаратуры.

**1928 г.**

## АНРЫ БАРБЮС. РОЗНЫЯ ФАКТЫ

Пераклад з французскай мовы Н.Белякоўскай.
Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва. Менск, 1929.
Тыраж 3000 экз. 203 стар. Цана 1 р. 30 кап.

Кніга жудасных фактаў. Іх пазбіраў з усяго свету гэты пісьменнік з найдасканальнейшым грамадскім сумленнем, які паставіў мэтай свайго жыцця „змаганне з прыгнечаннем і гвалтам, адкуль бы яно ні паходзіла“ (з праграмнае дэкларацыі Барбюсавага часопіса „Le Mond“).

Гэта кніга напісана з пэўнай мэтай — паказаць грамадскай думцы сапраўдны твар нашага XX веку, які больш за ўсё можна назваць „векам крыві“, калі

пад маскай хвалёнай буржуазнай цывілізацыі і прагрэсу „барбарства пануе ўсюды ў нашы дні“.

І ва ўсіх трох раздзелах кнігі перад чытачом праходзяць адзін за адным цені замучаных ахвяр імперыялізму. У раздзеле „Вайна“ аўтар з найвялікшай пераконанасцю паказвае чытачам, якое дзікае зверства хаваецца пад вэлюмам „геройскага патрыятызму“ афіцэраў і генералаў. Ён паказвае, як крываваю муштрай робяць з людзей быдла, у якога не хапае адвагі быць людзьмі. І гэта робіцца ў той краіне, дзе, па думцы некаторых жартаўнікоў, усе людзі маюць правы, якія і называюць урачыста „правы чалавека“.

А на справе: „зверскі садызм Атыл і Тамерланаў узняўся надзвычай высока ў наш прагрэсіўны век. Удасканалілі не толькі машыны. Удасканалілі таксама двудушнасць, подласць і нізкасць чалавечыя“.

І, прачытаўшы гэтыя кароценькія апавяданні, здаецца, нельга забыць няшчасных людзей, якія недарэчна гінуць з-за капрызу „дзікіх звяроў, апранутых у парадную форму афіцэраў генеральнага штаба, якім даецца ў часе вайны поўная воля забіваць людзей, калі толькі яны (афіцэры) гэтага зажадаюць“.

Апошнія два раздзелы апісваюць тыя сярэднявяковыя жудасныя катаванні, якімі буржуазія стараецца задушыць усё болей і болей узрастаючы рэвалюцыйны рух.

І якім непадробным, бяскрайным трагізмам вее ад гэтых балгарскіх дзяцей, якія, пераймаючы ўсё, што робяць дарослыя, пачалі амаль не па ўсёй краіне гуляць у паліцыю і павесілі некалькі сваіх маленькіх таварышаў. Або ад гэтага мексіканскага рэвалюцыянера, засуджанага ў астрог на ўсё жыццё, якога буржуазнае „правасуддзе“ паводле свайго „дабрачыннага“ звычаю адпусціла на адзін дзень дахаты, і які да таго аслабеў у астрозе, што не здолеў дайсці дамоў („Няспраўджаная пабыўка“).

Гэтую кніжку нельга чытаць спакойна. Яна не можа не выклікаць абурэння і нянавісці да той

„цывілізацыі“, якая спараджае, апраўдвае і абараняе ўсе гэтыя здзекі, злачынствы і зверствы.

„Калі гэтыя старонкі ўсхвалявалі некаторых людзей, дык толькі таму, што здолелі абудзіць струны жывога сэрца, як тыя скрыпкі са старых легенд, якія турбавалі і трывожылі людзей не таму, што яны былі артыстычна зроблены, а таму, што ў гэтых скрыпках пяяла чыясьці замкнутая ў іх душа“. І сапраўды, з гэтых старонак Барбюсавай кнігі даносяцца да нас крывавыя стогны людзей, закутых і заціснутых у ланцугі астрогу і прыгнечання. Гэта, здаецца, першая кніга з французскай літаратуры, выдадзеная БДВ. Яна бясспрэчна заслугоўвае дадатную ацэнку і займе адно з відных месцаў у нашай небагатай яшчэ перакладной літаратуры.

Адносна самога перакладу трэба адзначыць слабое знаёмства перакладчыцы з беларускай мовай, перагружанасць русіцызмамі, ужыванне неўласцівых беларускай мове дзеяслоўных прыметнікаў, усюды, дзе трэба і не трэба, а таксама і невыстарчальную працу стыль рэдакцыі. Але побач з гэтым, як станоўчы момант у перакладзе, трэба адзначыць наяўнасць прыгожых і вобразных стылістычных зваротаў.

**В. Армак (В.Маракоў і А. Мардвілка)**
**1930 г.**

## ХРОНІКА БЕЛДЗЯРЖКІНО КУЛЬГАЕ

Калі ў адносінах да мастацкіх і культ-фільмаў Белдзяржкіно за апошні час зрабіла шырокі крок наперад і мае такія значныя дасягненні, як карціны „Да заўтра“ і „Волат“, дык у адносінах да выпуску дабраякаснай хронікі яно топчацца на месцы.

У нашы дні вялікіх перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва кіно таксама павінна ісці на службу гэтага будаўніцтва. Павінна знаёміць працоўнага гледача з тымі задачамі, якія стаяць перад намі ў сучасны момант, уздымаць энтузіязм працоўных. Што ж мы бачым у кінахроніцы, якая ідзе цяпер у менскім кінатэатры „Культура“?

Перш за ўсё, што з’яўляецца недахопам, гэта тое, што юбілей т. Сталіна адзначаецца са спазненнем на месяц. Апрача ўсяго гэтага, зазняты партрэт Сталіна, якога вітае аўдыторыя, — жывога Сталіна няма. Такі малюнак у кіно з’яўляецца проста непісьменнасцю.

У аддзеле падрыхтоўкі да вясновай сяўбы не паказаны размах вытворчасці завода сельскагаспадарчых машын. Мала паказаць толькі адзін з момантаў — складанне веялкі.

Дзве наступныя старонкі кіначасопіса падносяць гледачу не больш не менш, як „мудрую“ галаваломку.

Два палітычна-важныя актуальныя моманты зманціраваны так, што ў гледача зусім блытаецца разуменне. Раптоўны пераскок прысуду па справе забойства Варавы да чысткі партыі і надпіс „...ён сапраўдны член партыі“ ствараюць уражанне, што гэтым членам партыі з’яўляецца забойца Варавы.

Малюнак сярод бязбожнікаў дае сапраўдны канкрэтны і блізкі разуменню шырокіх працоўных мас факт. Паказ таго, як рабочыя і работніцы здаюць ахвяраванні ў залаты фонд індустрыялізацыі, з’яўляецца адным з самых яркіх і цікавых момантаў хронікі.

Будаўніцтва, прадстаўленае толькі набудовай банку, наогул змазана. Не відаць размаху будаўніцтва. Фатаграфія расплыўчатая і шэрая.

Як агульны адмоўны бок хронікі трэба зазначыць тое, што яна адбівае амаль выключна жыццё горада

Менска. Няма ахвату ўсёй краіны.

Да надпісаў зроблены нейкія жалобныя рамкі, якія ніяк не ўвязваюцца з тымі малюнкамі, што паказаны ў гэтай хроніцы.

Белдзяржкіно павінна звярнуць больш увагі на якасць той хронікі, якую яно выпускае, і даць шырокім пралетарскім масам сапраўдны сённяшні дзень ва ўсіх яго галінах.

**В.Маракоў, Ч.Барысевіч**
**1930 г.**

## ПРА ПАЭЗІЮ

### 1

Што такое сяброўства?

Сяброўства — гайка, што яднае дзве рэйкі ў адну істоту, па якой прабягаюць блакітныя экспрэсы чалавечых надзей. Роўны, просты, адкрыты шлях з зялёным семафорам наперадзе!

За экспрэсамі — над гарадамі і над вёскамі, палямі і лугамі бягуць вятры. Вятрамі ж народжана музыка правадоў. Гэта дваццаты век — век электрычнасці, век радыё.

Гнуцца рэйкі пад цяжкімі коламі, гнуцца і стогнуць, але не разыдуцца, пакуль не лопне гайка.

А калі лопне — каюк! І тут тлумачыць непатрэбна, што бывае далей: блакітныя экспрэсы лятуць у нябыт.

Назаўтра злітуюцца рэйкі і пабягуць па іх новыя цягнікі, але ніколі не вяртаецца згубленае. Гайка надзей, што злучала дзве істоты ў адну, здрадзіла, а здрада не паўтараецца. Так у сяброўстве.

Што ж такое паэзія?

Паэзія — таксама гайка, але гайка, што яднае адну істоту з тысячамі другіх істот і, пад сакрэтам

кажучы, робіць іх паміж сабою сябрамі сэрца.

Калісьці даўно ў сівой мінуўшчыне складаліся доўгія падрабязныя паэмы пра жыццё і славу адысеяў. На многіх старонках гэтых цягучых паэм апавядалася пра тое, як людзі елі, пілі, кахаліся і ваявалі. Гэта і зразумела: куды было спяшацца? Над галавой ззяла празрыстае элінскае неба, вялікія багі лагодна ўсміхаліся людской мудрасці і светлагрывыя пегасы мора экспартавалі песні. І ўсё ж і тады, на туманнай зары чалавецтва, паэзія, як тая гайка, звязвала тысячы істот у адну істоту і вяла іх адною дарогай да пэўнае мэты. Паэзія і тады не была цацкаю: яна праслаўляла герояў і ганьбавала тых, хто быў пераможаны ў крывавых бойках.

У наш дваццаты век — век электрычнасці, век радыё, век вялікіх класавых боек, нельга апавядаць на дваццаці старонках пра тое, як чалавек з'еў міску заціркі, або выпіў куфаль піва. (Успаміны Гамера!). Нельга і распісваць з асалодай на дзесятках і сотнях старонках, як гэта рабіў брытанскі лорд і паэта Байран, прыгоды ўдалага Дон-Жуана.

І ўсё ж, зусім зразумела тое, што Байран быў уладаром дум свайго веку. Сытыя, узгадаваныя на жабрацтве мільёнаў, маладыя гультаі з багатых і славутых сем'яў не ведалі, куды кінуцца ад нуды. Працаваць яны не хацелі і не маглі, і адно, што ім заставалася — распуста, віно, прыгоды. Паэзія ж Байрана, дзякуючы суроваму і мяцежнаму генію яе творцы, была сугучна гэтым людзям. Бунт Байрана — бунт сытага чалавека.

Наш час патрабуе дынамікі. Учарайшы Дон-Жуан паступае сёння ў фашыстоўскую паліцыю і расстрэльвае рабочых. І цяпер яму непатрэбна блукаць па морах і акіянах у пошуках крывавых прыгод. О, не! Ён забаўляецца сёння ў родным горадзе на роднай вуліцы. Гэта не так небяспечна і лепш аплачваецца. Барбары дваццатага веку, якія душаць нямецкую рэвалюцыю і спалілі нямецкую культуру, не

раўня барбарам Байрана! Новым барбарам служыць новая тэхніка знішчэння і згубы, тэхніка смерці, і таму наш век патрабуе рэвалюцыйнай дынамікі ў барацьбе з пошасцю мінулага, з чорнымі сіламі капіталізму. І ў гэтых адносінах наша паэзія павінна быць рэвалюцыйна-дынамічнай і класава пільнай. Калі ж паэта здраджвае свайму класу, ён здраджвае і паэзіі.

**2**

У адзін гарачы жнівеньскі дзень я прайшоў многа цяжкіх вёрст доўгаю дарогай да горада. Сонца няшчадна пякло, і ў грудзёх у мяне варушылася цэлае шалёнае пекла агню. Было цяжка ісці, і мае патрэсканыя вусны паліла смага.

І толькі ў надвечар, калі задыміліся змрокам палі і постаці лёгкіх ценяў леглі на зямлю, я напаткаў крыніцу студзёнай вады, што пераліваласе з ціхім журлівым звонам з каменьчыка на каменьчык і спявала нязнаныя песні. Я прыпаў апаленымі вуснамі да крыніцы і піў яе празрыстае віно, аж покуль не пацямнела ў вачох.

А тады? Тады я аглянуўся на пройдзены шлях, і мяне як бы што скаланула. Мяне зачаравала хараство пройдзенага, і яшчэ раз захацелася прайсці той жа дарогай, каб зноўку, з такім жа захапленнем, з такой жа асалодай упіцца гаючай атрутай крыніцы.

Так і ў паэзіі. Калі вы праходзіце цяжкім і суровым шляхам жыцця і змагання, то з якой асалодай вы будзеце піць тую ісціну і тое хараство, што выказалі вусны, каб з новымі сіламі рушыцца ў новую дарогу. Слава таму паэту, да паэзіі якога хочацца прылажыцца двойчы. Паэзія павінна рухаць, як кроў, і ззяць, як алмаз. У гэтым яе спецыфіка. Нельга змешваць паэзію, як гэта часта робяць, з

газетнымі артыкуламі і артыкульнымі вершамі.

Мы супроць Багдановіча, калі ён дае перавагу васількам над збожжам, але мы не супроць васількоў. Мы любім хараство жыцця і знаем, што з ім лягчэй ісці да вызначанай мэты.

Я п’ю прагнымі вуснамі яд крыніц Лермантава. Я ўпіваюся ім і зноўку хачу жыць, будаваць, змагацца, каб знайсці новыя крыніцы, напіўшыся ад якіх, змог бы зноўку стаць у захапленні перад сваім пройдзеным шляхам і ўславіць яго поўным сэрцам.

**3**

Звычайна ў нашых школах — у сямігодках, тэхнікумах, інстытутах — пачынаюць вывучэнне беларускай літаратуры з Рыпінскага, Чачота, Баршчэўскага і канчаюць Александровічам. Можа, гэта, з гістарычнага і акадэмічнага пунктаў погляду, і правільна, але дазвольце на гэты раз не згадзіцца.

Баршчэўскі, Неслухоўскі, Марцінкевіч! — Ды, па сутнасці кажучы, якія гэта паэты? Што ў іх агульнага з паэзіяй?! Можа, толькі тое, што яны пісалі рыфмаванай прозай і не рабілі тых памылак, якімі грашаць паэты нашага часу?!

Зразумела, вы можаце заўважыць, што да ўсякай рэчы трэба падыходзіць гістарычна. Згодзен. Не будзем патрабаваць ад „старыкоў“ дасканалай тэхнікі верша, не будзем шукаць у іхніх творах вырашэння вялікіх і складаных ідэй, але мы ў праве патрабаваць ад кожнага паэта хоць нязначнай граматнасці ў напрамку рытмікі, рыфмы, вобразу. Апроч таго мы не можам не патрабаваць ад паэта праўдзівага і сур’ёзнага паказу сваёй эпохі.

Што ж мы маем у „старыкоў“? У большасці, як гэта нам ужо вядома, „старыкі“ беларускай паэзіі былі прадстаўнікамі вышэйшых класаў грамадства і

з'яўляліся высока адукаванымі людзьмі. Таму мы і павінны былі б, пры пераглядзе культурнай спадчыны, знайсці ў іхніх творах хоць нязначныя іскаркі гэтай культуры. Аднак, апроч настаўлення „дурным мужыкам“ не піць гарэлкі і слухацца „бацькі-пана“, мы нічога тут не знаходзім. Калі ж браць фармальны бок творчасці „старыкоў“, то трэба сказаць, што вучні звычайнай сярэдняй сямігодкі пакінулі іх на сённяшні дзень далёка па-за сабой. Які ж, у такім разе, бок культурнай спадчыны мы можам выкарыстаць „старыкоў“ для сябе? Адказ можа быць толькі адзін і толькі адмоўнага парадку.

Першае слова беларускай паэзіі сказалі Янка Купала і Якуб Колас. Вось вытокі беларускай паэзіі.

Наогул жа — бліжэй да сучаснасці. Нашымі навуковымі работнікамі, нашай крытыкай ганебна мала звяртаецца ўвагі на паэзію нашых сучаснікаў. Мы не маем па паэзіі ніводнае сур'ёзнай работы, ніводнага сумленнага артыкула. Гэтая вобласць літаратуры забыта крытыкай, як быццам яна з'яўляецца зусім нязначнай. Аднак гэта не так.

Вось гэты лёгкі падыход да паэзіі прыводзіў некаторых рэцэнзентаў да патрабавання ад паэты „павелічэння грамадазнаўчых матываў“, або адказу на тое, чаму паэта ўжывае блакітавы край, а не іншы які, бо ў Беларусі ж усяго толькі 50-60 сонечных дзён. Гэта, па сутнасці кажучы, дужа падобна да таго дурня ў Александровічавым „Напоры“, які пасля кожнага слова пытаецца: „А чаму ж?“.

## 4

Гэтымі днямі я неяк чытаў допіс пра тое, што адзін літаратурны гурток пачаў сваю працу з падрыхтоўкі да атрымання мандатаў на ўсебеларускі з'езд савецкіх пісьменнікаў. Атрыманне мандата — гэта, зразумела, рэч добрая, але тут хочацца пажадаць, каб не выйшла так, як у байцы нашага

паважанага сатырыка Кандрата Крапівы, калі галаву заменьваюць мандатам. Таварышы! Я думаю, што нарэшце мы выраслі, каб расцэньваць паэту па творчасці, а не па мандаце.

Перада мной артыкул паэты Пятра Глебкі „Думкі пра нашу паэзію“. Я перачытваю яго ў другі раз, і ён мяне канчаткова здзіўляе.

Згаджаючыся, таварыш Глебка, з цэлым шэрагам тваіх правільных думак пра літаратуру, як зброю класавай барацьбы, і прымаючы „асноўныя пункты тваёй паэтычнай праграмы“, дазволь мне не пагадзіцца з некаторымі тваімі палажэннямі.

а) Ні ў якім разе нельга адрываць Янку Купалу і Якуба Коласа ад усёй беларускай савецкай паэзіі і адводзіць ім асобны кірунак. Гэта зусім няправільна, тым больш, што гэты кірунак абгрунтоўваецца карэннай перабудовай гэтых паэтаў і тым, што і „наша рэчаіснасць пачынае біцца ў іх вершах поўным здаровым пульсам“. У наш час нікому не патрэбна даказваць, што здаровы пульс рэчаіснасці і карэнная перабудова маецца не толькі ў творах Купалы і Коласа, а і ў цэлага шэрагу другіх савецкіх пісьменнікаў, якія выходзяць на рэйкі сацыялістычнага рэалізму.

б) Правільная думка, што Куляшоў і Зарыцкі разбураюць дашчэнту спецыфічную розніцу паміж вершамі і прозай, псуецца заяўленнем, што ў гэтым вінавата эпічнасць рытмікі Куляшова і Зарыцкага, якая набліжаецца да мовы звычайнай гутаркі. Справа тут не ў эпічнасці, а ў тым, што і Зарыцкі, і Куляшоў пішуць звычайнай рыфмаванай прозай. „А ты, Чырка, жоўтароты варабей, Цыц! Я яшчэ з тваім дзедам у адной лазні мыўся. Не тое, каб мы былі з ім прыяцелямі, не любіў я твайго дзеда. Дужа ён не падобны быў да цябе: чыркае, чыркае, а сілы няма...“. Вось вам прыклад з „вершаванага“ твору Куляшова „Аманал“. Я не ведаю — каму гэта можна ўбіць у галаву, што вышэйпададзеныя

радкі з'яўляюцца вершаванымі, або больш таго — паэтычнымі радкамі? А гэткае ж з'явішча мы маем на кожнай старонцы.

**1933 г.**

# Пераклады

**Е. Б. БРОЎНІНГ**
*(З англійскай)*

## КРЫК ДЗЯЦЕЙ

Ці вы чуеце, браткі, як плачуць дзеці,
Не зазнаўшы гора сталых год?
Яны хіляцца галоўкамі да матак
І стрымаць не могуць слёзаў ход.

Ў паплавах маленькія ягняткі скачуць,
Птушкі весела шчабечуць у гняздзе,
У лясах зайцы гуляюць з лісцем,
Расцвітаюць краскі ў светлы дзень.

Толькі дзеці нашыя малыя
Горка плачуць без пары,
Плачуць і тады, калі другія
Весела гуляюць да зары.

Яны глядзяць — і на збялелых тварах
Запаў глыбока ў зморшчках сум —
Так у сівога старца карых
Вачах мігцяць зарніцы дум...

— Зямля бацькоў была спрадвеку жорсткай
Для кволых ног замучаных дзяцей,
Яшчэ ў жыцці мы не таптàлі сцежак,
А могілак спакой што далей, то бліжэй.

Спытай старых, чаму яны галосяць,
Калі пара надыдзе паміраць? —
А наша сэрца смерці просіць,
Бо вельмі цяжка вечна гараваць.

Мы змораныя, — кажуць дзеці, —
І не можам бегаць і скакаць.
Марым мы аб паплавах і леце —
Паваліцца б на траве і спаць.

Бо дрыжаць балюча нашы ногі
І мы валімся, калі пачнем ісці,
Нашаму замучанаму зроку
Ружа будзе белым колерам цвісці...

Бо штодня мы цягнем нашу лямку
Пад зямлёй у змроку сутарэнняў,
На заводах безупынна цягнем
Рух жалезных колавых злучэнняў.

Цэлы дзень гудуць і ходзяць колы,
Іхні вецер наш казыча твар,
Пакуль мур засвеціцца вясёлы,
Галаву і сэрца апануе жар.

І закруціцца ў вакне высокім неба,
Доўгі цень пачне круціцца на сцяне,
Мухі чорныя закруцяцца па столі,
Цэлы дзень мы круцімся усе.

Цэлы дзень гудуць жалезам колы,
І часамі крыкнуць бы хацеў:
„Супыніцеся! Мы так шалёна стогнем,
Замаўчыце, колы, хоць на дзень!“

Яны глядзяць — і на збялелых тварах
Лягла, як ноч, халодная нуда.
Туды, дзе ўсход расквітвае пажарам,
Яны нясуць любоў сваю аддаць.

— Як доўга, — кажуць, — жорсткія вы людзі,

Як доўга будзеце сусветам кіраваць?!
Ваш капітал нам цісне камнем грудзі,
Каб нашым сонцам скрынкі набіваць...

Смакчы да часу нас, залатахцівец,
Бо наша кроў твой вызначае шлях,
Бо гнеў дзяцей прыдушаны, маўклівы
Пачуе зноў крывавая зямля!

Пераклад падпісаны псеўданімам
В. Маракова — Б. Ім. Армар.
1928 г.

**А. НОВІКАЎ-ПРЫБОЙ**
*(З рускай)*

## ПА-ЦЁМНАМУ

### ФРАГМЕНТ АДНАЙМЕННАГА АПАВЯДАННЯ

Брудны і мізэрны шынок, якія бываюць толькі ў бедных кварталах. Пачарнелая столь. Шпалеры на сценах абадраныя вісяць шматкамі. Дзенідзе малюнкі тандэтнае вытворчасці. У адным з куткоў сумна тахкае вялікі стары гадзіннік са зломанымі стрэлкамі. За некалькімі столікамі сядзяць рамізнікі, дробныя гандляры і рабочыя. Адсопваючыся, гучна сёрбаюць са сподачкаў гарачую гарбату; п'юць гарэлку і прагна знішчаюць дрэнную закуску. За буфетам, абапёршыся локцямі, дрэмле прыказчык, тоўсты, лысы, у паласатай паркалёвай рубашцы і зашмальцованай жакетцы.

Духата. Пахне падсмажанаю цыбуляю, цвілаю стравою і гарэлкаю. Над галавою клубіцца воблака тытунёвага дыму. Гавораць вяла, неахвотна, збітымі словамі. Зрэдка хто-небудзь моцна выла-

ецца, і то не ад сэрца, а так сабе — з прывычкі. Ні думкі, ні жаданняў, як быццам усё ўжо даўно перадумана, расказана і тысячу разоў вырашана. І жыццё здаецца такім самым бяссэнсавым, як ход гадзінніка, у якога зломаны стрэлкі.

Нуда немагчымая.

Я прытуліўся за столікам у кутку, у баку ад іншых. Перада мною стаіць напалову пустая бутэлька з півам. Гадзіны ўжо дзве сяджу я так, заняты толькі адною думкаю: куды б зікнуць з гэтага горада.

Заставацца тут болей нельга. Таварышы арыштаваны, мяне таксама добра ведае паліцыя і шукае ўсюды. Хаваючыся ад яе, я ўжо некалькі тыдняў бегаю, як зацкаваны звер. Паліцыя ведае, што пашпарт мой фальшывы, другі нельга. У мяне няма ніякага прытулку. Жыву між небам і зямлёю...

**1931 г.**

**ЭМІ СЯО**
*(З кітайскай)*

## НАНКІН РОД

### I

Ціха на Нанкін Род,
у тумане гарань ліхтары.
Дождж, бы калючы шрот,
да касцей прабірае рыкш.

Як мармур, мокрыя сцены.
Спяць і лэдзі, і джэнтэльмены.

У сне сцены,

ў імгле цені,
адзін
рушыўся ўперад.
Два другіх,
пільных
і злых,
патанулі ў слізоце шэрай.

Рог. Тут.
— Не капайся...
— Чакай!
Слова, два — і нямее слова.
Гэта рукі
Чырвоных лістовак
За чырвоны галасуюць
Кітай.

А — Чжан справіўся!
А — Лі справіўся!
А — Ван справіўся!
Лістоўкі расклеены — ёсць!
Лістоўкі расклеены — на рагу.
І трое ў імглу бягуць.

„Далоў ангельскіх жандараў“.
„Прыцягнуць да адказу Гаміндан“.
„Хай жыве Чырвоная армія,
Улада рабочых і сялян“.

**II**

Расійскі белагвардзеец
Ангельцу служка навек —
Ён за індуса надзейней,
Сволач, а не чалавек.

Белагвардзеец стаіць з вінтоўкай
На скрыжаванні Нанкін Род.
Белагвардзеец цэліцца зноўку

Ў цень, што шагнула за плот.

А-Чжан разумее.
Не чакай дабра!
Вогненныя змеі
І чорны жах.
Трах-трах-та-рарах!

Упаў А-Ван,
Падбягае Лі і Чжан,
Вырваць ірвуцца вінтоўку.
Белы шалее —
Удар...
І стогн...
Бягуць вартавыя з усіх бакоў
І звязваюць нашых вяроўкамі.

На Нанкін Род захліпаюцца свісткі.
— З намі жартаваць небяспечна.
— Што гэта у вас за ліcткі,
Што за паркаль, крывёй асвечаны?..

— Гэта чырвоны сцяг
Для дэманстрацыі.
А гэтыя лісткі —
Адбіткі,
Пракламацыі.

Заклікаем рабочых —
Баставаць,
Заклікаем сялянства
Паўставаць!

Бі!
Прыклад...
                    Штык...
Ну, гавары,
Ты!

Адкуль вы? З якой турмы?..
Мы адусюль і усюды мы,
Дзе ёсць паветра —
Там
і мы...

Не сцерпяць масы
Лёс раба.
Дзе ёсць класы, —
Там барацьба.
Так, ты мяне не заб'еш, —
Я даканаю цябе.
Суровая справа,
Жорсткая справа —
Класавая барацьба!
Апошнія лозунгі — моцна, у крык,
Апошнія стогны — глуха, у хрып...

Ціха на Нанкін Род,
У тумане гарацць ліхтары.
Дождж, бы калючы шрот,
Да касцей прабірае рыкш.

Як мармур, мокрыя сцены.
Спяць і лэдзі, і джэнтэльмены.

**1932 г.**

## ПАМЯЦІ КАНТОНСКАЙ КАМУНЫ

„Рыс — рабочым!
Зямля — сялянам!
Уся ўлада — саветам!
Смерць гаміндану!“
Гэту песню
чатыры

гады
назад
На кантонскіх вуліцах
хорам спявалі,
З гэтай песняй
рабочы,
селянін,
салдат
Змагаліся
І перамагалі...
Гэту песню,
ўспамінаючы тыя дні,
Спявае Кітай
працоўнаю грамадой.
— Без згоднікаў!
Мы — адны!
Уперад, таварыш!
У бой!

*

Студзёная раніца грала над намі.
Ляжалі, як цукар, на бруку снягі.
На будынкі Кантона баявымі рукамі
Чырвоныя ўзняты сцягі.
Цёмная раніца зімняй раўніны.
Чырвонаармейцы. Вучэбны полк.
На вуліцах — крык, бегатня, страляніна.
І раптам — шум вуліцы змоўк.

Ні слова — ўсё ціха ў мяцежным стане,
Вакол цішыня ляжыць, —
На трыбуне — арганізатар паўстання —
Таварыш
Лю Шао-цы!
„Таварышы!...
Рабочыя, салдаты, сяляне,
Каб вызваліць Кітай —
Ярчэй агні змагання
За наш Савецкі край,

За наш працоўны край!“

*

Ангельскі імперыяліст!
Ты думаеш, моц у тваіх кананерках?
Ты думаеш — мы здаліся?
А ну,
павяртай
Цяпер ты!
А ці ж думаеш ты пра гэта,
Што жыве разбіты Кантон,
Што ніколі нязломны ў бойках
Саветы,
Што штандартаў кантонскіх чырвоны
агонь
абуджае працоўных
сусвету!

Японскі імперыяліст!
Ты расстраляў камуну Кантона,
Ты думаеш — мы здаліся,
Што — шмат у цябе патронаў?
А ці думаеш ты пра гэта,
Што жыве разбіты Кантон,
Што кліч камуны палыхае над светам
І што рабоў у Карэі
ўзнімае ён?!

Французскі імперыяліст!
Ты ў Лунчжоў разагнаў саветы...
Ты думаеш — мы здаліся?
Ты думаеш — зжыты чырвоныя з свету?!
А ці думаеш ты пра гэта,
Што жыве разбіты Кантон,
Што кантонскай камуны чырвоны
агонь

Займае Хайфан і Сайгон?!

*

Паўстаюць і цвітуць,
як пад сонцам сад,
Змагары
ўсіх калоній
свету,
Правільна Ленін сказаў,
І ў адсталых краінах
Магчымы
Саветы!
Хай у Кантоне забіта
шэсць тысяч салдат,
У дзесятках правінцый
усход разгараецца
І выходзяць,
— як сонца вясны,
на парад
Сто мільёнаў
Савецкіх кітайцаў!

**1933 г.**

**У. БРАНЕЎСКІ**
*(З польскай)*

## НА СМЕРЦЬ ТАВАРЫША

З гэтай камеры цёмнай, халоднай
Пойдзеш ты — непатрэбны госць,
І на ростань пад небам лагодным
Зноў прыпомніш сваю маладосць.

Па цябе хутка прыйдуць жандары,
Павядуць цябе з камеры жвава,
Трэба так, як салдаты арміі,

Быць спакойным у бойках крывавых.

Так! Памерці няцяжка будзе,
Хоць сэрцу ўсяго дваццаты.
Гэта сэрца ў сабе не застудзіць
Дзесяць крыўд, дзесяць куль заклятых.

Ёсць жыццё, што не хмурыць бровы,
Варта жыць і памерці варта!
Трэба несці, як штандар, галовы,
Трэба йсці, не губляючы гарту.

Трэба ўмець прыгожа памерці,
Ў вочы смерці той глянуць смела,
Каб злякаліся злыдні, і сэрца
Не пачула варожых стрэлаў.

**1933 г.**
**(Сумесна са Станіславам Шушкевічам)**

**С. БОГУШ**
*(З рускай)*

## БАЯВЫ ТАВАРЫШ

Я помню бой. Спявалі дзіка кулі.
Ішлі уперад мы, ішлі ў агонь і дым,
І ў тым смяротным, адгрымеўшым гуле
Перамагалі й падалі у гуле тым.

Расквітваў неба луг асквейкамі шрапнелі,
Пад капытамі конскімі выростаў пыл,
І клаўся з ветрам пыл на шэрыя шынелі,
І кроў лілася на кавыль.

І штось балюча ўрэзалася ў грудзі.
Аплочан смерцю тут, таварыш, кожны крок.
І быццам студзень ў сэрцы, ашалелы студзень

Шпурляе у бяссэнсны змрок.

Не ведаю, ці доўга так ляжаў я.
На поле лёг туман, ўзышла вячэрняя зара,
Калі схілілася ты нада мной, сяброўка баявая —
Мая сястра!

Я быў жывы! Жыццё ўсміхнулася наноў
Тваймі вачмі і зоркай над зялёным светам.
Ах, гэта ўсё было, здаецца, так даўно,
І так ўсё блізка гэта!

Пад кулямі шукала нас ты:
Цябе не страшыў бойкі шал,
І за табою смерць хадзіла часта,
І лёс вастрыў кінжал.
Крывёй і ты кавыль паіла.
Што даражэй, чым маладая кроў?
Ў грудзях жахліва куля стыла
І цень пакуты каля броў...

О, колькі вас,
Ад Менска да Растова,
Праз кожны горад і гарадок
Прайшло у бурах дзён суровых
І не адстала
Ні на крок!

З сястрой, што нас у бойках падымала,
Што ведала адну любоў, любоў адплаты,
Спаткаўся я аднойчы ля вакзала:
— Дабрыдзень, Зіна! Ты куды?
— Дахаты...

— Дахаты, кажаш?
— На завод, ў ячэйку.
Работы безліч, сарвалі ў лютым план.
А вочы, як тады, і гэткі ж гнуткі стан,

І так жа сонца ля вачэй тых.

І сёння так, як ў той закат суровы —
На фабрыцы, ў ячэйцы, ля станка
Нясе жыццё усходу долі новай,
І знаю пэўна, — не адна!

О, колькі іх,
Ад Менска да Растова,
Ў які ні глянеш ты куток,
Праходзіць ў бурах дзён барвовых
І не адстане
Ні на крок!

Схіляецца над кнігай галава.
Заснуў сынок. Ноч распасцёрла крыллі.
І быццам зноўку курыцца крывёй трава,
І ў бой выходзяць эскадрыллі.

Яе даклад амаль падрыхтаваны,
Расстацца ж з кнігаю няма ніякай сілы.
Ў грудзях пяе вясна, пяе агонь жаданняў,
Пяе жыццё, што мудрасці вучыла.

Ад лямпы падаюць жмуткі святла,
А вочы бліскаюць спакойна і сурова.
Член КП(б), таварыш Мураўёва,
Такая ж ёсць, як і была.

Ўзнімаюся, кладу далонь на лоб,
З усмешкай радаснай гляджу на сына.
Ўжо спачываць пара даўно было б:
— Ты адпачыла б, Зіна!

Квітнеюць вочы, як увесну сад,
Суровы жэст выпешчвае рука:
— Пакінь! Ты ж ведаеш, што заўтра мой даклад

З прычыны восьмага сакавіка.

О, колькі іх,
Ад Менска да Растова,
Ў які ні глянеш ты куток,
Праходзіць ў бурах дзён барвовых
І не адстане
Ні на крок!

**1933 г.**

**ГАЙРАШ**
*(З узбекскай)*

## НА ПРАПОЛЦЫ

Паглядзі — усміхнулася пышна зара,
Птушкі кідаюць цёплыя гнёзды-хаціны,
Прабягае вятрыска, і скроні гарацъ
Пацалункамі кветак даліны.

З-за далёкага ўзлёту лядзянай гары,
Валасы зачасаўшы шырокай рукою,
Выйшла сонца з усмешкаю дзіўнай такою,
У абдымкі хоць зараз бяры.

З прахалодай ружовага рання-кастра
Узяліся мы разам з табой за джаякі;
Мы палолі, і з плеч ападала гара,
Ні пакуты, ні крыўды ніякай.

Бавоўна цвіла, як вясновыя мары,
Дзе кветкам падзенні яшчэ не знаёмы,
І працы агульнай нас грэлі пажары,
Мы ў працы і ў песнях не ведалі стомы.

Ў магутных руках захліпаўся кітмень,
Ці злічыш ты радасці й той асалоды,
Што ў мудрых жаданнях праносіць струмень,

Узбуджаны сонцам з-пад цёмнага лёду.

Мы палолі зямлю, абліваліся потам,
І што грала на жоўтых далонях праменняў —
З пацалункамі шчасця паклалі мы потым
На чало залатое зямлі і каменняў.

Крывавы алмаз начапіўшы на грудзі,
Закацілася сонца за дымныя далі ракі.
Вось скончана праца, вяртаюцца зоры і людзі,
І вечар ва ўсе пралязае куткі.

**1933 г.**

**М. ЦІХАНАЎ**
*(З рускай)*

## ВЯСНА Ў ДЭНАЎ, АБО НАЧНОЕ ВОРЫВА ТРАКТАРАМІ „ВАЛЛІС“

Дыханне чую „валлісаў“, машын,
Як непакой тых замкнутых драконаў.
Падзел зямлі — аплот чужых законаў
Дастаўся ім ад даўнасці ў пачын.

Палі, велічынёй з абрус.
Платы і межы, ямы, межы, ямы,
Заданні ж часу йсці наперад прама,
І „валлісы“ ірвуць вякоў кару.

Яны ідуць, як ўзлёты парыванняў,
З агнямі светлымі жывых бліскучых воч.
Чужым, не гаспадарчым змардаваннем
Іх акружае д’ябальская ноч

Забытых мейд і забабонаў шэрых,
Трахомных воч, пракляццяў за вуглом.
Б’е месяц ў ноч — кладзецца цень на дзверы,

Дзверы адкрый — машына ўвойдзе ў дом.

І насцеж двор. Ён байскі, моцналобы
(Было бясед там цьма і цьма рабоў, рабынь),
І трактар ўстаў сваёй сталёваю вантробай,
Як нейкі слон сярод чарджуйскіх дынь.

Ў пустыні бай, а можа быць і далей,
І замест хатняй штурханіны, спрэчак тых
Тры вылучэнцы гутараць у гулкай зале,
І Азія ўслухоўваецца ў словы іх.

Джыдда цвіце, паперы ўсіх акацый
Пражыўлены тым водарам жывым,
Жывотным, душным — стойкім ў кожнай фразе,
І кожны тэст у яго ўпаў, як ў дым.

І ў дыме тым ўся трактарная база
Звяртае гнёт ашчэраных пустынь.
Шыпіць зямля і, быццам два алмазы,
Два ліхтары глядзяць цераз кусты.

**1934 г.**

**Х. ГРАЧЫЛ**
*(З армянскай)*

## МАЁ ДЗЯЦІНСТВА

Маё дзяцінства, сон ты мой убогі,
Мой чорны сон ў блакітавую ноч;
Цябе я помню на глухіх дарогах,
Маё дзяцінства, як прагнілы корч.

Былі палі, ухутаныя вохрай,
Лісты спакойна падалі на дол,
І вецер выў, нібы сабака ссохлы,
І вецер ныў, скітлеў і кідаўся вакол.

Ён сумаваў, ён плакаў пад сцяною,
Пад столлю выў ён — змрочны і сляпы.
— Нашто наш дом, нашто наш дом труною
Глядзеў у даль, над цемраю у дым?

Крычаў я з холаду тады, нібы шалёны,
Крычаў і плакаў я і курчыўся у цьме.
І маці плакала без крыўды і праклёнаў,
Ад болю  плакала, ласкаючы мяне.

Ласкавы твар яе — халодны і маўклівы,
Засохлы твар з пагаслымі вачмі.
Над полем дождж, над полем змрок тужлівы,
Над полем восень з змрочнымі слязьмі.

Навошта дзень лёг беднай сіратою,
На што ўздыхаў ён, енчыў і стагнаў?
Плылі па небе хмары чарадою,
Сабака выў — па небе йшла труна.

Маё дзяцінства ў чорным сутарэнні,
Даўно падмятае пад непакой капыт,

У ім было шмат холаду, шмат цені,
І безліч слёз над цемрай чорных пліт.

І разрываю я апошнюю з тых нітак,
Што звязвалі мяне, дзень змрочнасці, з табой,
І радасць песні-дня — той мармуровы —
Ўключаю я ў жыццё, вяду на бой, на бой.

Жывое сэрца з вечна новай сілай
Гарыць ў грудзях, як золата зары.
Хачу крычаць, хачу спяваць, мой мілы,
Як салавей, як сто зарніц ўгары.

Хачу амыцца я ў струменю творчай хвалі,
Хачу быць цэглай непаўторных дзён,
Каб сэрца білася, як сэрца гулкай сталі,
І гартавала край, каб рос-дужэў, каб узнімаўся ён.

**1934 г.**

**А. ГІДАШ**
*(З венгерскай)*

## КАЛОНІІ КРЫЧАЦЬ

### 1. АРАБ

Ходзіць самум,
Дрэвы — у шум,
голле трапеча,
лісце гамоніць,
пальмы, пальмы шумяць!
Дзе згубіліся,
дзе згубіліся,
браты арабы,
дзе згубіліся
воля, юнацтва мае?..
Мкнецца самум,

дрэвы — у шум,
голле трапеча,
лісце гамоніць,
пальмы, пальмы шумяць!
Дзе згубіліся,
дзе згубіліся,
браты арабы,
дзе згубіліся
воля, юнацтва мае?..
Вые самум,
дрэвы — у шум,
голле ў агні ўсё,
лісце счарнела,
пальмы, пальмы гараць!
Дзе згубіліся,
дзе згубіліся,
браты арабы,
дзе згубіліся
воля, юнацтва мае?..
Рукі, рукі, палымнейце, рукі,
расціце лясамі,
ўверх над пяскамі,
над гарачымі пяскамі
пустэльні маёй.
Гэй, захавайце
неба Аравіі,
гэй, захавайце
ад варожых воч.
Так, як поле трава ўсцілае!
Так, як хвалі дно укрываюць!
Так, як горы снягі пакрываюць!
Так засцілайце,
так зберагайце,
хавайце, хавайце
неба ад іх!
Вые самум,
дрэвы — у шум,

голле ў агні ўсё,
лісце счарнела,
пальмы, пальмы гарэць!
Дзе згубіліся,
дзе згубіліся,
браты арабы,
дзе згубіліся
воля, юнацтва мае?..

### 2. АФРЫКА НАША

Даволі былі вы ў нас панамі,
белыя.
Даволі душылі нас, кпілі над намі,
белыя.
Даволі да вашых ног мы цягалі
гарачай Афрыкі кроў і дабро,
белыя.
Мы ў гарачых чашах вылі, стагналі:
Ах-хо! Ах-ха-хо!
Мы нічога не маем даўно!
Вы бліскучыя біўні сланоў расцягалі,
белыя.
Вы груды алмазаў тут пазбіралі,
белыя.
Вы пахучы лясны каўчук адабралі,
белыя.
Вы галовы кучаравыя нам прабівалі,
белыя.
Сытыя крывёй вы чырвонай!
Ды гарачая Афрыка —
наша Афрыка!
Вочы бліщчаць
на чорных абліччах
пад зорамі.
Помста будзе
жахлівай.

Ноч за ноччу чорная маці
вучыць помсце дачок і сыноў,
і песня ад мора да мора
ў грымлівым раскаце,
і вецер да неба ўзнімае
гарачы пясок
стэпаў:
„Белы забойца, кат нашых надзей,
дзіцятка.
Ён горай гадзюкі, ён тыгра люцей,
дзіцятка.
Ты знайдзі яго, забі яго хутчэй,
дзіцятка.
Ты нянавісці выпі з маіх грудзей,
дзіцятка.
Хай зубкі твае растуць вастрэй,
дзіцятка.
За Конга зара, як пажар, зайшла,
дзіцятка.
Над Конга стынь месяца ў смутку лягла,
дзіцятка.
Ды белая ўлада ад нас не пайшла,
дзіцятка.
Чайкі, чайкі над ім крычаць,
дзіцятка.
Белых, белых, белых забі,
дзіцятка.
Гарачая Афрыка —
наша Афрыка!“

**1934 г.**

**ПАЎЛО ТЫЧЫНА**
*(З украінскай)*

## ПЕСНЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

А скажы, скажы, скажы,
Што тут за акраса —
Ў бляску сілы і жыцця
І здароўя класа?

— Падай, падай, упадай,
Самаўладства з тронаў:
— Не спыняцца нам нідзе,
Арміі Чырвонай!

А скажы, скажы, скажы,
Ці ж цяжка ўжо гэтак
Адвыкаць нам ад ярма
Ды ад цемры света?

— Падай, падай, упадай,
Звычай цемры ў доме;
— Мы пісьменныя усе,
Класава свядомы!

А скажы, скажы, скажы,
Прошласць даканаем?
Ну які ж у вас прысуд
Буржуазным зграям?

— Падай, падай, упадай!
Партыя сказала: —
З намі слаўны Варашылаў
І штандараў слава!

А скажы, скажы, скажы,
Дзе ж канец алюру?
Хто Дзянікіна разбіў,
Калчака, Пятлюру?

— Падай, падай, упадай,
Тхлань з царкоўным звонам...
Не спыняцца нам нідзе,
Арміі Чырвонай!

**1934 г.**

**СУЛЕЙМАН СТАЛЬСКІ**
*(З лезгінскай)*

***

Праз гор, цяснін бяскрайніх шыр
Мы ў дальнасць дальнюю прыйшлі.
Наш Ленін — мудры правадыр,
Яго пабачыць мы прыйшлі.

Жыцця галодны, дзікі луг —
Яго ўзараў магутны плуг,
Наш Сталін — правадыр і друг,
З вітаннем да яго прыйшлі.

Чырвонаармеец і нарком
Мне кроўна блізкі і знаём,
І ўсе таварышы кругом,
Што ў залу светлую прыйшлі.

Развеяўшы жабрацтва змрок,
Ўзнялі мы сонца — свету зрок.
Жыві, наш Горкі, бур прарок,
Цябе наведаць мы прыйшлі.

Падняўшы меч ў Акцябрскі час,
Ў сацыялізм вядзе што нас,
Няхай жыве рабочы клас!..
Мы, як браты, к яму прыйшлі.

У агнявую даль вякоў
Атрады песенных байцоў
Сюды ў Маскву з усіх бакоў
На з’езд пісьменнікаў прыйшлі.

Ў гады баёў, гады пагроз
Наш малады саюз узрос,
Пялёсткі руж — квітнеюць скрозь,
Мы ў гэты чысты сад прыйшлі.

Як неба гор наш ясны дзень,
Праз дні ўжо здзейсненых надзей
З свабодным подыхам грудзей
У век юнацтва мы прыйшлі.

Мой край — Саветаў старана,
З пут рабства вырвана яна,
Прачнуліся ад злога сна,
Прачнуліся й сюды прыйшлі.

Ў прасторы гор, ў нагорны стан
Сышла праменістая рань,
І вось я, Стальскі Сулейман,
На слаўны з’езд сюды прыйшоў.

**М. ДУДЗІН**
*(З рускай)*

## МЫ АДЫХОДЗІМ

Ці мала год жылі сумесна,
Чакалі прызыву... І вось —
Мы на вакзал прыходзім з песняй,
А буйны лівень хлешча скрозь.

Я заўтра буду ў Ленінградзе,
Сінь мора стане залатой,
І здзівіцца мой дзед і прадзед
Матроскай выпраўцы маёй.

Ты на Усход, здаровы, лоўкі,
Вясёлы едзеш. Прад табой,
Як растрывожаныя сопкі,
Бунтуе Ціхага прыбой.

І ў гэты момант за туманы,
У непакой другіх вятроў
Адносяць хвалі акіяна
Маёй рэспублікі сыноў.

Ты там, я тут, але ўсё так жа
Аховай служым берагам.
Хай крэйсеры дымяць з Ламанша,
Вайной з Цусімы грозяць нам.

Хай пагражаюць! Бойкі свежы!
Каторы год ізноў ды зноў
Ля ўсіх савецкіх узбярэжжаў
Ўстае шчацінiстай сцяной.

**1935 г.**

**М. ГАЛОДНЫ**

*(З рускай)*

## НАВАЛЬНІЦА

Спякота дыхала агнём,
А дождждык бескарысны
Яшчэ маўчаў.
І — раптам гром
Бліснуў стралой агністай.

Пыл і на дрэвах і лістах
Гарачым слаўся шквалам,
А змрокавая духата
Стаяла і стаяла.

І раптам хлынуў
Рукавом
Струмень вады іскрыстай.
Дах заспяваў,
І кожны дом
У вокнах шчасцем пырснуў.

Пад зрокам маладой вады,
Вялікім і чуллівым,
Лісты блішчэлі,
І плады
Галовы ніц хілілі.

Гром не жадаў ісці:
Унёс
З сабой свой рык-цурчанне,
І над зямлёю легла скрозь
Зялёнае маўчанне.

## Я ПРА ЦЯБЕ

Я пра цябе,
Мой друг дзівосны,
Падумаў так,
Што між людзьмі
Ты мне здаешся
Самай простай,
Або не простай, чорт вазьмі!

Ты абнімаеш альбо губіш
Халоднай строгай пекнатой —
І ўсё ж я знаю:
Любіш, любіш,
І, пэўна, любіш, як ніхто.

Адходзіш ты,
І я, змарнелы,
Ўпадаю ў сон,
Але не сплю!
Прыходзіш — зноў, як ачумелы,
Ўсё, як раней,
Цябе люблю.

Як і раней,
Любві удзячны
Агнём вачэй тваіх гарэз,
І мне здаецца, што няма чым
Запоўніць ціхіх слоў і грэз.

Тады мой лёс,
Як віхар стрэчны
Праменных мар,
Іх пекнаты,
Што на зямлі і ў небе вечна
Ўсё ты здаешся мне, ўсё ты.

Трох год не стала.

Дзе ж здагадка,
Што, ўзяўшы зоры на зямлю,
Ўсё так жа кожны дзень спачатку
То разлюблю,
То зноў люблю.

І ў час,
Калі, мой друг дзівосны,
Ты зноўку, шэптам:
„Абыймі“, —
Хто скажа мне:
Была ты простай,
Або не простай, чорт вазьмі!

**1935 г.**

**С. КРАЕЎ**
*(З рускай)*

## ПЕСНЯ ПРА ВІНТОЎКУ

Над Кітайскай,
Над Усходняй,
Над блакітнаю ракой,
Адпраўляла ў беззваротны
Белай конніцы
Прыбой.

На граніцы
Ноччу дымнай,
Пад агнём
Шрапнэльных зор
Быўшы рыкша —
Друг-рабочы —
Афіцэраў біў
Ва ўпор.

У змаганні за Саветы

Над Амурам, над ракой,
Перад смерцю называў ён
Трохлінейную сястрой.

Над Амурам пахавалі
Мы таварыша свайго.
Над магілай абяцаў я
З ёй адпомсціць
За яго.
Здрадзіць клятве
Не магу я —
Гэта ведае любы,
І як вока берагу я
Падарунак баявы.

Чышчу часта,
Дасканала,
Гонар любай
Я збярог,
Каб гартоўка
Не згасала,
Каб затвор
Астыць не змог.

Прыйдзе час
Ваеннай буры,
Не саступім
Ты ды я,
Тонкастанная
Сяброўка,
Дужацелая мая.

**1935 г.**

**А. ПУШКІН**
*(З рускай)*

# ПОМНІК

*Exegi monumentum**

Я помнік збудаваў сабе нерукатворны,
Народны шлях к яму не зарасце ў вяках.
Вышэй паўстаў ён з думай непакорнай
Александрыйскага сталпа.

Не, ўвесь я не памру і ліры звон заветны
І прах пераджыве пад прахам чорных пліт,
І слаўны буду я, пакуль ва ўсёй сусветнай
Жыць будзе хоць адзін пііт.

Слых пройдзе аба мне па ўсёй Русі вялікай
І назавуць мяне на кожнай з існых моў
І горды ўнук славян, і фін, і зараз дзікі
Тунгус, і вечны друг стэпоў.

І доўга буду тым жаданы я народу,
Што думы добрыя я лірай абуджаў,
І ў жорсткі век зямлі уславіў я
Свабоду,
І ў паўшых літасць заклікаў.

Загаду боскаму, о муза, будзь слухмянай,
Не бойся крыўды ты, вянкоў не патрабуй,
Замову і хвалу прымай ты занядбайна,
Запэўніць дурня не прабуй.

**1935 г.**

* Я збудаваў помнік.

# Дадатак

Успаміны пра В. Маракова сяброў
і сучаснікаў, погляд на яго і ягоную твор-
часць праз гады, кароткі
жыццяпіс паэта



**Эдзі АГНЯЦВЕТ**

# НЯЗГАСНАЯ ЗОРКА ЯГО ПАЭЗІІ

Ледзь не з першых гадоў жыцця чалавек з’яўляецца своеасаблівым мовазнаўцам: нас цікавіць пахо-джанне розных слоў, прозвішчаў. Гэтаму папярэднічала сто тысяч „Чаму?“. Мінаюць гады, а цікавасць застаецца.

Яшчэ я не ведала першых, юных кніжак Валерыя Маракова, а яго прозвішча ўжо лунала ў паветры. Уяўлялася, што яго нарадзіла вольналюбівае, адважнае племя маракоў, што ён абавязкова светлы, як лермантаўскі ветразь — „Бялее ветразь адзінокі...“

Пазней, з успамінаў С. Грахоўскага, мне стала вядома, што Маракоў вельмі любіў Лермантава і мог па памяці чытаць усе ягоныя творы...

Штосьці блізкае да лермантаўскага ветразя я знайшла ў абліччы Маракова, калі ўпершыню ўбачыла яго ўвесну 1931 года. Высокі, прыгожы, светлавалосы, ён хутка падняўся, нібыта ўзляцеў на шырокі ганак Беларускага педагагічнага інстытута, па-рыцарску адчыніў перада мною цяжкія дзверы, усміхнуўся: „Маракоў!“ і ніякіх пытанняў, ніякай размовы не было. Разумеў, што і я спяшаюся на заняткі. А куды? Будынак жа вялікі. Дарога ака-

залася адна і тая ж — літаратурна-лінгвістычны факультэт, крытычна-творчае аддзяленне Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута. На гэтае аддзяленне, створанае ўпершыню, прымалі і такога вядомага па тым часе, як паэт Валеры Маракоў, і такую невядомую, якой з'яўлялася я. Маракоў паспеў ужо скончыць Беларускі педагагічны тэхнікум, а мяне прынялі з адукацыяй не вельмі высокай — 3-я беларуская мінская сямігодка і адзін год навучання ў будаўнічай прафтэхшколе, якую потым перайменавалі ў будаўнічы тэхнікум. Іспытаў падчас прыёму не было. Галоўнае, што некаторыя мае вершы ўжо былі надрукаваны.

На нашым курсе былі два аддзяленні: педагагічнае і крытычна-творчае. Займаліся студэнты розных узростаў. Будучыя педагогі мелі пэўны стаж работы ў школах. Будучыя творцы — таксама розныя па ўзросце (я аказалася самай маладой). Лекцыі слухалі ўсе разам, а вучэбную практыку праходзілі па-рознаму: педагогі ў школе, а бывала, разам з намі, на новабудоўлях, на запалкавай фабрыцы, на Асінстане, у Любанскай камуне і інш. У такой практыцы было сваё рацыянальнае зерне: студэнты непасрэдна далучаліся да калектыўнай працы, да яе цяжкасцяў і радасцяў. А вось „брыгадны метад навучання", разлічанага на тры гады, быў, па маім сённяшнім разуменні, механічна перанесены з прадпрыемстваў у інстытут. За вучэбнымі сталамі былі асобныя брыгады: за нашым сталом — вельмі здольная пісьменніца А. Раманоўская*, якая пісала па-польску, Г.Гайлевіч — перакладчыца, будучыя педагогі П.Рэвут, Н.Гурыновіч, Н.Карабейка і адзіны мужчына С.Шушкевіч.

Разам з Валерыем Мараковым, як помніцца, „засядалі" за адным сталом паэты Ю.Лявонны,

* Будучая жонка С. Шушкевіча.


376

З.Піваварaў, крытыкі П.Хатулёў і С.Левін і педагог Р.Скаліна. Быў яшчэ адзін стол — паэты З.Бірала (Бульбянік), С.Мурзо, празаік Я.Казека і некалькі педагогаў. Выкладалі нам цікавыя, глыбокаадукаваныя людзі, дактары навук Я.Барычэўскі, І.Замоцін, М.Піятуховіч, П.Бузук, С.Аруцюнянц. Не ўсе лекцыі цікавілі В.Маракова, які меў папярэднюю добрую адукацыю, часам ён не хадзіў на заняткі, цягнула да ўласнай творчасці. Але залікі здаваў, і ніхто яго не папракаў за пропускі заняткаў. За час вучобы запомніліся такія эпізоды. Я, напрыклад, захаплялася філасофіяй. Аднаго разу, калі прафесар С.Аруцюнянц чытаў лекцыю пра дыялектыку Гегеля, — той заўважыў, што я ўсміхаюся. Папракнуў: „Чаму вы ўсміхаецеся?“ Я не магла адказаць. У маладосці многае без дайпрычыны здаецца смешным. Пасля лекцыі да мяне падышоў Маракоў: „Чым ён цябе насмяшыў? Ты чагосьці не зразумела, ці што?“.

Тут я пачала тлумачыць сваё разуменне прадмета, пачала „просвещать“ Валерыя. Ён слухаў, сур'ёзны, уважлівы, нават з павагай глядзеў на гэтае дзяўчо...

У другі раз ён быў маім прафесарам.

Лекцыі па тэорыі мовазнаўства нам чытаў прафесар П.Бузук, вельмі эрудзіраваны ў гэтай галіне навукі. На вялікі жаль, гаварыў ён у хуткім тэмпе, і я многае не разумела. І вось, пасля адной лекцыі я ўбачыла, што прафесар цёпла, па-бацькоўску размаўляе з Валерыем, пачакала да заканчэння іх гутаркі, падышла да Маракова і нерашуча спытала:

— Можа, ты мне растлумачыш сутнасць складанай лекцыі?

— Калі ласка, сядай і слухай!

Быў якраз перапынак. Селі побач, і Маракоў у яснай, зразумелай форме дапамог мне разабрацца, пра што ішла гаворка на лекцыі. Потым рассмяяўся і прамовіў трохі іранічна:

— А яшчэ лічылася выдатніцай!

Трэцяя сустрэча з Валерыем Мараковым у тым жа 1933 годзе ішла ў іншым плане, далёкім ад навуковага. Я была рэдактарам курсавой насценгазеты. Неяк з нашым мясцовым мастаком мы стаялі ў калідоры, прыдумвалі новы нумар. Ён удала маляваў вясёлыя шаржы, збіраўся і мяне „размаляваць“. Калі я засталася адна, да мяне падбег Маракоў. Сіні дагледжаны гарнітур, блакітны гальштук вельмі пасавалі да яго вачэй і залацістай галавы. Ён заўсёды апранаўся з густам. І вось дастаў ён з верхняй кішэні пінжака некалькі спісаных лісточкаў:

— Прачытай і падумай, каму гэты верш адрасаваны?

Загаловак быў такі: „Мая каханая — рэдактар газеты“. Эпіграф — з рускага паэта Лугаўскога:

> А у нее от луны ресницы видны,
> большая берет грусть.

Чытаю радкі гарачыя, эмацыянальныя, ласкавыя:

> На тысячы вёрст
> маё каханне.
> Рэйкі аорт
> узнімаюць гарачую кроў...
> Міліёны крывінак
> у пакутна-балючым тумане
> Загараюцца вечнай зарой.
> Я пішу ёй
> сагрэтыя сонцам гімны,
> За вокнамі ж мяцеліцы
> б’ецца глухі вадаспад.
> Белыя цені
> заходзяць у белы
> застуджаны сад,


378

І скокі вядзе карагод іх
Нястрымны…

Валеры кажа:

— Гэта табе!

— Не мані! Пры чым тут я?

— А хто рэдактар газеты? А ў каго тонкія бровы, як два кавалкі іспанскіх мячэй?

— Ты пішаш: „За капейкі свайго ганарару я хадзіў з ёй у кіно“. А мы ж з табой ні разу не былі ў кіно!

— А для чаго існуе паэзія? Калі не было, то магло быць! — Валеры нават крышку раззлаваўся, насуперак свайму добраму, далікатнаму характару.

...Цяпер, калі я перачытваю верш Маракова, які трапіў да мяне дзякуючы ягонаму пляменніку Леаніду Уладзіміравічу, думаю: „Мабыць, не я натхніла такога цудоўнага, лірычнага паэта. Мабыць, гэта быў абагульнены вобраз. Яго мара. Але, тым не менш, я шчаслівая таму, што такое адбылося“.

І яшчэ адзін маленькі эпізод, нават смешны. Мая маці, якая працавала ў Пушкінскай бібліятэцы, прыйшла аднойчы ў вясёлым настроі і сказала мне: „Ты не паверыш, але мая супрацоўніца Кацярына сёння віншавала мяне. Яна чула, што паэт Маракоў недзе ў кампаніі гаварыў, што збіраецца ажаніцца з Эдзі“. Маці смяялася і сказала супрацоўніцы:

— Гэта быў жарт, не болей. Маёй дачцэ рана думаць аб вяселлі!

...Праз пэўны час у Доме пісьменніка мусіў быў прайсці літаратурны вечар маладнякоўцаў з удзелам П.Глебкі, Т.Кляшторнага, В.Маракова, У.Хадыкі. Ну як прапусціць такое? Зала і нават пакойчык каля сцэны былі перапоўненыя. Паэтаў вельмі цёпла прымалі. Я радавалася поспеху нашага студэнта Валерыя Маракова, падбегла да яго, павіншавала. І тут ён пытаецца: „Чаму ты чырванееш?“. А я, шчыра кажучы, успомніла пра выпадак з „вяселлем“, яшчэ

больш пачырванела і пайшла.

Згадваю з душэўным болем і кароткія размовы, і нечакана — вясёлыя моманты. Думаю, колькі нязгасных твораў было б ім напісана, калі б не скасіў яго светлую галаву трагічны лёс?

Валеры Маракоў загінуў у лермантаўскім узросце.

„Бялее ветразь адзінокі...“

У такім жа ўзросце не стала калісьці Максіма Багдановіча і трошкі маладзейшага Паўлюка Труса. У кожнага па-свойму склаўся трагічны лёс. І калі Маракоў чытаў на розных вечарах балючыя радкі, прысвечаныя П.Трусу, — здаецца, думаў пра сябе самога:

Памёр паэт. Агню няма.
І вось пад гэты боль нястрымны
Хтось скажа — жыў ён недарма...

Хросным бацькам Валерыя Маракова быў Янка Купала. Помню цёплы, усхваляваны голас Маракова на Купалаўскім ушанаванні ў Доме асветы (Менск, май 1930):

За песні і думы
Мы любім паэтаў,
За кожнае слова,
За кожны радок,
Што нашым агнём
І трывогай сагрэты:
Купала,
Вам гэты вянок!

Лірычная, салаўіная душа Маракова адчувалася ва ўсім — нават у падборы эпіграфаў да сваіх вершаў. Для прыкладу: да верша „Яшчэ раз пра паэзію і ружы“ гучаў эпіграф з Рамэна Ралана: „Для таго, каб


380

складаць песні, трэба быць самому песняй“.

Альбо да верша „Паводка і паэт расплачваюцца за маладосць“ Маракоў узяў глыбока філасофскія словы рускага пісьменніка Леаніда Лявонава: „Яны не журыліся ад гора і не дзівіліся смерці. Яны ведалі: жыццё — не сенажаць з кветкамі, жыць — не кветкі на сенажаці збіраць“.

Некаторыя вершы Маракова гучаць асабліва сімвалічна. Прачытайце хаця б радкі з твора „Заяц“:

Заяц упаў на снег,
Стрэл быў сухі і кароткі...
...Круціцца дым ад крыві,
Сэрца кранулася
Й стала...
„Быццам і жыў і не жыў“,
Глуха зямля запытала.
...У сінюю скрынку душы
Раптам ударыла снегам.
Заяц для смажання
Жыў,
Толькі для шчасця бегаў.
Знік той стралок,
Не відаць.
Што ж я стаю ў задуменні?
Можа быць,
зайца шкада,
Можа, сваіх летуценняў?

Так мог напісаць толькі чалавек, які бязмерна любіў усё жывое і ганьбаваў бязлітаснага стралка. А можа, верш быў напісаны ў горкім прадчуванні свайго лёсу?

...Мы жылі ў страшэнны, неверагодна складаны час. Каб ён ніколі, ніколі не паўтарыўся! Кожнага мог зваліць на дол абыякава-злосны стралок. Людзі, навек адмятаючы зло, паверылі ў ачышчальную сілу

дабра.

У канцы дазвольце прывесці свой уласны верш:

Як мне шкада часін, патрачаных
На слуханне пустых прамоў!
О цяжкі лёс!
У дні юначыя
Не ў тых мы верылі багоў:
Віталі воплескамі шумнымі,
Не праганялі,
Не клялі,
Калі былі мы неразумнымі
І ачмурэлымі былі.
... Не толькі ж фарбы чорна-шэрыя
Жыццём валодалі штодня.
Жыццё мяне сагрэла вераю —
Ёсць Чалавек. Ёсць Дабрыня.

Дабрыня была істотнай рысай характару Валерыя Маракова — Чалавека і Паэта. Ніколі не ападуць пялёсткі яго паэзіі, такой неабходнай нашаму сучасніку.

У памяці людзей будзе жыць яго трапяткая, лірычная душа, яго шчырая сыноўняя любоў да ўсяго светлага на зямлі, што завецца Айчынай.

**Станіслаў ШУШКЕВІЧ**


382

## ВАЛЕРЫ МАРАКОЎ

На поўдні горада Мінска, каля чыгуначнай лініі, якая злучала Мінск — Гомель, у канцы дзевятнаццатага стагоддзя ўтварылася невялічкае паселішча. Жылі тут у асноўным будаўнікі чыгункі — грабары, укладчыкі рэек, цесляры, муляры. Большасць з рабочых, дэмабілізаваныя салдаты царскай арміі, атрымлівалі тут прысядзібныя ўчасткі на казённай зямлі, будавалі невялічкія хацінкі, а некаторыя нават і зямлянкі. Спачатку назвалі гэта маленькае паселішча Калоніяй, а ў далейшым невядома з чыёй лёгкай рукі пачалі называць вёскай, якая атрымала афіцыйную назву Акалонія.

У Акалоніі вырашыў пасяліцца былы царскі салдат Дзмітрый Маракоў. Прывабіла яго і маляўнічая мясцовасць, і беларуская прыгажуня Вольга родам з тутэйшай вёсачкі, і моцнае сяброўства з былымі адна-палчэнцамі, якія, як і Дзмітрый, пасяліліся паблізу чыгуначнага прыпынку Козырава. Усім тут знайшоўся кавалак хлеба, знайшлася праца. Муляр і цясляр Дзмітрый Маракоў пабудаваў тут спачатку невялічкую хацінку, а праз пэўны час з новых бярвенняў вырас даволі прасторны і прыгожы домік, і над комінам яго ўзвіўся роўны слупок сіняга дыму. Радаваўся Дзмітрый свайму жытлу.

З маладой жонкай яны пасадзілі вакол дома маленькі садзік, агарадзілі яго штыкетамі, навесілі моцную браму. Побач з гэтай сядзібай пачалі расці, нібы грыбы, і другія суседскія хаты і домікі.

Праз 5 гадоў побач з хатай Мараковых вырасла ўжо новая вуліца. І таму, што першым пасяліўся на ёй Дзмітрый Маракоў, чалавек, род якога, як відаць

з прозвішча, звязаны з морам, тутэйшыя жыхары і назвалі вуліцу Марской, а ў далейшым, пры забудове, яна стала Вялікаморскай. Раз ёсць тут Маракоў, павінна быць нешта марское, хоць і мора адгэтуль вельмі далёка.

Асабліва радасным для маладой сям'і Дзмітрыя і Вольгі Мараковых стаў дзень 27 красавіка 1909 года, калі нарадзіўся хлопчык, якому далі імя Валеры. І пачаў расці на ўцеху бацькам бялявы, сінявокі хлопчык, з-пад доўгіх і густых веек якога заўсёды была відаць глыбокая ўсмешка.

Васьмігадовым хлапчуком сустрэў Валеры Маракоў Кастрычнік. Пачалася грамадзянская вайна, і ён з маленства зведаў нямала нягод і бяды. І калі юнаку адчыніліся дзверы да адукацыі, ён прагна, усёй істотай аддаўся вучобе.

Маракоў бегаў за некалькі вёрст у школу, і ўжо ў 5 класе (у 12 год) у насценгазеце змяшчае свае першыя вершы.

Працавіты, паслушны і здольны вучань палюбіўся не толькі настаўнікам і аднакласнікам, але і суседзям.

Многія яго аднагодкі толькі і ведалі дзіцячыя гульні, бегалі ў лес і на рэчку, а маломму Валерыю, калі ў бацькі не стала работы на чыгунцы, давялося хадзіць у суседнія вёскі Лошыцу, Калядзічы, Сенніцу і іншыя мураваць падмуркі пад дамы і хаты, рабіць печы. Дзмітрый Маракоў славіўся адным з найлепшых печнікоў, а сын Валеры быў у яго найлепшым памагатым. Людзі казалі, што лепш за іх ніхто печ не складзе і што іхнія печы маюць нейкія сакрэты. Боханы хлеба выпякаюцца пышнымі, румянымі і пульхнымі.

...Не знаў Валеры цудоўных летніх і зімніх канікулаў.

Я пазнаёміўся з паэтам, калі яму было ўсяго чатырнаццаць год. У саўгасе „Шчытомірычы“ ён разам


384

з бацькам складаў печ на кватэры рабочага. Спрытныя рукі Валерыя ўмела падавалі цэглу, умела мясілі гліну. А пасля цяжкай работы, калі бацька Валерыя клаўся спаць, сын доўга сядзеў над кнігаю і позна-позна соладка засынаў з маленькім томікам паэзіі.

Пасля заканчэння сямігадовай школы ён ужо змяшчае свае вершы ў газеце „Беларуская вёска“, часопісах „Чырвоны сцяг“, „Малады араты“ і іншых. Валеры паступае ў Белпедтэхнікум і ўжо пачынае прыносіць маці сваю невялічкую стыпендыю. Тут ён слухае лекцыі вядомых пісьменнікаў Якуба Коласа і Міхайлы Грамыкі, вучоных Алеся Круталевіча, Міхаіла Рыдзееўскага і інш. І неўзабаве пра яго пачалі гаварыць і як пра паэта. Яго творы заўважылі Кузьма Чорны, Язэп Пушча. Міхась Чарот прарочыць юнаку сонечную будучнасць. Вядомыя пісьменнікі старэйшага і малодшага пакаленняў — Паўлюк Трус, Пятрусь Броўка, Алесь Дудар, Васіль Сташэўскі, Максім Лужанін — прыхільна ставіліся да творчасці Валерыя Маракова і былі звязаны з ім шчырым моцным сяброўствам.

Маракова акрыляў бацькоўскай ласкай і пры-хільнасцю Янка Купала. Народны паэт не раз запрашаў да сябе юнака на сваю кватэру і цешыўся яго першымі творчымі крокамі, даў паэту не адну сваю кнігу з цёплым і шчырым аўтографам. У 1925 годзе ён адносіць у выдавецтва рукапіс кнігі вершаў „Пялёсткі“, якая выйшла ў 1926 годзе. У гэты ж час прымаюць маладога паэта ў літаратурнае аб’яднанне „Маладняк“. Кніга атрымала станоўчыя водгукі ў друку. Не прайшло і года, як малады паэт выдаў другую кніжку вершаў з паэтычнай і арыгінальнай назвай „На залатым пакосе“. Не абмінуў цёплым, а часамі і ўзнёслым словам рэспубліканскі друк і гэту кнігу. Маракоў стаў вядомым паэтам.

У сувязі з выхадам зборніка „На залатым пакосе“

ўспамінаецца наступнае. Гэта было на пачатку восені. Разам з Валерыем Мараковым мы пабывалі ў кіраўніка Дзяржаўнага выдавецтва Цішкі Гартнага. Валеры Маракоў атрымаў аўтарскія экземпляры зборніка „На залатым пакосе“, а я прынёс рукапіс перакладу невялічкай брашуры. Валеры быў добра знаёмы з Гартным і падараваў Гартнаму свой зборнік „На залатым пакосе“ з шчырым і цёплым аўтографам. Цішка Гартны адказаў узаемнасцю: выняў са стала першы том рамана „Сокі цаліны“ і размашыста надпісаў.

У гэтым же годзе з 12 па 27 мая Народны Камісарыят Асветы і рэдакцыя газеты „Чырвоная змена“ арганізавалі паездку групы беларускай моладзі ў Ленінград і яго ваколіцы, для азнаямлення з сусветна вядомым багаццем культуры, — Дзецкім сялом (былым Царскім), тутэйшымі найбагацейшымі музеямі, незабыўнымі гістарычнымі мясцінамі, Кранштатам, Волхаўскай гідраэлектра-станцыяй, металургічным і суднабудаўнічым заводамі, рэдакцыямі газет і часопісаў. Разам з Платонам Галавачом і іншымі камсамольскімі кіраўнікамі пуцёўкі атрымалі маладыя пісьменнікі, крытыкі, мастакі, маладыя рабочыя і сяляне, якія былі звязаны з маладзёжным друкам, а таксама літаратары-маладнякоўцы — В. Маракоў, В. Каваль, М.Нікановіч, І.Барашка, С. Баркоўскі і я. Валеры Маракоў называў гэту экскурсію першым сваім універсітэтам. Тут ён выступае на заводах і фабрыках, у матросаў на лінкары „Парыжская камуна“, на Волхаўскай гідраэлектрастанцыі, наведвае Кранштат і іншыя мясціны. Тут адбылося знаёмства з ленінградскімі пісьменнікамі, у перыядычных выданнях Маракоў убачыў свае вершы ў перакладах на рускую мову (перакладаў Лаўроў. — **Л.М.**). Гэтыя 2 тыдні шмат далі маладому паэту, сталі яго творчай школай.


386

Да нашага пісьменніцкага гуртка далучыўся П.Кабзарэўскі. Ён мала меў вольнага часу, але часта суправаджаў нас. Ленінградскі юнак супрацоўнічаў у перыядычным друку, рэгулярна наведваў Беларускі клуб, чытаў беларускія часопісы і газеты.

І.Барашка наладзіў цесную сувязь з перыядычнымі выданнямі Ленінграда. У газетах змяшчаліся пераклады твораў беларускіх пісьменнікаў. Адбыліся сустрэчы з вядомымі ленінградскімі літаратарамі...

У 1930 г. паэт выдаў зборнік паэзіі „Вяршыні жаданняў“, які прыдзірлівая тагачасная крытыка высока ацэньвае за рэалістычныя матывы, за адлюстраванне сацыялістычнай рэчаіснасці. У гэтым жа годзе В.Маракоў стаў сакратаром рэдакцыі часопіса „Чырвоная Беларусь“ (рэдактар быў М.Чарот. — **Л.М.**). В.Маракоў часта змяшчае свае творы ў часопісах „Полымя“, „Маладняк“, газетах „Звязда“, „Савецкая Беларусь“, „Чырвоная змена“ і ў іншых. У 1930 годзе мы з В.Мараковым і Ц.Гартным выступалі перад рабочымі скурзавода „Бальшавік“. У красавіку 1931 года пасля здачы экзаменаў паэт быў залічаны студэнтам крытыка-творчай секцыі педінстытута.

З усёй Беларусі была падабрана творчая моладзь, якая атрымала глыбокі курс універсітэцкіх ведаў. Былі прыняты на вучобу маладыя паэты, празаікі, крытыкі. Сярод іх навучаліся Зяма Півавараў, Юрка Лявонны, Эдзі Агняцвет, рабочы паэт Сяргей Мурзо, польская пісьменніца Алена Раманоўская, Язэп Зазека, Пётр Хатулёў, Захар Бірала, крытык Саламон Левін, аўтар гэтых радкоў і рад іншых. На кожнага з гэтых маладых пісьменнікаў П.Галавачом была да-дзена творчая характарыстыка і рэкамендацыя. Пісьменнік прымаў актыўны ўдзел у складанні праграмы літаратурнага навучання, падбіраў прафесуру для выкладання.

В.Маракова любілі выкладчыкі педінстытута —

акадэмік Т.Замоцін, прафесары П.Бузук, М.Піятуховіч — за паспяховую вучобу, за глыбокія веды па мастацкай літаратуры. Ён смела падымаў голас супраць крыклівых і грубых сацыёлагаў. Дэкан інстытута знайшоў пад падушкай студэнта — былога віцебскага рабочага — два тамы твораў С.Ясеніна і патрабаваў выключыць з інстытута чытача „кулацкіх упадніцкіх твораў“. На агульным студэнцкім сходзе В.Маракоў выступіў, нагадаў зборнік С.Ясеніна „Русь савецкая“, „Паэму пра 26“, даказаў, што яго сябар ведае, як адрозніць станоўчае і патрэбнае ад шкоднага і слабога. Студэнт скончыў інстытут разам з усімі таварышамі крытыка-творчага аддзялення.

У тыя далёкія часы нас, студэнтаў, пасылалі на вытворчую практыку. Былі мы ў Любанскай камуне. Працаваў я са сваім сябрам у механічнай майстэрні. У свабодны час В.Маракоў пісаў вершы. У 1932 годзе, вярнуўшыся ў Мінск, ён пайшоў да Я.Купалы, чытаў яму любанскія вершы, расказваў пра людзей камуны.

Былі мы на практыцы на Рэчыцкай запалкавай фабрыцы. Кватаравалі ў рабочых. Тут і сталаваліся. Гаспадыня вялікай кватэры адвяла нам пакойчык на чатырох чалавек. Яна нас папярэдзіла, што будзе цяжкавата з гатаваннем стравы. Развалілася пліта і немаведама калі яе адрамантуюць. В.Маракоў усміхнуўся і спытаў, дзе можна знайсці з дзесятак цаглін і дастаць гліны. У той жа дзень ён адрамантаваў і пабяліў пліту.

Працаваў я са сваім сябрам і на Асінаўскай электрастанцыі. Грузілі торф, пампавалі праз фарсункі нафту ў топкі. Улетку за дзесяткі кіламетраў ад Мінска выпраўляліся на рэкі і азёры, блукалі ляснымі сцежкамі, любаваліся хараством незнаёмых мясцін.

В. Маракоў любіў людзей, любіў працу.

Пасля студэнцкай вытворчай практыкі, пасля


388

развітальнага літаратурнага вечара ў рабочым клубе горада Рэчыцы памятаю, як прыляцела да паэта ў Мінск пісьмо ад рабочых. Рабочая моладзь дзякавала Маракову за нізку вершаў, прысланую ў іх насценную газету. Паэт быў усхваляваны і ад радасці кінуўся абдымаць нас. Толькі адзін з гэтых вершаў — „Першы дзень на запалкавай фабрыцы“ — уцалеў і быў надрукаваны. Ён быў напісаны ў часе абедзеннага перапынку ў кацельным аддзяленні фабрыкі. Я тады качагарыў разам з Мараковым. Верш быў адразу ж прачытаны ўсім, хто сабраўся сюды пагрэцца ў халодны зімні дзень. Перад чытаннем Валеры Маракоў шпурнуў некалькі пален у вялізную печ і, прысеўшы на калоду, усхваляваным голасам чытаў нам новыя радкі:

> ...і гэтае дрэва
> мы кінем за дзверцы
> ў агонь, каб эпоха свяціла ярчэй!
> Каб нашай рэспублікі дужае сэрца
> не знала змяінай атруты начэй.
> Каб сонца і птушка
>         ўрываліся ў вокны,
> Каб промні шугалі
>         з кутка у куток,
> Каб заўжды ўключалі,
>         як быццам знарок,
> Мы ў нашыя сэрцы
>         вясны
> сваёй ток...

На ўсё жыццё запомніўся яго шчыры голас, яго ветлівы позірк. З-пад доўгіх чорных веек заўсёды свяціўся добры сіні агеньчык. Вонкавае хараство паэта было непарыўна звязана з хараством і чысцінёй душы і сэрца.

У кнізе „Права на зброю“, якая выйшла ў 1933 го-дзе, паэт ясна бачыў свой шлях у літаратуры:

Так многа
патрэбна сказаць нам,
так многа.
Каб песня пяшчотай
і куляй была...
Каб нашыя сэрцы
над
слаўнай
дарогай,
якой мы ідзём,
не кранала імгла...

У паэме „Таварыш Нюрын“ (першапачатковы варыянт меў назву „Муляр“. — **Л.М.**) паэт пісаў:

І ў новых
чыстых гарадах,
быць можа,
ўспомняць на хвіліну
аб нашых ранішніх
шляхах —
ў прасторы будучай краіны.

У чэрвені 1934 года адбыўся першы ў гісторыі Беларусі выпуск літаратараў-прафесіяналаў.

Валеры Маракоў скончыў крытыка-творчую секцыю літаратурна-лінгвістычнага аддзялення Вышэйшага педагагічнага інстытута імя Максіма Горкага. Ён атрымаў добрыя веды і творчую загартоўку ў вядомых тады вучоных-літаратуразнаўцаў.

У гэтым жа годзе ён стаў членам Саюза пісьменнікаў СССР і атрымаў білет, падпісаны М.Горкім. Паэт пачынае супрацоўнічаць у газеце Беларускай Ваеннай Акругі „Чырвонаармейская праўда“.


390

Пабываўшы на вайсковых зборах, ён не расставаўся з армейскай формай, з салдацкай гімнасцёркай.

Паэтычныя радкі ніколі не затуманьваюцца метафарычнымі выкрунтасамі, іх сіла ў прастаце мастацкай, сардэчнай.

Прад тым, кім свет заваяваны,
Хто бессмяротны быў заўжды,
Схіляюць голаў днепрастаны,
Растуць пад хмары гарады.

Жыццёвы і творчы шлях В.Маракова быў кароткім, але творча плённым, сонечным і іскрыстым. Ён імкнуўся быць карысным народу.

У асобе Валерыя Маракова мы мелі здольнага паэта, талент якога пабачыў толькі раннюю вясну і не дачакаўся свайго каласістага лета, свайго залатога пакосу.

**Алесь ЗВОНАК**

# НЯСКОНЧАНАЯ ПЕСНЯ

Шчырая, лірычная, задушэўная песня Валерыя Маракова абарвалася тады, калі яму было дваццаць сем гадоў. У канцы 1936 года ён раптоўна, як і многія ягоныя таварышы, сябры і паплечнікі па справах літаратурна-паэтычных, знік з паэтычнага небасхілу. Надоўга. Назаўсёды. І толькі праз 33 гады, у 1959 годзе, імя яго аднавілася на вокладцы невялічкай кніжачкі вершаў пад назваю „Лірыка“, якую выдала Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Яно прамільгнула, як маленькая іскарка колішняй вялікай трагедыі, каб ізноў забыцца...

А дарма. Памяць народа — гэта гісторыя народа, а яна не церпіць ні забыцця, ні пазнейшых карэкціровак, ні, тым больш, падробак...

Чалавечая істота створана так, што часам тое, што здарылася ці адбылося ўчора, забываецца, а тое, што было дзесяткі гадоў назад, паўстае ў памяці яскрава, выразна, нібы адбылося яно зусім нядаўна. Так і мне з вышыні васьмідзесяці гадоў выразна бачацца, аб'ёмна і абдымна акрэсліваюцца гады юнацтва, гады першых нясмелых паэтычных крокаў, гады першага творчага імпэту і свяшчэннадзейства, нясмелага пераўвасаблення бачанага і адчутага ў рыфмаваныя радкі верша...

Там, у той даўнасці, у інбелкультаўскіх калідорах, дзе ў невялікім пакойчыку тулілася ЦБ „Маладняка“ — „вярхоўны орган“ маладых беларускіх літаратараў, і сустрэліся два юныя муляры — васемнаццацігадовы аўтар гэтых радкоў і шаснац-цацігадовы Валерый Маракоў. Абодва — гарадскія.


392

Бацькі ў абодвух па прафесіі муляры, а ў вузкім профілі — майстры па складанні сялянскіх печаў і нават галандскіх грубак. А сыны іх — памочнікі, чаляднікі, вучні вялікага творча-будавальнага чараўніцтва, якім валодалі іх бацькі, што марылі перадаць усё сваё ўмельства і штукарства, як творчую спадчыну, сваім сынам, не ведаючы, што ў вольную часіну тыя патаемна займаліся слоўным чараўніцтвам, ператвараючы свае далёка не ружовыя мары ў далёка не дасканалыя паэтычныя радкі... Агульнасць жыццёвага лёсу, блізкасць узросту і невытлумачальная цяга да ведаў і да творчасці зблізілі юныя душы і іх творчыя парывы. Жылося галаднавата. Узімку мулярка спынялася. Трэба было набываць веды. Аднаму ў Белпедтэхнікуме, другому — на агульнаадукацыйных курсах. Разам хадзілі па рэдакцыях такіх часопісаў, як „Малады араты“, „Прафрух Беларусі“, „Чырвоны сцяг“, уладкоўвалі свае вершы. Ганарару тыя часопісы тады не плацілі. Адным жа „маральным задавальненнем“ пракарміцца было цяжка. Затое бушавалі маладыя страсці і будучыня малявалася выключна ў ружовых колерах. Напрыклад, у 1925 годзе ў адным з першых сваіх вершаў малады шаснаццацігадовы паэт Валеры Маракоў пісаў:

Сэрца — не лёд і не камень,
Сэрца — у полымі кліч,
Кліч маладога жадання
Вольных прастораў зямлі.
Кінуў той кліч я сягоння,
Сам малады, як вясна,
Радасна-сонечных гоняў
Ў сэрцы не змоўкне струна!

(„Белае зімняе поле...“)

Аднак струна струной, а марш ігралі кішкі, яўна заглушаючы гукі „паэтычнай струны“. У 1925 годзе я скончыў вышэйпамянёныя курсы і ўладкаваўся на склад акцыянернага таварыства „Кніга—вёсцы“ (было такое на Камсамольскай вуліцы ў падвале ў раёне Нямігі), а В. Маракоў працягваў вучобу ў Белпедтэхнікуме. Як бы склаўся наш далейшы жыццёвы і творчы лёс, невядома, калі б не прывёў ён нас у „Маладняк“. Кожнага паасобку і сваім шляхам: мяне прывёў у „Маладняк“ Язэп Пушча, які быў выкладчыкам беларускай літаратуры на Агульнаадукацыйных курсах; В. Маракова — Іларый Барашка, які быў рэдактарам „Маладога аратага“ і які зрэдку друкаваў нашы вершы.

Тут я павінен зрабіць невялічкае адступленне. Валерый Маракоў, як і я ды многія нашы равеснікі, належаў да „другога прызыву“ маладнякоўцаў. Справа ў тым, што „Маладняк“ як аб'яднанне і як часопіс пад той жа назваю ўжо існаваў два з лішкам гады, ужо добра быў вядомы маладому тагачаснаму чытачу, набіраў рост і творчую сілу. Імёны Чарота, Александровіча, Вольнага, Дудара, Зарэцкага, Дубоўкі, Крапівы, Пушчы, Бабарэкі, Чорнага, Моркаўкі, Хурсіка, Труса і іншых маладнякоўцаў „першага прызыву“ карысталіся вялікай павагай з боку „другога прызыву“, да якога належалі Каваль, Хадыка, Кляшторны, Фамін, Хведаровіч, Дарожны, Казлоўскі, Глебка, Лужанін, Плаўнік, Падабед, Прыбыткоўскі, Шушкевіч, Лынькоў, Бобрык, Тумiловіч, Дубовік, Бандарына, Вішнеўская, Пфляўмбаўм, Шашалевіч, Баранавых, Скрыган, Шукайла, Галавач, Якімовіч, Мурашка, Багун, Мікуліч, Нікановіч, Лявонны, Піваварaў, а таксама Маракоў і я.

Надрукаваўшыся ў „Маладняку“, мы нібы набывалі права лічыцца паэтамі або празаікамі. Прытым кожны набываў свой уласны голас: ужо можна было адрозніць голас маладога Хадыкі ад голасу Тру-

 394

са, голас Кляшторнага ад голасу Хведаровіча, а голас Маракова ад голасу Глебкі. Дзякуючы „Маладняку“, які арганізаваў сваё невялічкае выдавецтва пад той жа назвай, убачыла свет першая кніжка вершаў В. Маракова пад назвай „Пялёсткі“. Аўтару яе было няпоўных 17 год.

Моладзь тых бурных гадоў, апаленая нядаўнім агнём грамадзянскай вайны, нямецкай і белапольскай акупацыямі, суровай рэчаіснасцю першых паслярэвалюцыйных гадоў, рана сталела. Неспакойныя сэрцам юнакі і дзяўчаты, камсамольцы тых гадоў, смела браліся за справу адраджэння разбуранага краю, за пабудову яго культуры, літаратуры, мастацтва. У гэтым сэнсе і першая кніжка вершаў маладога паэта сведчыла пра яго паэтычную сталасць, а не пра недаспелыя вучнёўскія практыкаванні. Было ў той кніжцы многа сонца і святла, многа шчырага пачуцця і любові да роднае зямлі, да яе людзей, былі ў ёй тыя крылы, без якіх сапраўднай паэзіі высока не ўзляцець. У кніжцы была сапраўдная паэзія, адсутнічала „паэтычная поза“, кніжка ўся была прасякнута чыстым некранутым пачуццём маладога чалавека маладой эпохі.

„Пялёсткі“ Валерыя Маракова былі прыхільна прыняты тагачаснай літаратурнай грамадскасцю, узаконьваючы тым самым не толькі знаходжанне паэта ў шэрагах „Маладняка“, але і ў шэрагах набіраўшай сілы маладой савецкай паэзіі наогул. Праўда, не абышлося і без традыцыйнага свята „першай палучкі“, калі ўвесь невялікі ганарар ад першай кніжкі ішоў на святкаванне гэтай падзеі. А гэта значыць, што ва ўтульным доме бацькоў В. Маракова ў вядомым на сённяшні дзень Козыраве маладыя літаратары даволі гучна святкавалі выхад першай кнігі паэта...

Была яшчэ адна характэрная асаблівасць „Маладняка“ — гэта яго масавасць, адсутнасць замкнутасці,

чым пазней характарызаваліся такія літаратурныя аб’яднанні, як „Полымя“ і „Узвышша“, яго не толькі літаратурная, але і шырокая асветніцкая, папулярызатарская дзейнасць. Маладнякоўцы ўсталёўваліся ў тагачасных акруговых цэнтрах на сталую працу, узначальвалі так званыя акруговыя філіі „Маладняка“, арганізоўвалі друкаваныя выданні (часопісы, альманахі, зборнікі). Так апынуўся ў 1925 годзе і я ў старажытным Полацку, дзе змяніў Александровіча, які быў прызначаны рэдактарам клімавіцкай акруговай газеты „Наш працаўнік“. Прыехаўшы па нейкіх рэдакцыйных справах у Менск, я сустрэў Валерыя Маракова. Быў ён без пэўных заняткаў, пакрысе друкаваўся, рыхтаваў да друку другую сваю кніжку паэзіі „На залатым пакосе“, матэрыяльна быў не забяспечаны, вяртацца на бацькоўскую мулярку не хацелася, прывязваў тэхнікум... Не трэба забывацца на тое, што ў тыя гады існавала беспрацоўе. Я запрасіў Маракова прыехаць часова ў Полацк, папрацаваць, падправіць сваё матэрыяльнае становішча.

Неўзабаве ён такі прыехаў у Полацк. Тады Полацк і шэраг раёнаў Віцебшчыны былі далучаны да БССР, установы ўсе пераводзіліся на дзяржаўную мову Беларусі, ствараліся амаль пры кожнай установе гурткі па вывучэнні беларускай мовы. Вось тут Маракову была неабмежаваная педагагічная практыка як студэнту Мінскага Белпедтэхнікума.

Працэс гэты называўся тады афіцыйна словам „беларусізацыя“ і выклікаў даволі актыўнае пярэчанне старой часткі царскай чыноўнай інтэлігенцыі, якая засталася ад старых часоў у павятовым горадзе Полацку. Не абышлося і без кур’ёзаў. Мне і выкладчыку Полацкага педтэхнікума маладнякоўцу Грашчанку камгас вылучыў жыллёвае памяшканне ў былой цырульні. Абсталяваўшы яе тэхнікумаўскімі тапчанамі і табурэткамі, змайстраваўшы з нейкіх скрынак стол, мы зажылі самастойна і незалежна ў камгаснай кватэры. Была, праўда, і маленькая ня-


396

зручнасць. Уваход быў з вуліцы, і многія жыхары горада, а таксама прыезджыя з раёнаў па старой памяці з размаху адчынялі дзверы і пыталіся: „Пастрыгчыся можна? Пагаліцца можна?“ На што мы цярпліва адказвалі, што цырульня не працуе, зачынена і г.д. Вось тут мы і пасялілі В. Маракова. У „цырульню“ прыходзілі толькі начаваць. На дзвярах вешалі паперку „Цырульня зачынена на рамонт“. А ўвесь вольны час праводзілі ў рэдакцыі, там і „тварылі“. А самым любімым нашым заняткам былі начныя блуканні па берагах чароўнай Заходняй Дзвіны, па якой у туманнай далечыні мільгацелі агеньчыкі на плытах, што з парыпваннем і ўсплёскамі ціха праплывалі міма сівых муроў старажытнага Полацка ў замежную тады Латвію... Любілі пахадзіць і па абсаджаным клёнамі і бярозамі вале Івана Грознага, што ўзвышаўся над Стралецкай Слабадою зялёным паўкругам... Часцяком наведвалі славутую Сафійскую горку на лукавіне паміж маленькай Палатой і магутнаю Дзвіной. І міжвольна ў нашых юнацкіх сэрцах абуджалася шчымлівае салодкае пачуццё гонару за сваю дзяржаву Беларусь, за яе шматпакутную, замешаную на крыві і слязах гісторыю, за яе светлую будучыню, у стварэнні якой ёсць і наш сціплы ўдзел... Пазней гэта ўсё называлася „нацдэмаўшчынай“, праявамі „буржуазнага нацыяналізму“, „арыентацыяй на Захад“, карацей кажучы, контррэвалюцыяй , а за ўсе гэтыя хадзячыя ярлыкі трэба было пазней плаціць альбо жыццём, альбо „вандраваннем па пакутах“ у далёкіх сіберных краях, як гэта і здарылася з В. Мараковым і з многімі рамантыкамі рэвалюцыі, песнярамі новага жыцця.

Тады нас хвалявала ўсё, што адбывалася ў краіне, рэспубліцы, за мяжой. Будзіла трывогу і абурэнне становішча Заходняй Беларусі, выклікала захапленне мужная барацьба Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), Беларускай Грамады, палітэміг-

ранты з Заходняй Беларусі Паўлюк Шукайла і Алесь Салагуб, славутая падпольшчыца КПЗБ Вера Харунжая (так яе тады звалі), Мікола Арэхва, якія працягвалі барацьбу ў Заходняй Беларусі, — гэтыя імёны былі сімваламі нацыянальна-вызваленчага руху, карацей кажучы, нацыянальнымі героямі... Нездарма такія вершы, як „А ў Вісле плавае тапелец“ Янкі Купалы, „Фабрыка смерці“ Андрэя Александровіча, „Акрываўленая зямля“ Паўлюка Шукайлы, вершы Алеся Салагуба, пазней Валянціна Таўлая, „Лісты на волю“ Веры Харунжай, былі на ўзбраенні савецкай моладзі рэспублікі, клікалі да барацьбы, выхоўвалі пачуццё сапраўднага савецкага патрыятызму. Хвалявала гэта і нас — камсамольцаў, Валерыя і мяне. У тыя гады ў Полацку быў напісаны намі супольна верш, прысвечаны Беларускай сялянска-рабочай грамадзе, дзе юныя нашы галовы спрабавалі пафіласофску асэнсаваць працэс крывавай барацьбы ў Заходняй Беларусі:

Хай скрыгочуць здраднікі працоўных  
З іх бяссільнай злосцю у вачах, —  
Наша мэта —  
Ў поступе бунтоўным...  
І не згаснуць сілы у грудзях!..  
Не патухнуць светлыя жаданні,  
Кроў не стане ў жылах халадней:  
І ў агні  
Палаючых паўстанняў  
Край рука чужая не кране.

*(„Дні ідуць, праходзяць і знікаюць...“)*

Праз некаторы час пакінуў В.Маракоў нашу „цырульню“ і паехаў у Мінск, а неўзабаве з’явіліся на літаратурным полацкім гарызонце імёны ўшацкага селькара нашай газеты Петруся Броўкі, Тараса Хадкевіча, Ганны Брэскай, Эдуарда Самуйлёнка, Сцяпана Сямашкі.


398

У 1927 годзе, пакінуўшы і сакратарства ў газеце „Чырвоная Полаччына“, і старшынства ў Полацкай філіі „Маладняка“ Петрусю Броўку, я вярнуўся ў Мінск, паступіў у Беларускі дзяржаўны універсітэт і быў накіраваны працаваць на радыё на рэдактарскую работу. З В. Мараковым сустракаўся часта і ў „Маладняку“, а пазней у БелАППе, і на радыё, дзе наладжваў частыя выступленні паэтаў і пісьменнікаў. Справа гэта была новая, і вяшчанне ішло не толькі на радыёслухачоў Савецкай Беларусі, але і на Заходнюю Беларусь, тагачасныя „лімітрофы“, карацей кажучы, прыбалтыйскія дзяржавы...

Хоць і няшмат часу прайшло пасля нашага полацкага развітання, а В. Маракоў паўстаў перада мною зграбным, stанístым, рослым маладым чалавекам са светлымі хвалістымі валасамі, крыху кранутым мілай жаноцкасцю ружовым паўнаватым тварам, яркімі вуснамі, пад якімі хавалася мяккая белазубая, крыху дзіцячая ўсмешка, і сінява-блакітнымі вачыма. Абаяльнасць, добразычлівасць, гатоўнасць на добрыя ўчынкі або сяброўскую ўвагу, мяккасць і душэўная далікатнасць гэтага маладога чалавека выклікалі ўзаемную сімпатыю таго, хто з ім сустракаўся. І потым, перш за ўсё гэта быў паэт, цвёрда ўсталяваны на той хісткай глебе літаратурных размежаванняў, спрэчак, узаемных адштурхоўванняў пад эгідай класавай барацьбы, ідэалагічных нападак адных на другіх, стварэння розных літаратурных груповак („Полымя“, „Узвышша“, „Літаратурная камуна“, „Прабліск“ і, нарэшце, БелАПП). Акрэсліўшы сваю творчую пазіцыю як адданасць стварэнню пралетарскай літаратуры, прынцыпу партыйнасці ў ёй, перабываўшы ў розных групоўках („Маладняк“, „Прабліск“, БелАПП), мы спавядалі адзін прынцып — усёй сваёй дзейнасцю, грамадскай, творчай, надзённай, служыць народу, партыі, дзяржаве.

Умацаванню такіх ідэйных пазіцый як нельга

лепш спрыяла таварыская сустрэча маладнякоўцаў Беларусі з маладнякоўцамі Украіны, якая адбылася ўлетку 1928 года і ў якой удзельнічалі і мы з В. Мараковым. Паездка і братнія сустрэчы ў сталіцы Савецкай Украіны — Харкаве, знаёмства з яго прадпрыемствамі і культурнымі ўстановамі, паездка ў старажытны Кіеў, з яго славутым Крашчацікам, Падолам, Уладзімірскай горкай, Кіева-Пячэрскай лаўрай, паездка па Дняпры ў трагедыйнае Трыполле, на магілу Тараса Шаўчэнкі ў Канеў, у індустрыяльны Днепрапятроўск і, нарэшце, праз усе дзейнічаўшыя тады дняпроўскія парогі на будаўніцтва плаціны будучага Днепрагэса — усё гэта непамерна ўзбагаціла нас духоўна, пасяліла ў нашыя юныя сэрцы глыбокае пачуццё братняе дружбы і пралетарскага інтэрнацыяналізму. Падраслі крылы і ў нашай крыху абмежаванай, крыху правінцыяльнай музы. У 1930 годзе выйшла кніга вершаў В. Маракова „Вяршыні жаданняў“, а ў 1933 — „Права на зброю“. І гэта ўжо была творчая сталасць, праўдзівей — яе пачатак. Шырэйшымі сталі далягляды, глыбейшымі пачуцці любові да сваёй роднай зямлі, да сваёй Бацькаўшчыны, яснейшымі сталі пошукі свайго мастацкага асмыслення рэчаіснасці, тых глыбінных працэсаў і зменаў, якія адбываліся ў жыцці краіны. У сваёй паэме „Таварыш Нюрын“, напісанай у 1929 годзе, напоўненай святлом і сонцам, радасным адчуваннем вялікіх жыццёвых змен, паэт гаворыць, звяртаючыся да сваіх равеснікаў і да сябе:

Маладосць ахвярам і любві даруючы,
Будзь такім жа светлым і харошым сам...
На бунтоўным моры
Чалавечых мараў
Сёння творац шчасце новае зямлі,
Каб мільёны фабрык ад агню і пары
Да энергій сонца перайшлі...


400

І ў палях, абведзеных
Залатымі сцежкамі,
Каласіўся горда вечны ураджай,
І каб людзі сёння,
З залатымі ўсмешкамі,
Не былі братамі смерці ды крыжа.

Вершы паэта чытаюцца лёгка, нібы напісаны ў нашы дні. Сапраўды, верыш паэту, калі ён гаворыць: „Няма нідзе вялікшай праўды, як праўды працай жыць сваёй...“

У канцы 1930 года я пераехаў у Маскву, а пасля, праз два гады, у Ленінград. Скончыўшы аспірантуру Акадэміі мастацтвазнаўства, у пачатку 1935 года вярнуўся ў Менск, працаваў у Акадэміі навук, пісаў дысертацыю, з галавой, як кажуць, акунуўся ў працу, навуковую і творчую. З В. Маракговым сустракаўся як з даўнім сябрам год юнацкіх. За гэты час ён скончыў Мінскі педінстытут, творча акрэп, пашыралася і кола яго сяброў па пяру. Прыемна прыгадаць, што сябрына тая складалася з людзей таленавітых, сталых, з пэўна акрэсленай творчай пазіцыяй, з важкімі творчымі набыткамі, як, напрыклад, Дудар, Хадыка, Кляшторны, Броўка, Астапенка, Куляшоў і многія іншыя. Валерый многа падарожнічаў па Беларусі, падоўгу працаваў на прадпрыемствах рэспублікі, быў, як кажуць, у курсе спраў будаўнічых пяцігодак краіны. І ўсё гэта бачанае, перажытае, пераадчутае, аздобленае глыбокім лірычна-рамантычным пачуццём напаўняла, як жывая кроў, жывую тканіну паэзіі Валерыя Маракова.

**Сяргей ГРАХОЎСКІ**

# РАСТАПТАНЫЯ ПЯЛЁСТКІ

*Натхнёна лірыку пісалі Маракоў,*
*Лявонны і Сяднёў, і юны Розна,*
*Ды зрэнкамі бязлітасных ваўкоў*
*На іх глядзелі ўчэпіста і грозна.*

1992

Прачнешся веснавым ранкам — і раптам: дзіва дзіўнае — у хаце светла-светла, нібыта выпаў запозненны снег.

Не, не! Гэта зацвілі сады: узнялі празрыста-белыя ветразі вішні, у ружавата-водарны цвет увабраліся яблыні, загарэліся свечкі каштанаў, у надрэчных гаях з гаркавата салодкім хмелем у бель увабраліся чаромхі, белымі зорачкамі з залацістымі вочкамі ўспыхнулі кусты язміну. Як адзінокія нявесты, у белым вэлюме стаяць у полі адзінокія дзічкі.

Глядзіш на гэтую прыгажосць, і знікаюць горкія думы, клопаты і згрызоты. Хочацца жыць, дыхаць водарам і любавацца светлай кіпенню вясны. А раптам наляціць люты сівер, атрасе квецень, як снегам, укрые пялёсткамі зямлю, і адразу пусцее душа, шчыміць сэрца, калі гэтую цнатлівую прыгажосць прытапталі падкаваныя абцасы, умялі ў гразь капыты і колы грузавікоў.

Калі бушавала квецень, у далёкім 1926 годзе у кнігарні майго палескага Глуска трапіла на вочы тоненькая блакітная кніжачка з пяшчотнаю назваю „Пялёсткі“. Уверсе — імя аўтара: Валеры Маракоў. Такое імя і прозвішча я чуў упершыню. Падумалася: які прыгожы псеўданім. З маленькага партрэціка пазіраў яснавокі, светлавалосы, зусім юны прыгажун. Адгарнуў першую старонку і не мог адарвацца да апошняй. Купіць не было за што, але я сябраваў з сынам загадчыка кнігарні, і ён мне часта даваў на


402

адну ноч тоненькія зборнічкі маладнякоўцаў. З „Пялёсткамі“ разлучацца не хацелася, выпрасіў у мамы 15 капеек і доўга насіўся з кніжачкай Маракова: маю неспакушаную душу зачароўвалі і хвалявалі меладычныя радасці жыцця і шчымлівай тугі першага нясмелага кахання.

Чытаў і дзівіўся, як ён разгадаў і выказаў мае патаемныя думы і пачуцці:

І ўжо тады, пад белаю калінай
Нам будзе месяц сыпаць каласы.
І так, бывай, каханая дзяўчына,
Прыйду я хутка да цябе ў даліны
Упіцца свежасцю крамянае красы.

Радкі з „Пялёсткаў“ станавіліся нашымі нясмелымі прызнаннямі ў запісачках, перададзеных у падручніках упадабаным аднакласніцам. І ў той жа „Фізіцы“ Цынгера часам прыходзілі адказы з тых жа „Пялёсткаў“:

Будзе песні нам пець зачарованы гай,
Будзе слухаць іх месяц і радасны край,
А мы будзем кахацца у полі.

Гэта была рамантыка, разбуджаная і акрыленая светлай паэзіяй амаль нашага равесніка Валерыя Маракова. „Пялёсткі“ пераходзілі з рук у рукі, вершы перапісваліся ў патаемныя дзявочыя дзённікі.

Улюбёны ў беларускую паэзію, зачараваны лірыкай Дубоўкі, Труса, Пушчы і Маракова, я вечарамі хадзіў у мястэчковую бібліятэку, рэгулярна чытаў „Маладняк“, „Узвышша“, „Полымя“, літаратурныя дадаткі да „Беларускай вёскі“, „Савецкай Беларусі“ і штомесячныя літаратурныя старонкі ў „Звяздзе“.

У адным з нумароў „Маладняка“ прачытаў літара-

турны партрэт Маракова, напісаны яго аднакурснікам па Белпедтэхнікуме. З яго даведаўся, што любімы мой паэт статны, светлавалосы прыгажун, сын муляра з прыгараднай вёскі Козырава. Аўтар партрэта пісаў, што Маракоў ласкавы, шчыры таварыш усяе тэхнікумаўскае моладзі. Ён часам на лекцыях замест канспектаў цішком піша вершы, дае іх сябрам і сяброўкам, часам нават губляе.

На пачатку 1928 года мая стрыечная сястра Маруся павезла ў Мінск двум братам падмацунак з каляднай свежыны. Старэйшы ўжо быў урачом, а Янка Бобрык — студэнт Універсітэта, паэт, адзін з аўтараў калектыўнага зборніка вершаў „Пунсовае ранне“. Я нецярпліва чакаў Марусю з сталіцы: хацелася даведацца пра Янкавых сяброў-паэтаў, пра кіпучае літаратурнае жыццё: у друку ішлі спрэчкі паміж „Маладняком“ і „Узвышшам“, Тодар Глыбоцкі (Дудар) бэсціў Дубоўку. Ужо гучаў грозны бас Бэндэ.

Вярнуўшыся, Маруся расказала пра знаёмства з Валерыем Мараковым: „Ішлі мы з Янкам па Савецкай вуліцы, а насустрач — высакаваты прыгожы хлапец у караткаватым палітончыку і кепцы, ружовашчокі з марозу. Ідзе і здалёк усміхаецца Янку. Спыніліся, Янка пазнаёміў нас. Валеры гаварыў нешта прыемнае мне, а я слухала яго нягучны пявучы голас і дасціпныя жарты. Далей пайшлі разам. Яны гаварылі пра свае маладнякоўскія клопаты, пра Чарота, Александровіча, Пушчу, Труса, успаміналі нейкія смешныя гісторыі. Развіталіся на рагу Садовай, і Валеры пабег у свой тэхнікум“.

Я зайздросціў Марусі, што сустракалася з любімым мною паэтам, і марыў некалі трапіць у сталіцу і пабачыць жывых пісьменнікаў, можа, нават удасца сустрэць Купалу і Коласа.

Закончыўшы школу, у 1930 годзе я падаўся ў літаратурную „падсталіцу“— акруговы Бабруйск.


404

Філію „Маладняка“ узначальваў Міхась Лынькоў, выяўляў і апекаваў маладых літаратараў. У актыве ўжо былі Мікуліч, Вітка (Крысько), Кохан, Зарыцкі, Шынклер, Жукоўскі, Абакшонак, і я паспеў надрукаваць некалькі вершаў у акруговай газеце і літаратурным дадатку „Вясна“. Колькі тады было мараў, захапленняў, спадзяванняў і планаў. Мае сябры і я працавалі пераважна на дрэваапрацоўчым камбінаце. Зарыцкі на дзяжурства ў сушыльны цэх ішоў з ладным стосам паэтычных зборнікаў. Як ні было цяжка, мы жылі паэзіяй. Мінск нам здаваўся літаратурнаю Меккаю, асяродкам талентаў і славутасцей, мы сачылі за ўсімі навінкамі паэзіі і прозы.

У адным з зімовых нумароў „Маладняка“ з’явіўся верш Маракова „Цыганка“. Незвычайнай інтанацыяй, памерам, напеўнасцю, зрокавай дакладнасцю малюнка ён зачараваў усіх бабруйскіх пачаткоўцаў.

За вокнамі спевы,
За вокнамі вечар
І радасць зямлі і вясны
Чалавечай...
Цыганка у цьме...
Ў цьме ёй прысніліся стэп
і дарога
Блуканняў, і сум,
і любоў,
і трывога...

Мы часта ўдвох, утрох, блукаючы па вуліцах, дэкламавалі „Цыганку“, або „Маўчала ноч. Над сінім полем пунсовай кветкай месяц плыў“. Здавалася, нашы пачуцці і мары падслухаў і выказаў Валеры Маракоў. З вышыні цяперашняй дасведчанасці і вопыту ў „Пялёстках“ відны наіўнасць, штучная метафарычнасць, невысокае майстэрства. І гэта натуральна для шаснаццацігадовага таленавітага паэта.

Пасля цяжкай хваробы я прыехаў у сталіцу, спадзеючыся „ашчаслівіць“ беларускую паэзію. Наіўныя спадзяванні яшчэ цепліліся, а рэчаіснасць астуджвала іх і ставіла на сваё месца. Я не адразу адважыўся зайсці ў аблузаны шэра-зеленаваты асабнячок Дома пісьменніка, хоць ужо і быў членам БелАППа (Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў). Правінцыяльная сарамлівасць і сціпласць не дазвалялі пераступіць парог у цьмяны калідор дома на два паверхі і сутарэннем-сталоўкаю. Часта круціўся каля ўваходу, углядаўся ў кожнага, хто заходзіў у пісьменніцкую „рэзідэнцыю“. Па друкаваных партрэтах пазнаваў некаторых пісьменнікаў і дзівіўся, што з агульнага натоўпу той-сёй вылучаўся толькі капелюшом.

Аднойчы мяне заўважыў Барыс Мікуліч і зацягнуў у сярэдзіну. Там я сустрэўся і асабіста пазнаёміўся з вядомымі па завочнай перапісцы Таўбіным, Астапенкам і Куляшовым. У іх ужо выйшлі першыя кніжачкі, Таўбін нам чытаў сваю новую паэму „Таўрыда“. У суседнім пакоі на цыратавай канапе чыталі адзін аднаму вершы лірыкі Маракоў і Кляшторны. Мяне з імі пазнаёміў Таўбін. Валеры быў такі, якім яго ўяўляў па партрэтах і расказах. Неўзабаве ўсе мы сышлі па вузенькай пакручастай лесвіцы ў сутарэнне пісьменніцкай сталоўкі. Я быў шчаслівы. Аж не верылася, разам абедаю ледзь не з усімі вядомымі пісьменнікамі. Пасля абеду разыходзіліся невялічкімі купкамі. Я неяк далучыўся да Таўбіна, Хадыкі і Віктара Казлоўскага. Паселі на лаўцы ў тэатральным скверы, гаварылі пра вершы, лепшыя і горшыя, пра складанасці жыцця, пра несправядлівыя наскокі Бэндэ і Кучара на лірыку Маракова і Кляшторнага, пра абвінавачванні Хадыкі ў песімізме, адсутнасці мабілізуючай тэматыкі, мажорных настрояў, рытмаў сацыялістычнага будаўніцтва, такіх, як у „Гудках“ Александровіча і „Рытмах-кантрастах“ Хведаровіча.


406

Для мяне гэта ўсё было нова і неспадзявана.

У 1932 годзе я паступіў на літаратурны факультэт Вышэйшага педінстытута імя Горкага. Было трохі дзіўнавата — чаму імя Горкага? Аляксей Максімавіч інстытутаў не канчаў, адразу прайшоў „Мои университеты“. Тады ўсё здавалася нармальным. Вучыўся і аднначасова працаваў у рэдакцыі „Чырвонай змены“. Маракоў займаўся на другім курсе крытычна-творчага аддзялення. Гэта быў своеасаблівы літаратурны ліцэй для маладых і ўжо прыкметных паэтаў і крытыкаў. Самаю папулярнаю асобаю быў, вядома, Валеры Маракоў — аўтар кніг „Пялёсткі“ і „На залатым пакосе“.

Калі на шумным і людным калідоры з'яўлялася яго здалёк прыкметная постаць, гамана сціхала, усе расступаліся, маладзейшыя прыхільнікі шапталіся: „Вунь, Маракоў ідзе“. Я ганарыўся нашым знаёмствам. Валеры заўсёды вітаўся за руку, пытаўся, што пішацца, часам тут жа аддаваў для „Чырвонкі“ адзін або некалькі вершаў. Валеры часам расказваў, што часта бывае ў Купалы. Гасцінная цёця Уладзя шчодра частавала ў той галодны час маладога паэта хатнімі прысмакамі, мабыць, прывезенымі з Акопаў. Калі заседжваліся дапазна, дзядзька Янка пакідаў Валерыя нанач у сваім кабінеце, бо да свайго Козырава малады госць мусіў бы дабірацца пехатою. Апрача дзвюх ліній трамвая, ніякага гарадскога транспарту тады яшчэ не было.

Калі Валька, як ласкава яго звалі сябры, затрымліваўся на нейкіх вечарах ці сходах, нанач яго запрашалі Хадыка, Кляшторны ці Міхась Багун. Амаль усе пісьменнікі кватаравалі ў прыватных пакойчыках мінскіх старажылаў. Сяліліся „калоніямі“ — на Камароўцы, на вуліцы Розы Люксембург, за вакзалам на Красівай або вуліцы Талстога.

Пасля зборніка „Вяршыні жаданняў“ (1930) у 1933 годзе выйшла апошняя прыжыццёвая кніга

Маракова „Права на зброю“. Назваю сталі словы з „Ліста да паэта Петруся Броўкі“ — „Дадзена новым нам права на зброю“, а далей — аптымістычныя мары і спадзяванні на шчаслівую і натхнёную працу:

Так многа
патрэбна сказаць нам,
так многа,
каб песня пяшчотай
і куляй была...
Каб нашыя сэрцы
над слаўнай дарогай,
якой мы ідзем,
не кранала імгла.

Ці не адчуваецца тут вымушаная „перабудова“, інтанацыя і ломка радка пад Маякоўскага — „лучшего, талантливейшего поэта нашей советской эпохи“?

Забягаючы наперад, не магу не сказаць, што аптымістычныя надзеі ў самым узлёце абарвала дзікая куля, а сэрца накрыла імгла.

А ў студэнцкія гады дасведчаны, начытаны, эрудзіраваны Валеры Маракоў быў для сяброў аўтарытэтным кансультантам, а для акадэміка Замоціна, прафесараў Барычэўскага і Бузука — любімым студэнтам. У тыя гады ўсе мы атрымлівалі аднолькавую стыпендыю — 25 рублёў на месяц, картку на 300 грамаў глёўкага хлеба і пропуск у студэнцкую сталоўку на вуліцы Фабрыцыуса. У дні выплаты стыпендыі часам каля касы Маракова чакалі Кляшторны або Багун, спадзеючыся пазычыць нейкую дробязь. Выдавецтва ганарары па 30 капеек за радок цыркала нерэгулярна. На калідоры каля кабінета намесніка дырэктара Івана Адамавіча Бучукаса на дзіравай цыратавай канапе часта чакалі фінансавай ласкі паэты і празаікі. Аднойчы тут жа Маракоў склаў „слязніцу“:


408

„Бучукас, Бучукас, пашкадуй ты нас, дай адзін рубляс на куфляс півас“. Яна стала папулярнаю сярод пісьменнікаў, дайшла і да Бучукаса. Ён звычайна, падпісваючы паперку ў бухгалтэрыю, казаў: „Вось табе на куфляс півас“.

Ідэалагічныя прыстасаванцы, перавертні і прапаведнікі вышуквалі аб’екты дзеля сваіх спекуляцый: грамілі на сходах і ў друку „нікому не патрэбную лірыку“, цытавалі трыбуна рэвалюцыі: „Надо вырвать радость у грядущих дней“, а каб вырваць яе, пасылалі пісьменнікаў на „перакоўку“ на лічаныя тады ў Беларусі заводзікі, на пракладку брукаванак, на будаўніцтва такіх „гігантаў“, як Асінбуд. Асабліва клапаціліся пра лірыкаў. Папрацаваў і Маракоў на запалкавай фабрыцы Барысава, у Рэчыцы, на тым жа Асінбудзе. Як ні пнуўся, одапісцам Валеры не стаў. А вершы-справаздачы хутчэй нагадвалі стрыманыя пародыі.

У 1931 годзе Маракоў надрукаваў верш „Стаю прад Пушкіным адзін І думу думаю сурова...“. Прачытаў яго, і нейкі д’ябал падштурхнуў мяне напісаць пародыю: „Ты знаеш, Пушкін, я паэт, я славай гэтаю багаты, а мне, нікому не сакрэт, патрэбен добры, моцны тата“. Пародыя з выдатным сяброўскім шаржам мастачкі Галі Дакальскай з’явілася ў часопісе „Чырвоная Беларусь“ пад псеўданімам С. Каршун. Праз нейкі час сустрэўся з Мараковым і, відаць, вінавата замаргаў. Вітаецца Валька і смяецца: „Ну, колькі ты зарабіў на мне, „каршунёнак“? Хадзем, частуй півам“. Я пачаў аднеквацца. „Не тлумі галаву, хлопча. Я зазірнуў у ганарарную ведамасць і ўбачыў — тваё прозвішча. Запомні: пародыя і эпіграма — найлепшая рэклама. Не бойся, я не крыўдую. Калі не маеш 52 капейкі, я частую“. Прыйшлося ісці ў піўную Лёвы Браўна і ўзяць па куфлю густога, аж чорнага, піва „Портэр“.

З гэтай пары мы амаль пасябравалі з Мараковым:

часта сустракаліся ў Доме пісьменніка, шпацыравалі па інстытуцкіх калідорах, па Савецкай вуліцы. А калі заводзіліся капейкі, выходзячы з бухгалтэрый выдавецтва ці „Чырвонай змены“, заварочвалі на Камсамольскую вуліцу, у мясцовае „Стойла Пегаса“ — прапахлую півам і нейкаю смажанінаю забягалаўку, названую „Капернаумам“. Адразу станавілася шумна і весела. Потым „ідэолагі“ нашы паходы ахрысцілі „амаральнай багемай“, хоць і самі часта заварочвалі туды, каб сабрацьназіранні дзеля далейшай „работы“ ды і глынуць піва.

Аднойчы познім летнім вечарам каля кінатэатра „Чырвоная зорка“ сустрэліся мне Валеры і празаік Сяргей Знаёмы. Пагаварылі і вырашылі пасядзець за чацвярцінкаю і паслухаць новыя вершы Валерыя. Дзе? Я прапанаваў паехаць у мой маленькі пакойчык на не існуючым ужо Трамвайным завулку. Час позні: магазіны пачалі зачыняцца. Пайшлі з Валерыем па здабычу. На рагу Савецкай і Ленінскай вуліц стаяў паставы міліцыянер, хоць у горадзе было не больш дзесятка легкавых машын. Валеры мне сказаў пачакаць, а сам пайшоў да паставога. Павіталіся за руку, пагаварылі, разам падышлі да мяне і рушылі да першай зачыненай, але яшчэ асветленай, крамы. Міліцыянер пастукаўся. Дзяўчына ўпусціла нас, узялі, што трэба, падзякавалі ёй і міліцыянеру, вярнуліся да Знаёмага і паехалі ў мой катушок. Я спытаў, адкуль Валеры ведае гэтага міліцыянера. „Я іх амаль усіх ведаю: хлопцы з нашага Козырава падаліся ў міліцыю. І гэты — мой сусед“.

За гаворкаю, чытаннем вершаў заседзеліся позна. Знаёмы заспяшаўся, каб паспець на апошні трамвай. Валеры застаўся ў мяне. Каб нікому не было крыўдна, так-сяк паслаліся на падлозе, а сон не браў. Валеры па памяці чытаў і чытаў ледзь не ўсяго свайго любімага Лермантава і Ясеніна. Здавалася, ён ведае іх з першай да апошняй старонкі.


410

Назаўтра, ідучы ў пісьменніцкую сталоўку, не памятаю хто здзіўлена спытаў: „Вас абодвух выпусцілі?“ — „Адкуль?“ — не зразумеў я. „Як адкуль? З міліцыі. Вас жа з Мараковым учора ўвечары некуды вёў міліцыянер“. Я разрагатаўся, але не ўпэўнены, ці пераканаў цікаўнага.

У 1934 годзе Валеры канчаў інстытут, пісаў дыпломную работу і рыхтаваўся да экзаменаў. Таму сустракаліся радзей і радзей. Крытычна-творчае аддзяленне давала веды і не давала пэўнай спецыяльнасці, апрача педагагічнай. Маракова з Лявонным накіравалі настаўнічаць у Бабруйск.

Новыя кніжкі Маракова не выходзілі, у перыёдыцы ўсё радзей і радзей з’яўляліся яго вершы. Затое імя яго часта мільгала ў артыкулах заартадаксаленых бэндаўскіх падбрэхічаў. Абвінавачвалі яго ў песімізме, ясенінщчыне, ігнараванні мабілізуючай на выкананне „велічных планаў“ творчасці, у ідэалізацыі багемы. Нават нашу праходку з козыраўскім міліцыянерам залічылі ў парушэнне маралі. А рыфмаваных справаздач Валерыя на заводы Рэчыцы, Барысава, Воршы не заўважалі, і, мабыць, правільна рабілі, бо „Ноч трывогі і паэты на прарыве“, „За тысячы новых тваіх нафтабудаў“, „Першы дзень на запалкавай фабрыцы“ ўспрымаліся як пародыі на актуальную тэматыку. Героямі твораў эпохі таталітарызму павінны быць бясполыя будаўнікі сацыялізму, улюбёныя ні ў якім разе не ў жанчыну, а ў родную партыю, правадыра, сацыялістычны лад і шчаслівае жыццё па картках і „заборных кніжках“. А лірыка лічылася „атакованной в штыки“ варожай сацыялізму атрутай.

Тонкі і таленавіты лірык Маракоў стаў радавым настаўнікам у адной з бабруйскіх школ. Трывожныя прадчуванні, што насоўваецца хмара бяды, не пакідалі Маракова з 1933 года, калі знікла чарговая група маладых таленавітых пісьменнікаў за суровым Уралам, у завейнай Сібіры, казахстанскіх стэпах.

Мы знаем ўсё: дабро і зло,
І мы, быць можа, ўсім даруем,
Але знікаючы ў туман,
Мы з кожным крокам ўсё нервовей
Ў душы смяемся з даўніх ран
І спатыкаем сотні новых...

З новым наборам сустрэў і Маракоў „варфаламееўскую“ восень 1936 года, і разам з цветам беларускай літаратуры знік і Валеры Маракоў у атрутным тумане турэмных засценкаў. Нягледзячы на звышпільную ізаляцыю, няспынны нагляд праз „ваўчкі“, кожная турма жыла тоненькім пастукваннем у таўшчэнныя сцены кропкамі і працяжнікамі марзянкі і лічбамі „бястужаўкі“. У камерах ведалі, хто сядзіць па-суседску, зверху і знізу, хто следчы, хто іх сусед, хто падпісаў выбітыя паклёпы. За год катаванняў Маракоў паўтараў адзінае і самае кароткае слова: „Не, не“.

Самымі вытанчанымі здзекамі следчыя не змаглі выбіць у гэтага мяккага, далікатнага, чыстага душою паэта ніводнага самаабгавору, ні паклёпу на сяброў.

У кароткі адліжны прасвет перагляду фальсіфікаваных абвінавачванняў самых сумленных людзей былы пракурор Беларусі Г. Тарнаўскі ў інтэрв’ю карэспандэнту БелТА расказваў, як Валерыя Маракова і акадэміка Гаўрылу Гарэцкага абвінавачвалі то ў трацкізме, то ў прыналежнасці да міфічнага „Саюза вызвалення Беларусі“. Ні Гаўрылу Іванавіча Гарэцкага, ні Валерыя Маракова самыя вытанчаныя здзекі майстроў заплечных спраў зламаць не змаглі. Ведаючы ўсё гэта, Г. Тарнаўскі здзіўляўся: „Мужна трымаўся В. Маракоў. Пратаколы допытаў нязменна завяршае сказ: „Абвінавачаны вінаватым сябе не прызнаў“. Тое ж самае Маракоў паўтарыў 28


412

кастрычніка 1937 года тройцы Вайсковай калегіі Вярхоўнага суда СССР. Кожнае яе пасяджэнне доўжылася роўна 15 хвілін. У той жа дзень у крывавую пашчу ўсесаюзнага ката Васіля Ульрыха трапілі Чарот, Галавач, Вольны, Каваль, Дудар, Сташэўскі, Харык, Лявонны, Кляшторны, Таўбін, Півавараў, Зарэцкі. Іх лёс быў вырашаны па загадзя гатовым прысудзе, за тыя ж 15 хвілін — „вышэйшая мера пакарання, прысуд канчатковы і абскарджанню не падлягае“. Карная сістэма не дазваляла нікому марудзіць: 29 кастрычніка або ў канцы лесу, што стаў паркам Чалюскінцаў, або ў толькі што асвоеных Курапатах усе напярэдадні асуджаныя былі расстраляны.

Не магу ўявіць, у якога звера паднялася лапа, каб стрэліць у патыліцу аўтарам „Босых на вогнішчы“, „Спалоху на загонах“, „Сцежак-дарожак“, вершаў, якія ён, напэўна, вучыў напамяць у школе. Уяўляю, каб у гушчары пушчы сустрэўся галодны воўк з блакітнавокім, залатавалосым Валерыем Мараковым, у яго апусцілася б хіжая лапа, ён саступіў бы сцежку паэту, абароненаму аўрай дабра і натхнення. Наўрад ці дазволілі каты развітацца сябрам, пастаўленым над ровам з жоўтага пясочку, ці паспелі зірнуць у неба, як падаюць зоркі.

Дзень 29 кастрычніка павінен стаць, можа, некалі і стане, Днём Жалобы і Памяці нацыянальнай літаратуры і культуры, бо былі ж знішчаны вучоныя, мастакі, артысты, ледзь не ўсе выкладчыкі беларускай мовы і літаратуры. А прадчуванне дваццацівасьмігадовага Маракова было, сапраўды, прароцкім у вершах і ў „Маёй паэме“:

> Што ж мне спяваць расстрэленыя песні?
> Ім не развеяць роспачы туман.
> Тут, на зямлі,
> Другое сонца песціць,

Тут нейк умеюць жыць
І паміраць...

У часе адлігі на пачатку 90-х гадоў некаторыя даследчыкі былі дапушчаны да недасяжных крывавых архіваў. Але ні ў адной справе не знайшлі абавязковага „Акта о приведении приговора в исполнение“.

**Максім ЛУЖАНІН**

## ДЗЕНЬ З ВАЛЕРЫЕМ МАРАКОВЫМ

Мы сядзелі з Валерыем Мараковым у Доме пісьменніка на Савецкай вуліцы задоўга да таго часу,


414

калі яна стала праспектам Скарыны. Што рабілі? А з Валерыем можна было рабіць адно: слухаць вершы ці чытаць вершы, свае, калі нядаўна напісаныя, ці чужыя. Пры сустрэчы ў яго з вуснаў зрывалася не абвыклае „здароў“ ці „дабрыдзень“, а які-небудзь вершаваны радок. Часцей гэта было пушкінскае „Мою любовь, широкую, как море“ ці Багдановічава „Ёсць на свеце такія бадзягі“. Здаралася пачуць і зусім незнаёмае. Гэта азначала, што ён мае напашэве толькі-толькі выспеваны верш і, на ягоную думку, удалы. З гэтага чырванашчокага юнака, здавалася, так і тачылася паэзія: з светлага позірку, размашыстых рухаў, з красамоўнага маўчання.

І на гэты раз сустрэча пачалася з верша на вуліцы і перайшла ў прыёмную Дома пісьменніка.

Зазваніў тэлефон. Маракоў падняў трубку, сказаў: „Я“ і даволі доўга слухаў. Потым прамовіў: „Лячу!“ і падышоў да мяне.

— Рэдактар кліча, не магу адкруціцца.

Рэдактар — Міхась Чарот, Маракоў — ягоны сакратар у часопісе „Чырвоная Беларусь“, а, сказаць дакладней, адзіная штатная адзінка ў рэдакцыі. Ён падшукваў і заказваў нарысы і артыкулы, падбіраў фота, дамаўляўся з мастакамі. Не было цесна ў часопісе і паэзіі.

Чарот заходзіў у рэдакцыю не кожны дзень. Ён вызначаў накіраванасць матэрыялаў у наступны нумар, праглядаў і падпісваў гранкі ў друк. Ён быў задаволены сваім памочнікам, а Валеры нават крыху задаваўся гэтакім даверам і самастойнасцю.

Тэлефонны выклік Маракова тлумачыўся даволі проста. У красавіку 1931 года Свіслач надумалася паказаць сваю былую моц і выйшла з берагоў, заліла татарскія агароды і блізкія вуліцы. Па рацэ плылі змытыя з падмуркаў катушкі разам з іхнім насельніцтвам — козамі і пеўнямі. Козы панура маўчалі, а певуны гарлалі, гучней як на сваіх

сядзібах, быццам нічога не здарылася і яны зусім не турбуюцца пра свой лёс. Свіслач тым часам не драмала, а, мінуўшы Траецкую гару, рынула па сумежных вуліцах далей. Перарэзала тагачасную Савецкую, затапіла электрастанцыю (Эльвод) і ўсю ніжнюю частку гарадскога парку.

Купалаў дом, а стаяў ён прыкладна на месцы цяперашняга музея, апынуўся сярод нечаканага мора. Вада стаяла па саменькія вокны, і гаспадару з усімі сямейнікамі заставалася ратавацца на гарышчы.

Верны Купалаў збраяносец празаік Сымон Баранавых арганізаваў выратоўчую экспедыцыю. Разам з загадчыкам Дома пісьменніка Васілём Залуцкім дасталі вялікую лодку і рушылі да пацярпелых. Іван Дамінікавіч з жонкаю перабраліся да Чарота. Вось чаму Маракову было дадзена заданне: „Прыхапі адну“.

Пераказаўшы ўсё гэта мне, Валеры на хвілінку задумаўся:

— Не хочацца з табой разлучацца, не ва ўсім выспавядаліся,— ён разрагатаўся: — Ведаеш што, мы прыхопім не адну, а дзве бутэлькі, прыйдзем удвух. Павіншуем Купалу з перамогаю над стыхіяй.

На гэтым і пагадзіліся. Наскрэблі патрэбную суму і рушылі на Ленінскую. У глыбіні двара, насупраць бальніцы і аптэкі, Чарот наймаў даволі цесную палову драўлянага дома.

Да нашага прыходу віншавальнікаў з уратаваннем сабралася даволі шмат, як на невялікую Чаротаву сталовую. Уладзіслава Францаўна сядзела ў канцы стала, спіною да акна. Поруч, збоку на канапцы — Купала, Міхась Зарэцкі, Баранавых і яшчэ нехта. Мы з Валерам умасціліся на адным венскім крэсле ўдвух.

Купала спытаў у Маракова, ці не спяклося ў яго чаго новенькага. Той не прымусіў сябе прасіць, а прачытаў некалькі вершаў засаб. Ніхто не абзываўся,


416

чакаючы Купалавага погляду. А ён маўчаў, размінаў пальцамі папяросу. Потым падняўся, наліў Валерыю чарку, капнуў і сабе ў недапітую:

— Чокнемся! Не суцішай кроку.

Валеры пачырванеў, але не збянтэжыўся і пераадрасаваў тост на Купалу:

— Дай Бог Вам здароўя, дзядзька Янка!

Неўзабаве ў пакоі стала душна і тлумна — прыбывала людзей. Купала з Чаротам горача гаварылі пра польскую паэзію, Зарэцкі і Баранавых у сваю чаргу ўзяліся меркаваць пра задумку нейкага гістарычнага рамана. Мы з Валерыем ніяк не здолелі далучыцца да размовы і выскачылі на ганак, на свежае паветра.

У альтанцы за домам цьмеў агеньчык папяросы. Курыла жонка Чарота Аня, красуня, нядаўняя кінаактрыса. Яна пажалілася на змору: і разу не прысела, а людзей перавярнулася за дзень — не злічыш. У кампанію мы не вярнуліся, Аня адчыніла Чаротаў кабінет, і мы пачалі гартаць кнігі. Гарталі, чыталі ўголас упадабаныя мясціны і непрыкметна паснулі на мулкай канапцы.

Абудзіў мяне штуршок. Чарот незадаволена ўтлумачваў: спаць трэба ісці дамоў, тут цесна ды яшчэ давядзецца паслаць ложак для Купалы.

У пакойчыку, які я наймаў на другім баку горада, было ціха, утульна. Гаспадыня сабрала нам цёплую вячэру. І тут высветлілася, што Маракоў ведае напамяць усю кніжку „Безназоўнае“. І дасюль, праз невымерную далеч гадоў, чуецца яго прачулы і ўзрушаны голас:

Зерне кінулі шчасліва,
Чыстае, як вока.

**Павел ПРУДНІКАЎ**

# ПАЭТ ЭМОЦЫЙ

З’яўляючыся яшчэ вучнем сямігадовай школы, я прачытаў у „Чырвоным сейбіце“ нататкі аднаго беларускага літаратурнага крытыка* пра „надзвычай здольнага маладога паэта“, студэнта Мінскага


418

Белпедтэхнікума. Расказваючы пра „незвычайнага паэта“, аўтар сцвярджаў, што яго, гэтага паэта, можна параўноўваць толькі з Сяргеем Ясеніным. Бо як і той, паэт гэты „вершы свае сачыняе экспромтам, прама на хаду, — пісаў аўтар нататкаў. — А калі, бывае, трэба тэрмінова запісаць тое, што сачыніў, ды як на грэх зламаецца аловак, паэт з-за адсутнасці ножыка „завострывае“ яго (аловак) зубамі“.

Гэтым паэтам, пра якога ішла гутарка ў нататках літаратурнага крытыка, быў не хто іншы, як Валеры Маракоў.

Сапраўды, Валерыя Маракова да разраду „радавых“ не аднясеш. Гэта выключна здольны і надзвычай эмацыянальны паэт. Пра гэта гаворадь ужо першыя яго паэтычныя набыткі, якія пасля ўвайшлі ў яго першы вершаваны зборнік „Пялёсткі“, а затым у другі — „На залатым пакосе“:

Сэрца не лёд і не камень,
Ў ім не стрымаеш ты кліч,
Кліч маладога жадання
Вольных прастораў зямлі.

Пісаць Валерый Маракоў пачаў вельмі рана — у дзіцячым узросце. Першыя вершы ён надрукаваў тады, калі яму споўнілася 16 гадоў, а першую кніжку („Пялёсткі“) выдаў 17-гадовым юнаком, з’яўляючыся ўжо членам „Маладняка“.

Пазнаёміўся я з Мараковым тады, калі ён меў ужо на сваім рахунку аж тры паэтычныя кніжкі — „Пялёсткі“, „На залатым пакосе“, „Вяршыні жаданняў“. А я, грэшны, у сваім актыве меў усяго

* Аўтар, відавочна, мае на ўвазе артыкул А. Кучара „Валеры Маракоў. Творчыя партрэты“, надрукаваны ў часопісе „Маладняк“, №7 за 1929 г. „Чырвоны сейбіт“ у № 8-9 за 1927 г. пісаў: „Затое сэрца радуецца, чытаючы вершы… В. Маракова…“ Іншага ўпамінання ў „Чырвоным сейбіте“ пра В. Маракова ў гэтыя гады не заўважаецца.

толькі якія-небудзь тры-чатыры надрукаваныя вершы. Гэта розніца ў паэтычным нашым багажы не пашкодзіла нам пазнаёміцца, як след зблізіцца і потым знаходзіцца ў сяброўскіх адносінах. Тым больш, што мы былі амаль аднагодкі: ён быў старэйшы за мяне ўсяго толькі на два гады.

Валеры Маракоў быў юнаком вышэй сярэдняга росту, з выгляду прыгожы, бландзіністы, сінявокі і няўрымслівы. Увесь час ён як быццам кудысьці спяшаўся. Сам не мог спакойна сядзець на адным месцы і сяброў сваіх прымушаў разам з сабой бегаць. Здавалася, што і вочы яго не знаходзіліся на адным месцы — бегалі разам са сваім гаспадаром. Звычайна такіх людзей называюць „халерыкамі“. Але наш „халерык“ нікольні не падобны на іншых. Гэта — чалавек не толькі эмоцый, але яшчэ і думкі.

Пісаў Валеры Маракоў многа, толькі не ўсё тое, што выходзіла з-пад ягонага пяра, даводзілася яму выносіць на суд чытача: прытрымлівалі „патрабавальныя рэдактары“ і „пільныя цэнзары“. Так што перыяд з 1933 па 1936 год застаўся белай плямай у творчым жыцці паэта. А ён жа не сядзеў, склаўшы рукі, пісаў.

Валеры Маракоў нідзе ніколі не выступаў ні з якімі дакладамі. Не любіў ён наперад рыхтавацца да выступленняў на розных пісьменніцкіх форумах, як гэта было ўласціва іншым яго сябрам па пяру. Ён калі і адважваўся гаварыць, дык гаварыў, як кажуць, з ходу. А больш за ўсё свае думкі ён выказваў у прыватных гутарках.

Любому свайму субяседніку гаварыў у вочы тое, што думаў. Хітрыць, а тым болей двурушнічаць ён не ўмеў. Гэта было не ў ягоным характары. А вось выступаць перад чытачамі любіў, асабліва перад моладдзю.

Перад такімі аматарамі мастацкага слова ў яго было з чым выступіць. Было што прачытаць і пра што расказаць. Не толькі вершы, але і сама постаць гэтага


420

паэта прыцягвалі да сябе юных чытачоў-слухачоў, а калі дакладней — чытачак. Апошнія хадзілі за ім чародкамі. Мне неаднойчы даводзілася быць з ім на такіх сустрэчах і на свае вочы бачыць такія сцэны. Кожнай чытачцы-слухачцы хацелася як можна бліжэй пазнаёміцца з такім эмацыянальным і прыгожым паэтам.

Я памятаю, як на адным з такіх нашых супольных выступленняў (а нас было там некалькі чалавек) перад студэнтамі садова-агароднага інстытута, які нейкі час існаваў у Мінску, у Лошыцы*, дзяўчаты-студэнткі так загрузілі яго кветкамі, што аднаму яму не пад сілу было справіцца з імі. Яму, канечне, ад гэтага было вельмі прыемна, але неяк і няёмка перад намі.

— Вы даруйце мне, хлопцы, але я тут ні пры чым, — апраўдваўся ён.

— Навошта нам тваё апраўданне, — адказваў за нас ўсіх Змітрок Астапенка. — Гэта нам трэба прасіць у цябе прабачэння, што не здолелі заслужыць павагі ў гэтых красунь.

Трэба прызнацца, што на пачатку 30-х гадоў мы ўсе бедна жылі. У тым ліку і пісьменнікі, асабліва маладыя. Гэта быў час картачнай сістэмы. А таму па ўказанні ўрада Беларусі ў Доме пісьменніка быў адкрыты буфет-сталовая, дзе раз у дзень кожны пісьменнік меў права паабедаць. А таму ў дзве гадзіны дня ўсе пісьменнікі збіраліся ў гэтай сталовай. Абед каштаваў роўна адзін рубель. Але, шчыра кажучы, не ў кожнага пісьменніка, асабліва маладога, знаходзілася ў кішэні і гэта сума. Так што перад пачаткам абеду ў калідоры Дома пісьменніка чуліся галасы:

— У цябе часам не знойдзецца рубліка да заўтра?

* Знаходзіўся недалёка ад дома Мараковых.

— Слухай, дружа, пазыч мне да заўтра рубель.

З усёй нашай пісьменніцкай брацii больш-менш у выгадным становішчы знаходзіўся Валерый Маракоў, таму што ён жыў у бацькоў. А значыць, заўсёды наросхрыст перад сваімі сябрамі. Ён быў не толькі таленавіты паэт, але і чалавек выдатны. Канечне, такая беднасць панавала толькі сярод літаратурнай моладзі. Ні Купала, ні Колас, ні маладзейшыя за іх сталыя пісьменнікі, як, напрыклад, Міхась Чарот, Кузьма Чорны, Міхась Зарэцкі, за „рублікамі“ не палявалі. У іх заўсёды знаходзіліся грошы на абед.

Валеры Маракоў пісаў добрыя вершы пра каханне, ад якіх дзяўчаты млелі. Але сам ён за дзяўчатамі не бегаў. Мы неяк гаварылі яму:

— Валеры, жаніўся б ты, каб яны перасталі за табой бегаць.

— Што вы, хлопцы?! Хочаце звязаць мяне па руках і нагах? Хочаце, каб я з паэта ператварыўся ў нянь-ку? Не, сябры, на гэтую вуду вы мяне не возьмеце. Мне яшчэ трэба шмат чаго напісаць. Што з таго, што Алесь Дудар ажаніўся? Не паспеў ён вымушана пакінуць на нейкі час Менск, як ягоная Наташа перамахнула да Алеся Звонака...

За верш „Пасеклі наш край“ Алесь Дудар у 1928 годзе па прыгаворы суда быў высланы за межы Беларусі — у Смаленск*. Вось у гэты час Н.Вішнеў-ская і памяняла яго на Звонака. Калі ж у 1936 годзе быў арыштаваны і Алесь Звонак, Н.Вішнеўская не разгубілася — яна стала жонкай сябра Звонака Янкі Бобрыка**, які ў той час жыў у Ленінградзе.

— Не, хлопцы, пэўна, яшчэ рана мне жаніцца, трэба трошкі пачакаць.

Як быццам Валеры прадчуваў сваю немінучую бяду.


422

Аднойчы, седзячы на канапе Дома пісьменніка, ён гаварыў нам:

— А ведаеце, хлопцы, што Кучар*** хацеў мяне ажаніць з буфетчыцай Фаняй?

— Ну і што? — пытаемся мы. — Пэўна, абрадаваўся ты?

— Вельмі абрадаваўся. Паслаў яго падалей і ўсё. Але Кучар не разгубіўся. Ён гэтую ж самую Фаню стаў навязваць Уладзіміру Хадыку.

— І што?

— Што, пытаецеся? А тое, што ён, пэўна, клюне на такога жыўца.

І Валеры не памыліўся. Праз нейкі час Кучар ажаніў Хадыку з Фаняй. Жылі яны нядрэнна, зладжана. Нажылі сына. У 1937 годзе Уладзіміра Хадыку арыштавалі, асудзілі і вывезлі ў Забайкалле, дзе ён праз нейкі час трагічна загінуў: яго засыпала зямлёй у кар'еры. Фаня нічога пра тое не ведала і чакала яго. Так яна ў чаканні дажыла да пачатку Айчыннай вайны — да 1941 года. Калі Менск акупавалі немцы, яны арыштавалі Фаню з яе сынам, звезлі ў гета і праз нейкі час расстралялі. Вось такі лёс напаткаў Хадыку і яго сям'ю.

Янка Купала вельмі любіў Маракова. Ён заўсёды называў яго ласкава: „Валерык“, „Валік“. Не аднойчы запрашаў яго дахаты, каб „за шклянкай гарбаты“ паслухаць яго новыя вершы і прачытаць свае яму. Купала часам запрашаў Валерыя і на сумесныя літаратурныя выступленні. Ён гаварыў, што Маракоў — гэта будучыня нашай беларускай паэзіі. На вялікі жаль, прарочыя словы народнага паэта не збыліся: перашкодзілі цёмныя сілы. Яны адабралі ў Валерыя

---

* В. Маракоў быў адным з нямногіх, хто насмеліўся прыехаць да А. Дудара ў ссылку.

** Стрыечнага брата С. Грахоўскага.

*** Вучыўся разам з В. Мараковым у Белпедтэхнікуме.

самае каштоўнае — жыццё.

З вялікай сімпатыяй і любоўю адносіўся да Маракова і другі беларускі класік — Якуб Колас*. Апошні часта запрашаў яго разам з сабою на сустрэчы з чытачамі. На адной з такіх сустрэч прысутнічаў і я. Гэта было ў Белпедтэхнікуме, дзе да гэтага народны паэт выкладаў методыку беларускай мовы. Скажу шчыра, што я па-сяброўску зайздросціў Валерыю, калі яго выклікалі на „біс!“.

У 1933 годзе шмат каго з сяброў Маракова арыштавалі сталінскія апрычнікі, асудзілі і вывезлі на Поўнач. Валеры вельмі перажываў. Пры размове на гэтую тэму ён плакаў і казаў: „Пэўна, хутка і да мяне чарга дойдзе“. Сапраўды, у 1935 годзе яго „патурбавалі“, але праз некалькі дзён выпусцілі**. Праўда, не надоўга***. Адным словам, з ім энкавэдэшнікі гулялі, як кошка са сваёй ахвярай-мышкай.

Калі я ў 1935 годзе пачуў, што і Маракова арыштавалі, я напісаў верш „Сяброўства“, у ліку герояў якога меў на ўвазе і Маракова.

## СЯБРОЎСТВА

*Где они, друзья твои?*
*Не знаю.*
*Может быть, и не было друзей.*
**А. Пракоф’еў**

---

* Я. Колас выкладаў В. Маракову методыку літаратуры ў Бел-педтэхнікуме ў 1927–1929 гг.

** Знаходзіўся тады пад арыштам каля 70 дзён.

*** Паўторна быў арыштаваны 6 лістапада 1936 г.


424

Было нас пяць —
Амаль што аднагодкаў.
Пачуццяў жар
Аднолькава ўсіх грэў.
Юнацтва білася
Шалёнаю паводкай!
Не мелі роспачы,
Не ведалі пра гнеў.
Былі часы —
Дзяліліся цыгаркай,
Кавалак хлеба
Рэзалі на пяць.
А зелень год
Разгульнаю цыганкай
Не пакідала ўсё ж
Віхрыцца і спяваць.

Было нас пяць.
Пісалі і кахалі,
Любілі ўсё
Бадзёрае ў жыцці!
Пакут і скрух
Ніколі мы не зналі,
Пляткарства яд
Нам сэрцы не труціў.
Былі ж упартасць,
Сіла і яднанне,
І мары цвёрдыя,
Каб пець,
Каб праз усе
Нягоды і змаганні
Віхорам, бурай
З песняй прагрымець!

Пазараслі травою
Сцежкі тыя.

Курыцца пыл
На ростанях дарог.
Я прагну склікаць іх, —
Мінуты ж дарагія
Ў прадонне канулі
Агаркамі трывог.

І я адзін
За сотні кіламетраў,
Адзін з пяцёх
Гартую голас струн,
Дзе мора дыбіцца
Ад сілы фінскіх ветраў,
Дзе неба муціцца
Ад чорных труб.
Я ўпарта йду —
Не енчу, не хварэю,
Юнацтва цвет
І дужасць зберагу.
І веру я,
Што песнямі сагрэю
Мільёны душ,
Як здолею, змагу!
Бывае й так,
Што часам засумуеш:
Успомніш
Блізкіх, дарагіх людзей...
Цыгарку ў зубы,
Ад тугі закурыш...
...А „может быть,
И не было друзей?“

Валеры Маракоў быў надзвычай сціплы чалавек. Каб не быць галаслоўным, раскажу пра адзін выпадак, які я пачуў ад ягонага аднакурсніка Захара Біралы. Ішлі семінарскія заняткі па савецкай беларускай літаратуры на 3 курсе крытычна-творчага


426

аддзялення літаратурна-лінгвістычнага факультэта педінстытута. Вёў іх прафесар Піятуховіч. Ён акінуў позіркам аўдыторыю і сказаў:

— Тэма нашых сённяшніх заняткаў — паэзія маладнякоўцаў 2-й паловы 20-х гадоў. Хто б з вас, таварышы, зрабіў нам кароткі, але змястоўны агляд паэзіі гэтага часу і назваў імёны лепшых яе творцаў.

Ён перавёў свой зыркі позірк на Маракова і прамовіў:

— Таварыш Маракоў, можа б вы ўзялі на сябе гэтую пачэсную справу? Бо вы самі варыліся ў тым бурлівым катле. Так што вам і ўсе карты ў рукі.

— Я не супраць, калі ласка, — адказаў той.

— Тады пачынайце.

Маракоў патраціў мінут 10 на агляд тагачаснай паэзіі. І назваў імёны творцаў:

— Тодар Кляшторны, Паўлюк Трус, Пятро Глебка, Пятрусь Броўка, Уладзімір Хадыка, Сяргей Дарожны, Максім Лужанін, Аркадзь Моркаўка, Алесь Вечар, Алесь Звонак, Янка Туміловіч... Працягваць ці хопіць?

— Працягвайце.

— Віктар Казлоўскі, Міхась Багун, Язэп Падабед, Мікола Хведаровіч, Станіслаў Шушкевіч, Юрка Лявонны, Сцяпан Ліхадзіеўскі, Захар Бульбянік і тройца мсціслаўцаў — Змітрок Астапенка, Юлій Таўбін і Аркадзь Куляшоў.

— А што, паэтэс у вас не было?

— Чаму не было, былі і ёсць. Хоць не густа, але былі і ёсць. Напрыклад, нашы цудоўныя Зіна Бандарына і Яўгенія Пфляўмбаўм, а таксама прыгажуня палачанка Ганна Брэская. Ну, здаецца, і ўсё.

— Не, не ўсё. Вы забыліся назваць імя самай яркай і каларытнай паэтычнай асобы з гэтай кагорты.

— Каго вы маеце на ўвазе, прафесар?

— Паэта Валерыя Маракова.

Пасля гэтых слоў Піятуховіча Маракоў пачырванеў, а потым нават пабляднеў.

— Па-першае, гэтая асоба не такая важная, каб яе называць. А па-другое, з майго боку гэта было б вельмі нетактоўна.

— А што тут нетактоўнага? Студэнт Валерый Маракоў назваў паэта Валерыя Маракова.

— Усё роўна непрыгожа, — не здаваўся Маракоў.

— Дзякуй за інфармацыю, толькі вы не крыўдуйце на мяне. Я гавару гэта шчыра.

Штосьці непрадбачанае, страшнае адбывалася навокал. Хацелася ад усяго гэтага бегчы, а куды? Уся неабдымная краіна і чалавечая свядомасць знаходзіліся пад нябачным замком. Бяда ў тым, што большасць насельніцтва краіны па-ранейшаму верыла „бацьку ўсіх часоў і народаў“ і ў „светлую будучыню“. На вялікі жаль, такім абалваненым быў наш таленавіты народ. Яго ціснулі за глотку сталінскія памагатыя, а ён не пераставаў крычаць: „Дзякуй вялікаму Сталіну за наша шчаслівае жыццё!“. Таго, хто не далучаўся да такога хору, проста ўбіралі з дарогі. Да іх ліку быў аднесены і Маракоў.

Валеры Маракоў быў вельмі таварыскі і шчыры сябар. Ён ніколі не пакідаў у бядзе блізкіх яму людзей. Заўсёды быў тактоўны да іншых асоб, у тым ліку і афіцыйных. Але, як і ўсе смяротныя, часам губляў раўнавагу, чаму спрыяў і ягоны „гарачы характар“. Дазволю прывесці толькі адзін прыклад.

Было гэта вясной 1931 г. Я тады працаваў на Беларадыё. І вось рэдакцыя радыёгазеты даручыла мне арганізаваць літаратурную перадачу. Я з вялікай ахвотай узяўся за гэтую справу — дамовіўся з добрым дзесяткам пісьменнікаў (у асноўным паэтаў) на чале з Якубам Коласам. Былі там прадстаўнікі і старэйшага, і сярэдняга, і малодшага пакаленняў,

як, напрыклад, Міхась Чарот, Міхась Зарэцкі, Тодар Кляшторны, Уладзімір Хадыка, Аркадзь Куляшоў, Клім Грыневіч, Валеры Маракоў і іншыя.

Як гэта і павінна быць, першым выступіў Якуб Колас, другім Міхась Чарот, трэцім Міхась Зарэцкі, потым Тодар Кляшторны і г. д. Сябе я паставіў апошнім. З парадкам выступлення былі азнаёмлены ўсе ўдзельнікі гэтай перадачы. А выступалі ж тады адразу, без папярэдніх запісаў. Усе выступоўцы знаходзіліся ў другім пакоі, і іх па чарзе выклікалі (запрашалі) да мікрафона.

Так было і на гэты раз. Дыктар Юрэвіч (старэйшы брат Уладзіміра Юрэвіча) пасля Якуба Коласа паклікаў Міхася Чарота, а за ім па ўстаноўленай чарзе павінен быў выступаць Міхась Зарэцкі, потым Тодар Кляшторны... Але нечакана ў пакой з мікрафонам урываецца Маракоў.

— Таварыш Маракоў, — папярэдзіў яго дыктар, — пачакайце, не ваша чарга.

— Чаму не мая? Мая!*

Мікрафон давялося выключыць. Праз некалькі хвілін перадача была прадоўжана, але ўжо без Маракова.

Назаўтра, роўна праз суткі пасля таго, я сядзеў на канапе Дома пісьменніка. Раптам адчыніліся дзверы, і ў пакой увайшоў Валеры Маракоў з бледным, як палатно, тварам.

— Валеры, што з табой? Дзе ты быў? — спытаў я ў яго.

— Ты ж, пэўна, бачыў, хто браў мяне ў свае „абдымкі“? Цэлыя суткі пратрымалі. Хацелі шпіянаж

* Чарга чамусьці супала з узростам выступоўцаў, з чым, відаць, быў не згодны В. Маракоў. Ён працаваў намрэдактара часопіса „Чырвоная Беларусь“. Рэдактарам быў М. Чарот. Маракоў, відаць, вырашыў, што наперадзе яго можа выступаць толькі яго выкладчык Я. Колас і яго „начальнік“ М. Чарот.

прышыць, але абмежаваліся хуліганствам.

Пасля таго выпадку Валерый Маракоў стаў больш разважлівым, тактоўным і насцярожаным. А калі ў 1933 годзе прайшлі чарговыя „хапуны“ і шмат хто з ягоных сяброў аказаўся іх ахвярай, ён, як мне пасля расказвалі, аднойчы ў Доме пісьменніка заплакаў і сказаў:

— Пайду лягу пад трамвай — усё роўна і мяне забяруць. Навошта ж такія пакуты? Лепш ужо адразу...

Праўда, тады яго не ўзялі. І гэта, можа, толькі таму, што ён на нейкі час пакінуў Менск і ўладкаваўся настаўнікам у адной з барысаўскіх школ*, дзе і працаваў амаль да самага піку „рэкруцкіх набораў“. Адным словам, успомнілі пра яго „сябры“ ў блакітных фуражках ужо ў 1937 годзе. Дзе і як загінуў ён, ніхто толкам не ведае. Па звестках НКУС, ён „памёр 7.5.40 г.“. На самой жа справе смерць напаткала яго значна раней. Кажуць, што ён развітаўся з жыццём у тым жа 1937 годзе**. Маракоў не падпісаў хлуслівага абвінавачвання, і яго звезлі ў Курапаты. Ён мужна трымаўся і на допытах, і ў час расправы. Мужна жыў і мужна паміраў.

У канцы 60-х гадоў, калі я апынуўся ў Менску і жыў беспрытульным халасцяком, доўгі час беспаспяхова шукаў кватэру, каб перавезці сваю сям'ю. Да каго ні звяртаўся, ніхто не мог дапамагчы мне ў гэтай справе. І вось з такім пытаннем я звярнуўся да былой загадчыцы пісьменніцкай бібліятэкі Марыі Канстанцінаўны Хайноўскай***.

— Я падумаю, — сказала яна, — пачакайце трошкі.

---

* Знаходзіўся ў творчай камандзіроўцы на лесасплаве ў мястэчку Чарняўка Барысаўскага раёна.

** 29 кастрычніка 1937 г.

*** Жонка сябра В. Маракова—С. Баркоўскага.


430

І вось дні праз два-тры яна ўбачыла мяне і прапанавала такі варыянт:

— Павел Іванавіч, я падшукала вам кватэру. У раёне камвольнага камбіната ёсць вуліца Марская. Яна амаль што ўпіраецца ў вуліцу Маякоўскага. Там стаіць пrасторны драўляны дом на два канцы, у якім жыве ў адзіноце маці Валерыя Маракова. Вы дапаможаце ёй толькі адрамантаваць гэты дом і будзеце ў ім жыць з сям'ёй, як у сваім уласным. Я ўжо мела размову з гаспадыняй. Так што не губляйце дарма часу, едзьце туды і дамаўляйцеся. Яна чакае вас.

Я падзякаваў Марыі Канстанцінаўне за яе клопаты, узяў у яе адрас і адразу ж накіраваўся ў патрэбным напрамку. Скажу шчыра, што патрапіў я туды не адразу, але ўсё ж знайшоў-такі забыты Богам і людзьмі дом.

Сапраўды, дом быў не малы. Але ён патрабаваў капітальнага рамонту.

Гаспадыня дому, маці майго даўняга сябра па пяру, сустрэла мяне з вялікай радасцю. Для яе ўжо дастаткова было таго, што я добра ведаў яе любімага сына Валеру. Яна, са слязамі на вачах, дрыготкімі старэчымі рукамі абняла мяне.

— Я пастаўлю самавар, пачастую вас чаем, — прапанавала.

— Дзякую, але я толькі што са сталовай.

— Вы добра ведалі майго сына Валеру? — не спынялася яна.

— Не толькі ведаў, але і сябраваў з ім.

— Мой сын быў вялікі паэт! Праўда?

— Праўда, матуля, Валеры быў выключны паэт, вы не памыляецеся, — адказаў я.

— А то я чула рознае...

— Не верце гэтаму рознаму. Гэта ўсё плёткі.

— І я так думаю...

Усё ішло, як і трэба было пры такой сустрэчы,

але раптам я зрабіў недаравальную памылку. Непрыкметна для сябе я ўліў у бочку з мёдам лыжку дзёгцю. Калі старэнькая маці ўсё працягвала хваліць свайго сына (і, канечне, не без падстаў), я міжвольна заўважыў:

— Валера быў членам ТАВІЗа*. Удзельнікі яго збіраліся звычайна ў адной з кавярняў горада. Афіцыйныя ўлады называлі іх багемай і абвінавачвалі ў злоўжывані алкаголем.

І вось тут раптам адбылося нечаканае: маці насцярожылася, збляднела — змянілася ў твары і вымавіла:

— Гэта няпраўда, мой сын…

— Матуля, супакойцеся. Я ж меў на ўвазе, што Валера, як і яго сябры, адчуваючы непазбежны арышт, часам здымаў нервовасць, узбуджанасць чаркай…

Шчыра кажучы, я ўжо не раз укусіў сябе за язык за непрадуманую заўвагу.

— Дык вам што, кватэра трэба? — спытала яна суха. — Я не супраць, калі возьмеце на сябе рамонт гэтага дома. Вы бачыце, які ён?

— Бачу, што яго трэба цалкам рамантаваць. А на гэта трэба не толькі сродкі, але і час. Мне ж патрэбна жыллё сёння. Я падумаю.

— Надумаеце, дык паведаміце мне, — сказала яна.

Дом разам з гаспадыняй дажываў свой век. Галоўная бяда была ў тым, што працякаў дах. Я падумаў: „Каб быў жывы Валеры, ці ж ён дапусціў бы гэта? Сын загінуў у муках, пакутуе нікому не патрэбная маці. І гэта ў Краіне Саветаў!“.

---

* ТАВІЗ — Таварыства аматараў выпіць і закусіць. У яго ўваходзілі: Т. Кляшторны, У. Хадыка, В. Каваль, А. Дудар, В. Маракоў, С. Дарожны і інш.


432

**Ядвіга РАМАНОЎСКАЯ**

# НЕКАЛЬКІ ЗГАДАК З МАЙГО ДЗЯЦІНСТВА

У патаемным архіве чалавечай памяці надзейна аберагаюцца рысы, жэсты, усмешкі тых, хто даўно сышоў з цёплай зялёнай дарогі. Памяць паслужліва дапамагае нам узнавіць далёкія падзеі ў дэталях і рухах, якія поўняцца сцішэлай энергіяй ды забытымі галасамі. Просты і лёгкі, грацыёзны, як маёвы матыль, радок з верша Валерыя Маракова, добрага і шчырага знаёмца-прыязніка Янкі Купалы, расхінае ў маёй памяці абярэжную заслону і раскрывае схаваны ў доўгія дзесяцігоддзі замоўчвання ды адцурання свет літаратурных супольнасцяў на пачатку стагоддзя. Прагучаў гэты вырваны з верша радок — „За песні і думы мы любім паэтаў“, — і я апынаюся ва ўладзе тых песняў і думаў. І спрабую свае пачуцці перадаць вам, спадкаемцам тых няўтомных, гарачых песняў.

Вяртаюся ў незабыўныя гады пачатку, веры, натхнення. Гартаю часопіс „Маладняк“. Першы нумар адкрываецца вершам Я.Купалы „Арлянятам“, прысвечаны маладнякоўцам. Гэтаму вершу суджана стаць своеасаблівым гімнам айчыннай моладзі. Увесь час Янка Купала не парываў сувязь з маладнякоўцамі, маладымі, прыгожымі, упартымі юнакамі і дзяўчатамі, што любілі Беларусь і матчыну мову, чуйна прыслухоўваліся да паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа. З павагай вучыліся ў іх літаратурнаму майстэрству. А мы, дзеці, захоплена дэкламавалі вершы, чыталі абразкі і апавяданні, вывучалі жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў,

праводзілі літаратурныя віктарыны, ставілі п’есы, інсцэніроўкі па іх творах. Калі мы жылі ў Акопах, былі пастаўленыя „Паўлінка“ Янкі Купалы, „Босыя на вогнішчы“ Міхася Чарота. У п’есе М.Чарота мая старэйшая сястра Ніна Раманоўская выконвала ролю Волі (Свабоды). Незвычайны быў яе сцэнічны касцюм — на шырокай стужцы, перакінутай праз яе плячо, было напісана „Воля“. Усе прысутныя былі ўражаны, як яна выконвала гэтую ролю, па-артыстычнаму праўдзіва, таленавіта, шчыра.

Сустрэчы маладнякоўцаў са старэйшымі паэтамі часцей за ўсё адбываліся ў Доме пісьменніка, што месціўся на Савецкай вуліцы ў Мінску, прыблізна на тым месцы, дзе цяпер на праспекце Скарыны стаіць дом з гарадскім гадзіннікам. Пасля вырашэння неадкладных пытанняў, абмену думкамі, калі сціхалі спрэчкі, завяршаліся сустрэчы, усе спяшаліся: хто ў рэдакцыю, хто дадому.

Некаторыя з маладзейшых — Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Валерый Маракоў — любілі праводзіць дадому Янку Купалу на Кастрычніцкую, 36-а. Каля весніцаў Іван Дамінікавіч запрашаў сяброў паглядзець ягоны малады сад, у якім раслі прыгожыя чайныя штамбавыя ружы. Гэтыя ружы дзядзька Янка прывозіў з Каўказа, сам іх садзіў, кожную восень уцяпляў, каб не замерзлі. Пасля агляду саду Іван Дамінікавіч клікаў да абеду. Ад гэтай нагоды — пасядзець за гасцінным сталом цёці Ўладзі — ніхто не адмаўляўся. „Былі рады падсілкавацца“, — успамінаў Пятрусь Броўка.

Частаванне, як і гутаркі з Купалам, было шчырым і шчодрым — ад сэрца. Дабрынёй свяціліся Купалавы задумныя вочы, а ўсмешка, ветлая і адкрытая, блукала па твары. Значыць, суразмоўцы да душы дзядзьку Янку — разумелі мы, дзятва паэтавага роду. Усе госці здаваліся нам вельмі прыгожымі, а Маракова і дзядзьку Янку аб’ядноўвала нейкая асаблівая

 434

абаяльнасць, якую мы неаднойчы заўважалі пры іх сустрэчах. І мы ганарыліся, што жывём у доме, слаўным гасціннасцю ды павагай да добрых людзей. Жывыя, імпульсіўныя, гарачыя гутаркі за сталом здаваліся нам святам, якое было трошкі таемным, нібыта чароўным. Бо ў гасцёўні чыталі вершы Купалу крыху старэйшыя за нас людзі, а дзядзька Янка ўважліва слухаў і прымаў творы маладых сур'ёзна і ўдумліва, зрэдзь часу падказваючы, раячы, папраўляючы. Але гэтак далікатна, мякка ён крытыкаваў, што, здавалася, ухваляе, падтрымлівае. Гэтак яно, па сутнасці, і было. Цяпер я ведаю: місія духоўнага настаўніка моладзі, што выпала на долю Івана Дамінікавіча, была надзвычай адказнаю, і трэба было не захвальваць, не ўзносіць маладую амбітнасць, а патрабавальна, па-пісьменніцку і па-чалавечы роўна скіроўваць творчую энергію новага пакалення ў рэчышча ўзбагачэння роднай літаратуры, што апынулася на самай строме развіцця, узвышэння на свой, адметны, пасад у сусветным мастацтве слова. Клопат Купалы пра маладыя парасткі творчасці чуцён і ў ягоным адказе на пытанне Л.Клейнбарта, хто з тагачасных паэтаў песняру бліжэй. У адным з лістоў дзядзька Янка годна і лагодна напісаў: „Усіх іх я вельмі люблю і цаню...“

Дом Купалы стаяў блізка ад рэчкі Свіслач. У веснавую паводку рака часта выходзіла з берагоў і пагражала затапіць дамы, што знаходзіліся паблізу. Увесну 1931 года гэткая небяспека навісла і над Купалавым гняздом. Звярталіся да блізкіх сяброў сям'і, дома. Асабліва Іван Дамінікавіч хваляваўся за лёс сваёй вялікай бібліятэкі. Вырашылі перанесці амаль усё каштоўнае на гарышча. Гэтым найперш займалася радзіна Янкі Купалы: сястра Ганна Дамінікаўна ды пляменніцы. Дапамагалі і мастак Сцяпан Андруховіч, паэт Валерый Маракоў, Сігізмунд Мядзёлка з жонкай Вікторыяй (яны ў 1925—1935 гг. жылі ў доме

Купалы) і інш. Стрымлівалі стыхію як маглі. Каля брамы-веснічкаў зладзілі дамбу з дошкаў, засыпалі сярэдзіну пяском, усклалі мяшкі з пяском. Але нічога не дапамагала. А першай гадзіне ўначы дамбу прарвала. І вада хлынула ў дом Купалы. Такім чынам, мы ўсе і Іван Дамінікавіч з маці ратаваліся на гарышчы. Толькі адна цёця Уладзя хадзіла па вадзе да тэлефона, які безупынна званіў. Званілі ўсе, хто рупіўся пра Купалу, трывожыўся пра слабое яшчэ пасля хваробы здароўе. Дачакаліся раніцы, перавезлі Івана Дамінікавіча спачатку ў Дом пісьменніка, а потым да Якуба Коласа. Найшчырэй за ўсіх падмагаў Валерый Маракоў, які з асаблівай павагай і сыноўняй любоўю адносіўся да Купалы і яго сям'і. Даволі часта ён гутарыў з маці паэта на лавачцы ў садзе. Пра што яны гаварылі, мы, дзеці, не прыслухоўваліся. Магчыма, Маракоў раіўся з Бянігнай Іванаўнай, як лепей адсвяткаваць 50-годдзе Купалы: паэт жа не любіў юбілеяў.

Лета 1932-га было ўрачыстым. Самое свята паўвекавой жыццёвай дарогі песняра было яркім, непаўторным. Вітанні сяброў і паплечнікаў, зычанні моладзі, кветкі, усмешкі, тэлеграмы... Калі ж госці вясёлай гаманой выйшлі разам з Іванам Дамінікавічам у сад, усе ўлюбёныя Купалам ружы загарэліся насустрач радасным святлом. Гэткай прыгожай неспадзяванцы ўсе здзівіліся. Дзядзька Янка ўзрушана і ўдзячліва запытаўся, хто прыдумаў гэты казачны дарунак. А задумка належала Валерыю Маракову, чалавеку ўдумліваму і адкрытаму, які часта бываў у доме Купалы, паказваў Івану Дамінікавічу свае вершы, чуйна ўслухоўваўся ў падказкі і парады. Мабыць, таму некаторыя з вершаў Маракова па настраёвасці і паэтычнай вытанчанасці блізкія да Купалавых: духоўная роднасць, як у люстэрку, адбіваецца ў пластыцы радкоў. Гэтак няўлоўна-шчымліва адчуваецца інтанацыя Купалавай „Бацькаўшчыны“ ў вершы

Маракова „Майскім маршам“. Нібыта сугучча думаў, спадзяванняў і мелодыяў сусвету выткалася ў дзве рытмічныя плыні, што імкнуць да вялікай ракі Айчыны. А з гэтай ракі выплывае прызнанне Валерыя Маракова ў вершы, прысвечаным Купалу:

Мы мудрасць вякоў і сусвету
Знаходзім ў паэтаў штодзень.

Валерыю Маракову, як і Купалу ў маладосці, калі прыязджаў з Пецярбурга да маці ў Акопы, вельмі плённа працавалася, вершы нібы ліліся з-пад пяра. І такое паэтычнае натхненне яшчэ больш іх зблiжала, духоўна аб’ядноўвала.

Перада мною тры фотаздымкі 1930—1931 гадоў, якія нядаўна перадаў музею Янкі Купалы вядомы беларускі паэт Максім Лужанін. Здымкі зроблены на адной з тых шматлікіх сустрэч, што адбываліся ў Доме пісьменніка. Я гляджу на маладыя, прыгожыя, адухоўленыя твары Максіма Лужаніна, Алеся Звонака, Валерыя Маракова, Міколы Нікановіча, Васіля Каваля, Аркадзя Мардвілкі, Змітрака Астапенкі, Віктара Казлоўскага, Юлія Таўбіна, Станіслава Шушкевіча і прыгажуні Наталлі Вішнеўскай. Я ўглядаюся ў далёкую памяць. І памяць ўваскрашае сустрэчы, гутаркі, святы — ўзаеміны ў паэтычным свеце, калі рэчаіснасць была пагрозлівай і непрадказальнай. Памяць наноў стварае жывы, трапяткі вобраз часу. Часу, асвечанага ўзлётнай марай і гаркотным болем. Часу, які занатаваў падзеі літаратурнага жыцця ў летапіс Адраджэння.

28 мая 1930 года Валерый Маракоў чытае свой верш „Янку Купалу“ на вечары ў Доме асветы з нагоды 25-годдзя літаратурнай дзейнасці Песняра-Прарока, а ў 32-ім разам з Міхасём Зарэцкім, Максімам Лужаніным і іншымі пісьменнікамі вітае Купалу з 50-годдзем, яшчэ не прадчуваючы парога, за якім сцеражэ яго, поўнага сілы і натхнення, маўклівы нябыт. Але з цёмнага маўчання праз гады прабіўся голас маладога паплечніка Купалы, летуценніка нашай Волі.


438

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

## „...ВІНАВАТЫМ СЯБЕ НЕ ПРЫЗНАЎ“

Якім бы жорсткім і няўмольным ні быў лёс да Валерыя Маракова, але хоць у нечым ён злітаваўся. Калі ў многіх пісьменнікаў — ахвяраў таталітарызму, нават асобныя публікацыі згубіліся, канулі ў Лету, не кажучы ўжо аб рукапіснай спадчыне, дык у яго захаваліся ўсе чатыры зборнікі, што выйшлі пры жыцці. Дастаткова завітаць у аддзел беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, каб праз якія паўгадзіны ўзяць у рукі кніжачкі, якія, здаецца, сагрэты цяплом самога сэрца аднаго з самых цікавых і складаных нашых паэтаў дваццатых — трыццатых гадоў.

Паэтам В.Маракоў быў па сваёй сутнасці. Лірычнасць, песеннасць яго натуры адразу кідалася ў вочы. Гаваркі, шчыры, непасрэдны... Алесь Звонак згадвае: „Вось і зараз стаіць перад вачыма дужая постаць маладога зграбнага хлопца з шырокімі плячыма з кучаравымі светлымі валасамі, з блакітнымі яснымі вачыма, у якіх заўсёды свяціліся чалавечая дабрата, добразычлівая ўсмешка і крыху сарамлівая наіўнасць“.

Ці не гэтыя якасці прыхінулі паэта-юнака да самога Янкі Купалы? Хто-хто, а дзядзька Янка добра ведаў цану сапраўдным дружбе і сяброўству. Ён жа, па словах С. Шушкевіча, „Маракова акрыляў бацькоўскай ласкай і прыхільнасцю. Народны паэт не раз запрашаў да сябе юнака на сваю кватэру і цешыўся яго першымі творчымі крокамі. Вядомыя пісьменнікі старэйшага і малодшага пакаленняў — Міхась Чарот, Паўлюк Трус, Пятрусь Броўка, Алесь Дудар, Васіль Сташэўскі, Максім Лужанін — прыхільна ставіліся

да творчасці Валерыя Маракова і былі звязаны з ім шчырым і моцным сяброўствам“.

У гэтай атмасферы сардэчнасці, сапраўднай творчай прыязнасці і ўзаемаразумення, калі кожны шчыра і адкрыта радуецца поспехам сябра, і з’яўляліся вершы В.Маракова. На пачатку свайго мастакоўскага шляху малады паэт, як і іншыя ягоныя калегі па пяру, адчуваў здзіўленне перад новым светам і гэтае захапленне імкнуўся ўвасобіць у творах. Можна перачытаць некалькі яго ранніх вершаў, каб упэўніцца, што паэзія В.Маракова развівалася і сталела ў рэчышчы агульных пошукаў творцаў 20-х гадоў.

Твор, якім адкрываецца зборнік „На залатым пакосе“:

З ценямі думкі, а з думкамі цені
Ўдаль па шпалерах бягуць.
Нехта стаіць прад зарой на каленях,
Выпіўшы сэрца разгул.

Месяц чырвонцам скаціўся у травы,
Ціш, хоць душу вынімай, —
Сёння мне песняў, пачуццў і славы,
Тых, што ў нікога няма!

У наступным вершы — нешта падобнае: „Хрыпла гудок прагучаў, мірна схіліліся нівы. //Ў цемры асенніх начэй жыць маладым і шчаслівым!“ В.Маракоў нічога не хацеў браць напавер. Ні ў жыцці, ні ў літаратуры. Яму самому хацелася прайсці там, дзе ўжо прайшлі іншыя, каб адчуць тое самае, што адчувалі яны. Невыпадкова ў адным з вершаў ён прызнаваўся: „Мне хочацца любіць, задумацца і верыць, душу з другімі душамі зліваць“.

Першыя тры зборнікі В.Маракова напоўнены пастаянным жаданнем (няхай часам яно выяўляецца і апасродкавана) любіць усё навокал. І, як само са-

 440

бой, гучалі ў яго творчасці ясенінскія матывы. Як у гэтым вершы:

О, вясна!..
І бяссонне ночы:
Сціх у сэрцы
Юнацтва разгул,
Мо затым, што нічога не хочу
І нікога спаткаць не магу.

Знешне прыхаваны, бо за „жорсткай рамансавасцю“ вымалёўваецца і сацыяльнасць, калі паэт згадвае тых, у каго „у змаганні за хлебам адцвітае жыццё і вясна“. А гэта ўжо — „кабацкі“ Ясенін:

Маркітанка, песня ты ці казка,
Ці прыгожай радасці прыбой...

У творчым наследаванні традыцый цудоўнага паэта, зразумела, нічога благога няма. Але рэч у тым, што В.Маракоў нярэдка страчваў меру. Праўда, гэта не адсутнасць належнага мастацкага густу, а вынік маладосці аўтара, калі хочацца абавязкова звярнуць на сябе ўвагу. Былі ў творчасці В.Маракова і іншыя выдаткі — празмерная прывязанасць да будняў. Але ў гэтым не яго віна. Як і іншыя паэты, ён, кажучы словамі У. Маякоўскага, нярэдка мусіў „наступаць на горла ўласнай песні“. Дарэчы, і пад Маякоўскага таксама пісаў. Гэта адчуваецца ў кнізе „Права на зброю“, у якой асабліва моцныя сацыяльныя матывы:

Чалавек —
гэта вам не мумія, —
ўзяў са склепа і выштурхнуў
вон.
Чалавек —
гэта сад
з залатымі думамі,
дзе па жылах праходзіць

блакітны агонь.

Інтанацыя ўзмацняецца, набываючы ўсё больш выкрывальны пафас, дае знаць пра сябе нават „ворагаманія“.

Без перабольшання: у тым, што В.Маракоў так часта кідаўся ў крайнасці — то сентыментальная рамансавасць, то паэтычныя агіткі, часам пазбаўленыя паэзіі — немалая віна і тагачаснай крытыкі. Яна ж, аддамо ёй належнае, пастаянна трымала яго ў полі свайго зроку. Іншая справа, на *што* і *як* арыентавала. Асабліва перапала В.Маракову ад Міхася Клімковіча, які тады быў старшынёй арганізацыйнага камітэта па стварэнні Саюза пісьменнікаў, а гэта значыць, што яго выступленне трэба было разглядаць не толькі як асабістае меркаванне старэйшага таварыша, а ў пэўнай ступені — і як афіцыйную думку. Дарэчы, рэцэнзія М.Клімковіча „Пра кніжку В.Маракова „Права на зброю“ з'явілася ў газеце „Літаратура і мастацтва“ (№2 за 12 студзеня 1934 года) невыпадкова. У гэтым жа нумары была змешчана „Пастанова аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б па выніках і бліжэйшых задачах правядзення ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР“, у 8-м раздзеле якой канстатавалася: „Пры значным росце беларускай савецкай літаратуры і мастацтва і пісьменніцкіх кадраў на гэтым фронце асабліва выразна выявіўся ўплыў буржуазна-нацыянальных элементаў і іх агентуры ў партыйных радах“. Гэтым жа духам прасякнуты і перадавы артыкул — „Праграма бальшавіцкай работы“. Чаго вартае хаця б яго завяршэнне: „Гістарычная пастанова пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б па нацпытанні з'яўляецца праграмай бальшавісцкай работы, якая будзе ажыццёўлена рабочым класам і працоўнымі БССР пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з лепшым сталінцам тав. ГІКАЛА“. Зноў-такі, у гэтым нумары апублікаваны і артыкул Я.Бранштэйна „Узмоцнім

пільнасць на фронце мастацкай змены“.

Няцяжка здагадацца, наколькі небяспечным было ўсё гэта для далейшага лёсу В.Маракова. Паэт спрабуе хоць неяк рэабілітавацца. Толькі так можна вытлумачыць яго верш „Слава Беларускай Савецкай рэспубліцы“. Красамоўны эпіграф да твора: „Асабліва вялікія дасягненні мы адзначаем за апошнія два гады пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, на чале якога стаіць моцны бальшавік тав. Гікала“ (з даклада В. Шаранговіча на XV з’ездзе КП(б)Б). Яшчэ больш красамоўная канцоўка твора:

...Мы шлем прывітанне
найвысшай ясноты
Ўсяму бальшавіцкаму
штабу зямлі,
Бо партыя Леніна нас гартавала,
Растуць і шчыльнеюць нашы рады.
Так вучыць, вядзе нас таварыш Гікала,
І Сталіна поступ — шлях нашай хады.

Як бачым, В.Маракоў пачынае славіць Сталіна, хоць дагэтуль, будзем справядлівыя, падобнае за ім не вельмі назіралася. Ды, калі махавік праследаванняў быў запушчаны, нішто яго ўжо не магло ўратаваць. Праз тры гады паэта арыштавалі. Ён паўтарыў лёс дзесяткаў сваіх калег па пяру і соцень, тысяч сумленных людзей, якіх зрабілі „ворагамі народа“. Абвінавачаны „ва ўдзеле ў контррэвалюцыйных нацыяналістычных арганізацыях“, нягледзячы на жорсткія фізічныя катаванні, трымаўся ён мужна, не паддаючыся ні на якія правакацыі. Больш за тое — не ішоў ні на якія ўступкі следчым, катэгарычна адмаўляўся прызнаць сябе „ворагам народа“. Усе пратаколы нязменна заканчваліся аднымі і тымі ж словамі: „Абвінавачаны вінаватым сябе не прызнаў“.

Чаго гэта каштавала яму, можна толькі здагадвацца. Вядома, што нават знакамітыя рэвалюцыянеры, якія з гонарам прайшлі праз царскія турмы і жандарскія засценкі, не вытрымлівалі, калі траплялі ў шасцяронкі сталінскай машыны.

Пасяджэнне ваеннай калегіі Вярхоўнага суда БССР, што вырашала лёс В.Маракова і яго сяброў па няшчасці, працягвалася ўсяго 15 хвілін. Праз дзень — 29 кастрычніка 1937 года — прысуд быў прыведзены ў выкананне: паэта расстралялі.

Паэзія В.Маракова на фоне дасягненняў дваццатых–трыццатых гадоў, не кажучы аб набытках апошняга часу, выглядае крыху сціплай і як бы нейкай „сарамлівай“. Але гэта тая сціпласць і тая „сарамлівасць“, якія сведчаць аб значнай духоўнай напоўненасці лепшых радкоў, іх эмацыянальнай узрушанасці. Лепшае з напісанага В.Мараковым не можа не быць дарагім кожнаму, хто па-сапраўднаму любіць роднае слова і беларускую паэзію.

Акідваючы позіркам яго шлях, згадваючы імёны іншых паэтаў, празаікаў, якія развіталіся з творчасцю і жыццём у маладым узросце, не пакідаю спадзявання, што калі-небудзь усё ж настане час і мы зажывём лепш. Тады абавязкова трэба будзе падумаць, каб выпускаць крытыка-бібліяграфічныя нарысы — невялікія аб’ёмам, у некалькі ўлікова-выдавецкіх аркушаў — пра тых, перад кім усе мы ў неаплатным даўгу. Веру, што кніжка пра В.Маракова з’явіцца адной з першых.

**Алесь БЕЛЬСКІ**

# „НЕ ХАЧУ ТАК РАНА Ў ПЕСНЯХ ДАГАРАЦЬ!..“

Паэтычныя зборнікі, выдадзеныя ў 20-я гады на той час яшчэ маладымі аўтарамі, бяру ў рукі з хваляваннем. Адчуваю, здаецца, той прыўзнята-святочны настрой, што напоўніў і акрыліў істоту Валеры Маракова ў яго семнаццаць гадоў, калі была надрукавана ўласная кніжка вершаў паэта „Пялёсткі“ (1926). Яшчэ нядаўні дэбютант, які досыць прыкметна заявіў пра сябе на старонках перыёдыкі (фактычна на працягу аднаго 1925 года!), ужо ў 1926 годзе апынуўся ў шэрагах літаб’яднання „Маладняк“ і ўслед за сваім „паэтычным першынцам“ падрыхтаваў новы зборнік вершаў „На залатым пакосе“ (пра гэта паведаміла „Хроніка беларускае культуры“ ў часопісе „Полымя“ за 1926 год, № 8). Якая зайздросная творчая актыўнасць, якія мэтанакіраванасць і прага сягнуць у вышыні роднай літаратуры!

Адгортваю „Пялёсткі“. Перад гэтым міжволі адзначаю, што на вокладцы зборніка — больш зялёнага колеру. А на першай старонцы з чорна-белага фотаздымка пазірае прыгожы, з вытанчанымі рысамі юначы твар, які нагадвае Сяргея Ясеніна. І гэта падабенства не толькі вонкавае, бо Ясенін быў адным з літаратурных куміраў Валеры Маракова, паэтам унутрана сугучным яму і блізкім сваім лірычным светаадчуваннем. Прасветлены, задуменны позірк яшчэ „зялёнага“ хлопца абуджае вобразныя асацыяцыі — перад намі, кажучы словамі самога паэта, „месяцюнак“.

Паэзія В. Маракова 20-х гадоў па-маладому лету-

ценная, поўная „сонца і вясны, духоўнага прастору і песеннага лірызму. Яго абвостраны зрок, разняволенае сэрцабіццё нараджалі па-мастацку адметную вобразнасць, багатую пачуццёвую палітру, яркі лексічны склад верша. Лірыка В. Маракова несла ў сабе суб'ектыўна-асабовы пачатак, які грунтаваўся на прыхільнасці да імажынісцкай эстэтыкі слова. Ён імкнуўся да маляўнічай яркасці і эфектнасці паэтычнага вобраза:

І так пішу...
І зноў пішу з натхненнем —
Твой васілёк перада мной ляжыць.
А за вакном снуюцца і танцуюць цені,
Упаў срабрысты месяц на калені,
Стаў цалаваць магільныя крыжы.

У гэтых радках з верша „Дзяўчыне“ звяртаюць на сябе ўвагу аўтарская культура рыфмы, меладычная інструментоўка фразы. Твор напісаны „з... верай у шчасце і каханне“.

Літаратурная крытыка 20-х гадоў і пазнейшага часу нямала гаварыла пра святочна-ўрачысты пафас паэзіі ранняга В. Маракова. І сапраўды — у шматлікіх вершах паэтава сэрца і сама прырода, якую ён апявае, „звоніць песняй вясновых надзей“ („Эх ты, поле! Шырокае поле...“). У вершы „Белае зімняе поле...“ аўтар кажа, што ён „сам малады, як вясна“, і ўсклікае: „...Радасна-сонечных гоняў // Ў сэрцы не змоўкне струна!“. Як і Кузьму Чорнага ў апавяданнях, рамане „Зямля“, яго клічуць і вабяць раздолле, незамглёнасць даляглядаў — „шыр палёў“, „залаты прастор“, „шыр-прастор... зямлі“, „вольная сінь“...

Паэзія В. Маракова была адраджэнска-патрыятычнай па сваім духу, не бяздумна-бадзёрай, як нярэдка вершатворчасць маладнякоўцаў — „дзяцей


446

рэвалюцыі“. Паэт успрымаў родны край як свята вясновага адраджэння і квітнення: „Хай цвіце Айчына // На прасторах сініх, // Дзе агнём палае прозалацьзара...“ („Зноў прыйшла, прыйшла ты...“//). Яго сэрца было ахоплена высакароднай мэтай — „песняй радасці і волі // Праслáвіць свету Беларусь“ („Цяпер ў грудзях другія словы...“). У шчасці і радасці паэт хацеў бачыць не нейкую прывідную, эфемерную краіну, а свой родны край, авеяны патрыятычнай легендай Кастуся Каліноўскага, славай продкаў. Герой В. Маракова паўстае як вартавы Айчыны-Беларусі, яе верны сын. У вершы „Чуеш, Беларусь?“ паэт думае-разважае пра лёс Беларусі ў перыяд імклівай перабудовы і абнаўлення рэчаіснасці, ён з імем Каліноўскага кліча яе да высокага быційнага сэнсу і годнага самасцвярджэння:

О Беларусь! Ці чуеш ты, ці чуеш?
Твой лепшы сын распяты за цябе,
Няўжо ў грудзях тваіх начуе
Яго вялікіх дум разбег?
О, мабыць, не!

Такім чынам, творчасць В. Маракова 20-х гадоў прасякнута маладым адраджэнскім настроем, свабодалюбствам, пачуццём палкай любові да жыцця, хараства і роднага краю.

Яго паэзія прыкметна ўвасобіла дух часу, агульную тэндэнцыю аптымізацыі і рамантычнай ідылічнасці ў адлюстраванні жыцця і свету; тым не менш было б няправільна і бессэнсоўна адносіць яе да так званага „пралетарскага мастацтва“, літаратуры рэвалюцыйнага змагання. У 20-я гады В. Маракоў не прымаў ідэалагічнай установкі на класавае супрацьстаянне і адведзенай паэзіі ролі „штыка і бізуна“ (выраз У. Маякоўскага). Калі змест яго паэзіі вызначаўся

„героікай рэвалюцыі“, як сцвярджае І. Чыгрын (Беларускія пісьменнікі: У 6 т. Т. 4. Мн., 1994. С. 209), то ён упісваўся б у сістэму тагачасных ідэалагічных ацэнак. Аднак паэт быў далёкі ад пустапарожняга грукату рыфмаў і адычных прамоў, павярхоўна-прымітыўнага канфармізму. Ён імкнуўсz заставацца самім сабой і не здраджваць эстэтычнай сутнасці мастацтва. У такіх паэтаў, як В. Маракоў, былі суровыя і пільныя суддзі — крытыкі, якія ацэньвалі мастацкую творчасць з пазіцыі „ідэалагічнай вытрыманасці“, яе грамадска-палітычнага прызначэння. Крытык Антон Адамовіч, рэцэнзуючы зборнік „Пялёсткі“, патрабаваў ад маладога на той час паэта Маракова ўвасабляць „грамадскасць“, абвінавачваў яго ў дэкадэнцтве — упадніцтве, хваравітым песімізме. „А дзе ж грамадскасць?“ — пытаў гэты крытык са старонак часопіса „Чырвоны сейбіт“ і, у прыватнасці, пісаў: „Першае, што здзіўляе нас у зборнічку (і ў чым крыецца прычына ўпадніцтва), — гэта поўная, блізкая адсутнасць грамадскіх матываў. Ён адарваны ад грамадства, і калі і імкнецца, дык да другога, такога самага, як ён, чалавека, каб разам з ім уцячы да прыроды“. Крытык не разумеў уцёкаў на прыроднае ўлонне паэта, які жадаў „піць прыгажосць сонца і вясны“ і збіраўся „для кветак у полі… пець…“. Гэткія намеры раздражнялі аўтара рэцэнзіі, бачыліся яму з’явай антыграмадскай. Крытык адмаўляў паэзію „чыстай красы“, бачыў у ёй небяспеку і павучаў, як трэба пісаць, нагадваючы ленінскае выказванне пра тое, што „адарваным ад грамадства… быць нельга“.

Ды і пазней В. Маракова абвінавачвалі, што ён „упадае… у містыку“, „яшчэ не ў разгары жыцця“ (Антон Адамовіч), яго разам з Паўлюком Трусам, Язэпам Пушчам, Тодарам Кляшторным, Сяргеем Дарожным залічвалі да паэтаў „пяшчотных струн, ледзяных гітар, пярыннага блажэнства і літаратурнай


448

пустазвоніцы“ (Паўлюк Шукайла), ад яго патрабавалі „карэннай, арганічнай пераробкі свайго нутра, сваёй сацыяльнай прыроды ў адпаведнасці з задачамі рабочага класа“ (Уладзімір Сядура). Апошні ў 1931 годзе на старонках часопіса „Маладняк“ выносіў паэту фактычна ідэалагічна-класавы прысуд: „...У глыбока песімістычнай „Маёй паэме“ — адрыў ад здаровага творчага жыцця і ўцяканне ў нетры багемы дасягнулі таго пункту развіцця, калі пытанне — ці разам з пралетарыямі, ці супраць іх (сярэдзіны не павінна быць) — у сваім выражэнні давала — супраць“. Так даўся ў знакі ўдзел В. Маракова ў ТАВІЗе — „Таварыстве аматараў выпіць і закусіць“, якое аб’ядноўвала сталічную літаратурную багему. Гэта была своеасаблівая маладзёвая літтусоўка, што ўзнікла як пратэст супраць афіцыёзу, як, па словах Юркі Віцьбіча, апазіцыя „пісьменніцкаму калгасу“, непрыманне творчай моладдзю „існуючага пракруставага ложа“. Таму, як сведчыць Юрка Віцьбіч, менавіта „на пасzдж”ннях багемы без старшыні і сакратара за кухлем ці кілішкам чыталіся творы, якія пісалі для сябе, а не для друку. Тут кожны адчуваў сябе самім сабой, тут скідваліся тыя „маскі“, пра якія прыгадваў Язэп Пушча“. Залічэнне да „п’янай багемы“, „адарванасць ад грамадства“, „лінія ўпад-ніцтва“ напрамую звязваліся крытыкамі-аглабельшчыкамі з прыналежнасцю да буржуазнага нацыяналізму.

Савецкі паэт павінен быў увасабляць калектывісцкія пачуцці, пралетарска-класавыя погляды, ідэалогія аўтаматычна пазбаўляла яго права маркоціцца, спяваць тужлівыя элегіі, быць у глыбокім одуме, рэфлексійным стане, тым больш — у меланхоліі і бязвер’і. Нягледзячы на тое, што ў паэзіі В. Маракова, кажучы словамі А. Блока, „звенят ручьи... стихов“, разам з тым у многіх яго строфах выяўляецца элегізм, лірыка-псіхалагічны рух пачуцця. Паэтава

сэрца працінаюць трывожныя прадчуванні, яго вершапіс становіцца люстэркам унутранага „я“:

Я стаміўся, прыціх, я не знаю:
Недзе вецер спраўляе магільны разгул,
І так хочацца зноў упівацца далёкім,
І ў азёрах душы захаваць чорнай восень.
*(„Мая паэма“)*

Вульгарна-дагматычная крытыка не шкадавала песняра смутку, таптала яго душу і годнасць. Літаратурныя наглядчыкі імкнуліся перакаваць лірычны талент В. Маракова, а ён з цяжкасцю паддаваўся гэтаму маральнаму садызму і гвалту — клапаціўся пра жыццёва-чалавечае напаўненне паэзіі, эстэтычную насычанасць вобраза, яго арыгінальнасць. Таму на пачатку 30-х і ў наступныя гады В. Маракова крытыкі і пісьменнікі бязлітасна шальмавалі, цкавалі, судзілі ў духу таго крывавага сталінскага часу. „...У гады актывізацыі нацдэмаўскіх пісьменнікаў Валер Маракоў падпаў пад досыць значны ўплыў гэтых пісьменнікаў“, — пісаў у „ЛіМе“ за 26 лістапада 1933 года Саламон Левін. У студзені наступнага года Міхась Клімковіч вылучыў „асноўныя памылкі палітычнага парадку“ ў творах Маракова: „прапаганда буржуазнай тэорыі надкласавага мастацтва“; „сцверджанне „права“ паэта стаяць у баку ад практыкі сацыялістычнага будаўніцтва“; „няправільнае, скажонае адлюстраванне нашай рэчаіснасці, няправільныя рэцэпты выпраўлення недахопаў“; „пасіўная роля наглядальніка прыводзіць паэта да хворага песімізму“. Выснова Клімковіча, які выступіў у ролі класавага суддзі, была сапраўды жорсткая і безапеляцыйная: „Маракоў не зразумеў таго, што надкласавая паэзія — гэта паэзія надпралетарская, буржуазная“.


450

У 1935 годзе М. Клімковіч як старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР падпісаў характарыстыку, у якой гаварылася пра паэтавы „грахі“: „мещанское воспевание любви“, „неудовлетворенность проводимой партией национальной политикой“. Адзначалася, што „он начал опевать богему, по-кулацки показывать наши заводы, нашу действительность“ і г. д. Арыштаванаму паэту на допытах прад’яўляліся абвінавачванні ў антысаветчыне, контррэвалюцыйных закліках, нацдэмаўшчыне, варожасці пралетарскаму мастацтву. І неймаверна балюча, нясцерпна крыўдна было ведаць і чуць, што палітычны прысуд вынес той, каго лічыў некалі сябрам, — Алесь Кучар, які па даручэнні Саюза пісьменнікаў у 1935 годзе напісаў характарыстыку, а фактычна данос „О творчестве Валерия Морякова“ (гл. падрабязней: Маракоў Л. Валеры Маракоў: Лёс, хроніка, кантэкст. Мн., 1999. С. 102-142). Хто-хто, а Алесь Кучар разбіраўся ў паэзіі, эстэтычна пранікліва прааналізаваў творчасць паэта ў артыкуле „Літаратурны партрэт Валерыя Маракова“ яшчэ ў 1929 г. Тады ён не быў адданым служкам сталінскай сістэмы, умеў чытаць паэзію з адкрытым сэрцам, таму цудоўна раскрыў непаўторнасць і багацце лірычнага свету свайго сябра, асаблівасці яго індывідуальнасці. Гэта ён, Алесь Кучар, гаварыў пра В. Маракова як пра паэта эмацыйна чуйнага, некан’юнктурнага і псіхалагічна скіраванага ў сваёй творчасці: „Адносна сучаснага літаратурнага жыцця і пралетарскае літаратуры яго абурае тое, што некаторыя людзі ўзводзяць у фетыш машыну. Другія ж нават думаюць пісаць вершы машынам... „Я ж,— кажа Валеры, — буду пісаць свае вершы не для машын, а для людзей“. Божа мой, якую ж вялікую ўнутраную драму зведаў паэт, калі яго душу і цела дапамагалі ўкрыжоўваць браты-адзінакроўцы з пісьменніцкай сям’і! Ён, блакітнавокі, надзвычай

далікатны і інтэлігентны беларускі паэт, хацеў толькі аднаго — быць самім сабой, свабоднай творчай натурай, а яго бязлітасна мералі меркай грамадскай, пралетарска-ідэалагічнай. „Чалавек — гэта вам не мумія“, „чалавек — гэта сад з залатымі думамі...“ — даводзіў паэт таталітарнаму грамадству, якое асудзіла яго на пакуты і смерць.

Валеры Маракоў быў творца, які выказваўся, захоўваючы пачуццё ўласнага „я“, ён даволі доўгі час заставаўся непадлеглым прымітыўнаму фальшу і дэмагогіі, жорсткай рэгламентацыі. Яго „сэрца... запаланела“ ідэаламі вечнай і неўвядальнай красы, ён як і М. Багдановіч, марыў пра зямную асалоду быцця на зямлі, той „шчаслівы рай“, што дорацць чалавеку гармонія свету, прырода і каханне. Пошукі красы былі духоўным узвышэннем паэта і ўсёй тагачаснай паэзіі 20-х — пачатку 30-х гг. Адчуваць прыгожае, эстэтычную каштоўнасць усяго існага заклікаў яшчэ Вацлаў Ластоўскі ў знакамітым артыкуле „Сплачывайце доўг“ (1913). В. Маракова не захаплялі ідэя глабальнай рэвалюцыі і заклікі да класавага змагання. У гэтай сувязі прыгадваюцца развагі пісьменніка Васіля Быкава пра свабоду творчай асобы: „Але ці дужа якая ідэя патрэбна творцу, калі ягоная душа ўжо захоплена ідэяй іншага кшталту, ідэяй праўды і прыгажосці? Іншаму там месца няма, і ён індывідуаліст; усё значнае ў мастацтве спрадвеку ствараецца на грунце індывідуалізму. Спробы заангажаванай мастацкай творчасці, тым больш літаратурнай, заўсёды сканчаліся фіяска і пакінулі кепскую памяць пра сябе“. В. Маракоў нават тады, калі пісаў на грамадскія тэмы, хваляваўся пра сапраўднае і вечнае на зямлі, пра чалавека, нават думаў пра „камунізм і вясну, не скаваныя лёдам“:

Любоў і паэзія
йдуць праз вякі,


452

праз краты улад
і кароны цароў...
*(„Дарогаю да чырвонай сталіцы“)*

Сталінская ідэалогія, праўда, рабіла сваю справу, чыніла дыктат ды маральна-псіхалагічны рэкет — таму і выпатрабавала пад страхам фізічнай расправы пафасна-рытарычныя творы пра Леніна і небывалы размах сацыялістычнага будаўніцтва, „горад-сад сусветны — ... СССР“, чырвоны сцяг і творы на іншыя ідэйна значныя тэмы савецкага гатунку (зборнік „Права на зброю“, 1933). Беларускі паэт, які „касіў“ пад Маякоўскага, усё ж не мог забыць, што ён лірык, які выракаецца свайго „я“, ён памятаў пра мастацкую кволасць і фальш Купалавай паэмы „Над ракой Арэсай“, Коласавы „дрындушкі“ — вершы-адна-дзёнкі пра савецкія дасягненні і святы. У гэтых умовах творчай несвабоды і змушанага канфармізму нарадзілася прадчуванне ўласнай бяды:

... й за гэты край
вясной вялікай,
быць можа,
знімуць галаву,
праколюць цела
вострай пікай.
*(„Жыццё, як мора-акіян“)*

Трагічнае гэтае прароцтва з’явілася не адразу. Ужо ў творчасці В. Маракова другой паловы 20-х гадоў побач з мажорам суіснуе мінор, поруч з аптымізмам гучаць матывы смутку і жалю, узнікаюць сімвалы нябыту: „А мне сніўся выстрал, цёмныя крыжы“ („Сястры Ніне“); „Ах, мой край каханы, залаты мой край, // Не хачу так рана ў песнях дагараць!“ („Жаданне“). „Я сэрца з грудзей вырываў...“ — так выказваў паэт свой унутраны разлад.

І, можа, асабліва трагедыйна паўстае вобраз Маракова-паэта, калі ўсведамляеш, што ён быў адным з цудоўных песняроў кахання, выдатным лірыкам рамантычнага светаадчування, які незвычайна тонка перадаваў прыгожыя чалавечыя пачуцці і шчырыя хваляванні сэрца. Ён у 20-я гады аддаваў перавагу не грамадскім эмоцыям, а асабіста-інтымным пачуццям, і тым самым паглыбляў лірыка-псіхалагічныя асновы беларускай паэзіі. У лірыцы кахання В. Маракова выразны настраёвы пачатак, вельмі яркія тропы, але самае галоўнае — ён непасрэдны і адкрыты ў выказванні інтымнага:

… Каб хто-небудзь блізкі і каханы
Ў вусны мне і ў грудзі цалаваў
І ў сваім апошнім развітанні
Ўсю душу, ўсё сэрца аддаваў.
*(„Маркітанка цыгарэт“)*

Паэт-лірык вылівае з сэрца радасць, сум, выяўляе іншыя фарбы і адценні ўнутранага свету. Пры гэтым у паэтыцы яго твораў назіраецца цяга да прачулай меладычнасці радка, пачуццёвага дынамізму, арыгінальнай метафарычнасці:

А ў бяздонні воч тваіх азёрных
Вольным морам плакала зара.
*(„Помніш ты, быў ціхі-ціхі вечар...“)*

Шэраг твораў пра каханне напісаны з эратычнасцю пачуццяў — і тады ў вершах тыпу „З белых начэй“ выяўляюцца, як і ў „кабацкай“ паэзіі С. Ясеніна, нястрымныя маладыя жаданні, памкненні, імпэтны „разгул“ душы. І ўсё ж паэзія кахання В.Маракова — „пачуццяў дзіўны сад“, вясновая краіна салодкіх летуценняў.

Наогул вершы паэта — гэта штосьці незвычайнае,


454

сапраўды нечаканае, каларытны жывапіс слоўнымі фарбамі:

Толькі раніцай сонца як гляне
І расою заплача трава —
Устае ў русакудрым тумане
Залацістых нябёс сінява.
*(„Толькі раніцай сонца як гляне...“)*

Паэзія В. Маракова настоеная на сіні нябёсаў, пералівах сонечнай зары, водары кветак, напоўненая ціхай музыкай і жывымі фарбамі навакольнага свету. У творчасці паэта вяла эмоцыя светлых трапяткіх адчуванняў, ён выяўляў імпульсы душы, яе нябачны „нерв“ трывогі. Ён ведаў, што значыць „зубамі каменне ламаць“, перажываў агрэсіўнасць навакольнай рэчаіснасці, але не дакор і праклёны вымаўляў са сваіх грудзей, а складаў прачулую жыццялюбную песню, па-хрысціянску імкнуўся „за ўсё дабром плаціць“. Чорны віхор забраў паэтава жыццё, але агонь яго шчырых песень не згас і не сатлеў у часе, ён здольны і сёння сагрэць чалавечае сэрца.

**Сяргей ВЕРАЦІЛА**

# СТРАХ НАРАДЖАЕЦЦА НА ЎСКРАЙКУ ДНЯ

Час, калі асабістае прызнанне ставалася доказам віны, час, калі нявінных не было, прынамсі не магло быць, час, калі на краіну абрынулася не сем, не дзевяць, а семдзесят дзевяць бедаў, і ўсе яны былі чужыя, і ўсе яны былі ад злыдня. Але селянін выходзіў на атаву з касою, з плугам на раллю, і не перапынялася адвечная хада жыцця, бо каб нешта дзяліць, гэтае нешта павінна быць, а значыцца — тое нешта трэба ствараць кожны дзень, з дня ў дзень. І не змянялася змена пораў года: за вясною, як і належыць, наступала лета, і так кола за колам. І кола лёсу круцілася, заведзенае ў далёкім мінулым, і з гэтага мінулага да горла, да сэрца, да вачэй падступаюць ягоныя нязжытыя прывіды. Хочацца махнуць на іх рукой, плюнуць праз левае плячо, пастукаць аб дрэва, хочацца перажагнацца, але не злятаюць словы малітвы з перасмяглых вуснаў. Час, як выпітая атрута. Час разбітых лёсаў і час ускрыленых надзей. Час, калі слова прамаўлялася так лёгка, а плацілі за яго так цяжка. Але словаў вымагалі, і паэты не маглі маўчаць. А кола лёсу ўсё круціцца і круціцца, і адчуванне такое, што хада яго паскорылася, што падзеі спрасаваліся ў кароткі адрэзак часу. Але гэта зманліва і не праўдзіва. Гэта проста вецер скуголіць згаладалым ваўком, носячыся сярод пустэльні і маўчання, бо словы даўно сказаны, бо словы даўно забаронены. Дазволены толькі гукі.


456

Іх вымагаюць ад паэтаў. А вось там на крыле лёсу, бачыце, той, хто быў уверсе, ляціць уніз, лямантуе, бразгоча, чапляецца рукамі за спіцы. Не хоча, гад, падаць. Падпіхнем яго. А ён і нас за сабою цягне. З пекла ў пекла. З лядоўні ў печ. І ні следу, ні знаку, і ні знаку, ні следу. І нат сляза забаронена. Сляза на твары Жалезнага.

І толькі араты выходзіць у поле, бо і жалезныя прагнуць хлеба, а таго, што да хлеба, прагнуць яшчэ больш. „У бой, маладая гвардыя рабочых і сялян!“ „І вечны бой...“. І бухае вецер дзвярыма разбураных храмаў. І няма слоў, а ёсць толькі гукі. Гукі па жывым разадраных горлаў. Падаюць, як жоўтае лісце, бедныя канарэйкі. Ім зварочваюць галовы за іхнія спевы. Бо тыя спевы — ад слязы, ад рабінавай ночы, ад пачуцця, што дзень назаўсёды пражыты, і пражыты ён неяк не так...

„Калі б паэты кіравалі светам!“ — што хацеў сказаць Англічанін? Яго анёл крануў Словам, а ўлады не даверыў. А паэты выходзілі на газетныя прасторы і забівалі іншых паэтаў. Забівалі насмерць, узапраўду. Забівалі Словам. Яно, Слова, сталася памагатым — таварышам нагану, маўзеру, „максіму“, параходу, паравозу і самавару. А Душа? — Бедная вандроўніца, мятлушка. Не загартуешся, не станеш сталлю, а проста згарыш. Але вось падаюць тыя, хто стаяў на трыбунах, а месца займаюць адразу, бо там чарнеюць натоўпамі тыя, хто думае, што Слова — гэта так, гэта кожнаму па плячы, гэта ж не мяхі цягаць. А Бога ўжо нібыта і няма, і сонца абагравае змарнелыя твары партрэтам Бацькі Народаў, і сонміскам „анёлаў“ ля яго — людзі іншай пароды: асабісты, гэбісты,

энкавэдысты, ваўкі з жалезнымі зубамі. Прыходзяць уначы, цягнуць у норы, у пячоры свае. Ведаюць адно: ворагу — смерць! І патрабуюць: „Прызнайся!“

Дзе ж схавалася ты, птушка па імені Літасць? У якіх землях і часінах твой спагадлівы палёт адкрывае сэрцы? Там Бог не спазнаны, а тут Бог забыты. А з рогу — усяго многа. Хто сумняваецца. А ты прызнайся, прызнайся! Рэвалюцыйная дысцыпліна і пралетарская гуманнасць. А, можа, наадварот? Можа, я ізноў усё паблытаў? Можа, і не сніла мая краіна тых крывавых прывідаў, а ўсё гэта адбылося не са мною, не з табою, не з намі, і не адбылося, а так прымроілася, як мроіцца ў запоі?

Што думалася яму перад расстрэлам? Што ўзгадвала ягоная памяць? І ці спрабавала сэрца пакласці малітву на сасмяглыя вусны? І ці сумавала ў той кастрычніцкі дзень прырода? Можа, світанак спазняўся і спазняўся, каб хоць неяк, хоць як адцягнуць тую хвіліну, калі да халоднага муру, босых, у бедных кашулях, іх паставяць і выдадуць ім свінцовы паёк у сэрца, каб больш з разарванага горла не было ўжо ні слова, ні гуку, каб нават імя згінула і не парушылася Маўчанне.

Страх нараджаецца на ўскрайку дня, калі амаль ноч, калі амаль цемра, калі цені ваўкоў з жалезнымі зубамі напагатове прагнуць вырвацца з пячораў падсвядомасці. „Прызнайся!“ — закрычаць яны. А ён не прызнаўся і нікога не пацягнуў за сабою. Той час, калі асабістае прызнанне ставалася доказам віны. А ён так і не прызнаўся. Малады чалавек з блакітнымі вачыма. Ужо дванаццаць гадоў, як не мой равеснік. Ты, у імені якога было само жыццё.

І не такія ламаліся. А вось такі не зламаўся і не

сагнуўся. Яго раструшчылі без жалю, як бот дзікуна трушчыць тэракотавы кубак, поўны амброзіі, бо барбару патрэбна скіслае піва, бо барбару трэба сталь на мячы, бо барбару патрэбны маршы. Але гліна, з якое быў зроблены кубак, ёсць сама зямлёю, а таму яна вечная. А таму, пакуль круціцца ганчарны круг, то рукі, умелыя, мудрыя, чуйныя рукі зробяць новы кубак. Толькі ці ягонае гучанне паўторыць тое — непаўторнае? Вось дзе і ўзнікае туга.

**Мікола МІШЧАНЧУК**

# „ПЫРСНУЦЬ СМЕХАМ ЛІЛЕІ Ў ТУМАНЕ НАД ЖАЛЕЗНЫМ ПАХОДАМ ВЯКОЎ...“

Радкі належаць Валерыю Маракову — аднаму з тых, хто ў даваенны час „цаглінка да цаглінкі“ ствараў будынак мастацтва, раскалыханага званамі трывожнага ХХ стагоддзя, захоплены водбліскамі вогнішчаў ад спаленых „босымі“ палацаў. Апантанасць, святочна-ўрачысты настрой, „бурапеннасць“ (формула, развітая і падрабязна расшыфраваная яшчэ на пачатку 60-х гадоў ужо мінулага ХХ стагоддзя Нілам Гілевічам), вера ў чырвоныя сцягі, будучыню... Дзеля гэтага хацелася жыць. На гэта настройвалася ліра ў многіх. І ў тым ліку — у студэнта літаратурна-лінгвістычнага аддзялення філалагічнага факультэта Беларускага педінстытута Валерыя Маракова:

Сэрца не лёд і не камень,
Ў ім не стрымаеш ты кліч,
Кліч маладога жадання
Вольных прастораў зямлі.

Выразныя „радасна-святочныя“ вобразы ствараюць уражанне: перад намі — лірыка тыповага энтузі-яста даваеннай пары, які ўсім сэрцам прымае змены ў жыцці, стварае оды сацыялістычнаму будаўніцтву, пераадольваючы такі натуральны для кожнага чалавека, нават маладога ўзросту, настрой расчаравання і тугі. Як бы пераадольваючы, перасільваючы нешта трывожнае ў душы, ён прыходзіць да аптымістычнай высновы ў вершы „Ёсць лепшы свет...“ са зборніка


460

„Вяршыні жаданняў“ (1930): „Я знаю шчасце — верыць і змагацца,// Ісці, гарэць, ўпівацца барацьбой“. Трывога ў многіх паэтавых вершах адціскаецца на другі план часцей розумам, чым сэрцам. Сучасны чытач гэта адчувае. Радасць аўтара цудоўнага твора „Я ўспамінаю дні змагання…“, да прыкладу, суіснуе з павоем болю, „агонь тугі“ стрымліваецца паэтам свядома, „суму джала“ таксама свядома вырываецца з грудзей… дзеля „гордай веры ў перамогу“ і змагання. Верш заканчваецца радкамі, якія мусяць сцвердзіць агульную канцэпцыю „перабудовы“ паэта на карысць ідэалаў даваеннага часу:

І з гордай верай ў перамогу,
Згубіўшы дум сваіх
Крыжы,
Выходжу сам я на дарогу
Ісці, змагацца, верыць, жыць…

Можна спаслацца ў пацверджанне сказанага на творы „Два франты“, „Леніну“ і амаль усе напісаныя ў 30-я гады — „Дарогаю да чырвонай сталіцы“, „За тысячы новых тваіх Асінбудаў“, „Першы дзень на запалкавай фабрыцы“, „Майскім маршам“. Рытарычныя, „нарысавыя“, дакументальныя, рэпартажныя, яны, гэтыя творы, і блізка не стаяць з „паэзіяй сэрца“ — лірыкай. Як і многія іншыя аўтары, у атмасферы падазронасці і недаверу да самавыяўлення ў творчасці, патрабавання „радасных песень“ марнеў і згасаў талент Маракова. Твор „Майскім маршам“ заканчваецца радкамі, закліканымі засведчыць лаяльнасць паэта да ўлады, ідэалагічную „пільнасць“ і чысціню яго намераў: „Байцом паэтычнай, цяжкой эскадрыллі // Запісаны ў полк Акцябра“. Верш гэты быў напісаны ў 1934 годзе, за тры гады да расстрэлу. Сваімі радкамі ён перагукаецца з творамі П.Броўкі

— аўтара кнігі „Цэхавыя будні“, з вершамі на вытворчую тэматыку Аркадзя Куляшова, які ў імя перабудовы жыцця выносіць прысуд „трухляваму“ хутарскаму бытаванню. Сугучныя радкі знаходзім і ў тонкага лірыка Тодара Кляшторнага.

Ствараючы лірычны вобраз „сацыялістычных будняў“, Маракоў прытрымліваўся агульных установак, перасільваў, стрымліваў сябе, „станавіўся на горла ўласнай песні“. Але спынім ход нашых разважанняў у гэтым напрамку і звернемся да пачатку нашай размовы, да загалоўка артыкула, да твораў, якія па розных прычынах выпалі з поля зроку крытыкаў даваеннай пары і пазнейшага часу.

***

У 1-м нумары „Маладняка“ за 1932 год была надрукавана падборка вершаў В. Маракова „Новыя вершы“ з прысвячэннем: „Васілю Кавалю“. Яе склалі ўсяго два творы — трывожныя, нейкія „надламаныя“ паводле настрою элегіі. Пра паэтаў і паэзію, пра квітнеючы сад, дзень і жанчыну, „рана збітую горам“; хросную маці паэта — вернага сына Радзімы, дачку яе, што спявае свае радасныя, а не тужлівыя песні. Цесна і арганічна звязаны ў вершы радасць і сум, трывога, святочны настрой і боль расчаравання. Паэт спявае „праз сілу“, напружвае галасавыя звязкі, настройваецца на адычную хвалю. Яму так хочацца праспяваць оду новаму жыццю, ды раз за разам прарываецца іншае пачуццё — бяды, трывогі, балючага суму. Першая частка дыстыха заканчваецца радкамі пра драматычны, ледзь не прымусовы працэс развітання з мінулым, з песняй трывогі; сумоўцы — паэт і дзяўчына з квітнеючага саду — доўгім позіркам

праводзяць мінулае:

Мо’ заплачаш, мо’ так адыдзешся,
Ранне згасне, запаліцца дзень,
Над пражытым з журбой усміхнешся,
Не паверыш, што гэта не песня,
І назад будзеш доўга глядзець...

Звернем увагу на такую дэталь: дзеля перадачы трагедыйнасці развітання з мінулым паэт акаймоўвае апошні радок паўзамі, падкрэслівае гэта нават графічна — шматкроп’ямі на пісьме.

У вершы сутыкаюцца супярэчлівыя пачуцці, фарбы, гукі, тропы, міні-вобразы, адзнакі „чыстай красы“, як некалі гаварыў М. Багдановіч, і грамадзянская паэзія, традыцыйнае і наватарскае. Пануе трывожны настрой, спавіты квеценню пакінутага саду, упісаны ў кола рамантычных і імажыніснцкіх вобразаў тугі, вясны, згаслай лучыны, згасаючага дня, дагарэлай Зары (аўтар сам напісаў гэтае слова-сімвал з вялікай літары), „глухіх і надломаных песень“ і інш. „Фактура верша“ — яго вобразы-сімвалы — вынікае якраз з адчування разлому, пакутлівых пераменаў (параўнаўшы з адчуваннем радасці ў „вытворчых“ вершах, зробім выснову пра яе просталінейнае, рытарычнае раскрыццё), пацверджана самарухам унутранага пачуцця — ад аднаго вяршыннага пункта да другога, трэцяга — не менш выразных і псіхалагічна акцэнтаваных. Якое б ні было „спрошчванне“ вобразнасці, уласцівае паэзіі 30-х гадоў у цэлым, у вершы яно таксама адсутнічае. Вобразнасць яго шматслойная, сімвалы расшыфроўваюцца не адразу. Іх сэнсавая ўскладненасць — адзнака ў большай ступені імпрэсіяніснцкага і імажыніснцкага стыляў, чым рамантычнага. І падзелены яны як бы на дзве групы, акрэсленыя, вызначаныя радкамі чацвёртым

і пятым, вынесенымі намі ў загаловак артыкула. Прывядзем іх у кантэксце трох папярэдніх, каб зразумець, што за імі — аўтарская творчая ўстаноўка, яго эстэтычнае крэда:

Ты прыглядзіся да гэтага рання,
Зноў нахлыне у сэрца спакой.
І ўсё любым і радасным стане,
Пырснуць смехам лілеі ў тумане
Над жалезным паходам вякоў.

Чацвёрты і пяты радкі — своеасаблівы ключ да разгадкі прычын трагедыйнага зместу верша ў цэлым. У іх сышліся дзве пазіцыі мастака слова: пазіцыя ўдзельніка „жалезнага паходу вякоў“ (прыгадаем прароцтвы і выказванні яшчэ Баратынскага, а потым Блока пра тое, што век „шествует путем своим железным“) і пазіцыя песняра красы, незалежнага ад кан'юнктуры (жалезнай!) гістарычнага працэсу. Апошняя выразна акрэсліваецца ў вершы вобразам-сімвалам, магутнейшай мастацкай дэталлю — „смех лілеяў у тумане“. Менавіта лілеяў, а не пунсовай шыпшыны (Дубоўка), не шумлівага чароту (Міхась Чарот), не іншай кветкі ці расліны. Лілея — кветка, жыццё якой абумоўлена абставінамі выжывання ў рэзка абмежаваных умовах воднай прасторы. За гэтым вобразам праглядаецца ідэя ахвярнасці паэтавага лёсу, якая можа стацца явай у выніку адрыву ад роднай стыхіі. Жалезная хада вякоў згубна ўплывае на лёс паэзіі — „лілеі ў тумане“, смех якой чуецца мастаку смехам развітання, згасання ў страшэнных умовах часу. Два наступныя вобразы-сімвалы — Сад і Зара — таксама трагедыйныя ў кантэксце (і не толькі гэтага) твора. Сад застаецца ў мінулым, у выніку

абставінаў паэт выключаны з яго надоўга разам з каханай дзяўчынай, Зара дагарае, — так разбураецца падмурак дарагой і блізкай сэрцу паэта творчасці:

Дарагая мая,
Паглядзі, як над лесам
Дагарэла крывавай тканінай Зара, —
Гэта сімвал глухіх і надломаных песень,
Гэта сімвал любові
Й пачуццям пара.

Давяраць самаасуджэнню паэта за „глухія і надломаныя песні“ поўнасцю нельга. Нельга на сто працэнтаў верыць аўтару, які кліча каханую ісці далей, не спыняцца ў хадзе, згадвае песню інакшую. Усё роўна сэрца яго належыць песні іншай — трывогі, суму, жалю. Умовы 30-х гадоў прымушалі аўтара пісаць пра такі настрой іншасказальна, азіраючыся наўкол, ці не пільнуе крытык-аглабельшчык „сумныя радкі“, ці не сочыць ён пільна за ягоным настроем, паводзінамі. Грамадзянскія падзеі не згадваюцца ў творы пра паэта і паэзію, „перакрываюцца“ радкамі пра каханне:

Я багаты
І песняй сваёй, і юнацтвам.
Ў маёй хаце блакітны варушыцца свет...
Буду сёння над смерцю варожай смяяцца,
Бо інакшая песня да мэты заве.

. . . . . . . . . . . . . . .

Мы так доўга блукалі ў квітнеючым садзе,
Месяц ласкай сваёю лісты апаліў.
З доўгай русай касою і з болем у паглядзе,

Расказала ты мне пра любоў на зямлі.

Вось такі фінал: абстрактная сентэнцыя пра інакшую песню (за межамі саду, „блакітнага свету“, туманнай лілеі) выцясняецца рэальнай сітуацыяй — сустрэчай з каханай, з Каханнем, якому саступаюць месца і гэтая інакшая песня, і „жалезны паход вякоў“, на якім засяродзіўся позірк аўтара ў самым пачатку твора — трагедыйна-ўзнёслы, я сказаў бы, ахвярны. Паэт свядома падстаўляе сваю „выю“ пад серп бэндэўскай крытыкі, ставячы перамены ў жыцці не на першую пазіцыю, паглыбляючы трагедыйную аснову, зацямняючы сімволіку, выводзячы на першы план асабістае, суб’ектыўнае. Жалезны час толькі згадваецца. Яго абрысы цьмяныя і расплывістыя. Пазіцыя аўтара відавочная: не пра іх, а пра сад, мары, каханне, родны дом хочацца пісаць і выказвацца Маракову.

***

У першым вершы дыстыха Маракоў згадвае другое вымярэнне жыцця — гісторыка-адраджэнскае. Сімвалам адраджэння, вернасці Айчыне выступае Жанчына, маці-Беларусь, якая вітае паэта, „нібы сына“, ухваляе яго за тое, што ён не здрадзіў краю свайму, застаўся на пазіцыях праўды. Вобраз Жанчыны-маці „падмацоўваецца“ вобразам яе дачкі, што становіцца паэтавай каханкай. Эстафета перададзена з рук у рукі, старэйшымі — малодшым. Менавіта падобная змястоўнасць лірыкі Маракова нас павінна цікавіць у першую чаргу. На яе наслойваюцца і вобразы квітнеючага саду, раніцы, зары, блізкія „нашаніўскай“ пары, набываюць характар

той эстафетнасці, пра якую мы згадалі вышэй. Вобразнай сістэмай паэт акрэслівае і грамадзянскую пазіцыю не дэмана-руйнавальніка ўсяго мінулага, не ідалапаклонніка новага, выяўленага ў жорсткім трагедыйным пачатку, а стваральніка-адраджэнца, песняра вечнай прыгажосці і красы, здольнай існаваць на жалезнай ды крывавай аснове.

Валерый Маракоў — паэт „чыстай красы“, імажыніст, майстар вытанчаных вобразаў-„настрояў“. Нехта можа палічыць гэтыя вобразы імпрэсіяністычнымі і, можа, будзе мець большую рацыю. Важна тое, што паэт не абмяжоўваецца рэалістычнай „празрыстасцю“, чыстай „праўдападобнасцю“. Ён, як і Язэп Пушча, Тодар Кляшторны, Уладзімір Хадыка, выходзіць за межы праўдападобнага рэалістычнага мастацтва, спасцігае законы мадэрнісцкай творчасці. І ад гэтага цэласнасць яго светабачання не парушаецца: наадварот, яно робіцца больш гуманістычна скіраваным, чалавекалюбным. У 8-м нумары „Маладняка“ за 1928 год я з радасцю перачытаў верш-прысвячэнне „М. Дубовіку“ — паэту, якога не стала ў раннім веку. Гэтае пасланне — цэлая эстэтычная праграма мастацтва „чыстай красы“, недасяжнай вышыні:

А людзі горда йшлі
І горда рвалі кветкі.
Ўпівалі сонца,
Славілі вясну,
І іх надзей былі мы толькі сведкі,
Мы не маглі іх душ закованых
Крануць.

Ці не эстэтычная праграма: пісьменнік — не раб

абставінаў, не рэха падзей, а нешта большае — сведка трагічных падзей, бяссільны крануць чалавечыя душы-ільдзіны. Лепш было б — айсбергі. Адзінокі і горды, ён застаецца спадарожнікам усяго і ўсіх.

Верш „трымаецца“ на вобразах ясенінскага кшталту, нязвыклых для чалавечых зроку і слыху: блакітныя вочы жыцця, „сэрца раннія надломы“, „ільдзіна душ“, „душы закованыя“ і інш.

Памяць наша засяроджваецца і на радках перадапошняга катрэна, крыху супярэчлівых: паэт адначасова канстатуе, што не заве таго, што „адпалала“, і што „Лепш паміраць у росквіце надзей, // Чым несці крыўды горкай жала — //Чужых дарог,//Чужых людзей“. Супярэчлівасць здымаецца папярэднім аналізам дыстыха, зместу гэтага твора і інш. Думаецца, паэт сцвярджае ідэю нелагічнасці, неапраўданасці песень „пад дыктоўку“ пра чужыя яму падзеі і адчуванні. Падобны нігілізм — гэта нігілізм няскоранасці і вальнадумства, гэта сцвярджэнне права мастака быць падобным толькі на сябе.

Валерый Маракоў — пясняр надлому ў чалавечых душах перыяду „жалезных паходаў“, пясняр маркоты і жалю па зарытых гэтымі паходамі каштоўнасцях і — аўтар рэпартажаў пра „сацыялістычнае будаўніцтва“. Прымаючы яго такім неаднолькавым (двухаблічным — тут не тое слова), разнастайным, які знаходзіцца ў пошуку новых каштоўнасцяў і паклоне старым, аджылым, мы, бадай, і будзем найбольш аб’ектыўнымі і праўдзівымі:

Прайшлі жалезныя гады
І ўскаланулі ў сэрцы нешта,
І я сягоння, як заўжды,
Выказваю сябе дарэшты.

**Леанід МАРАКОЎ**

## ЖЫЦЦЯПІС ПАЭТА

Валеры Дзмітрыевіч Маракоў нарадзіўся 14(27).03.1909 г. У тым жа годзе бацькі Дзмітры Захаравіч і Вольга Станіславаўна ахрысцілі яго ў Сенніцкай царкве пад Менскам.

У час імперыялістычнай вайны Мараковы вымушаны былі пакінуць Беларусь. Жылі ў Мцэнску (Расія), потым у Рамнах (Украіна), дзе Валеры паступіў у рэальнае вучылішча.

Недзе ў канцы 1919 — пачатку 1920 г. сям'я вярнулася ў Мінск і хлопец працягваў вучобу ўжо ў 4-ай Мінскай узорнай сямігадовай школе.

У 1922 г., будучы вучнем 5 класа, Валеры ў школьнай насценгазеце змяшчае свае першыя вершы.

У 1924 г. В.Маракоў скончыў школу і да канца 1925 г. працаваў разам з бацькам печнікам.

Тады ўпершыню і з'явіліся яго вершы ў друку.

У снежні 1925 г. пастановаю ЦБ юных піянераў і пры спрыянні Алеся Якімовіча В.Маракоў быў прызначаны сакратарам рэдакцыі часопіса «Піянер Беларусі».

У пачатку 1926 г. паэта прымаюць у літаб'яднанне «Маладняк», куды яго прывёў рэдактар часопіса «Малады араты» Ілары Барашка. Адначасова яго абіраюць членам рэдкалегіі часопіса «Маладняк».

Улетку таго ж года выходзіць першы зборнік В.Маракова «Пялёсткі». Яго адразу заўважылі крытыкі і чытачы. М.Гарэцкі пісаў: «Рэцэнзенты даволі ўважліва (С.Баркоўскі, Янчук. — **Л.М.**) адгукнуліся на выйсце з друку зборніка <...>

«Пялёсткі». <...> [Але] спатканы [ён] быў даволі сурова за ідэалогію... Рэцэнзенты зазначылі вялікі суб'ектывізм паэта, адсутнасць грамадскіх матываў, пэўны песімізм (Ант. Адамовіч, Ю.Лявонны. — **Л.М.**)».

З восені 1926 г. В.Маракоў разам з А.Звонакам жыў у Полацку, дзе некаторы час друкаваўся ў мясцовай газеце «Чырвоная Полаччына».

Улетку 1927 г. з друку выходзіць другі паэтычны зборнік В.Маракова «На залатым пакосе». На кнігу з'яўляецца шэраг рэцэнзій (Ант. Адамовіча, А.Ляснога (Мардвілкі), С.Замбржыцкага, П.Шукайлы, В.Вераса, І.Райда — псеўданім украінскага паэта Т.Масэнкі — і іншых).

У канцы 1927 г. Наркам асветы БССР накіроўвае паэта на вучобу ў Мінскі Белпедтэхнікум імя У.Ігнатоўскага.

Пасля заканчэння двух курсаў В.Маракова адклікалі з вучобы і прызначылі загадчыкам літаратурнага аддзела газеты «Савецкая Беларусь» , дзе ён працаваў (з невялікім перапынкам) да канца 1930 года.

Улетку 1929 г. для азнаямлення з «сацыялістычным будаўніцтвам» В.Маракоў выязджаў на Асінбуд, а «заадно» наведаў у высылцы (у Смаленску) А. Дудара.

У ліпені–жніўні 1930 г. выйшла з друку трэцяя кніга В.Маракова «Вяршыні жаданняў».

У красавіку 1931 г. В.Маракоў паступае ў Мінскі Вышэйшы Белпедінстытут імя М.Горкага. Адначасова працуе сакратаром, а потым наменікам рэдактара часопіса «Чырвоная Беларусь» (заснавальнікам і рэдактарам быў М.Чарот).

У канцы 1931 г. выйшла з друку кніга апавяданняў А.Новікава-Прыбоя «Па цёмнаму» ў перакладзе В.Маракова.


470

Улетку 1933 г. выйшаў апошні прыжыццёвы зборнік паэта «Права на зброю».

У чэрвені 1934 г. В.Маракоў скончыў (разам з Э. Агняцвет, З.Біралам, С.Левіным, Ю.Лявонным, С. Мурзо, З. Піваваравым, А. Раманоўскай, П. Хатулёвым, С. Шушкевічам) крытыка-творчую секцыю літаратурна-лінгвістычнага аддзялення Белпедінстытута. Тады ж стаў сябрам Саюза пісьменнікаў БССР.

Увосень таго ж 1934 г. паэт перайшоў з часопіса «Чырвоная Беларусь» у «ЛіМ», дзе супрацоўнічаў да пачатку 1935 г.

У студзені 1935 г. В.Маракоў паехаў у мястэчка Чарнеўка Барысаўскага раёна ў творчую камандзіроўку на лесараспрацоўкі і лесасплаў, дзе прабыў да 1 сакавіка. Потым, вярнуўшыся ў Мінск, прыступіў да працы над раманам «Вечная крыніца».

21 сакавіка 1935 г. за «контррэвалюцыйную дзейнасць» В.Маракова арыштавалі органы НКВД.

4 мая 1935 г. энкавэдысты забралі і бацьку паэта, старасту Козыраўскай царквы. У канцлагерах і ссылцы ён прабудзе больш за дзесяць гадоў.

7 ліпеня справа В.Маракова была спынена і яго выпусцілі з унутранай турмы НКВД.

6 лістапада 1936 г. паэта арыштавалі паўторна. Разам з ім «па справе» праходзілі: С.Левін, С.Мурзо, Ю.Лявонны, П.Хатулёў, С.Шушкевіч, В.Каваль, С.Кучынскі, М.Багун, М.Чарот, А.Звонак, З.Бірала, З.Піваварaў, П.Шастакоў, Т.Кляшторны, А.Дудар.

Першага жніўня 1937 г. на вялікім вогнішчы ў «амерыканцы» сярод тысяч рукапісаў беларускіх пісьменнікаў разам з невядомымі, не «праскочыўшымі» цэнзуру або напісанымі «ў стол» творамі М.Багуна, С.Баранавых, А.Вольнага,

П.Галавача, У.Галубка, Ц.Гартнага, М.Гваздова, С.Дарожнага, А.Дудара, М.Зарэцкага, С.Знаёмага, В.Каваля, Т.Кляшторнага, Д.Курдзіна, Ю.Лявоннага, Я.Нёманскага, З.Піваварава, С.Ракіты, А.Розны, В.Сташэўскага, Б.Тарашкевіча, У.Хадыкі, І.Харыка, М.Чарота, В.Шашалевіча і многіх іншых гарэлі і творы Валерыя Маракова...

28 кастрычніка 1937 г. Выязная Ваенная калегія Вярхоўнага Суда СССР прыгаварыла В.Маракова да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці. Прыгавор быў канчатковы, абскарджанню не падлягаў і паводле Пастановы ЦВК СССР ад 1 снежня 1934 г. быў неадкладна выкананы.

29 кастрычніка 1937 г. Валерыя Маракова расстралялі. У адну ноч з ім былі знішчаны: Якаў Браніштэйн, Віктар Вайноў (Войнаў) , Анатоль Вольны, Платон Галавач, Алесь Дудар, Хацкель Дунец, Міхась Зарэцкі, Васіль Каваль, Язэп Каранеўскі, Майсей Кульбак, Аляксей Кучынскі, Саламон Левін, Юрка Лявонны, Валеры Маракоў, Зяма Півавараў, Васіль Сташэўскі , Ізі Харык, Пятро Хатулёў, Міхась Чарот, Макар Шалай, Павел Шастакоў, Арон Юдэльсон.

10 верасня 1956 года прыгавор ад 28 кастрычніка 1937 г. ў адносінах да В.Маракова Ваенная калегія Вярхоўнага Суда СССР адмяніла.

23 красавіка 1957 г. за адсутнасцю складу злачынства была адменена і «справа».

У тым жа годзе рэабілітавалі і бацьку паэта Дзмітрыя Захаравіча Маракова.


472

# ЗМЕСТ

***Вячаслаў Райгоша.*** На пераломе жалеза і песні. . . . . . . 5

## Вершы і паэмы

### 1925

«Песні, песні юнацкага слова...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
«Белае зімняе поле...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32
«Толькі раніцай сонца як гляне...» . . . . . . . . . . . . . . . . 32
«Я іду зялёнай палоскай...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
У лесе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
«Зялёны месяц над ракой...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
«Гадавала нас вёска і горад...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
З вёскі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
Гораду . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
Муляр . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
«Хоць даўно ўжо я выбраўся з вёскі...» . . . . . . . . . . . . 39
Тыя дні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39
А цяпер . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
«Ой, не радасна шуміць дуброва...» . . . . . . . . . . . . . . . 41
Увосень. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
«Б’ецца вецер над далінай...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
«Сціскаецца сэрца не таму, што восень...» . . . . . . . . . . . 43

### 1926

«Над сінім лесам, шэрым полем...» . . . . . . . . . . . . . . . . 44
«Чаго сёння так сэрца палае...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
«Я цяпер з хлапцамі ў радасці бягу...» . . . . . . . . . . . . . 46
«О, мой любы дружа, дружа дарагі...» . . . . . . . . . . . . . 46
«І зноў прыйшоў, і зноў пабачыў родны край...» . . . . . . 47
«Эх ты, поле! Шырокае поле...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
«Над прасторам ніў і над квяцістым лугам...» . . . . . . . . 49
«Тут так хораша, свету так многа...» . . . . . . . . . . . . . . . 50
«Пеў пякучыя песні свае салавей...» . . . . . . . . . . . . . . . 50

«Помніш ты, быў ціхі-ціхі вечар...» . . . . . . . . . . . . . . . . .51
Дзяўчыне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .52
«Нашто глядзіш мне так у вочы...» . . . . . . . . . . . . . . . . . .53
«І зноў холад і вецер, і сіняя цьма...» . . . . . . . . . . . . . . . .54
«Эх, палі, залатое раздолле...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .55
«Зноў прыйшла, прыйшла ты...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .56
Ноч запаліла . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .57
Алесю Івашкевічу... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .60
«О, каменне замоўкла, каменне маўчыць...» . . . . . . . . . . . .61
Сон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .62
«І так, усё... ўсё праляцела...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .63

## 1927

«Была восень у роднай краіне...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . .64
Вясной . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .65
«Патанаюць далі ў стынь і ў сон-туман...» . . . . . . . . . . . . .65
«Мне хочацца любіць, задумацца і верыць...». . . . . . . . . . . .66
«О, вясна...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .67
На прыволлі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .68
«Мой родны край... І зноў я тут!» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .69
«Цяпер ў грудзях другія словы...». . . . . . . . . . . . . . . . . . . .70
Я прыйду . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .70
«Ты не знаеш, Ніна, што жыццё — вясна...» . . . . . . . . . . . .71
Адказ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .72
Сястры Ніне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .73
Я не кахаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .73
Маўрытанка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .74
«Добры дзень, дарагая...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .75
З белых начэй . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .77
Летуценні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .78
«Здароў, мой таварыш, мой дружа...» . . . . . . . . . . . . . . . . .81
Паэтам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .82
«Хрыпла гудок прагучэў...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .83
Маці. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .84
«У гэтай цемры...». . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .85

Жаданне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .86
«З ценямі думкі, а з думкамі цені...» . . . . . . . . . . . . . . .87

## 1928

«Адсумаваўшы маладосць сваю...» . . . . . . . . . . . . . . . . . .88
Уступ да паэмы «Рабінавая ноч» . . . . . . . . . . . . . . . . . . .89
«Маладняку» — 5 год . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .90
Чуеш, Беларусь? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .91
«Ёсць лепшы свет...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .92
«Доўга, доўга стаяў пад акном я і марыў...» . . . . . . . . . . . .93
Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .94
Васілю Кавалю . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .96
«Ён адчыніў вакно...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .98
Цішку Гартнаму . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .100
«За чужое шчасце і любоў...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . .101
М. Дубовіку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .102
Цыганка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .103
Адноўленая зямля (Паэма) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .105
Пры дагараючым кастры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .116

## 1929

Жыццё, як мора-акіян . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .118
«Сягоння сонца ўстала маладое...» . . . . . . . . . . . . . . . . .119
«Перада мной напружаная зала...» . . . . . . . . . . . . . . . . .120
Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .121
Паўлюку Трусу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .124
Муляр (Паэма) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .126
Мая паэма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .141
Я веру . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .176

## 1930

«Там...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .179
«Пракрычалі пеўні ўночы...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .180
Янку Купалу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .181

«Гукі маtораў і радыё...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 183
Парогі паміраюць (Урывак з паэмы) . . . . . . . . . . . . . . 183
«Там дзесьці у цемры туманных вякоў...» . . . . . . . . . . 185
«Ах, спявай, дарагая, спявай...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 186
«Ты гаворыш, што сэрца прыстала...» . . . . . . . . . . . . . 187
«Пазнаў і я, што ёсць прырода...» . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
Адышоўшым . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 189
«Я ўспамінаю дні змагання...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 189
«Цені бягуць другія...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 191
«Вецер гуляе па даху...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 192
Заяц . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 194
«Сягоння сонца ўстала маладое...» . . . . . . . . . . . . . . . . 195

## 1931

«Я помню, — яблыні цвілі...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 196
«Страшныя сны навеяла гісторыя...» . . . . . . . . . . . . . . 197
«Сінімі шляхамі на ружовы шлях...» . . . . . . . . . . . . . . 198
«Горад грыміць і грыміць...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 199
«Стаю прад Пушкіным адзін...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 200
Міхасю Лынькову . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 201

## 1932

Ля кастра чалавечага ўсходу надзей . . . . . . . . . . . . . . . 203
Новыя вершы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 209
Першы дзень на запалкавай фабрыцы . . . . . . . . . . . . . . 220
Паводка і паэт расплачваюцца за маладосць . . . . . . . . . . 225
Мой сябра Капусцін . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 229
Ліст да паэта Петруся Броўкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 234

## 1933

Яшчэ раз пра паэзію і ружы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 239
«Бывай, вясна мая, бывай...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 243
«Ударыць сэрца раз...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 243
Ілжэударнік Абрамаў з фабрыкі «Дзвіна» . . . . . . . . . . . 244
Мая каханая — рэдактар газеты . . . . . . . . . . . . . . . . . . 248

Пачастунак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .252

## 1934–1935

Першы снег. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .254
Пілот . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .255
З цыкла «Пальмы даліны» . . . . . . . . . . . . . . . . . . .258
На дарозе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .260
Байка пра Мішу і зайку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .262

## Інакшыя песні

## 1925–1935

Піянерская восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .263
«О, выходзь, маладняцкая раць...» . . . . . . . . . . . .264
За што? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .264
Дзесяць год. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .266
Яшчэ адна. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .266
«Загараўся крывавы усход...» . . . . . . . . . . . . . . . .267
Два франты. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .268
«Калі растручаны пачуцці...» . . . . . . . . . . . . . . . .269
Чуецца мора гул . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .271
Прыйшла трынаццатая восень. . . . . . . . . . . . . . . .272
Чуеце голас антэн . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .274
Зямля бунтуе (Фрагменты паэмы) . . . . . . . . . . . . .278
Леніну . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .286
Адтуль, дзе палыхаюць домны . . . . . . . . . . . . . . .287
Дарогаю ў штаб . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .288
Камісар. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .291
Адна партыя ў валейбол . . . . . . . . . . . . . . . . . . .292
Майскім маршам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .297
Жыццё за нас . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .299
Голас паэта . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .301
Жыццё ў цвеце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .302
Мы ўключаем сваю маладосць. . . . . . . . . . . . . . . .305
«Бліскучых лямп...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .306

Слава Беларускай Савецкай Рэспубліцы . . . . . . . . . . . . . 307
За край камуны. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 308
Памяці тавараша Кірава . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 311
Маладая кроў рэспублікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 312
Мы дзён шчаслівых кавалі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 315
З цыкла «Пальмы даліны» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 316
Насустрач ветру (Фрагмент паэмы) . . . . . . . . . . . . . . . . 317

## Проза, публіцыстыка, крытыка

Па бярозавым шляху . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 321
Я верыў тады . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 322
Маладнякоўская ўдзячнасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 324
12 дзён . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 325
І.Ю.Кулик. «Антологія американськоі поезії». 1855 — 1925 гг. 327
Анры Барбюс. Розныя факты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 330
Хроніка Белдзяржкіно кульгае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 333
Пра паэзію . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 334

## Пераклады

***Е. Б. Броўнінг.*** Крык дзяцей. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 343
***А. Новікаў-Прыбой.*** Па-цёмнаму . . . . . . . . . . . . . . . . . 345
***Эмі Сяо.*** Нанкін Род . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 346
Памяці Кантонскай камуны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 349
***У. Бранеўскі.*** На смерць таварыша . . . . . . . . . . . . . . . 352
***С. Богуш.*** Баявы таварыш . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 353
***Гайраш.*** На праполцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 356
***М. Ціханаў.*** Вясна ў Дэнаў, або Начное ворыва трактарамі «Валліс» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 357
***Х. Грачыл.*** Маё дзяцінства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 358
***А. Гідаш.*** Калоніі крычаць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 360
***Паўло Тычына.*** Песня Чырвонай Арміі . . . . . . . . . . . . . 363
***Сулейман Стальскі.*** «Праз гор, цяснін бяскрайніх шыр...» . 364

***М. Дудзін.*** Мы адыходзім . . . . . . . . . . . . . . . . . . .366
***М. Галодны.*** Навальніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .367
Я пра цябе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .368
***С. Краеў.*** Песня пра вінтоўку . . . . . . . . . . . . . . . . . .369
***А. Пушкін.*** Помнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .371

## Дадатак

***Эдзі Агняцвет.*** Нязгасная зорка яго паэзіі . . . . . . . . . . .375
***Станіслаў Шушкевіч.*** Валеры Маракоў . . . . . . . . . . . . . .383
***Алесь Звонак.*** Няскончаная песня. . . . . . . . . . . . . . . . .392
***Сяргей Грахоўскі.*** Растаптаныя пялёсткі . . . . . . . . . . . .402
***Максім Лужанін.*** Дзень з Валерыем Мараковым . . . . . .415
***Павел Пруднікаў.*** Паэт эмоцый . . . . . . . . . . . . . . . . . .419
***Ядвіга Раманоўская.*** Некалькі згадак з майго дзяцінства 433
***Алесь Марціновіч.*** «...Вінаватым сябе не прызнаў» . . . .439
***Алесь Бельскі.*** «Не хачу так рана ў песнях дагарацьǃ..» 445
***Сяргей Вераціла.*** Страх нараджаецца на ўскрайку дня . .456
***Мікола Мішчанчук.*** «Пырснуць смехам лілеі ў тумане
над жалезным паходам вякоў...» . . . . . . . . . . . . . . . . .460
***Леанід Маракоў.*** Жыццяпіс паэта. . . . . . . . . . . . . . . . .469

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**МАРАКОЎ Валеры Дзмітрыевіч**

**РАБІНАВАЯ НОЧ**

*Вершы, проза, публіцыстыка, крытыка, пераклады, а таксама ўспаміны пра паэта і агляд яго творчасці*

Рэдактар *М.С.Гіль*
*Карэктар Л.З.Кудравец*
*Камп'ютэрны набор тэксту Л. У.Маракоў*

Падп. да друку Фармат Папера Гарнітура
Афсетны друк. Ум. друк. арк. Ум. фарб.-адб. Ул.-выд. арк.
Тыраж Заказ